Я. І. Клімуць

Шляхі пазнання

НАРЫСЫ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XX ст.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Магілёў
МДУ імя А. А. Куляшова
2016

Электронны аналаг друкаванага выдання:

Я. І. Клімуць
Шляхі пазнання :
нарысы гісторыі беларускай літаратуры другой паловы XX ст.
Магілёў: МДУ імя А. А. Куляшова, 2016. – 248 с.

ISBN 978-985-568-196-1

У кнізе разглядаецца творчасць вядомых беларускіх паэтаў і празаікаў, у асноўным ураджэнцаў Магілёўшчыны, ці непасрэдна з ёй звязаных гадамі працы, літаратурная дзейнасць якіх найбольш поўна разгарнулася ў другой палове XX стагоддзя. Раскрываюцца ў належнай форме асаблівасці мастацкай манеры кожнай творчай асобы, таксама ўдзелена належная ўвага даследаванню творчасці паэтаў і пісьменнікаў, што пісалі і пішуць для дзяцей. Адрасуецца кніга літаратуразнаўцам, выкладчыкам і студэнтам гуманітарных факультэтаў, настаўнікам сярэдніх школ.

УДК 821.161.3.09“19”
ББК 83.3(4Бел)6

Клімуць, Я. І. Шляхі пазнання : нарысы гісторыі беларускай літаратуры другой паловы XX ст. [Электронны рэсурс]: манаграфія / Я. І. Клімуць. – Электрон. даныя. – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2016. – 1 электрон. апт. дыск (CD-R); 12 см. – Сіст. патрабаванні: Pentium II 300, 64 Mb RAM, свабоднае месца на дыске 16 Mb, Windows 98 і вышэй, Adobe Acrobat Reader, CD-Rom, мыш. – Загал. з экрана. – 3 экз.

212022, г. Магілёў
вул. Касманаўтаў,1
тэл.: 8-0222-28-31-51
e-mail: alexpzn@mail.ru
http://www.msu.mogilev.by

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Куляшова

ISBN 978-985-568-217-3
(электроннае выданне)

© Клімуць Я. І., 2016
© МДУ імя А. А. Куляшова, 2016
© МДУ імя А. А. Куляшова,
электронны аналаг, 2016

I

АД БЕСЯДЗІ ПАЧАТАК

Штрыхі творчай індывідуальнасці Аркадзя Куляшова

Сярод паэтаў XX стагоддзя Аркадзь Куляшоў займае адметнае месца. Менавіта ў пасляваенны час поплеч з Максімам Танкам і Піменам Панчанкам вывеў беларускую паэзію, а, разам з тым, і ўсю літаратуру на міжнародны ўзровень. Асабліва гэта відавочна стала на пачатку шасцідзясятых гадоў, калі паэзія А. Куляшова загучала сапраўды па-філасофску, закранаючы космас і мікракосмас жыцця чалавека. Але, каб стаць такім, яму прыйшлося прайсці праз пэўныя кругі выпрабаванняў на сталасць і творчую самастойнасць. Ён уваходзіць у маладзейшае пакаленне творцаў абноўленага мастацтва слова, што ішло ў літаратуру ў другой палове дваццатых гадоў мінулага стагоддзя. Уваходзілі яны імкліва з вялікай верай, што новы час дакляруе сапраўднае нацыянальнае Адраджэнне, ідэя якога так пакутліва выкрышталізоўвалася на пачатку стагоддзя.

Аркадзь Аляксандравіч Куляшоў нарадзіўся 6 лютага 1914 года ў в. Саматэвічы на Касцюкоўшчыне ў сям'і настаўнікаў. Рана навучыўся чытаць, у сем гадоў ведаў на памяць паэму М. Лермантава "Мцыры", вучыўся ў Саматэвіцкай сямігодцы, у сёмым класе жыў адзін у школьным інтэрнаце, паколькі бацькоў накіравалі на працу ў розныя школы. У 1928 годзе паступіў у Мсціслаўскі педагагічны тэхнікум, дзе ў той час склалася моцная творчая суполка, талентам сярод якіх выдзяляліся З. Астапенка і Ю. Таўбін, з якімі ён хутка і пасябраваў. У 1930 годзе пераехаў у Мінск, дзе вучыўся ў педістытуце. З гэтага часу ўсё яго жыццё, за выключэннем вайны, было звязана са сталіцай Беларусі.

Як і многія пачаткоўцы таго часу Аркадзь Куляшоў дэбютаваў у газеце "Наш працаўнік" тады Калінінскай акругі даволі прымітыўным вершыкам "Ты мой брат", у якім дванаццацігадовы хлапчук з апломбам заяўляе ад імя пакалення змагароў рабочых і сялян часу вядомай агітацыйнай ідэі змычкі вёскі і горада:

Ты ёсць рабочы, я – мужык,
Завёмсь з табой працаўнікамі.
Да працы ты і я прывык:
Мы для сябе працуем самі.
……

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Я помню, як мы з родных межаў
Турылі ворагаў палкі;
Ад Магілёва й Белавежы
Блішчалі вострыя штыкі[1].

Гэта спроба перадаць маналітнасць калектыўнага мы, змагароў за новую ўладу адпавядала сацыяльна-грамадскім патрабаванням. Асобы паэта тут не заўважаецца: перадаецца звычайная для таго часу лозунгавая інфармацыя. Але ў пачаткоўца былі і іншыя вершы, калі меркаваць па ўспамінах аднакласнікаў, якія гавораць, што ўжо тады Аркадзь Куляшоў вызначаўся сапраўдным талентам сярод сваіх аднагодкаў. Гэта пацвярджаюць і пазнейшыя публікацыі ў перыядычным друку. Ужо ў наступным годзе былі надрукаваныя вершы іншага кшталту, няхай яшчэ і празмерна шматслоўныя і па-маладнякоўску "квяцістыя". Паказальныя ў гэтым плане вершы "Жаўталісце" і "На шляху", апублікаваныя ў "Магілёўскім селяніне" ў 1927 годзе яшчэ пад псеўданімам Алесь Дуда. Ім характэрна агульнасць, жаданне ўключыць у твор усё, што бачыць паэт, разам з тым надаючы рэчаіснасці арэол таямнічасці, загадкавасці і як вынік – усплёск неўтаймоўнай радасці. Для нагляднасці параўнаем гэтыя вершы ў першай публікацыі і пазнейшай аўтарскай рэдакцыі. Вось "Жаўталісце":

Жаўталісце з роем павучын
У маністы восені сплялося.
На паўмежак сцелецца палын,
Дзень бяжыць з палёў
пужлівым лосем.
Адцвілі блакітам васількі,
Прыхілілісь з коласам да долу.
У пракосах енчуць кавалькі,
У снапы кладзецца
жытні колас.
У прадонне ж дум маіх адно:
Не загіне радасць, будзе цвісці,
Хоць чакаю мілую даўно,
Як чакаю
гэта жаўталісце!..
І пад восені мінорны шум
Хто жыццё вірлівае ўкрадзе,
У каго захован дзесьці сум

[1] Дуда, А. Ты мой брат/А.Дуда // Наш працаўнік, 1926. – 30 верасня

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

І не б'е
Ключом бурлівым радасць?..
Жаўталісце, засцілай дыван,
Залаціцца поле хай табою!
Шлях часова восенню убран
І даецца
толькі барацьбою… [2]

З гэтага квацістага эцюда пазней Аркадзь Куляшоў зрабіў верш пад назваю "Восень", узяўшы толькі восем радкоў з сярэдзіны твора, крыху памяняўшы асобныя словы і пераставіўшы радкі. Верш атрымаўся выразным і кампактным:

Адцвілі блакітам васількі,
Каласкі схіліліся да долу.
У снапы кладзецца жытні колас,
Пад снапамі енчаць кавалкі.

Жаўталісце з роем павуцін
У маністу восені сплялося.
Горкі асыпаецца палын,
Дзень бяжыць з палёў пужлівым лосем[3].

Тое ж самае зрабіў Аркадзь Куляшоў і з вершам "На шляху", праўда, тут пакінуў ранейшую назву. Зноў узяў толькі дзве страфы, адкінуўшы ўсю блытаную інфармацыю, таму твор атрымаўся надзвычай лірычным і праўдзівым:

Гінуць дажджыстых хмар валаконцы,
Дыхае свежасцю сіняя гладзь.
Хочацца шыры, паветра і сонца,
Хочацца з лісцяў расінкі страсаць.

Хочацца мне прыдарожнай дубровы
Песні вясёлыя слухаць душой.
Колькі там радасных сцежак кляновых,
Казак жывых за таемнай імглой[4].

А вось гэты самы верш у першай публікацыі:

…Там, за курганам, пярэсціцца поле,
Поўніцца скрогатам новых калёс.

[2] Куляшоў, А. Жаўталісце // Магілёўскі селянін. – № 87. – 14 жніўня.
[3] Куляшоў, А. Збор твораў: у 2 т. Т. 1 / А. Куляшоў. – Мн.: ДВБ, 1957. – С. 4.
[4] Тамсама. – С. 8.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Золата збожжа. Без межы раздолле,
Сыплюцца слёзкі з бярозавых кос.

Гінуць дажджыстых хмар валаконцы,
Мерна сплываюць у сінюю гладзь.
Хочацца шыры, паветра і сонца,
Хочацца з лісцяў слязінкі абняць.

Хочацца мне кучаравай дубровы
Песні вясёлыя ў лісці пачуць.
Колькі там радасных сцежак кляновых,
Поўна таемнымі казкамі муць…

Носіцца вецер у воблаках белых,
Дзікай завеяй спяваюць лясы,
Спелая радасць у садзе зжаўцелым
Сніцца сягоння ў крышталях расы.

Лес адгукнуўся глухім сутарэннем,
Поўніцца скрогатам, гулам калёс.
Сонца пяшчотнае вастрым праменнем
Выпіла слёзкі з галінаў бяроз[5].

Тут відаць мноства ўсяго лішняга ў адным вершы. Пазней некаторыя з трапных метафар паэт выкарыстае ў іншых творах. Многае з апублікаванага ў “Магілёўскім селяніне” ў 1928 годзе Аркадзь Куляшоў наогул не ўключаў у зборнікі трыццатых гадоў, не звяртаўся да іх і пазней. Гэта “Углядаюся ў далеч…”, “Раніца”, “Сягоння”, “Сяброўскі ліст”, “На травах наквець”, “Дні бягуць”, “Снягі”.

У трынаццаці-чатырнаццацігадовым узросце ён напісаў праніклівыя лірычныя вершы, якія склалі аснову яго першага зборніка “Росквіт зямлі” (1930). Ды час пачынаўся ўжо круты. Тады Маякоўскі быў аб’яўлены першым і вышэйшым савецкім паэтам, усім рэкамендавана было пісаць падобна да яго. Несумненна, роля Маякоўскага ў гісторыі літаратуры значная, і ў многім уплыў яго і ў беларускай літаратуры быў станоўчы. Але камандныя ўстаноўкі ніколі не прыносілі карысці. Адмоўна яны адбіліся і на творчасці Аркадзя Куляшова. Пацверджанне гэтаму – яго многія вершы са зборнікаў “Па песню, па сонца” (1932) і

[5] Куляшоў, А. На шляху / А. Куляшоў // Магілёўскі селянін, 1927. – 11 верасня.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

“Медзі дождж” (1932). Менавіта пра гэты перыяд значна пазней скажа А. Твардоўскі як пра язду “со спущенными вожжами”.

Малады беларускі паэт быў актыўны, эксперыментаваў, асвойваў ліра-эпічны жанр. У гэты час напісаны паэмы “Аманал” (1933), “Гарбун” (1935, пазнейшая назва “Антон Шандабыла”). Усё ж у сярэдзіне трыццатых пачала ўзрастаць незадаволенасць. Пра гэта ў 60-я ён напіша: “Разумею, што дрэнна, павярхоўна ведаю жыццё, а пра тое, што ведаю, пяю, як кажуць, не ўласцівым для мяне голасам”[6]. І гэта ў той час, калі паэт меў толькі станоўчую крытыку. Пра яго паэтычныя эксперыменты ўхвальна пісаў Якуб Колас, акцэнтуючы ўвагу на перспектыўнасці яго самабытных пошукаў. А сам паэт адчувае наступленне крызісу. Таму звяртаецца да класікі, беларускай і рускай. Ізноў да сваіх любімых з дзяцінства паэтаў – Пушкіна і Лермантава. Шмат перакладае.

Пры гэтым трэба мець на ўвазе і драматычныя падзеі другой паловы трыццатых, рэпрэсіі, што выкасілі амаль усю інтэлігенцыю. Гэты дамоклаў меч вісеў і над самім Куляшовым.

Выхад з крызісу сам А. Куляшоў звязваў са з’яўленнем паэмы А. Твардоўскага “Краіна Муравія”. Але гэта хутчэй быў толькі знешні штуршок. Унутраная напружаная работа дала нарэшце свой плён.

У канцы трыццатых гадоў А. Куляшоў вяртаецца да самога сябе, да вытокаў, да лірычнага ўспрымання рэчаіснасці, але ўжо на новай аснове, на чарговым вітку інтэлектуальнага развіцця. Паэтычны цыкл “Юнацкі свет” пацвердзіў з’яўленне паэта са сваім бачаннем рэчаіснасці, са сваёй устойлівай эстэтычнай праграмай, выкладзенай у вершах “Магілёўская хмарка”, “Плыла, цалавалася хмара з зямлёй…” :

Спакою не ведаць, ні ноччу, ні днём
І не прыставаць у знямозе,
Вялікай любові дажджом
І агнём
Зямлю цалаваць па дарозе[7].

Крыху пазней гэта ўсведамленне будзе пацверджана хрэстаматыйнымі радкамі з “Маёй Бесядзі”:

З надзеяй гляджу на крыніцу спатканую,
Хачу, каб яна разлілася ракой…
Не Волгай магутнай,

[6] Пяцьдзесят чатыры дарогі: Аўтабіяграфіі беларускіх пісьменнікаў / скл. Я. Казека. – Мн.: ДВБ, 1963. – С. 325.

[7] Куляшоў, А. Збор твораў. – С. 141.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Не нават Камаю,
Хоць Бесяддзю, што на радзіме маёй.
Бо прагай да працы ахоплены часта я,
І сэрца абпалена смагай радка!
Бо жыць не магу,
Як каня няшчасная,
Кропляй дажджу з лесавога лістка[8].

Станаўленне асобы паэта, па сутнасці, завяршылася, што сабой пацвердзіла яго паэзія часу вайны. Творы яго таго часу гучалі набатна, па сваім пафасе не ўступалі ваяўнічаму вершу Янкі Купалы "Беларускім партызанам", хоць сёння яны ўспрымаюцца неадназначна.

Пачатак вайны для ўсіх тады савецкіх людзей быў ашаламляльным. Пры разгорнутай прапагандзе сяброўства з Германіяй грамадства верыла, што сапраўды бацька народаў абароніць іх ад усіх бедаў. Існавала на той час і яшчэ адна распаўсюджаная дактрына: калі вораг усё-такі нападзе, то вайна будзе весціся толькі на чужой тэрыторыі. Ідэалагічная апрацоўка народа ў цэнтральных і ўсходніх раёнах Беларусі была татальнай, сумненне ў правільнасці дзяржаўных установак пагражала вялікімі бедамі. Сёння ўжо не ўзнікае здзіўлення, як гэта за нейкіх пятнаццаць гадоў ідэалагічнай апрацоўкі партыйнай вярхушцы ўдалося замбіраваць амаль усё падуладнае насельніцтва. Асабліва гэта праявілася ў апрацоўцы моладзі, у падрыхтоўцы своеасаблівых "камікадзе", для якіх асабістае жыццё амаль нічога не павінна было значыць у параўнанні з ідэйнымі палажэннямі партыі і камсамола. У гэтым партыйна-тэхналагічным катле пераварыўся і А. Куляшоў, што нанесла адбітак на даволі значны перыяд яго творчасці. Яшчэ ў 1929 годзе А. Куляшоў напісаў верш "Манеўры", у якім зусім юны паэт наіўна сцвярджае еднасць сілы і закону:

Чуеш свет!
Шырэй для нас дарогу:
Мы сягоння – сіла і закон[9].

У сувязі з гэтым М. Арочка адзначае: "Фактар сілы, здавалася, вырашаў усё, дыктуючы на свой лад нават законы, а ім жа, законам, калі будаваць цывілізаванае грамадства, належыць асобная ўлада, якая стрымлівае фатальнасць, разгул усеўладдзя сілы. У творчасці 30–40-х гадоў падобныя выдаткі і адзнакі суровага таленту будуць яшчэ ні адзін раз

[8] Куляшоў, А. Збор твораў. – С. 210–211.
[9] Тамсама. – С. 25.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

праяўляцца”[10]. Вось і ў вершы “Ранак” гучаць гэтыя трагічна-ахвярныя матывы.

Выходжу я ў разведку –
Рашучы заўтра бой[11].

У трагічнай сітуацыі герой звяртаецца да ранку:

У родную краіну
Дарогі перайнач.
А я? А я загіну.
А ты?
А ты не плач[12].

І гэта не абстракцыя. Былі ахвяры паходу ў Заходнюю Беларусь і Заходнюю Украіну. Яшчэ больш падстаў давалі для такога трагічнага і адначасова патрыятычнага пафасу канфлікты з Японіяй на Далёкім Усходзе, і ганебная ваенная савецка-фінская кампанія, у выніку якой Савецкі Саюз быў выключаны з Лігі Нацый, як, дарэчы, і Германія, што ў далейшым трагічна адбілася на лёсе савецкіх ваеннапалонных. А ў паэме “Хлопцы апошняй вайны” (1940) А.Куляшоў здолеў перадаць драматызм сучаснасці і спрагназаваць ў нейкай ступені будучыню. У яго ўяўленні яна павінна быць надзвычай трагічнай, але ўвогуле толькі для салдата агрэсара. Гэта ён павінен быў загінуць ад кулі або снарада, калі пакваліцца на нашу тэрыторыю. Але аб’ектыўнасць адлюстравання павінна была прымусіць паэта сказаць і пра немінучасць ахвяр з боку абаронцаў.

Паколькі твор у нейкай ступені абстрактны, не прывязаны да канкрэтных дзей, месца і часу, не мае канкрэтна імянных герояў, то ў ім і прачытваецца агульнае асуджэнне агрэсіўнасці, якая бачылася толькі з-за мяжы. Таму А.Куляшоў акцэнтуе ўвагу на ахвярнасці, як таго патрабавала камсамольска-камуністычная прапаганда. Але разам з усім у паэме выражана і рэальная трывога за чалавека.

У творы даецца яскравае прадчуванне вайны, а таксама найвялікшае жаданне яе пазбегнуць. Як гэта можна было зрабіць, аўтар адказу не дае, ды яго і чакаць у мастацкім творы немагчыма, бо літаратура не вырашае канкрэтных грамадска-палітычных задач, а толькі звяртае на іх увагу. Тут проста паказана абагуленае відовішча магчымых трагедый. Пра малыя ваенныя канфлікты даходзіла хоць і даволі скажоная

[10] Арочка, М.М. Аркадзь Куляшоў / М.М. Арочка // Гісторыя беларускай літаратуры ХХ ст. : у 4 т. Т. 3. – Мн.: Бел. нав., 2001.

[11] Куляшоў, А. Збор твораў. – С. 145.

[12] Тамсама. – С. 146.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

інфармацыя, але можна было і адчуць, што тыя падзеі прадвяшчалі вялікую бяду, што добра адчуваў паэт. На гэта звярнуў увагу яшчэ ў 60-я гады М.М.Грынчык: "*У цэнтры паэмы – раскрыццё маральна-псіхалагічных матываў паводзін і ўчынкаў чалавека, якому неўзабаве прыйдзецца прыняць удзел у такім гістарычным змаганні, ад якога "лёс зямлі залежа*"[13]. Сапраўды, твор яўна прамоўніцкага характару, паэма-араторыя, жанр, які ярка праявіцца крыху пазней. Прытым, тут гучала моцная гуманістычная антываенная ідэя непрымання самазнішчальных войнаў, якая перадаецца ў метафарычным паданні пра сонца, якое адмаўляецца свяціць людзям, якія "*яшчэ не пакінулі біцца, калоцца, рэзацца… вось яны*"[14]. Але ў творы гучыць і найвялікшая перакананасць у справядлівасці народа, які змагаецца за вольнае шчаслівае жыццё. Гэты твор як бы адкрываў рамантычна-ўзнёслы пафас выяўлення будучых трагічных выпрабаванняў і адначасова страснае непрыняцце вайны, на што звярнуў увагу В. Бечык: "*Паэма прасягнута страсным антыванным пафасам, пазначана душэўнай амбівалентнасцю і адказнасцю перад краінай"*[15]. Аднак трагічнае прадказанне, што пра падзеі будучай вайны раскажа кожны дзесяты, на жаль, пацвердзілася.

У той жа іпастасі жорсткай ахвярнасці гучыць і ўся паэзія А. Куляшова ваеннага часу: жорсткая неабходнасць, перакананасць ў сваёй праваце, недапушчанне хоць нейкіх хістанняў у герояў у адносінах свайго абавязку. І гэта праявілася найбольш поўна ў шэрагу яго балад часу вайны. Першай, быццам зусім нейтральнай, бо не перадае ніякіх гераічных падзей, стала балада "Млынар", якая ў многім акрэсліла далейшую творчую пазіцыю Куляшова.

Змест балады даволі адназначны: рэзкі падзел грамадства на сваіх і чужых. Былыя сябры і аднадумцы, безымянны млынар і яго сябар Савелі, клянуцца ў вернасці свайму краю і народу. Аднак адразу шляхі іх дыяметральна разыходзяцца, але паэт не дае тлумачэнне гэтаму, бо, хутчэй за ўсё, яго ў той час больш цікавіла знешняя праява, чым унутранае абгрунтаванне ўчынкаў. Нават не называецца прычына такой лёгкай адрачонасці Савелія ад прысягі, дадзенай у даволі ўрачыстай абстаноўцы:

Не для мірнай прыемнай размовы адны
Тут сустрэліся блізкія людзі, –
Чужакоў тут застаюцца чакаць яны,

[13] Грынчык, М. Аркадзь Куляшоў / М. Грынчык Мн.: Беларусь, 1964. – С. 322.
[14] Куляшоў, А. Збор твораў. – Т. 2. – С. 83.
[15] Бечык, В. Свет жывы і блізкі / В. Бечык. – Мн.: Маст. літ, 1974. – С. 19.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Часу мала ім, нельга марудзіць.
І таварыш тварышу клятву даваў
Над ствалом партызанскай бярданкі [16].

Вядома, учынкі людзей часта бываюць невытлумачальныя, аднак нельга зразумець, чаму пасля такой клятвы Савелі адпраўляецца за вёску з хлебам-соллю сустракаць акупантаў. Чым гэта вымагалася: захаваннем вёскі, даць магчымасць людзям выжыць, а, можа, яшчэ іншая тайная задума ў яго была. Аднак, відаць, у той час паэту у такіх аргументацыях не бачылася патрэбы: на яго думку таго вымагаў драмтычны час, калі адбывалася палярызацыя сілаў. Таму, відаць, станавілася высакародным і тое, што здрадніку станоўчы герой выносіць адназначны прысуд, не разбіраючыся асабліва ў матывах яго рашэння:

Плюнуў дымам млынар
І агнём яму ў твар,
Верны клятве, пайшоў у партызаны[17].

Па сутнасці, гэта самасуд, які ў савецкія часы набываў правы вышэйшага закону. Ён асабліва праявіўся ў час вайны, калі многае нельга было праверыць, але вельмі трэба было сцвердзіць справядлівасць здзейсненага, а, у большай ступені, апраўдаць незаконную дзейнасць. Натуральна, тады А.Куляшоў не мог ведаць пра ўсе тайныя дзеянні органаў бяспекі, але як паэт-камсамолец (па вызначэнні М. Сяднёва) ён ні ўчым не сумняваўся, верыў у прадвызначанасць сацыялістычнай сістэмы, яе караючых органаў, таму ён у паэзіі быў асабліва бескампрамісным, нават у параўнанні са сваімі крыху старэйшымі калегамі.

Праблемы вернасці і здрадніцтва ў той час ўспрымалася без аніякіх светаценяў, якія ў савецкія часы набываў права вышэйшага закону. Хутчэй за ўсё ў тонкія прававыя нюансы паэт і наогул не ўнікаў. Ён ужо амаль аўтаматычна выяўляў агалошаныя тагачасныя лозунгі пра магчымае здрадніцтва, чым і апраўдваліся масавыя знішчэнні. У гэтай плыні бескамраміснасці часу вайны, можна сказаць, А. Куляшоў быў сярод першых, як ні дзіўна, бо ва ўсёй ранейшай і пазнейшай творчасці прапаведаваў любоў да чалавека, захапленне светам і душэўнай прыгажосцю асобы. Але паэтычны вобраз “або-або” прасякае ўсю паэзію таго часу, але не набывае такой жорсткасці, як у вершах А. Куляшова пачатку вайны. Хоць тут можна прыгадаць і плакатна-заклікальныя вершы Якуба Коласа адносна акупантаў, якіх трэба знішчаць як сабак. Аднак у

[16] Куляшоў, А. Збор твораў. – Т. 1. – С. 157–158.
[17] Тамсама. – С. 158.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

адносінах да суайчыннікаў такая знішчальная фармуліроўка не прадугледжвалася, што і пацвярджаецца многімі творамі беларускіх аўтараў. У баладзе П. Броўкі “Адыход у партызаны” раскрываецца прыблізна такая ж сітуацыя: патрыёт, былы пастух Андрэй Кашуба раптам зразумеў, што яго ворагу выдае аднавясковец Каліст рат. Таму герой поўны прагі помсты здрадніку. Але і думкі не дапускае, што яго можна проста застрэліць. Згодна народнай маралі ён цвёрда верыць, што здрадніка чакае суд і страшнае пакаранне. У мастацкіх адносінах твор Броўкі істотна ўступае куляшоўскаму, аднак гуманістычны пафас яго больш адпавядае агульначалавечым нормам. Кашуба настроены жорстка адпомсціць Каліст рату, але ўстрымліваецца ад прывядзення ўласнага рысуду, прыходзячы да вываду, што спачатку трэба адпомсціць акупантам, а пасля разбірацца са сваімі. Ён пайшоў у лес і “*там клятву даў*, *пакуль жывы*, *адпомсціць чужаніцам*…”[18]. Пад той час каштоўнасць асобы не бралася пад увагу, найбольшы выхад атрымлівала канцэпцыя жорсткіх адносін. Таго патрабаваў ва ўсіх выступленнях і тагачасны ўрад. Як з гэтай сітуацыі выйшла беларуская літаратура, можна меркаваць па творах многіх паэтаў. Патрыятызм, ахвярніцтва і здрадніцтва, як дзве антыганістычныя з’явы, у час вайны становяцца вядучым пафасам усёй паэзіі. Іншых меркаванняў не дапускала і таталітарная ідэалогія, таму чорна-белая каляровасць запаланяла паэзію, і блізка не дапускаючы нейкую паўтоннасць. Назіралася яшчэ адна крайнасць: прыслужнікамі фашыстаў станавіліся выключна былыя ворагі, звычайна кулакі і падкулачнікі, якім у свой час удалося пазбегнуць кары. Таму помста разумелася ў такой сітуацыі як заканамернасць. Такі факт з’яўляецца ключавым і ў вершы П. Панчанкі “Здраднік”:

Хто там валачэцца, як пабіты?
А каго там сокалы вядуць?
Здрадніка, кулацкага бандыта, –
Ён разносіў па сялу бяду…[19].

Яму і вырак павінен быць адназначны – смерць. Аднак прысуд гэты выносіць не нехта адзін, а грамада, жыхары вызваленай беларускай вёскі:

Ты капаў магілу для народа,
Ды папаўся сам у пастку, гад.
Атрымай за ўсё ўзнагароду –
Кулю ды праклён ад родных хат [20].

[18] Броўка, П. Збор твораў : у 9 т. / П. Броўка – Мн.: Маст. літ., 1987. – Т. 1. – С. 67.
[19] Панчанка, П. Збор твораў : у 4 т. / П. Панчанка. – Мн.: Маст. літ., 1981. – Т. 1. – С. 132.
[20] Тамсама. – С. 132.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У той час, відаць, нават і не дапускалася думка, што на такіх пасадах, як староста, чалавек мог апынуцца выпадкова. Калі ж працаваў па заданні, то ў той час гэта афішаваць было нельга, а пасля, калі гінулі яго непасрэдныя кіраўнікі, якія таксама ўсё трымалі ў тайні, даказаць і ўвогуле што-небудзь было немагчыма. Аднак А. Куляшоў на той час, відаць, яшчэ не дапускаў такой магчымасці. Выхаваны на камсамольска-партыйным максімалізме, ён на пачатку іншага плану вырашэння драматычных сітуацый проста не бачыў. Ён, і не толькі, поўнасцю прыняў тагачасную форму існавання і ўспрымання рэчаіснасці, абвешчаную ў сярэдзіне трыццатых гадоў: калі ты не з намі, значыць, вораг. Трэба ўлічыць і тое, што на пачатку саракавых гадоў, як ужо адзначалася, народ не ведаў тайнай палітычнай кухні, таму агрэсія ўспрымалася ўсёй міжнароднай супольнасцю як страшэннае вераломства. Такім чынам, сам жорсткі час дыктаваў свае ўмовы, значыць і сумненняў у правільнасці ці няправільнасці дзяржаўных патрабаванняў ахвярнасці ад грамадства ў паэтаў у той час проста не ўзнікала. Як адзначаюць сучасныя даследчыкі, "*суровая эпоха патрабавала мужнай песні – у Куляшова гэта былі балады "Над брацкай магілай", "Маці", "Ліст з палону*". У "Баладзе аб чатырох заложніках", пабудаванай на рэальным факце, перададзены трагізм "*памежнай сітуацыі", калі "бацька" Мінай, герой твора, мусіў выбіраць паміж бацькоўскім пачуццём і абавязкам воіна (пазней у аповесці Абеліск" Васіль Быкаў, улічыўшы гуманістычныя запатрабаванні новага часу, аспрэчыў залішне жорсткую, на мяжы з бесчалавечнасцю, пазіцыю паэта*)"[21]. Час, вядома, уносіць свае карэктывы ў ацэнкі многіх з'яў. Аднак, трэба ўлічваць і канкрэтную сітуацыю, тыя абставіны, сутнасць ідэалогіі, якая ператварала чалавека ў дадатак да машыны, у своеасаблівы вінцік. Свой погляд на рэчы не толькі ўспрымаўся падазрона, ён катэгарычна адмаўляўся. І вось гэты рэзкі падзел дамоклавым мячом вісеў над кожным, бо сёння ты герой, а заўтра пры нейкіх трагічных абставінах не па сваёй волі трапіў у рукі ворага – і ты ўжо здрднік. Сталінскае выслоўе – "ў нас няма палонных, ёсць толькі здраднікі" – вызначала ўсё. Людзі на акупіраванай тэрыторыі агулам адносіліся да патэнцыянальных здраднікаў, быццам гэта была іхняя віна, што доблесная армія іх кінула на пакуты. А ўжо тыя, што па нейкіх прычынах апынуліся на службе ў акупацыйных улад, адназначна без усялякага разбору падлягалі знішчэнню. Вось гэтую жорсткую ідэалагічную ўстаноўку многія тагачасныя паэты

[21] Арочка, М.М. Аркадзь Куляшоў. – С. 304.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

прымалі безагаворачна, але ў кожнага з іх былі свае нюансы. Праўда, большасць твораў з прыкладна такой тэматыкай была напісана ў другой палове вайны, калі драматызм поўнага вынішчэння дзяржаўнасці паслабіўся, у вайне адчуваўся пералом на карысць савецкіх войск. Паняцце "*калабарацыянізм*" тады не існавала ў савецкім лексіконе: быў адназначны падзел на здраднікаў і патрыётаў, сваіх і чужых, без усялякіх адценняў. Але ўжо ў падобных сітуацыях, як у "Млынары", паэты не спрабавалі вырашаць пытанні безапеляцыйна. І выўлялася гэта ўжо пераважна ў жанры паэмы, дзе было больш магчымасцей у даследаванні прычын служэння акупантам і высвятлення долі іх віны.

Пэўныя цяжкасці для паэтаў пры выяўленнні падобнай тэматыкі складалі аб'ектыўныя прычыны: знаходзячыся далёка ад роднай зямлі, тыворцы слаба ведалі ўсе перыпетыі жыцця, сутнасць узаемаадносін з акупацыйнымі ўладамі. Таму і атрымлівалася крыху шаблоннае адлюстраванне, калі спрацоўвалі ранейшыя стэрэатыпы. Праўда, кожны паэт уносіў сваё ўяўленне пра магчымае разгортванне падзей, але зыходны пункт быў падобным. Якуб Колас напісаў дзве паэмы, блізкія тэматычна – "Суд у лесе" і "Адплата", дзе яскрава праводзіцца думка абавязковай адплаты за здзекі, рабункі, разбой. Аднак, як паэт з вялікім жыццёвым вопытам, ён не мог вырашыць праблемы прасталінейна. Вядома, тады не магло быць і блізка нейкіх следчых працэсаў, высвятлення долі віны ворага ці здрадніка. Але паэт не дапускае прысуду аднаго, няхай сабе і знакамітага камандзіра партызанаў. На авансцэну выходзіць народ, які і з'яўляецца вышэйшым суддзёй, або прысуд выносіць сабе сам адступнік. Так, у паэме "Суд у лесе" грамада асуджае на смерць карніка фон Зюмеля, але і тут ўсё адбываецца ў рамках закона: тут ёсць пракурор, суддзі і нават абаронца, якім вымушаны стаць, па ўсеагульным рашэнні, фашыстоўскі прыхвасцень Кандрат Губіч. Камандзір партызанскага атрада Гурба бярэ на сябе ролю пракурора, суддзёй выступае народ. Тым не менш, прысуд даволі дэмакратычны: злога ворага, захопніка прысуджаюць да смерці, Губіча пасля яго раскаяння пакідаюць жывым пад наглядам грамады. І так у многіх іншых творах многіх беларускіх паэтаў. У Куляшова ж на раннім этапе якраз на першы план вылучаўся жорсткі абавязак, выкананне грамадзянскага ахвяравання, а потым ужо, як светацені, выяўлялася шкадаванне пра неапраўданыя страты. Менавіта ў такім жорсткім ключы напісаны "Балада аб чатырох заложніках", "Камсамольскі білет". Вершы выключна грандыёзныя. Напісаныя пафасна, яны ўздзейнічалі на адчуванні тага-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

часнага чалавека. Але дужа бесчалавечнай нават у час вайны з'яўляецца забарона бацьку ратаваць сваіх дзяцей, нешта трохі халодна-жудаснае гучыць і ў "Камсамольскім білеце", хоць лагічна там усё на месцы. Натуральна, можна станоўча ўспрымаць грамадскую пазіцыю юнака, які ахвярна абараняе свае сімвалы. Вядома, сёння многім можа здацца, што гэтыя сімвалы надуманыя, ці варта было за іх класці жыццё. Але ў гістарычным плане да такіх стрэсавых сітуацый можна падыходзіць па-рознаму. Так, у перадваенныя гады партыйна-камсамольскія фетышы былі выведзены ў разрад найвышэйшых маральных законаў. А што зробіш? Такой была дзяржава, якая жорстка патрабавала абараняць яе сімвалы, хоць некаму яны былі і не па душы. Але ў агульным плане стойкасць юнака-камсамольца выклікае захапленне, хацелася б толькі параіць многім такой стойкасці ў адстойванні сапраўдных беларускіх сімвалаў. Выклікаюць нязгоду і асобныя старонкі "Сцяга брыгады", асабліва ў тых мясцінах, дзе паэт пазбаўляе права бацькі сустрэцца са сваім сынам, якога ён бачыць здалёк, і ўжо ў расправе над Ворчыкам, што ўвогуле стаіць за нормамі юрыдычнай і грамадскай маралі. Ці не таму ў "Васілю Цёркіну" А.Твардоўскі зрабіў процілеглыя сцэны, калі камісар дазваляе групе зрабіць невялікі крук, каб галоўны герой пабачыўся са свамі роднымі. На жаль, на пачатку вайны такога разумення ў А. Куляшова не было. Ён вядзе сваіх герояў па жорсткіх лініях выпрабаваняў і, як ні дзіўна, яны гожа ўсё гэта праходзяць. Але не можа душа паэта быць канчаткова анямелай. У ёй струменяцца ўсе падзеі часу, там кіпіць вулкан, бо ён успрымае ўсе беды народа як свае. Таму з такім уздымам напісаны "Ліст з палону", у якім напал грамадзянскіх пачуццяў настолькі высокі, што закранае самых цвёрдакаменных.

Мнагагамнасць паэзіі А. Куляшова і палягае ў тым, што побач з такімі бескампрміснымі верашамі ў яго паяўляюцца балады "Маці", "Быль аб цымбалах і цымбалісце", "Алёнка", "Балада аб знойдзенай падкове" і інш. Вылучаецца на першы план менавіта спрадвечная дабрата беларуса. Але, відаць, найбольш уражлівай на той час была балада "Маці", напісаная на аснове народных матываў, у нейкай ступені аправяргала хуткаспечаныя тэорыі савецкіх паэтаў. Ён яшчэ раз даказаў вечную ісціну, што маці ніколі не забудзе сваё дзіця, нават пад пагрозай уласнай смерці, насуперак лёгкавесным "Пусть забудет сын и мать..", хоць, магчыма, і такія заявы вымагаліся часам выйны. А тут трэба прыгадаць і цудоўнейшую паэму А. Куляшова "Прыгоды цымбал", гэты выдатнейшы твор пра неўміручасць жыцця.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У канцы саракавых гадоў А. Куляшоў яшчэ раз вернецца да такой тэмы ў паэме “Простыя людзі” (“Перамога”), дзе падзеі, як і ў “Хлопцах апошняй вайны”, даволі ўмоўныя. У апошнім пераможным баі Мірон Гукай завалены ў бліндажы, ён жывы, але быццам яго ўжо і няма. Ды сутнасць якраз у тым, што чалавек заўсёды павінен супраціўляцца розным неспрыяльным і пагражальным абставінам. Прытым, паэт не акцэнтуе ўвагу на батальных сцэнах, зрэшты, іх там проста няма, па задуме твора яны і не патрэбныя. М.М. Арочка адзначаў: “*У паэме “Перамога” (“Простыя людзі”) ідзе змаганне за Чалавека. Філасофскія пачаткі ўзняты ў значнай абстрагаванасці: са смерцю ваюе не проста салдат, а жыццё*”[22]. Менавіта Жыццё прымушае салдата змагацца да апошняга: “*Смерці не слухай, рухай нагамі, рукамі знямеўшымі рухай. Не паддавайся, змагайся…*” [23]. У выніку магутных намаганняў урэшце Гукай прабіваецца да святла, а на радзіму ўжо адпраўлена вестка пра гераічную гібель салдата. Такім чынам, чалавек з гонарам выходзіць з трагічнай сітуацыі, насуперак абыякавасці вайсковых чыноўнікаў, канчаткова перамагае Жыццё. Натуральна, тады А. Куляшоў не мог адкрыта сказаць пра антыгуманнасць дзяржаўнай палітыкі ў адносінах да чалавека, як гэта пазней выявіць А. Твардоўскі ў паэме “Теркин на том свете”. Але і тут Аркадзь Куляшоў быў першым. І гэта надзвычай важна.

У першае пасляваеннае дзесяцігоддзе, самы супярэчлівы перыяд у нашым літаратурным працэсе, Аркадзь Куляшоў побач з многімі вершамі на злабадзённасць дня напісаў творы з адкрытымі рысамі вечнасці, што прадвяшчалі касмічную тэматыку ў літаратуры. У 1947 годзе ён напісаў баладу “Зямля”, у якой выявіў адчуванні касманаўтаў (тады называў іх астраномамі), пасля звароту з міжпланетнага палёту:

Будзе прыемнай назад вам дарога –
Быццам салдатам з паходу цяжкога.

Здасца зямля вам, ад смагі зялёным,
Флягай з вадою, балонам з азонам.

Здасца яна вам, шчаслівым бясконца,
Хлебам ружовым, што выпекла сонца[24].

[22] Арочка, М.М. Беларуская савецкая паэма / М.М. Арочка. – Мн.: Нав. і тэхн., 1979. – С. 193.

[23] Куляшоў, А. Збор твораў. – Т. 2. – С. 221

[24] Тамсама. Т. 1. – С. 222.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Гэтая праніклівасць надта здзівіла касманаўта Клімука, калі ён даведаўся, што верш быў напісаны за паўтара дзесяцігоддзі да першага касмічнага палёту.

У гэты ж час Аркадзь Куляшоў натхнёна працаваў над перакладам рамана А. Пушкіна “Яўгеній Анегін”, выдадзенага ў 1949 годзе да 150-гадовага юбілею рускага паэта, што стала значнай падзеяй у літаратурным жыцці Беларусі і ў творчым лёсе самога перакладчыка, паколькі з’явілася важным фактарам у шліфоўцы ўласнага паэтычнага майстэрства.

У пачатку пяцідзесятых гадоў у творчасці А. Куляшова заўважаецца пэўны спад: ён амаль не піша вершаў, працуе над удасканаленнем вершаванай аповесці “Граніца”, якая ў закончаным варыянце была выдадзена пад назвай “Грозная пушча”. Потым аддаў шмат гадоў працы на кінастудыі “Беларусьфільм”, дзе спачатку быў начальнікам сцэнарнага аддзела, а потым галоўным рэдактарам, напісаў сцэнарыі фільмаў “Чырвонае лісце” (у сааўтарстве з А. Кучарам), “Запомнім гэты дзень” і “Першыя выпрабаванні” (абодва ў сааўтарстве з М. Лужаніным), апошні выклікаў шмат нараканняў за адступленне ад кананічнага тэксту трылогіі Якуба Коласа “На ростанях”. Але там хутчэй адчувалася рука Лужаніна.

У канцы пяцідзесятых гадоў А. Куляшоў надрукаваў некалькі вершаў, якія можна лічыць яго адказам на заявы некаторых творцаў, што А. Куляшоў як паэт скончыўся, поўнасцю выпісаўся. Ён заявіў, што не збіраецца пакідаць ганаровай пасады паэта, працуе не дзеля славы і грошай:

Я не супраць пашаны,
працую, рабоце адданы,
На пасадзе цяжкой,
і не трэба мне большай пашаны[25].

І ўславіў вечны пошук, няспынныя парыванні, жаданне адкрыццяў новага, непазнанага, а знікненне з людскіх вачэй сведчыла хутчэй не пра разладжанасць са светам, а пра імкненне да спасціжэння новага. Вяртанне чалавека юбілейнага ўзросту з працяглага маўчання многія ўспрынялі скептычна:

Перад ім,
як вярнуўся,
Не твары мільгалі, а спіны,

[25] Куляшоў, А. Збор твораў: у 4 т. / А. Куляшоў. – Мн.: Беларусь, 1967. – Т. 3. – С. 8.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Адварочваўся кожны,
Хто ведаў яго, хто не знаў.
Ён жа,
ловячы ўсмешкі
І чуючы крыўдныя кпіны,
Не зважаў на тых жаб,
І, як бусел, іх моўчкі глытаў[26].

Няўдзячная справа атаясамліваць паэта з тымі вялікімі вобразамі, што ўвасабляюць паэтычнае бачанне свету. Ды ўсё ж … Адказ скептыкам быў дадзены, бо вершы гэтага часу, склаўшыя крыху пазней кнігу паэзіі пад сімптаматычнай назвай “Новая кніга”, сапраўды прадставілі Куляшова зусім у іншай іпастасі – паэта не мясцовага, а агульнаеўрапейскага маштабу. Паэт выходзіў за межы агульнапрынятага, тым часам, застаючыся цалкам ў межах беларускай літаратурнай традыцыі. У яго з’явілася багдановічаўская канцэнтрацыя думкі разам з купалаўскай метафарычнай размашыстасцю, што, урэшце, і дало ўзоры непаўторнай, толькі ўласна куляшоўскай паэзіі. Засталіся тыя самыя прыярытэты, тыя ж карціны жыцця, праблемы і жыццёвыя канфлікты, але яны падаваліся ўжо ў іншым святле, недзе акцэнтуючыся на вечнасці.

Актуальнай засталася для Аркадзя Куляшова праблема паэта і паэзіі, сваё бачанне ролі паэта ў грамадстве, сфармуляванае ім на мяжы 30–40-х гадоў. Зараз яна паглыбляецца філасофскім асэнсаваннем важкасці мастацкага слова, яго ўздзеяння на чытача, у той час яшчэ вернага друкаванай кнізе. Паэт спрабуе пераасэнсаваць бяздумна напісанае раней, вымушанае альбо памылкова ўспрынятае на веру.

Палю я рэшту дзён мізэрных,
Але не за цяжкія іх
Шуканні вернасці ў няверных,
Святой любові ў несвятых.

І не за тое іх палю я,
Што абпаліўся жорстка сам,
Што больш за марай не палюю,
Гадоў на марнасць не аддам –

Палю з рашучасцю суровай,
Каб сталь з іх выплавіць да дня,

[26] Куляшоў, А. Збор твораў: у 4 т. – Т. 3. – С. 30.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Загартаванаю падковай
Надзейна падкаваць каня.

Палае горан мой у соснах,
Куецца ў ім дарожны дух
Для горных круч, для хваль высозных,
Для самых грозных завірух[27].

Гэта як подступ да вырашэння яго галоўнай праблемы вартасці ўласнай паэзіі ў вірлівым гэтым веку. Часам можна сустрэць песімізм, але большасцю пераважае менавіта стваральнае, што кампануе ў сабе неўміручасць свету і індывідуума ў ім. Заглянем у яго вершы "Элегія", "Да паэзіі", "На паўмільярдным кіламетры…" і ншыя. Паэт шмат у чым удакладніў само разуменне тварэння паэзіі, хоць, вядома, гэта ўсё ўмоўна: узятае ў паэтычнай творчасці з народных капілак, яго сынам павінна быць вернута стокроць. Таму Куляшоў і паэтычна сцвярджае, што творчасць павінна садзейнічаць самаўдасканаленню чалавека. Гэта яскрава праяўляецца ў многіх яго вершах, бо галоўным, усё-такі, стновіцца вобраз звычайнага чалавека, але ў складаным узаемаперапляценні самых высокіх драмтычных агульных перажыванняў, выражаных праз асабістае. Так уласна праблемна-творчыя развагі пераходзяць увогуле ў інтымную сферу, бо ўсё гэта ўзаемазвязана. Каханне, вера, вернасць пераплятаюцца ўвогуле з самімі паняцямі творчасці і чалавечай годнасці. І ўжо паэт пачынае мысліць глабальна, бо простае існаванне індывідуума выяўляецца на фоне не зямных, а ўжо касмічных прастораў. Паэту хочацца верыць у разумнасць дзеяння чалавека, у яго стваральную, а не разбуральную сутнасць. Таму ў інтымна-філасофскай лірыцы яго больш клопату пра магчымасць суіснаваня людзей у супярэчлівым часе. Натуральна, небяспека яму бачылася толькі ў тым варожым капіталістычным свеце, што ўсё-такі зрэдку праяўлялася ў яго паэзіі, калі гаворка заходзіла пра лёс Планеты:

Сачу, каб не скрануў яе з арбіты
Заакіянскі ядавіты грыб[28].

Пасля рэзкага процістаяння перыяду "халоднай вайны" ў другой палове пяцідзсятых быццам наступіў час усеагульнага паразумення. Аднак на самй справе гэты спакой быў ілюзорным. Неўзабаве свет зноў стаў на грань катастрофы ў так званы момант "Карыбскага крызісу".

[27] Куляшоў, А. Збор твораў. – Т. 3. – С. 39.
[28] Тамсама. – С. 113.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Тады хапіла ў кіраўнікоў двух процістаячых супердзяржаў вытрымкі і знаходжання спосабу кампрамісу, які скончыўся вывазам савецкіх ракет з Кубы, а амерыканцы ў сваю чаргу ўстрымаліся ад прамой ваеннай агрэсіі супраць гэтай краіны. Але ў свеце было неспакойна, вяліся лакальныя войны, на пачатку шасцідзесятых нарастала эскалацыя вайны ў В'етнаме, дзе зноў праявіла сябе агрэсіўная знешняя палітыка ЗША. Ва ўсіх войнах і канфліктах удзельнічалі і савецкія сілы, але грамадскасць пра тое не ведала, акрамя, хіба, паведамленняў пра савецкіх ваенных спецыялістаў, якія аказваюць у якасці саветнікаў дапамогу Паўночнаму В'етнаму па арганізацыі паветранай абароны. Пра сапраўдную місію тых спецыялістаў ніхто не мог нават здагадвацца. А паэты заўсёды чуйна адносіліся да такіх праблем, адпаведна на іх рэагавалі. Але для літаратуры ўжо недастаткова было адкрытай публіцыстычнасці саракавых гадоў, выяўленне ўсяго жыцця выходзіла на новыя віткі гістарычнага асэнсавання.

Апошняя злавесная вайна пакінула моцныя "зарубкі" ў памяці пакаленняў, што ў рознай ступені прайшлі праз яе. Яны пісалі пра тое, але ўжо з адценнем новай трывогі, адчуваннем небяспекі, што павісала над чалавецтвам. Ды і сама тая вайна згадваецца ўжо ў гэткім аспекце: мы перамаглі. Але ці забяспечылі свет ад новых знішчэнняў? Таму і набывае праблема захаванне свету ярка акрэсленае філасофскае гучанне, у паэзіі ўсё боьш адчуваецца клопат пра лёс Планеты і чалавека на ёй.

Непасрэднае выяўленне ваенных падзей і чалавека ў іх падаецца зараз праз прызму новага часу. Тады яшчэ памятная вайна была балюча адчувальнай, смылелі фізічныя і душэўныя раны, таму людзі ў кожным мастацкім слове шукалі адказаў на спрадвечныя пытанні: ці апраўданыя тыя страты, ці помняць пра тых, хто здабываў Перамогу. Жорсткая праўда вайны тады была яшчэ недаступнай кожнаму чалавеку, бо спробы сказаць пра яе тут жа перакрываліся ідэалагічнымі службамі. Усё ж А. Куляшову ў асацыятыўным плане многае ўдавалася сказаць пра дзень вайны:

Там дзень як век, світанне як вітанне,
Апроч атак няма там іншых дат.
А баявое выканаў заданне –
Лічы, вярнуўся з вечнасці, сапдат[29].

На жаль, шанцавала не многім, у жорсткіх лопасцях вайны перамолваліся многія лёсы і жыцці, мажліва, многія гінулі, не паспеўшы

[29] Куляшоў, А. Дарогі / А. Куляшоў. – Мн.: Маст. літ., 2003. – С. 126.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

здзейсніць гераічны ўчынак, нават проста паваяваць. Але ўжо і гэтым прыбліжалі дзень светлы, застаючыся ў брацкіх магілах безымяннымі. Пра гэта напамінае паэт у вершы “Слова невядомага салдата”:

Забіты я быў пад Масквою,
І там, не пазнаны нікім,
Засыпаны роднай зямлёю
Быў з імем забытым маім[30].

Вось гэта і не дае спакою, прымушае яшчэ і яшчэ раз вярнуцца ў тыя гады. Ён хоча напомніць кожнаму пра тых, якія баявыя сцягі “*са славай, не падаючы, неслі праз вайну*”, каб свабодна віравала жыццё, каб кожны ад нараджэння быў упэўнены ў сваёй будучыні. Ды сітуацыя ўжо зусім іншая: недастаткова толькі помніць, а ўжо трэба і рабіць захады, каб не дапусціць новай знішчальнай вайны. А праблема гэта была актуальнай на працягу ўсёй другой паловы XX стагоддзя. Грамадства ўсё добра адчувала, разумела пагрозу. Але асэнсоўвала яе толькі ў адпаведнасці з пануючай ідэалогіяй і нашым ярка выражаным даверам да кіраўніцтва, якое ўсё ведае і вырашыць усе пытанні без тых, чый лёс вырашаецца.

Вялікія паэты чуйна адносіліся да павеваў часу, адпаведна на іх рэагавалі, але не заўсёды маглі выказацца пра тое адкрыта: у суадносінах з ідэалогіяй савецкай дзяржаўнасці ў мастацкіх творах несправядлівасць у адносінах да чалавека тварылася толькі ў буржуазным свеце, а сацыялістычная дзяржава ўвесь час змагалася за лёс чалавека, каб стрымаць тых разбушаваўшыхся акулаў вайны. Псіхалагічна добра быў распрацаваны ход: пры абвале на простага чалавека масавай інфармацыі пра замежны свет, у людзей павінна была выпрацавацца псіхалагічная ўстаноўка: няхай будзе, як ёсць, толькі не было б вайны. У палітычным аспекце гэтая догма спрацоўвала: шараговае грамадства даверліва ставілася да прапагандысцкай папулісцкай тэорыі. Відаць, у вялікай залежнасці ад ідэалогіі тагачаснай савецкай дзяржаўнасці знаходзіліся многія творцы. Таму часам падаецца, што і ў паэзіі А.Куляшова сёе-тое залішне палітычна заангажаванае, падладжанае пад чарговы палітычны курс. Але гэта толькі вонкавае ўспрыняцце, глыбінны сэнс крыецца зусім у іншым: не дапусціць усеагульнага знішчэння можна толькі праз узаемапаразуменне. Таму паэт часам адкрыта дэкларацыйна паведамляе, што ён не дазволіць

каб дым і пыл
Зямлю ператварылі ў бамбасховішча,

[30] Куляшоў, А. Дарогі. – С. 144.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Мільярд прапісак – у маўклівы прысак,
Мільярд калысак – у мільярд магіл[31].

Але гэта элементы мікраскапічныя, галоўнае ў тым, што грамадства павінна змагацца за мір у свеце, бо ў вершах апеляцыя вядзецца менавіта ў такім накірунку. У вершы "Пра Марс" за пятнаццаць гадоў да чарнобыльскай катастрофы ён папярэджваў чалавецтва, арыентуючыся, вядома, толькі на міждзяржаўную сітуацыю, канфратацыю дзвюх супердзяржаў, пра сусветную катастрофу, калі пісаў пра марсіянаў:

Можа, сапраўды іх існаванне
Больш патрэбна для планет другіх,
Можа, гэта ў час процістаяння
Неўміручай працай рук сваіх
Нас засцерагаюць марсіяне
Ад бяды, што не мінула іх"[32].

Напамінак у той час быў надзвычай актуальным. Зрэшты, застаецца такім і ў XXI стагоддзі.

Але можна прачытаць у яго зварот і да сваіх з такой жа перасцярогай, хоць там адрасат канкрэтна не ўказаны. Хутчэй за ўсё словы паэта трэба ўспрымаць як папярэджанне абодвум бакам процістяння, што выявілася ў яго хрэстматыйным вершы "Я хаце абавязаны прапіскаю…":

Свет, не дазволю я, каб дым і пыл
Зямлю ператварыў у бамбасховішча,
Мільярд прапісак – у маўклівы прысак,
Мільярд калысак – у мільярд магіл[33].

Магчымасці самазнішчэння А. Куляшоў паэтычна пераканальна паказаў у невялікай філасафічнай паэме "Цунамі", у якой па-свойму засяродзіў увагу на немагчымасці сучаснага чалавека адгарадзіцца ад глабальных праблем часу. Правёўшы сваіх герояў праз шматлікія выпрабаванні, у тым ліку і атамна-знішчальныя, ён усё ж сцвярджае, што асноваю ўсяго жыцця з'яўляецца спрадвечны занятак Чалавека.

А можа, гэта не яны, а іх
Далёкія патомкі, што ў сваіх
Абліччах іх абліччы паўтарылі?
Хто б ні былі яны, а толькі зноў
Яны – жыцця людскога сувязныя,

[31] Куляшоў, А. Дарогі. – С. 134.
[32] Тамсама. – С. 69.
[33] Тамсама. – С. 134.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Дзве долькі неразлучныя, якія
Вякам перадаюцца ад вякоў[34].

Вечнасць існавання Сусвету неразрыўна звязана ў паэта з пачуццём вернасці сваім сябрам, у якіх быў свой вялікі і трагічны лёс. Нельга без глыбокага суперажывання чытаць "Маналог", прысвечаны памяці цудоўных паэтаў, падсечаных на самым узлёце, З. Астапенку і Ю. Таўбіну. Так жа шчымліва гучаць і радкі, прысвечаныя вялікаму паэту XX стагоддзя А. Твардоўскаму, які ў дзяржаве партыйнага таталітарызму спрабаваў знайсці чыста чалавечую справядлівасць, і ў гэтым змаганні загінуў са светлай верай у магчымасць пабудавання грамадства роўнасці. Ці адчувалі тады паэты ўтапічнасць сваіх прагнозаў адносна пабудовы камуністычнага грамадства з яго абсалютнай роўнасцю? Дапушчальна. Таму А. Твардоўскі як апошні рыцар кідаўся ў бітву з непераможнай партыйна-бюракратычнай сістэмай, адваёўваючы права на свабоду слова. Гэта і выказаў А. Куляшоў у паэме "Варшаўскі шлях", выявіўшы вобраз паэта-ахвярніка, паэта-прадбачальніка:

Як не прарокам,
кім жа быць тады?
Не бойся слова гучнага – прарок! –
Прарок не бога – праўды слых і зрок[35].

Прарокам праўды з усімі ўласнымі зрывамі і сляпымі служэннямі культу быў і Аркадзь Куляшоў, які сапраўды меў права сказаць:

Хацеў бы век, які ўжо на зыходзе,
Забраць мяне з сабой, а я руку
Гарачую працягваю прыродзе –
З дваццатага ў трыццатае стагоддзе[36].

Гэта сапраўдная паэзія, глыбокая думкай і дасканаласцю формы, што стваралася ў адно імгненне. Таму ў свядомасці інтэлігенцыі (у некаторай ступені і ў літаратуразнаўстве) трывала замацавалася стэрэатыпнае меркаванне, што Аркадзь Куляшоў без вялікай душэўнай напругі адразу выдаваў паэтычныя шэдэўры. Пры гэтым, пераканаўча даводзіцца, што ў народнага паэта была свая манера тварыць вершы. Ён, нібыта, ляжаў, думаў, а пасля раптоўна падымаўся і запісваў гатовы твор. І, мусіць, пачалося гэта з успамінаў былога рэдактара армейскай газеты "Знамя Советов", які прыгадваў эпізод: высокае начальства,

[34] Куляшоў, А. Дарогі. – С. 173.
[35] Тамсама. – С. 309.
[36] Тамсама. – С. 102.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

убачыўшы каля рэдакцыйнай зямлянкі ляжачага “гультая”, раптам загаварыла пра парушэнне статутнай дысцыпліны. Рэдактар адказаў, што гэта паэт Аркадзь Куляшоў, у яго такая манера творчасці. І далей прыгадваў, што праз колькі хвілін А.Куляшоў прыходзіў у рэдакцыю і дыктаваў машыністцы гатовы верш. Такі спосаб творчасці пазней не адзін раз згадваліся і дачкой паэта Валянцінай, і ўнукам Уладзімірам Берберавым. І гэта стала своеасаблівым міфам, да яго прызвычаіліся, сёння амаль усе так і лічаць: А.Куляшоў ляжаў на канапе, пасля падымаўся, запісваў і – аддаваў у друк. Але ўсё было некалькі інакш. Дапушчальна, што спосаб мыслення ў яго адбываўся сапраўды так, бо калі надыходзіць той міг, творчае азарэнне, нябеснае пасланне, ці няхай яго назавём неяк інакш, да сённяшняга дня застаецца невытлумачальным. Зямляк паэта, таленавітая асоба, Алесь Пісьмянкоў нават напісаў цыкл невялікіх эсэ пра “думанне вершаў”, у яго ж можна знайсці выраз “сёння гаварыў ён з небам”, значыць, гэтае пасланне-імпульс прыходзіць не заўсёды, яго трэба ўлавіць у патрэбным месцы і ў патрэбны час. У Аркадзя Куляшова гэта атрымлівалася амаль заўсёды. Пра што і сведчанні яго родных. Але гэта толькі першы этап. Успыхвала ідэя, тэма, можа нават структура, форма верша, якую паэт тут жа занатоўваў. А пасля пачыналася тытанічная праца ў пошуках патрэбнага слова, канцэнтраванага выяўлення канцэпцыі твора, яго ідэйнай завершанасці.

Сёння цяжка меркаваць, як творчы працэс праходзіў у даваенныя гады, бо архівы не захаваліся. А многія перапрацоўкі ранніх вершаў праводзіліся сталым, вопытным паэтам, а сёе-тое, магчыма, і пад напорам рэдактараў. Але творчасць пасляваенная, асабліва 50–60-х гадоў дае шмат матэрыялу для роздуму над шляхам куляшоўскага верша “*ад задумы да здзяйснення*” (М. Мушынскі). І гэта можна праілюстраваць на некалькі прыкладах з творчай спадчыны Аркадзя Куляшова.

У архіве знаходзіцца многа рукапісаў уласных твораў і шматлікіх перакладаў.

Для Аркадзя Куляшова надзвычай актуальнай была праблема вызначэння творчага *credo*: сувязь паэзіі з жыццём, трываласць слова, узаемаперапляценне зямнога і духоўнага, што яскрава праявілася, як ужо адзначалася, ў вядомым цыкле “Юнацкі свет” і канчаткова сфармулявана ў класічным вершы “Мая Бесядзь”. Але і ў часы вяршыннай творчасці яго не пакідаў клопат вызначэння сутнасці паэзіі, яе значэння ў жыцці грамадства. А гэта значыць, што верш павінен закранаць самыя патаемныя струны душы чытача, весці яго ў свет прыгожага. А дабіцца

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

падобнага можна было толькі дасканалым, вытанчаным радком. І вось такога ўздзеяння і дабіваўся паэт у час дапрацоўкі твораў.

Асаблівасці такога творчага працэсу можна паспрабаваць раскрыць на прыкладзе працы А. Куляшова над асобнымі вершамі. Сутнасць паэзіі, яе прызначэнне, спосаб уздзеяння на чытача былі для яго надзвычай важным. Але ў працэсе працы паэту здараецца спазнаваць не толькі радасць удач, але і гаркоту паражэнняў. Таму вобраз палыну даволі распаўсюджаны ў яго паэзіі. Мы бачым пастаяннае збліжэнне такіх паняццяў, як Паэзія, Слава, Маці, Муза. Прыгадаем вершы “Мы славу параўноўваем з віном…”, “Пра славу”, “Я музу параўнаў бы з роднай маці…”, “Палын не трэба ні млынам, ні зводкам…” і інш., у якіх у той ці іншай форме закранаецца праблема паэта і паэзіі. Матывы гэтых вершаў упершыню зафіксаваныя ў чатырох строфах верша “Паэзія, як маці над калыскай…”, напісаным у 1961 годзе. Тэкст машынапісу верша перакрэслены, а на палях пададзены варыянты радкоў, якія пазней увайшлі ў вышэй пералічаныя вершы. Вось гэты тэкст:

Паэзія, як маці над калыскай,
Схілялася ў малецтве нада мной,–
Адной рукой карміла, другой
Мяне вучыла, як валодаць лыжкай.

Каб вырастаў не сытым сасунком,
Каб з прагнасці маёй не кпілі людзі,–
Яна да гаркаты пякучай грудзі
Пахучым націралa палыном.

А як свае паспрабаваў я крокі
На бітым шкле і на жарстве дарог,
Мне паказала свет яна шырокі
І босага пусціла за парог.

Каб там я сам зазнаў усе нястачы,
Усе няўдачы асушыў да дна,
І каб, п’ючы салодкі хмель удачы,
Не забываў пра горыч палына[37].

[37] Куляшоў, А. Паэзія, як маці над калыскай… / А. Куляшоў // БДАМЛіМ. – Ф. 411. Воп. 1. Арк. 8 (Адваротны).

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Тут папраўлена толькі слова “*п’ючы*” на “*каштуючы*”. А ў выніку апошняя страфа, стаўшы асобным вершам, загучала так:

Мы славу параўноўваем з віном,
А забыццё глухое – з палыном.

Пакуль не лёг твой цень, твой дзень кароткі
З табою ў ложак вечнасці – труну,
П’ючы шумлівай славы хмель салодкі,
Не забывай пра горыч палыну[38].

Першыя дзве страфы ужо раней згадванага верша сталі асновай твора “Палын не трэба ні млынам, ні зводкам…”, у якім вобраз палыну становіцца скразным як сімвал вернасці матчыным запаветам, тым сцяжынкам, якія выводзілі на шырокія шляхі жыцця і творчасці. Гэта пацвярджаецца і сэнсам верша “Я музу параўнаў бы з роднай маці…”. Але ўпершыню вобраз шляху паўстае ў першым варыянце вядомага зараз верша “Ужо з другім заручана дзяўчынка…”. У машынапісе верш выглядае наступным чынам:

Жанчынай зрабілася дзяўчынка,
А я – юнак – хаджу халасцяком.
Паэзія – прапаўшая сяжынка–
Вярнулася ў мой апусцеўшы дом.

Яна ў мяне нічога не спытала,
А моўчкі павяла праз лес густы,
Дзе ўчора я спаліў усе лісты,
Што мне мая любоў па пошце слала.

Я сцежцы расказаў сваю бяду,
Даваў зарок, што для мяне даволі
Дзявочых стужак, і што я ніколі
З яе пяшчанай стужкі не сыйду.

Я гаварыў і слоў мне было мала.
Яна ж маўчала, і не знаў я сам,
Што ў гэты час яна перадавала
Маё юнацтва сталасці шляхам[39].

[38] Куляшоў, А. Дарогі. – С. 80.

[39] Куляшоў, А. Жанчынай зрабілася дзяўчынка / А. Куляшоў // БДАМЛіМ. – Ф. 411. Воп. 1. Арк. 9.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У час дапрацоўкі слова *“жанчынай”* заменена выразам “*нявесткаю*”, два наступныя радкі загучалі так: “*Вярнулася ў асірацеўшы дом // Таварышка дзіцячых дзён – сцяжынка”*. Другая і чацвёртая строфы выкрэсленыя. Трэцяя страфа загучала наступным чынам: “*я расказаў ёй пра сваю бяду, // Даў зарок ёй, што з мяне даволі // Дзвочых стужак, што сваю нуду // Пазбуду хутка* (закрэслена) *Я з ёй пазбыў, і што больш ніколі // З яе пясчанай стужкі не сыйду”. Дапісаныя строфы: “Я прысягаў ёй, а яна маўчала // Наперад бег я, а яна з-пад ног // Плыла назад, як рэчка да прычала // Тых дзён, якіх ніхто вярнуць не мог”*. І “*У* (не расчытваецца) *шляху сцяжынка палявая // Пералілася хвалямі пяску // Што ціхай рэчцы мора абяцае? // Што абяцае сталасць юнаку?”*[40]. Тут заўважаецца лагічная разарванасць, хутчэй гэта чарнавыя накіды, пошукі патрэбнага слова для выражэння закончанай думкі.

І вось канчатковы варыянт:

Ужо з другім заручана дзяўчынка,
А я – юнак – хаджу халасцяком.

Вярнулася ў мой апусцелы дом
Дзіцячых мар таварышка – сцяжынка.
Я расказаў ёй пра сваю бяду,
Зарок даваў ёй,што з мяне даволі
Дзявочых стужак і што я ніколі
З яе пясчанай стужкі не сыду.
Я прысягаў ёй, а яна маўчала,
Наперад бег я, а яна – назад.

Тым дням, адкуль яна пачатак брала
Прыйшоў канец у рэчышчы прысад,
Дзе, як ручай, сцяжынка палявая
Пералілася хвалямі пяску
У сталасці шырокую раку –
Гасцінец-шлях… А ён куды ўпадае?[41].

Як бачым, ад першага машынапіснага варыянту мала чаго засталося. І гэта дае падставы лічыць, што не так і проста пісаліся вершы. Паэт шукаў, эксперыментаваў, мяняў цэлыя сказы і строфы, пакуль не дабіваўся лагічнага выяўлення думкі, метафарычнасці, паэтычнай дасканаласці.

[40] Куляшоў, А. Жанчынаю зрабілася дзяўчынка // БДАМЛіМ. – Арк. 9.
[41] Куляшоў, А. Дарогі. – С. 71.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Яшчэ цяжэй спазнаць рух думкі ў ліра-эпічных творах “Цунамі” і “Варшаўскі шлях”, дзе першыя праўкі праводзіліся ў рукапісным тэксце. Там столькі розных напластаванняў, выкрэсліванняў, варыянтаў, надпісаў над радком, занатовак на палях, якія расчытаць можна толькі з дапамогай спецыяльнай апаратуры.

Творчая спадчына Аркадзя Куляшова, што захоўваецца ў БДАМЛіМ г. Мінска, дае шмат матэрыялу для даследчыкаў, якія цікавяцца творчым працэсам у працы паэтаў, тэарэтычнымі праблемамі вершаскладання.

Такім чынам, усебаковае даследаванне творчасці народнага паэта Беларусі яшчэ наперадзе.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

“ПАДУМАЕМ АБ ГАЛОЎНЫМ…”
Паэзія Пімена Панчанкі

Пімен Панчанка таксама адзін са знакамітых паэтаў XX стагоддзя. Разам з Максімам Танкам, П. Броўкам і А. Куляшовым ён быў яскравым выразнікам свайго часу, у нейкай ступені, узроўнем, на які арыентаваліся маладзейшыя паэты, і ў першую чаргу тыя, хто з нейчага лёгкага бласлаўлення былі празваныя “філалагічным пакаленнем”, хоць і пазней творцы ішлі ў літаратуру тым жа шляхам, аднак такога наймення не атрымалі.

Радаслоўныя карані П. Панчанкі ідуць на Ашмяншчыну, адкуль яго бацькі яшчэ перад Першай сусветнай вайной (па словах самога паэта), з’ехалі на працу ў Прыбалтыку. У Рэвелі (зараз Талін) паэт нарадзіўся 23 жніўня 1917 года. Час пачынаўся складаны, маці з дзецьмі пераехала на радзіму, бацька ж, удзельнік грамадзянскай вайны, не пажадаў вяртацца на спадчынныя надзелы, якія тады ўваходзілі ў склад буржуазнай Польшчы, выбраў савецкую Віцебшчыну. Калі ўсталявалася заходняя граніца, бацька вытрабаваў сям’ю да сябе. Таму і дзяцінства будучага паэта прайшло на Бягомльшчыне, краі надзвычай прыгожым і да страхоты бедным, дзе закончыў сямігодку. А працоўную дзейнасць пачаў на Магілёўшчыне. Спачатку вучыўся на падрыхтоўчых курсах пры Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі, стаў студэнтам аграхімічнага факультэта, але вучобу пакінуў і паехаў працаваць на Бабруйскі дрэваапрацоўчы камбінат. “*Праз год быў рэкамендаваны на педагагічныя курсы, скончыў іх, і мяне накіравалі загадчыкам Алянскай пачатковай школы Кіраўскага раёна*”[42]. Гэта адбылося ў 1934 годзе. Пасля П. Панчанка вучыўся завочна на філалагічным факультэце Мінскага настаўніцкага інстытута і выкладаў беларускую мову і літаратуру ў Казуліцкай сямігодцы, а потым і ў СШ № 1 Кіраўска.

Вершы, напісаныя на Кіраўшчыне, былі характэрныя і для таго часу, і для таленту маладога паэта. Большасць тэмаў ён браў з уласных назіранняў жыцця даваеннай вёскі, нешта ўспаміналася з дзяцінства, пацверджанае працай новага часу. Вершы перадавалі бадзёры, радасны настрой, захопленасць жыццём, што характэрна для творчага юнацкага ўзросту. Гэтыя пачуцці аж пераліваюцца цераз край у яго творах, што давала падставы пазнейшай крытыцы пісаць пра аднабаковасць адлюстравання калгаснай рэчаіснасці маладым паэтам.

[42] Панчанка, П. На паэтычным небасхіле / П. Панчанка. – Мн.: Маст. літ., 1977. – С. 188.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Дз. Бугаёў заўважае адносна першага зборніка вершаў П. Панчанкі “Упэўненасць” (1938): “*Аблегчана-аднабаковы падыход да адлюстравання рэчаіснасці ў той ці іншай меры адчуваецца і ў таленавітых, ярка-маляўнічых творах. Ён, гэты падыход, кладзе на даваенную паэзію П.Панчанкі адбітак ідылічнасці, афарбоўвае гістарычна, вядома, аптымізм панчанкаўскага лірычнага героя ў занадта ружовыя тоны і часта робіць яго павярхоўна-адналінейным і не пазбаўленым той наіўнасці, якая перашкаджае разумець глыбіню і складанасць жыцця*”[43].

Тым не менш, у ранніх вершах П. Панчанку ўдалося стварыць цікавыя вобразы працаўнікоў вёскі: даярак, пастухоў, паляводаў, лесарубаў, увогуле людзей усіх сялянскіх прафесій. Вядома ж, паэт бачыў цяжкасць гэтай працы, калі ўсё рабілася ўручную, але яго захоплівала разам з тым і апантанасць працоўнага чалавека, яго вера ў немагчымасць абыходзіцца без паўсядзённага занятку. Вось як гэта паказана ў вершы ”Нараджэнне дня”:

З кароўніка даярка рупна йдзе,
Нясе вядро з пахучым сырадоем.
Ёй, пэўна, радасна, што ў гэты ясны дзень
Каровы шмат далі ўдою.
Гляджу я з хваляваннем навакол –
Дзень нарадзіўся ясны, працавіты,
І славіць хочацца густое малако
І гэты лог, туманам апавіты [44].

Такой харошай узнёсласцю вызначаюцца і вершы “Яблыня”, “На пашы”, “Зажынкі”, “Падсочка”, “Выязджалі лесарубы”, “Меліяратары”, “Адкапаныя зарніцы”. Паэту з усімі гэтымі і іншымі працаўнікамі прыходзілася не адзін раз сустракацца, бо настаўнікаў прымушалі хадзіць па вёсках, праводзіць гутаркі, а ў летнія часы і працаваць фізічна. З аднаго боку, гэта дапамагала назапашванню тэмаў, з другога, – адбірала і той невялікі вольны час, так патрэбны для творчасці.

Узнёсла-юначае захапленне жыццём уласціва і для твораў грамадзянскага, патрыятычнага накірунку, што найбольш ярка выразілася ў вершы “Радзіме”. Тут яскрава супадала ідэйна-палітычная дактрына і рамантычныя парывы моладзі, выхаванай на не заўсёды пераканальных прыкладах з часоў грамадзянскай вайны. Тым не менш, парыў

[43] Бугаёў, Дз. Талент і праца / Дз. Бугаёў. – Мн.: Маст. літ., 1979. – С. 121.
[44] Панчанка, П. Размова з наследнікамі / П. Панчанка. – Мн.: Нар. асвета, 1967. – С. 23.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

юнага героя павінны і зараз з паразуменнем успрымаць і сённяшнія яго аднагодкі, калі справа заходзіць пра абарону Радзімы.

Атрыманне дыплома супала з грамдскімі выпрабаваннямі. У 1939 годзе П. Панчанку прызываюць у войска, ён ўдзельнічаў у “славутым” паходзе ў Заходнюю Беларусь, працаваў у газеце паўакупацыйнай зоны на Беласточчыне, шмат у чым ваенізаванай, бо супрацоўнікі спрэс былі ваенаабязанымі, г.зн. чырвонаармейцамі. Тагачасная рэчаіснасць з перакосам адбілася ў творчасці П. Панчанкі, бо пісаць трэба было не так, як яно ёсць, як бачыў і адчуваў паэт, а ў адпаведнасці з ідэалогіяй: пра палярнасць жыцця – багацеі-гандляры і бедная сялянская басота. Ды ўсё ж нават у асуджальных вершах праглядвалася перавага дабрабыту чалавечага жыцця там перад існаваннем у калгасных раёнах. Таму выкрывальныя ноты ў яго тагачасных вершах і паэме “Беластоцкія вітрыны” сёння бачацца як надуманыя.

На Беласточчыне П. Панчанка сустрэў і пачатак вайны, адступаў, бачыў крывавыя раны сваёй Беларусі, урэшце стаў супрацоўнікам беларускага армейскага друку, працаваў у франтавой газеце “За Савецкую Беларусь”. Менавіта ў час вайны канчаткова аформілася грамадзянская пазіцыя паэта, яго публіцыстычныя вершы набылі сваю мастацкую завершанасць. Якраз тады былі ім напісаныя класічныя вершы пра гераізм, самаадданасць, вернасць пачуццям, любові да роднага краю.

Паэзія гэтага часу ў П. Панчанкі прайшла істотнае трансфармаванне ад адкрытага публіцыстычнага закліку, што, несумнена, выклікалася часам вялікіх выпрабаванняў. На пачатку, вядома, былі напісаныя вершы агульназаклікальнага характару, але ўжо ў 1942 годзе ім была створана балада “Герой”, якая ўвайшла ў класіку беларускай паэзіі. У гэтым творы П. Панчанку ўдалося сумясціць жорсткі рэалізм часу з рамантычным парывам подзвігу:

Злосна сказаў: “Уставай, пяхота!
Мы не пляжы, а на вайне”.
І лёг на змяіныя скруткі дроту.
І дзвесце салдацкіх запыленых ботаў
Прайшлі па яго спіне[45].

Жорсткасць вайны тут відавочная, ахвярнасць таксама быццам бы апраўданая, бо паэт нідзе не дапускае сумніўнасці. І толькі ў фінале, ізноў жа на ўзроўні жорсткага рэалізму, завяршае баладу на рамантычна-шчымлівай інтанацыі:

[45] Панчанка, П. Размова з наследнікамі. – С. 67.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

А ён свае косці з іржавых калючак
Сваімі рукамі без стогну аддзёр,
Звaліўся на травы, і стала балюча
І травам, і росам, і ветрам гаючым,
Што прыляцелі з валдайскіх азёр[46].

Акрамя таго было напісана шмат вершаў, якія таксама сталі хрэстаматыйнымі: “Сінія касачы”, “Тваё і маё маленства” і інш., у якіх найбольш ярка выявілася бачанне трагедыі вайны праз прызму мінулага мірнага часу. У.Гніламёдаў лічыць, што тут выразна бачыцца сплаў асабістага і грамадскага: *“У творах перыяду вайны, пачынаючы з 1942–1943 гг., часцей за ўсё немагчыма знайсці мяжу паміж сферай інтымнага і грамадзянскага – спалучэнне аднаго з другім выліваецца ў надзвычай арганічным лірычным пафасе, які шырока ўключае тэму вечных каштоўнасцей чалавека”*[47]. Цікава, што і ў франтавой паэзіі П. Панчанкі неяк неўпрыкмет праходзіць тэма трагедыі ні ў чым не вінаватых. Гэта найбольш яскрава праявілася ў вершы “Коні”, у нейкай ступені таксама хрэстаматыйнага. Ды ўсё ж галоўнай ў яго творчасці таго часу стала нізка вершаў “Іранскі дзённік”. У першае пасляваеннае дзесяцігоддзе пры разглядзе цыкла асноўная ўвага ўдзялялася адлюстраванню процілегласці дзвюх розных сістэм, асуджэнні лагеру капіталізму. Пазней акцэнты змяніліся, хоць ідэалагічныя рысы ў поглядах на вершы захоўваліся. І для гэтага ўсе падставы ёсць: там-сям праглядваюцца і звыклыя рысы з беластоцкіх уражанняў: размежавнне на багацеяў і галетнікаў, пра яркія фарбы валадарных палацаў і страшэннасць прытулкаў беднякоў, што сёння гучыць не надта пераканаўча. Вельмі цікава выказаўся пра гэты цыкл М. Стральцоў у сярэдзіне сямідзясятых, заўважыўшы, што сёння “Іранскі дзённік” успрымаецца “*і прасцей, і тым часам складаней*”, бо “*ягоная канструкцыя здаецца ў некаторых вершах залішне аголенай, рацыяналістычнай*”, але ў іх не адчуваецца намёку “*на пазнейшага Панчанку – іранічнага і лірычнага адначасова, па-хлапечы задзірыстага і разважліва-мудрага, ды ўсё ж паэтычную якасць вершаў можна было б назваць “рэактыўнасцю”, маючы на ўвазе як “сиюминутность” трансфармацыі матэрыялу ў твор, так і сілу ўздзеяння твора на чытача. Дзеянне і вынік. Самаадда-ча і зваротная аддача*”[48]. Сёння ж бачыцца і іншае. Усёй душой П. Пан-

[46] Панчанка, П. Размова з наследнікамі. – С. 67.

[47] Гніламёдаў, Ул. Пімен Панчанка / Ул. Гніламёдаў // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя: у 4 т. Т. 3. – С. 528.

[48] Стральцоў, М. У полі зроку / М. Стральцоў. – Мн.: Маст. літ.,1976. – С. 66–67.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

чанка быў на Беларусі, менавіта яна бачылася паэту найпрыгажэйшай у параўнаннні з незвычайнымі экзатычнымі краявідамі. Ён не прыніжае персаў, цэніць іх уклад жыцця і культуру, але помніць заўсёды пра сваё роднае. Там жа нараджаліся і цудоўныя вершы пра беларускую прыроду, пра родныя бярозкі, жыццядайныя крыніцы, няхай сабе і перададзеныя настальгічна. І гэта апраўдана, бо паэт знаходзіўся ў нямыслімай далі, але жыў вобразамі роднага краю.

Вяртанне ў родны край было як бальзам на збалелую душу, што выявілася ў першых вершах, напісаных у Беларусі: “Пад’язджаючы да Мінска” і інш. Але ў гэты час, як і ва ўсёй беларускай паэзіі, у П. Панчанкі даволі прахадной рыторыкі, якую ён пазней бескампрамісна асудзіў. Новы этап ў творчасці П. Панчанкі пачаўся ў сярэдзіне пяцідзясятых, калі ва ўсім літаратурным савецкім працэсе як бы з’явілася другое дыханне. Ад надуманага адлюстравання неабходна было павярнуцца тварам да рэальнасцей, складанасцей жыцця. У гэтым плане П. Панчанку ўдалося натуральным голасам загаварыць пра новыя праблемы, а, можа, і пра вечнае. Варта толькі згадаць яго верш “Прыстасаванцы”. Як паэт-трыбун, у пэўнай ступені вучань У. Маякоўскага, ён надаваў вялікае значэнне грамадскаму гучанню паэзіі. Выразна публіцыстычныя, дасканалыя па форме і мастацкім выяўленні яго вершы гэтага тыпу здзяйснялі харошую грамадскую службу. У час асуджэння культу паэт развенчвае арэол недасягальнасці сталінскіх бюракратаў, многія з якіх адразу памкнуліся пераарыентавацца, падладзіцца пад новыя абставіны, яны ваяўніча былі настроеныя на абарону сваіх прывілей. Таму і помслівыя:

А хто памкнецца іх быт парушыць,
Адразу траціць у іх засаду:
Яны аблаюць, яны заглушаць,
Яны задушаць салідным задам[49].

У канцы васьмідзясятых згадваў гэты верш Ніл Гілевіч у дастасаванні да тагачасных абставінаў: *“Трыццаць з гакам гадоў прайшло з таго часу – а гучыць так, нібы сёння напісаны, нібы прадыктаваны ідэалагічнымі задачамі перабудовы, ці не праўда? І як шкада, што такі ювеналаўскай сілы сатырычны гнеў не выкарыстоўваўся належным чынам для сацыяльнага і маральнага выхавання*!”[50]. Сёння можна толькі дабавіць, што такія паэтычныя рэчы варта было б прапаноўваць

[49] Панчанка, П. Збор твораў: у 4 т. / П. Панчанка. – Мн.: Маст. літ., 1981. – Т. 1. – С. 85.

[50] Гілевіч, Н. Годнасць, сумленнасць, мужнасць / Н. Гілевіч. – Мн.: Маст. літ., 1988. – С. 121.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

для чытання і завучвання на памяць розным палатачнікам ды вертыкальшчыкам, як спробу паглядзець у люстэрка праўды.

Шасцідзясятыя гады ў творчасці П. Панчанкі – час вялікіх спадзяванняў і драматычных прадчуванняў. Пры ўсіх радасных перажываннях не пакідала чуццё, што нешта ідзе не так, не туды кіруецца наша грамадства. Змена курсу на "стабільнасць" чуйным душам давала падставы для роздуму. Калі ў эканамічным плане пагроза была і не надта адчувальнай, то ў грамадска-культурным пры ўсім радасным пафасе патыхала халоднымі зазімкамі. Засталася жывой хрушчоўская ідэя пападання ў камуністычны рай першымі тых, хто хутчэй адмовіцца ад нацыянальных традыцый і ўласнай мовы, хоць на высокіх узроўнях быццам бы і падтрымлівалася нацынальная культура, але ўжо ў нейкай ступені як факт мінулы, дадзенасць гісторыі, а не праявы сучаснасці, чаму былі пацвярджэннем правядзенне розных фестываляў народнай творчасці, дзе беларуская мова ўспрымалася проста як фактар міфалогіі, бо на практыцы чыноўнікі камуністычна-дзяржаўнай сістэмы ўсё рабілі, каб забіць нацыянальны дух, а праўладныя навукоўцы нават прыдумалі спецыяльнае вызначэнне "савецкі народ", што ўвогуле павінна было нівеліраваць адчуванне нацыянальнага. Вось праз такую супярэчлівую рэчаіснасць грамадства і ўехала ў часы застою. Небяспеку ўсяго гэтага П. Панчанка добра адчуваў, яго трывожыла, што разбураюцца маральныя крытэрыі жыцця, падае адказнасць за ўсё, што творыцца вакол, бо за дзесяцігоддзі народ прывучылі, што ўсё вакол народнае, а, значыць, і нічыё. У паэзіі ён спрабуе абурацца развязнасцю хапуг, якія на дзяржаўным узроўні раскрадаюць матэрыяльныя каштоўнасці. І, як ні дзіўна, у яго ў паэзіі 60-х – пачатку 70-х хапае вершаў і пра праўдзівасць ленінскага шляху, і веры ў камуністычную будучыню, і захаплення велічнасцю чырвані крамлёўскіх сцен і маўзалея, казачнасцю пераўтворанага Палесся, убачанага праз ілюмінатары верталёта. Але большасць вершаў таго і асабліва пазнейшага часу маюць ужо іншую танальнасць: яны больш тэматычна разнастайныя, роздумна-аналітычныя, па-філасофску заглыбленыя, але з той жа грамадзянскай напорнасцю, што яскрава праявілася ў зборніках "Крык сойкі" (1976), "Вячэрні цягнік" (1977), "Маўклівая малітва" (1981) і наступных. Варта яшчэ раз сказаць пра некаторую супярэчлівасць ва ўспрыманні свету П. Панчанкам. Побач з тымі заклікальна-велічнымі вершамі раптам з'яўляліся поўныя роспачы і трывожнага чакання творы пра сучасны стан прыроды, экалагічнуюпагрозу. Як бы у знак прабачэння за свой

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

узнёслы погляд на пераўтворае Палессе, зробленае быццам з птушынага палёту, з'яўляюцца тужлівыя вершы "Азону, – просім мы, – азону", "Зноў гром на лес, на голы", "Лясы і рэкі", "Мы пільней паглядаем на рэкі" і інш., у якіх глыбокі роздум не столькі пра стан прыроды, колькі пра "разумную" дзейнасць чалавека. Вядома, людзі не хацелі шкоды, калі бяздумна пачалі высякаць гаі, асушваць невялічкія балотцы і спрамляць руслы рэк. Верылася, што прапановы і патрабаванні вышэйшага начальства прадуманы, пацверджаны навукай і эканамічнымі разлікамі. А, можа, і проста па звычцы выконваць загады. Паэт папракае і сябе, што бяздумна "пісаў пра дробязь… і цярпеў". Таму такое горкае адчуванне ад незваротна страчанага, ад погляду на родную прыроду, дзе некалі выгінаста плылі чыстыя рачулкі:

Паглядзіш – і камяк у горле:
Парадзеў і збяднеў наш бор,
І блакітную скуру здзёрлі
Дзе-нідзе з нашых рэк і азёр:

Леглі плямы мазуту і нафты,
Бруд сцякае з усіх бакоў.
Як там птушкам пяецца?
Не надта.
Як там рыбы?
Спытай рыбакоў[51].

Бяздумнае стаўленне да прыроды, спадзяванне на імгненныя выгады немінуча прыводзяць да катастрофы. У прыродзе гэта вельмі адчувальна, хоць і ў іншых сферах жыцця (у эканоміцы, культуры) апрыорныя ўрыванні заўсёды будуць мець такія ж фатальныя наступствы, толькі праяўляюцца яны больш марудна, таму і больш небяспечныя. Таму паэт і заклікае быць абачлівымі, спагадліва адносіцца да прыроды, шчодра аднаўляць лясы як аснову нязводнасці жыцця:

Любоў да лесу не пагасла,
Шум бору сніцца…
Раней любіў я леспрамгасы,
Цяпер – лясніцтвы[52].

Такі погляд на прыроду – як трывожнае ўзіранне ў будучыню, прадчуванне трывогі, надыход нечага злавеснага, якое можа ўспрымацца як

[51] Панчанка, П. Крык сойкі. – С. 36–37.
[52] Тамсама. – С. 34.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

пакаранне за непрадуманыя дзеянні, што найбольш поўна выявілася ў вершы “Крык сойкі”:

Ды заўсёды такі насцярожаны
Крык твой, сойка,
Птушыны гнеў.
Можа мне тут хадзіць няможна?
Не крану я ні гнёздаў, ні дрэў.
……
Што ж ты крыкам мяне сустракаеш?
Мы маглі б падружыцца, бадай.
Ці то ворагаў многа маеш?
Ці то мне пагражае бяда?[53].

Сапраўды, бяда на Беларусь нахлыне праз дзесяцігоддзе з-за чарнобыльскай аварыі, калі гэтыя рэкі будуць яшчэ і атручаныя. Людзей асабліва бянтэжыла пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС, што дзяржаўныя кіраўнікі хавалі праўду пра трагедыю, падманвалі нязначнасцю страт і жахлівых наступстваў. Ад імя ўсіх беларусаў пра гэта з болем крыху пазней напіша П. Панчанка:

Уся Беларусь ад Чарнобыля
ад сцежак і мінскіх, і брэсцкіх
Закладзена д’яблу і мафіі.
Ніхто ў тым не разбярэцца.
Скажыце мне, добрыя людзі,
а праўда, што свету канец?
Я плачу над лёсам сваёй Беларусі,
сівы і бязногі баец[54].

Яркая публіцыстычнасць верша не дае падставы сварджаць яго аднадзённасць. Гэта паэзія высокага кшталту, якая пацвярджаецца майстэрствам падбору адпаведнай лексікі, яркіх алітэрацый, характэрным для Панчанкі наборам асацыятыўных рыфмаў і г.д. Многія грамадскасацыяльныя беды канца 80-х – пачатку 90-х гг. паэту бачацца як вынік працэсаў, што адбываліся па ініцыятыве партыйна-дзяржаўнай наменклатуры ці проста па абыякавасці выканаўцаў на розным узроўні ў папярэдні перыяд. І самая страшная бяда – вынішчэнне ў свядомасці чалавека яго беларускасці, чаму нямала садзейнічала і адукацыйная сістэма, працэс у сярэдняй і вышэйшай школе. Гэтую пагрозу адчуў

[53] Панчанка, П. Крык сойкі. – С. 98.
[54] Панчанка, П. Высокі бераг / П. Панчанка. – Мн.: Маст. літ., 1993. – С. 40.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

П. Панчанка, як ужо адзначалася, у хрушчоўскіх навацыях у вобласці нацыянальнай палітыкі, а пасля і ў дзейнасці яго прадаўжальнікаў, у якой знайшлі працяг асіміліцыятыўныя кацярынінскія ідэі, пацверджаныя потым Мураўёвым-вешальнікам, што школа і праваслаўная царква павінны вытравіць пачуццё нацыянальнай прыналежнасці ў чалавеку. Камуністычны рэжым у сваім антырэлігійным запале царкву адрынуў, а школу выкарыстаў напоўніцу. Пазбаўленне мовы – пазбаўленне душы чалавека. Супраць гэтай праявы П. Панчанка змагаўся ўсё жыццё, пачынаючы з верша “Родная мова”:

Кажуць мова мая аджывае
Век свой ціхі: ёй знікнуць пара.
Для мяне ж яна вечна жывая,
Як раса, як сляза, як зара[55].

У другой палове 80-х, шчыра прыняўшы ідэі перабудовы, П. Панчанка паверыў у магчымасці нацыянальнага адраджэння, вяртання народнай натуральнасці праяўлення чалавечых пачуццяў, здольнасці здзяйснення важных спраў. Гэтыя магчымасці ён бачыць найперш у адносінах дзяржавы да беларускай мовы, народных святыняў. На эмацыйнай хвалі ўспрымання рэчаіснасці выяўляецца захапленне роднай мовай, асуджэнне халуйства і здрадніцтва, вера ў разумнасць грамадства. Хваля вялікага ўзрушэння пераліваецца нейкімі высокімі накатамі ад захаплення прыгажосцю роднай мовы да поўнага расчаравання ў магчымасці яе захаваць у цяперашніх умовах, нешта разумнае здзейсніць. Гэтая гама супярэчлівых адчуванняў найбольш поўна выявілася ў вершы “Беларуская мова”:

Ільняная і жытнёвая. Сялянская.
Баравая ў казачнай красе.
Старажытная. Ты самая славянская.
Светлая, як травы ў расе.
Вобразная, вольная, пявучая
Мова беларуская мая!

Ды вось бяда:

Ад цябе, ласкавай і праўдзівай,
Адракаюцца цяпер твае сыны[56].

З не меншай гаркатой ён выкажацца на гэту тэму і ў вершы “А мову ледзь не затапталі…”:

[55] Панчанка, П. Размова з наследнікамі. – С. 184.
[56] Панчанка, П. Горкі жолуд / П. Панчанка. – Мн.: Маст. літ., 1988. – С. 21.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Усе сыны ўсіх народаў
На памяць помняць кожны верш
І ганарацца песняй роднай,
З якой з калыскі ты жывеш.

Ну, а салдаты з Беларусі
Ці служаць, ці ідуць на бой .
Саромяцца ў юнацкай скрусе:
Не знаюць спадчыны сваёй…[57].

Ізноў з той жа ранейшай непрымірымасцю і праматой, папракаючы і сябе, знішчальна піша ён пра дзейнасць начальнікаў і гібельныя вынікі яе:

Я спяваў пра жыта і пра жаўранкаў,
Ненавідзеў акупантаў і прыгнёт,
А сягоння – вялікадзяржаўнікаў,
Што разбэсцілі вялікі мой народ.
Навучылі не рабіць –
Хлусіць і красці.
Дзеці ў школу з іншай моваю бягуць[58].

Скрушліва піша паэт пра сучаснасць, пра перабудовачную кругаверць, дзе спадзяванні перакрыжоўваюцца з адчаем, але ўсё ж адсутнічае песімізм, бо яму хочацца верыць, што людзі адумаюцца і шчыра возьмуцца за аднаўленне страчанага і назапашванне духоўнасці. Развенчванне бюракратыі застаецца ў П. Панчанкі і на пачатку дзевяностых, бо заўважыў, што былыя наменклатуршчыкі і зараз добра ўладкаваліся.

І бюракратам шчэ жывецца
Няроэнна ў логаве кантор.
……
Яшчэ мармыча паказуха:
“Раней, чым летась… Значна больш…”[59].

Праўда, у вершах не назіралася ранейшай напорнасці, размашыстасці і гневу, у іх адчуваліся матывы ранейшых твораў, таму ўзнікала ўражанне паўторнасці. На гэту акалічнасць звярнуў увагу і Максім Танк, запісаўшы ў дзённіку 5. VIII. 1994 г.: “*Прачытаў у “Маладосці” вершы Пімена. Яны, мне здаецца, у многім паўтараюць яго раней-*

[57] Панчанка, П. Горкі жолуд / П. Панчанка. – Мн.: Маст. літ., 1988. – С. 41.
[58] Тамсама. – С. 21.
[59] Панчанка, П. Праметэі / П. Панчанка // Маладосць. – 1994. – № 6. – С. 4.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

шыя вершы супраць бюракратаў, казнакрадаў, розных ідэолагаў, якія прывялі краіну да распаду і г.д. Праўда, ён быў у нас адным з першых, які выступаў супраць іх, нат некаторыя яго вершы здымалі цэнзары…”[60]. Яшчэ ў часы перабудовы, звяртаючыся зноў жа да вялікадзяржаўнікаў, П. Панчанка з гневам пісаў: “А вы ў народа запыталі, якая мова нам радней?”. Пазней, ужо ў прэзідэнцкай Беларусі, запыталі, і няхай, як многія кажуць, вынікі таго апытання і галасавання былі падтасаваныя, вынік усё ж сумны. Сапраўды, раз’яднаны народ не змог выказаць сваю волю, перадаверыўшы вырашаць гэтае вельмі важнае пытанне розным прыстасаванцам з выбарчых камісій.

Як і раней, актуальнай для П. Панчанкі засталася і тэма вайны, толькі на новым этапе выяўленне яе адбылося ў іншым ракурсе: як праверка на вернасць, як памяць у сэрцах, як арыенцір для вызначэння годнасці чалавека. І яшчэ адна акалічнасць: яшчэ ў час вайны многія яго вершы прывязваліся пэўным чынам да Магілёўшчыны, што пазней праявілася нават у іранскім дзённіку, калі ў вершы “Бутэлька цынандалі” пісаў:

А пасля па чарцы цынандалі
Вып’ем за здароўе тых сяброў,
Што сягоння ў далёкіх далях,
Б’юцца за Бабруйск і Магілёў[61].

І праз трыццаць гадоў пасля Перамогі ўспамінаюцца перш за ўсё франтавыя пабрацімы. Чалавек імкнецца забыць пра трагедыю вайны, але памяць заўсёды вяртае яго да тых дзён. Нават у абсалютна мірнай абстаноўцы, на ўлонні прыроды, насуперак жаданням былое вяртаецца:

Толькі агонь шугане,
Толькі мы чаркі напоўнім,
Зноў аб вайне, аб вайне
Абавязкова ўспомнім.
……
Гады мае агнявыя!
Памяць навек устрывожана…
З намі сябры франтавыя
Каля агеньчыка кожнага[62].

Вайна – гэта перш за ўсё незваротныя страты, якія цяжарам ляжаць на душах жывых, таму часам герой як бы вяртаецца ў тую рэальнасць,

[60] Танк, М. Дзённікі / М. Танк // Полымя. – 1997. – № 12. – С. 101.
[61] Панчанка, П. Чатыры кантыненты / П. Панчанка. – Мн.: Беларусь, 1964. – С. 33.
[62] Панчанка, П. Дзе начуе жаваранак / П. Панчанка. – Мн.: Маст. літ., 1983. – С. 14.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

адчувае сябе зноў там, на фронце, у акопе пасля толькі што скончанага бою, калі ўжо амаль у тыле, але ў псіхалагічнай напружанасці гаворка "ўсё пра атаку". Паэт разумее, што нельга вярнуць незваротнае, таму памяць пра ахвяры павінна жыць вечна, згадваць пра іх трэба не толькі ў дзень Перамогі ветэранам, але і наступным пакаленням, менавіта для гэтага і трэба ўсё здзяйсняць.

Што даты? Гэта толькі вехі
Гісторыі.
А для салдат,
Чые навек закрыты векі,
Няма ўжо дат, ніякіх дат.

За рыскай той – маўкліва, пуста,
І на дарогах крыжавых
Узводзім помнікі і бюсты
Мы не для іх, а для жывых[63].

Аднак не толькі франтавое пабрацімства прысутнічае ў памяці ветэранаў, але і ўсенародная жалоба па загінуўшых мірных жыхарах, асабліва жанчынах і дзецях, гэтых зусім бязвінных ахвярах. П. Панчанка не адзін раз успомніць у вершах пра мясціны свайго дзяцінства і працоўнага юнацтва, Бягомльшчыну і Кіраўшчыну, якія ў час вайны сталі партызанскімі зонамі. Там людзі жылі ў пастаяннай напружанасці, бо нават пры няпэўнай спакойнасці, у любы момант магла абрынуцца варожая карная экспедыцыя, якіх за вайну людзям прыйшлося перажыць неаднойчы. Таму паэт і аддае даніну павагі Бярэзінскаму запаведніку, які быў прытулкам не толькі для партызанаў, але і сховам для мірных жыхароў. Ды вяртацца адтуль суджана было не ўсім, пра што сведчаць вядомыя і невядомыя магілы. Ды і не ўсім была магчымасць схавацца, многія гінулі ва ўласных хатах, попел ахвяр стукаецца ў сэрца. Менавіта пра іх піша П. Панчанка ў вершы "Казулічы":

Не патрэбна слёз і слоў прачулых...

У якой траншэі мокнуў я,
Як палілі вас,
Матруна Булах,
Гаспадыня добрая мая?

[63] Панчанка, П. Дзе начуе жаваранак / П. Панчанка. – Мн.: Маст. літ., 1983. – С. 81.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Попел чалавечы доўга стыне,
Адлятае ў хмары маладосць...
На сцяне журботнай у Хатыні

І маіх Казуліч імя ёсць[64].

Трагічны вобраз жанчыны-маці паэты стварылі яшчэ ў час вайны, гора маці, у якой загінулі сыны, несціханае. І гэта надзвычай дакладна перадаў П. Панчанка ў вершы “Іх вечныя агні”:

Да болю можа кожны прыцярпецца
І да няшчасця, толькі не яны,
Што страцілі дзяцей…
Гарыць для іх цяпельца
На тым далёкім беразе вайны.

Ці зойдзе сонца, ці дзень займецца,
Адны сярод вялікай цішыні
Старыя маці ў печах старасвецкіх
Штодзённа паляць вечныя агні.

У печах, быццам небасхіл, паўкруглых
Зара ўсё разгараецца ярчэй.
А за акном – свет цёмны і аглухлы,
А пры агні суцішней і лягчэй.
……
Уюцца каснікі агню і скачуць,
І твары ўзнікаюць з небыцця.
Цалуюць іх кабеты, ціха плачуць
І не клянуць самотнага жыцця[65].

Карціна выпісана надзвычай запамінальна, хоць знешне ўсё здаецца простым. На гэта яшчэ ў сярэдзіне сямідзясятых звярнуў увагу В. Бечык, калі пісаў, што ў вершы няма “*ні банальных суцяшэнняў, ні рытарычнага падбадзёрвання, ніякіх “адводаў” ад галоўнага, адлучэння перажывання ад прозы жыцця. І якая сіла душэўнага, чалавечага ўдзелу паэта. А форма – усюды актыўная. <…> Тут узважана кожнае слова, яго сэнс і асацыятыўныя, стылявыя патэнцыі, нават “акустычныя” паказчыкі. У вершы няма нейтральных, абыякавых да зместу мясцін.*

[64] Панчанка, П. Дзе начуе жаваранак. – С. 16.
[65] Тамсама. – С. 40–41.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Кожнае слова па-свойму баліць, сваё гаворыць, мае самастойную і неабходную для верша істотнасць. А многае "гавораць" яшчэ і рытмічныя перабоі, інтанацыйныя змены, сінтаксічна-фразавае чляненне"[66].

Такой жа сілай уздзеяння валодае і верш "Цяжкое партызанскае качэўе...", у якім выяўлены лёсы многіх маладых маці, што траплялі ў блакады, як гэта было і на Кіраўшчыне ў 1943 годзе. Цяжкая справа пераказваць змест лірычных твораў, але ўсё ж сутнасць трэба выкласці. У час блакады "*ў глухіх карчэўях хавалася ад карнікаў сяло*", там была маці з дзіцем, якое галоднае, бо ў яе прапала малако. Хутка павінна скончыцца блакада, а тут дзіця можа ўсіх выдаць плачам, пад паглядам-просьбай людзей "*на парозе чорнага вар'яцтва яна была гатова задушыць*". І вось:

Прайшлі гады...
Глядзіць на сына з ласкай:
Высокі, дужы, і два ўнукі ёсць;
Расказвае малым, нібыта казку,
Пра партызан, блакаду, маладосць.

Гатуючы сняданкі і абеды,
Перабірае ў памяці гады!
І кожны раз жахаецца кабета:
"А што, калі б?" – і млее ад жуды[67].

Вяртанне да перажытага ў маладосці – уласцівасць ці не кожнага паэта. Заўсёды ёсць патрэба па-новаму глянуць на перажытае і зробленае, многае пераасэнсаваць на ўзроўні ўласнага і чужога вопыту. Гэта характэрна і для творчасці П. Панчанкі.

Найбольш поўна сувязь з мясцінамі і людзьмі часу сваёй маладосці П. Панчанка выразіў у вершы "А час па грыбы мне хадзіць не прыйшоў...". Гэта ні ў якім разе не падвядзенне вынікаў, а роздум над здзейсненым, спробай заглянуць у будучыню, праверыць, якім ураджаем прарасло ім пасеянае вечнае, мудрае. Паэт і дасягнуўшы саліднага ўзросту не мае права заставацца ўбаку ад бурлівага жыцця:

А час па грыбы мне хадзіць не прыйшоў,
Я веру пранікліваў сойцы.
У бор я пайду пасля першых дажджоў,
Што высушыць зыркае сонца.

[66] Ярош, М., Бечык, В. Беларуская савецкая лірыка. / М. Ярош, В. Бечык. – Мн.: Нав. і тэхн., 1979. – С. 243.

[67] Панчанка, П. Дзе начуе жаваранак. – С. 25.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

А покуль прысядзем на шэры валун,
Падумаем аб галоўным.
Забудзем няўдачы, забудзем хвалу
І плюнем на высакамоўнасць...
……

Зрабіўся відушчым ты толькі цяпер:
Нам век не вучыць, а вучыцца;
Рабіць, памыляцца, ўзнімацца, цярпець,
Вучыцца ў бабра і ваўчыцы;
Нястомнасці вечнай – у мураша,
Зімовай трываласці ў дрэва...
Замоўкні ты ныць, трапяткая душа,
Табе адпачынку не трэба[68].

Нават з адчуваннем нямала зробленага паэт не жадае спыняцца, яго голас быў чуцён у самыя пераломныя моманты жыцця краіны. Ён лічыць, што чалавек пастаянна павінен адчуваць патрэбу ў пазнанні, не задавальняцца дасягнутым. Яшчэ ў час свайго паўвекавога жыццёвага стану П. Панчанка з пэўнай іроніяй гаварыў пра сябе ў вершы “Паўвека… Гэта шмат – паўвека…”, што ён быццам бы ўжо растраціў палову сваіх сілаў, але ўсё ж застаецца жаданне служыць грамадству:

Каб на людскім дарожным сходзе
Патрэбным гэтым людзям быць
І ведаць, дзе каму сыходзіць,
Якія станцыі любіць.

І каб на той, на канчатковай,
І не пазней, і не раней
Сысці не ў табар Канчаковы,
А ў свет бяроз, што ўсіх мілей[69].

Пімен Панчанка шмат у чым абнавіў беларускую паэзію, расшырыў сферу яе дзейнасці і ўздзеяння на чалавека, сышоў можа і дачасна, 2.05.1995, у вечнасць, застаючыся ў памяці ўдзячных яму чытачоў.

[68] Панчанка, П. Дзе начуе жаваранак. – С. 64–65.
[69] Тамсама. – С. 115–116.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

“А НАШЫ ХАТЫ – ЗАЛАТЫЯ ХРАМЫ…”
Паэзія Сцяпана Гаўрусёва

У пакалення літаратараў, што першую школу жыцця праходзілі ў другой палове 30-х – пачатку 40-х гг. XX стагоддзя, склаўся свой імідж, сваё ўяўленне пра час, свае ацэнкі чалавечых паводзін і, наогул, успрыняцце і адчвуванне сваёй асобы. А калі яшчэ мець на ўвазе, што менавіта прадстаўнікам гэтага пакалення і крыху маладзейшым за іх прыйшлося сцвярджаць новае бачанне чалавечых адносін пасля “сталінскай зімы”, усталёўваць, хай сабе і хісткія, але ўсё ж дэмаркратычныя дачыненні ў грамадстве, то павінны зазначыць, што ім удалося зрабіць многае. Яны адразу (дзякуючы ўласнаму таленту) сталі ўлюбёнцамі грамадскасці і людзьмі амаль знакамітымі. Ды гэта выпрабаванне славай удалося вытрымаць не ўсім. І сёння толькі можна шкадаваць, што многія так і не змаглі рэалізаваць дадзеныя ім Богам магчымасці. Яны зрабілі многа. Ды ўсё ж… Сярод тых, якіх усе добра ведалі, з найбольшай супярэчнасцю ўспрымаўся Сцяпан Гаўрусёў, асоба якога ў бытавым і паэтычным стане знаходзілася як бы на розных палюсах.

Сцяпан Захаравіч Гаўрусёў нарадзіўся 10 мая 1931 года ў вёсцы Нова-Аляксандраўка Дрыбінскага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям’і. Радасць была двайная: нарадзіліся блізняты. Іх і ў дарослых гадах адрознівалі з цяжкасцю. Дзяцінства праходзіла ў шчаслівых хвілінах і паўсядзённых турботах, як і ва ўсіх аднагодкаў: першыя паездкі ў начное, дапамога бацьку ў гаспадарцы. Да вайны скончыў тры класы, а ў 1948 годзе атрымаў пасведчанне аб сканчэнні Пудаўнянскай сямігодкі і паступіў у Магілёўскае педагагічнае вучылішча, пасля трэцяга курса прызваны ў армію. Дэмабілізаваўся ў 1954 годзе, працягваў вучобу завочна ў Мінскім педвучылішчы, але, мусіць, дыплом так і не атрымаў. Усё астатняе – самаадукацыя. Працаваў у газеце і выдавецтве з перапынкамі не болей пяці гадоў, у асноўным быў на творчай рабоце: пісьменнікам такое дазвалялася. Такая акалічнасць давала магчымасць шмат падарожнічаць. У сярэдзіне шасцідзясятых у аўтабіяграфічных нататках С. Гаўрусёў адзначыць: “*Я праехаў усю краіну – ад брэсцкай цытадэлі да ціхаакіянскага берагу – і не здзіўляюся, калі ў мае сны прыходзяць глыбокая празрыстасць байкальскіх хваль ці сібірскае неба з буйнымі зорамі, быццам медалямі за адвагу тым, хто з рамантычнай марай у грудзях прыйшоў сюды, каб па-сапраўднаму разгарнуцца;*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

зусім натуральна ў маю свядомасць уваходзіць шчымлівая прыгажосць братніх латышскіх дайнаў, спякотных украінскіх каламыек…”[70]. Натуральна, шмат што з убачанага выявілася пазней у вершах, ліра-эпічных творах.

Складаць вершы С. Гаўрусёў пачаў рана, але адлік яго паэтычнага стажу пачынаецца з 1948 года, калі ў часопісе “Беларусь” быў апублікаваны верш “Мост”. Гэты ж верш (і іншыя) былі ўключаныя ў альманахі “Літаратурны Магілёў” (1949, 1950). Вядома, вершы апублікаваныя ў той час ў абласной газеце “За Радзіму” былі апісальнымі, не па часе ўзнёслымі, а, значыць, і не адпавядалі тагачаснай рэчаіснасці. Гэта была бяда ўсёй паэзіі, а не толькі пачынаючых творцаў. Патрабаванне выяўлення толькі жыццярадаснага, заможнага жыцця адбівалася на літаратуры негатыўна. Паэты пачыналі пісаць па шаблону, баяліся хоць неяк выказаць асабістыя думкі. Таму і вершы былі быццам з канвеера. У гэтым плане паказальным будзе параўнанне гэтага верша з творамі старэйшых магілёўскіх паэтаў. Вось аднайменны верш С. Гаўрусёва і А. Пысіна “Мост”. У іх падаецца абагуленая з’ява працы чалавека, бо плён яе працаўніку не належыць. У Пысіна:

Кругі ўлягліся па вадзе
З аблокамі і небам,
І ўжо з сяла абоз ідзе
На элеватар з хлебам[71].

У С. Гаўрусёва:

Вада шуміць і ў хвалі б’ецца,
Паціху рушыцца абоз.
У навaколлі аддаецца
Рупліvы дружны стук калёс[72].

Такім жа аблегчаным паказана жыццё і ў вершы В. Матэвушава “Мой рукапіс”:

І з літараў-зярнятаў
На ўвесь бацькоўскі край
Узрос мой твор багаты
Пад назвай “Ураджай”[73].

[70] Гаўрусёў, С. Трываласць грунту / С. Гаўрусёў // Пра час і пра сябе: Аўтабіяграфіі беларускіх пісьменнікаў. – Мн.: Беларусь, 1965. – С. 106.

[71] Літаратурны Магілёў. – Мн.: ДВБ, 1949. – С. 13.

[72] Тамсама. – С. 30.

[73] Тамсама. – С. 28.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

І гэта характэрна для паэзіі таго часу. Паэты выражалі не асабістыя перажыванні, бачанне жыццёвага працэсу, а толькі тое, што павінна станоўча прымацца ўладаю. Таму заставалася не выказаным самае істотнае, тое, што характарызавала паўсядзённасць цяжкай працы хлебароба. Вядома, і жніво, і новая сяўба заўсёды мела сваю рамантычнасць, міфалагічную ўстойлівасць, што брала пачатак у далёкай старажытнасці. Але глыбіннасць пачуцця радасці ад працы і ў калектыве заставалася для паэзіі недаступнай, бо ў большай ступені дзяржаву цікавіў не працэс працы, а вынік, які, па сутнасці, самому чалавеку і не належаў. Паэзія клалася ў пракрустава ложа ідэалагічных патрабаванняў, адсюль быў і мізэрны вынік.

Праўда, і тады ўжо ў многіх вершах С. Гаўрусёва заўважалася індывідуальнае бачанне жыццёвых працэсаў, што праявілася ў спробе стварыць вобраз свайго пакалення, рамантычна-ўзнёслага, гатовага пакараць невядомыя далі, абжываць мясціны, на якіх яшчэ не ступала нага чалавека, значыць, самастойна тварыць будучыню.

Нясем з сабою сцяг зары,
Дарогі ў будучыню мосцім,
А пасля нас:
Кастры,
Кастры,
Сляды гарачай маладосці[74].

Па-новаму загучала паэзія С. Гаўрусёва ў сярэдзіне 50-х гадоў, што асабліва выразна праявілася ў першым зборніку “Паходныя кастры” (1955). Фенаменальнасць кнігі праявілася і ў тым, што на яе ў розных выданнях было змешчана аж дзесяць рэцэнзій, сярод аўтараў якіх на той час былі прызнаныя крытыкі Р. Бярозкін, Я. Казека, А. Есакоў, І. Кудраўцаў. Гэтая кніга засведчыла вялікія магчымасці аўтара, хоць там былі яшчэ і прахадныя вершы, на што звярнулі ўвагу рэцэнзенты. Але ў большасці твораў ужо адчувалася рука дасведчанага майстра. Пацвярджэннем сказанага з’яўляюцца вершы “Клён”, “На сенажаці”, “Вясёлка ў гарах”, а таксама тыя, у якіх яскрава ствараліся вобразы свайго пакалення, людзей розных прафесій: хлебаробаў, будаўнікоў, настаўнікаў. Паэтыка С. Гаўрусёва традыцыйная, але яму ўдаецца стварыць запамінальныя вобразы сучаснікаў, няўрымслівых ва ўсіх сваіх пачынаннях, здзейсненых справах. Вось як успрымае свет і сваю працу малады настаўнік, які шчыра верыць у станоўчы вынік сваёй працы.

[74] Літаратурны Магілёў. – Мн.: ДВБ, 1950. – С. 99.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Я рад,
Што ў жыцці я не госць,
І сэрца нядарма так б'ецца:
Пад старасць гукну маладосць –
І ўсюды яна адгукнецца[75].

Лірычны герой з першых кніг С. Гаўрусёва – няўрымслівы даверлівы чалавек, які захапляецца ўсім створаным. Яму нават бачыцца рамантыка ў самых абыдзённых з'явах. Яго захапляюць працоўныя будні, радасць удзелу ў паўсядзённай працы, дзе ён адчувае сябе раўнапраўным. Пры гэтым, лірызм твораў паэта не саладжавы, няма знешніх захапленняў прыгажосцю краявідаў, прырода тут існуе натуральна, бо чалавек любога ўзросту на ўлонні прыроды адчувае сябе як вялікі здзяйсняр народных запаветаў. Сціплыя людзі славяцца менавіта сваімі працоўнымі дасягненнямі, што было ў народзе спрадвеку, але часта не рашучыя ў рашэнні ўласных праблем. Яшчэ ў той час А. Лойка звярнуў увагу менавіта на спосаб лірычнага выяўлення складанай рэчаіснасці ў першых зборніках паэта. "*Прывязанасць паэта да вобраза канкрэтна-зрокавага, жывапісна-яркага, рамантызаванага*"[76] дае адпаведны вынік у паказе юнака.

Звініць, звініць у лузе скошаным
Дзявочы спеў і – замірае.
А смутак чмелем растрывожаным
Яшчэ ў грудзях маіх іграе.
……
І сум, як чмель той растрывожаны,
Цяпер гучыць у сэрцы дзесьці:
Сягоння кветкі тыя скошаны
Што ёй саромеўся паднесці[77].

Паэт не раз пацвердзіць жыццёвую цягавітасць сваіх суродзічаў. Ён менавіта і засяроджвае ўвагу на такіх якасцях, якія выдзяляюць беларусаў з усяго славянскага свету. Повязь з роднымі мясцінамі ў ранніх вершах паэта надзвычай адчувальная. Лірычны герой усё яшчэ там, сярод цягавітых касцоў, аратых і сейбітаў, цесляў і кавалёў, усіх тых, хто стварае дабрабыт. Гэта яскрава выявілася ў вершах "Ставок вады", "Маленства", "О, каб я мог у час вячэрні…" і інш. Сялянская прафесія

[75] Гаўрусёў, С. Збор тв-ў: у 2 т. / С. Гаўрусёў. – Мн.: Маст.літ., 1993. – Т. 1. – С. 23.
[76] Лойка, А. Сустрэчы з днём сённяшнім / А. Лойка. – Мн.: Нар. асвета, 1968. – С. 103.
[77] Гаўрусёў, С. Збор твораў. Т. 1. – С. 41.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ці не найбольш выразілася ў вершы “Хлеб на кляновых лістах”. Вобраз хлеба надзвычай пашыраны ў беларускай паэзіі, першую паэтызацыю якога зрабілі нашаніўцы. Але і ў пазнейшыя часы можна ўзгадаць “Песню пра сухар” П. Глебкі, “Хлеб” В. Віткі, у якім бохан уяўляецца не проста як рэчыўная з’ява, а як увогуле сімвал народнага жыцця:

Падкладзены знізу ён лістам кляновым,
А зверху пасыпаны кменам,
Вяртаўся ён з печы, як сонца ружовы,
І доўга свяціў на стале нам[78].

Падобная радасць, задавальненне ад адчування асалоды, а таксама ўдзячнасці матчыным рукам і ўсяму працоўнаму супольніцтву выявілася і ў вершы С. Гаўрусёва “Хлеб на кляновых лістах”:

Сялянскі звычай – з ураджаяў новых
Хлеб выпякаюць на лістах кляновых.
А з печы бохан вымеш – ён ружовы,
Як жнівеньскага сонца дыск барвовы
Як сонца, ўзнятае з зямлі падзольнай,
Што захавала след рукі мазольнай.
Спадыспаду ж, як працы ўсёй аздоба,
Кляновы ліст – далонню хлебароба[79].

Тут заўважаецца і абнаўленне паэтычнага вобраза, бо, не сакрэт, тады надта ўжо расхожым стаў вобраз кляновага і дубовага ліста як медалю на выцвілай гімнасцёрцы пераможцы. С. Гаўрусёў вяртаў вобраз у яго спрадвечную стыхію, што надавала яшчэ большага даверу заявам лірычнага героя. Ён сталеў разам з грамадствам, пераадольваў цяжкасці паваеннага перыяду, з надзеяй глядзеў у будучыню, паколькі змены ў грамадскім жыцці ўжо давалі такія падставы. Герой поўны энергіі, гатоў здзяйсняць подзвігі, імкнуцца ў безаглядныя далі, але разам з тым тут адчуваецца і моцная прывязанасць да роднай зямлі. Аднак і ў новым часе ў настроях лірычнага героя выяўляюцца ўсе супярэчлівыя пачуцці, упэўненасць і сумненні ў сваіх магчымасцях, жаданне здзейсніць штосьці надзвычайнае, вартае гэтага гераічнага і трагічнага стагоддзя. У многіх вершах са зборніка “Шчодрасць” (1962), як, напрыклад, “Журба недаляцеўшых журавоў”, “Калі б не месяц, што ў акно зірнуў…”, “Садок вячэрні, садок ружовы…” і інш., праяўляецца ўсё яшчэ рамантычнаузнёслае ўспрыманне рэчаіснасці, сплятаецца ў адзінае светлая закаха-

[78] Вітка, В. Выбраныя творы / В. Вітка. – Мн.: Беларус. навука, 2013. – С. 23.
[79] Гаўрусёў, С. Збор твораў. – Т. 1. – С. 41.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

насць і жаданне здзейсніць значны подзвіг, але юнак не надта ўпэўнены ў сваіх сілах, таму і звяртаецца за падтрымкай да сваёй каханай:

Я не ведаю, здзейсніць мне многа ці мала,
І сумленню свайму гавару я: турбуй!

Я хачу, каб і ты так мяне падымала:
Урывайся!
Будзі!
Падганяй!
Патрабуй![80].

Разам з тым вера ў свае магчымасці не пакідае героя, адкідваюцца часовыя сумненні, ён верыць у магутную стваральную сілу грамадства і лічыць, што ад яго асабіста многае залежыць:

Настроем сваім я зямлю афарбую,
Аддаўшы ёй лепшыя колеры ўсе.
І кожны каменьчык, травінку любую
Прымушу заззяць у жаданай красе.
……
І кожнае сэрца заб'ецца праўдзіва,
І сумныя вочы ўсміхнуцца навек,
І найдзіўнейшае дзіўнае дзіва
Будзённасцю
назаве
чалавек![81]

Вось такімі якасцямі, у многім трыбуннымі, вызначаюцца вершы С. Гаўрусёва з першых яго трох кніг. А. Лойка адзначаў: "*Прывязанасць паэта да вобраза канкрэтна-зрокавага, жывапісна яркага, раманты-заванага прывяла яго пазней да такіх значных вершаў, як "Я вырас пад гарматнымі стваламі", "Спёка". Паэт паказвае жыццё ў сувязі з асабіста перажытым і перадуманым. <…> сярод лепшых вершаў С. Гаўрусёва – "Хлеб-соль", "Без кажуха", "Ставок вады…", "Няхай паслужыць мне здароўе…" са зборніка "На грэбнях хваль" (1959), "Калі б не месяц, што ў акно зірнуў…", "Лівадзійскія чайкі" са зборніка "Шчодрасць" (1962)*"[82].

Сапраўды, паэзія С.Гаўрусёва гэтага перыяду сваім лірызмам добра ўпісвалася ў літаратурны працэс, калі надзённым было для гэтага жан-

[80] Гаўрусёў, С. Збор твораў. – Т. 1. – С. 51.
[81] Тамсама. – С. 68.
[82] Лойка, А. Сустрэчы з днём сённяшнім. – С. 103–104.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ру пазбаўленне ад агульшчыны, плакатнасці, шаблону, псеўдавелічнага пафасу ў адлюстраванні рэчаіснасці. А верш “Я вырас пад гарматнымі стваламі” стаў нават свайго роду нейкім геральдычным знакам пакалення, дзяцей вайны.

Аднак у сярэдзіне 60-х – пачатку 70-х плынь паэзіі С. Гаўрусёва мяняецца. Тон яе становіцца больш напорным, пашыраюцца абсягі пранікнення ў сутнасць падзей, з павышэннем унутранай змястоўнасці мяняецца і знешняе яе праяўленне. Верш у яго набывае трыбуннае гучанне, на што звярнуў увагу В.Бечык, разглядаючы вершы творцаў гэтага пакалення: “*Сцяпан Гаўрусёў адным з першых здолеў паказаць фарміраванне характару і светапогляду свайго равесніка ў плыні жыцця і часу, раскрыць сэнс і арганічную сувязь тых духоўных, грамадскіх фактараў, што ўплывалі на яго сталенне і ўнутранае развіццё (лірычная паэма “Штодзённы лістапад” і зборнік вершаў “Шчодрасць”). З часам у паэта мацнее схільнасць да маштабна-ўзбуйненага ўспрыняцця жыццёвых з’яў, да прамоўніцка-гучнага ладу выказвання, манументальна-сімвалічнай вобразнасці (кнігі “Профіль веку”, “Ураган” і інш.). Пры гэтым ён застаецца і майстрам тонкай, інтымна-пяшчотнай лірыкі, стрымана-эскізных замалёвак, сагрэтых пранізлівым пачуццём “бытавых” вершаў (“На возе чэрвеньскага сена…”, “За прыгуменнем – ядранае жыта…” і інш.)*”[83].

Сапраўды, у кнізе “Ураган” (1966) па-новаму, па-свойму загучала тэма вайны, пасляваеннага сіроцтва і бедства. Раптам у радкі вершаў уварваліся яшчэ больш трагічныя абставіны, але ўбачаныя здалёк, таму і надзвычай уражлівыя. Нават першая заяўка “ памяць наша – быцам мост пантонны” настройвала чытача на адпаведны лад, на адчуванне трагедыі народа і сучаснае ўспрыманне той трагедыі. Цяпер мінулая вайна ўспрымаецца праз трагедыю кожнага канкрэтнага чалавека, напрыклад, пра “акружэнца-салдата”, які не адважваецца зайсці ў хату, каб выпіць кубак вады, бо адчувае віну ў тым, што адбылося і на фронце, і ў цэлым з краінай, і за тых ахвярных дзяўчатак-санітарак, што ў свае маладыя гады ўзвалілі на свае хісткія плечы цяжар чужой бяды, бо ў медсанбатах часта якраз і адбывалася апошняе развітанне са светам, і горыч ад няздзейсненых надзей цяжкім каменем клалася на душы незагартаваных асоб. Яны спачувалі, пісалі бадзёрыя пісьмы пад дыктоўку салдат, падаючы надзею, хоць часта аўтары не дажывалі да таго часу, калі ліст дойдзе да адрасата, бо час “сабраў іх і панёс у

[83] Ярош, М.Р., Бечык, В.Л. Беларуская савецкая лірыка. – С. 284.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

вырай”. Паэт не раз скажа, што “памяць наша – быццам мост пантонны – берагі злучае пад агнём”, яднае мінулае з сучасным. Ізноў адзін з вершаў нават стаў адзнакай пакалення, трагічнага і гераічнага адначасова. “Пярсцёнкі з медных пятакоў” – гэта ў нейкай ступені рэквіем па ўсіх тых, хто не дайшоў да перамогі, да той пары, калі можна было надзець на палец заручальны пярсцёнак, а разам з тым, тут і трагедыя нявест, што не дачакаліся сваіх суджаных, таму і зелянелі не запатрабаваныя пярсцёнкі.

Аднак не толькі адчай быў у паэзіі С. Гаўрусёва. Яго вершы гэтага часу з усёй іх трыбуннасцю былі праніклівa лірычнымі. Перажыванні героя датычаць усяго існага, бо любая падзея праходзіць праз яго душу, пакідаючы такім чынам незабыўны след. Чалавек не можа ўяўляцца неяк ізалявана, ён уключаны ва ўсе працэсы, яму ёсць за што перажываць, ёсць што цаніць, бо і праца, і прырода маюць аднолькавую значнасць: звонкасць ручая, пошум ляснога бору, шчэбет птушак, бо ўсё ўвязана ў адно цэлае, і аб’ядноўвае і цэментуе гэтую цэласнасць чалавечая памяць.

Лясы Радзімы!
Як мы цэнім мала,
Што вы для нас прыстанішчам былі,
Што разам з намі доля вас ламала,
Ды вы цярпліва цяжкі крыж няслі![84].

Прырода ў паэта заўсёды напоўнена жыццёвымі працэсамі, яна актыўная, уздзейнічае на чалавека, абуджае яго пачуцці, прымушае ўнікліва ўглядацца ва ўсе праявы, у тое, што здзяйсняецца, і які з яго будзе плён. Жыццё мнагалікае, у ім праяўляюцца самыя нязначныя дробязі і маштабныя з’явы, і паэт гэта заўсёды павінен ўспрымаць і адлюстроўваць, рабіць своеасаблівы паэтычны злепак. Гэтыя працэсы ў перапляценні ствараюць вобраз часу, знітоўваючы мінулае з сучасным. Але трэба прызнаць, што не ўсе паэтычныя дэталі вершаў будуць адназначна ўспрымаць нашчадкі, нейкія рэчы навек пайшлі ў нябыт, ад іх засталіся толькі гістарычныя згадкі, але людзі павінны памятаць пра ўсё, што было да іх, каб не ператварыцца ў безымянныя жывыя статуі. Сёння нават для многіх выхадцаў з вёскі могуць быць незразумелымі вобразы жнеяк, узброеных сярпамі, высока апетых Янкам Купалам, яшчэ рэальных у першыя пасляваенныя дзесяцігоддзі. С. Гаўрусёў іх таксама паэтызуе, ствараючы прываблівы воблік нястомных працаўніц, чым і робіць іх бессмяротнымі.

[84] Гаўрусёў, С. Збор твораў. – Т. 1. – С. 85.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Гарлач бярозавіку ў жніўным полі –
Уцеха жней у звонкую сухмень.
Чакаюць, рукі склаўшы на прыполе,
Пакуль прыгубіць стомлены прамень.
……
У ногі жнеям кланяецца ніва,
Асмужаная ліпеньскім дымком,
Над гладышом ракоча гаманліва
Нахіленым асмяглым каласком[85].

Увогуле, у 60-я гады С. Гаўрусёў, асэнсоўваючы новыя рэаліі часу, у тым ліку і змену адносін улады да працаўнікоў вёскі (прызнанне іх грамадзянамі з увядзеннем пашпартоў), ён заўважае і ўсё, што застаецца ў вёсцы як цудоўная спадчына продкаў, і тое новае, што ўрываецца ў жыццё. Але ён яшчэ не акцэнтуе ўвагу на тых працэсах, якія будуць паступова губіць вёску: тое нарастала спакваля і гарадскому жыхару нават у першым пакаленні не надта кідалася ў вочы. Ды ўсё ж трывога ў вершах паэта праяўляецца: лірычны герой са смуткам заўважае, што знікаюць у вёсцы памятныя архетыпы, што вёску ўсё больш пакідае моладзь, бо яе клічуць нязведаныя далі, што ўвогуле з'яўляецца натуральным. Але бяда вёскі пачыналася ў іншым: змяншалася нараджэнне дзяцей, знікала традыцыя, калі нехта з сям'і абавязкова павінен стаць спадчыннікам, каб прадаўжаць сялянскі вясковы род. Негатыўна адбівалася тут і непрадуманая дзяржаўная палітыка неперспектыўных вёсак, якая вымушала моладзь шукаць выйсце, якое ім бачылася ў пасяленні ў больш вялікіх жыллёвых масівах, дзе звычайна знаходзіліся цэнтры калгасаў, паселішчы, нейкім чынам папярэднікі сучасных аграгарадкоў. Усё гэта ўжо адчувалася ў паэзіі С. Гаўрусёва канца 60-х гадоў, хоць было яшчэ як прадчуванне будучых вялікіх пераменаў. Юнакі і дзяўчаты едуць у вёску ўжо не як пастаянныя яе жыхары, а толькі як наведнікі, каб абнавіць пачуцці, успомніць дзіцячыя гады, таму і роднасць з усім ужо крыху абстрагаваная, хоць яшчэ псіхалагічна родны дом быццам абярэг ад усіх бедаў, ратунак, каб не парваць канчаткова ніці жыццёвых каранёў.

Яны, як юная ліства,
Імкнуцца к сонцу маладому.
Ды мала сэрцу хараства
Заўжды без бацькаўскага дому.
І між палёў, і між бароў

[85] Гаўрусёў, С. Збор твораў. – Т. 1. – С. 89–90.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Сюды штогодна хлопцы едуць,
Каб незабыўных стрэць сяброў,
Каб незабыўны край праведаць[86].

Лірычны герой цвёрда ўпэўнены, што на гэтай зямлі, дзе ён жыве і творыць, усё павінна падпарадкоўвацца чалавечаму розуму і пачуццям, адказнасці за адносіны чалавека да ўсяго, што творыцца не толькі пры ім, але і ўвогуле ў свеце грамадскіх адносін. Магчымасці людзей амаль неабмежаваныя, яны могуць мяняць не толькі контуры сваіх сялібаў, іх колеры, але і мясцовыя краявіды, што моцна бянтэжыць героя гаўрусёўскай лірыкі. Але ў яго ёсць унутраная моц, якая ідзе ад бацькоўскіх каранёў, ад юнацкай загартаванасці ў працы, ад настойлівасці ў дасягненні мэты. Сённяшняе адчуванне сваёй прысутнасці ва ўсім ён правярае гісторыяй, тымі далёкімі падзеямі, якія асабліва пагражальнымі былі для славянскай супольнасці. Навалач з усходу, тыя чынгізханаўска-батыеўскія спусташальныя паходы, якія знішчылі некалі магутную дзяржаву, даўно сталі гісторыяй. Час устанавіў справядлівасць, знікла тая ханская арда, але водгаласы яе засталіся, праяўляюцца ў дзеянніх сённяшніх правіцеляў, у якіх у геннай памяці засталося імкненне да панавання. Таму і непакоіць паэта гэтая сённяшняя спакойная няўстойлівасць, якая ў любы момант можа абрынуцца непрадказальнымі дзеямі. Нашы продкі не пусцілі знішчальную сілу ў Еўропу, але пагроза для цывілізаванага свету застаецца. Ва ўяўленні героя ўзнікаюць тыя даўнія прасторы:

У іх развеецца арда
Сярод раздолляў апусцелых,
Каб пакацілася вада
Да ног бярозак памярцвелых.

І знікне ханства.
Чую я
Праз столькі год неспадзявана:
Шыпіць галодная змяя
З пустога ханскага калчана.[87]

Радкі верша гучаць надзённа, але не варта думаць, што тады, у шасцідзясятыя гады паэт прадказваў сённяшнія падзеі. Вядома, трывога адчувалася, але проста яшчэ цяжка было ўявіць адкуль яна насунецца. У ідэалагічна выхаванага тагачаснага грамадства пагроза бачылася толькі

[86] Гаўрусёў, С. Збор твораў. Т. 1. – С. 100.
[87] Тамсама. – С. 102.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

з боку старога капіталістычнага свету. І паэт застаецца верным ленінскім запаветам, на ўвакавечванне асобы якога, як і яго сучаснікі, ён патраціў нямала паэтычна-метафарычных сродкаў, душэўных намаганняў, што характэрна было для яго некаторых твораў са зборніка "Профіль веку" (1969).

У наступных зборніках, калі яшчэ і сустракаліся такія матывы, то яны не вызначалі асноўнай танальнасці кніг. Вершы яго ў пераважнай большасці працягвалі выяўляць душэўны стан чалавека, яго стойкасць у многіх грамадскіх выпрабаваннях. Ужо ў зборніку "Пераклічка" (1973) пераважаюць менавіта лірычныя вершы, медытатыўныя, без тога арганнага грому. Паэзія становіцца больш сцішанай, але не менш уражлівай. У вершах усё часцей перамежаецца былое і сучаснасць, дзе як бы ажывае гісторыя народа ва ўсёй яе складанасці, жыццёвай прастаце і невытлумачальнай супярэчнасці. І гэта повязь часоў будзе мацнець сумесна з надыходам жыццёвай мудрасці, што найбольш яскрава будзе праяўляцца ў наступнх кнігах "Водсветы" (1978), "Азарэнне" (1980), "Пладаноснасць"(1986), "Званы нябёс" (1988). Мнулае ўрываецца ў лагодную сучаснасць, не дае права проста заспакоіцца, лічыць, што ўжо ўсё дасягнута. Лірычны герой пастаянна як быццам адчувае сваю віну перад светам за тое, што, магчыма, не ўсё зрабіў па сваіх сілах, не заўсёды адпаведна ўспрымаў запаветы бацькоў. Гэтае адчуванне вінаватасці, мусіць, з'яўляецца характэрнай рысай не аднаго пакалення: юнацтва заўсёды імкнецца прыспешваць час, не заўважаючы многага, што пазней усё часцей будзе прыходзіць у памяць.

Поле з васковым адлівам
Дзе пакаянна стаю,
Але з сярпом гаманлівым
Маці не бачу сваю[88].

Мудрасць чалавечага жыцця заўсёды пазнаецца спакваля, непрыкмента, без асаблівых нейкіх урокаў, з паўсядзённасці ўчынкаў старэйшага пакалення, перш за ўсё бацькоў, праз іхнюю нетаропкую руплівасць. Кола жыцця неабмежаванае, кожная дробязь пазней усплывае ў памяці як доказ пастаянных патрэб працы, у якой і выкрашталізоўваецца характар. Перш за ўсё ўспамінаюцца гады дзяцінства, калі, можна так сказаць, людзі тады выжывалі за кошт натуральнай гаспадаркі. Таму яркімі прыкметамі часу сталі кросны, ткальныя чаўнакі, выбеленыя палотны, піла, сякера і іншы гаспадарскі рыштунак. Маці з усімі хатнімі клопатамі (пячы хлеб, шыць кашулі і г.д.) прывучала і да самастойнасці,

[88] Гаўрусёў, С. Збор твораў. Т. 1. – С. 290.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

да адчування ўласнай годнасці.

Словам уцехі лячыла
Кожнага з нас у журбе.
І назаўжды навучыла
Сілы шукаць у сабе[89].

Як і вечна застаецца ў нашчадкаў якідкая бацькава навука: дзяліцца з дзецьмі самым лепшым, даваць урокі прыкладам сваёй працы, што становіцца арыенцірам на доўгія гады, што яскрава выявілася ў невялікім паэтычным эцюдзе:

Чаго спяшаюся сюды –
Хоць рэдка – ці за блізкі свет?
Даўно завеяны сады,
Нібы на іх маёвы цвет.

Яшчэ світальнаю імглой
Ля студні коні п'юць ваду.
Падпераазаўшыся пілой,
У дровы з бацькам я іду.

Шлях выбіраем, дзе раўней,
Дзе зыбка высіцца барок…
Даўно было. Ды як раней
Ступаю з бацькам крок у крок.

І сёння ў сумнай немаце
Гадаю, вядомая рэч:
Ці то мяцеліца мяце,
Ці гамоніць шумна печ[90].

Памяць паэта відушчая, яна ў нейкай ступені прадметная, канкрэтна індывідуальная. Кожная дэталь у вершах псіхалагічна абгрунтаваная, сведчыць не толькі пра мінулае, але і служыць повяззю з сучаснасцю. Пры гэтым мінулае часцей за ўсё падсвечваецца падзеямі вайны, з якой з абпаленай памяццю выйшла гэта пакаленне. Пачынаючы з ранняга верша "Я вырас пад гарматнымі стваламі" вайна па-свойму будзе праламляцца ў паэзіі С. Гаўрусёва, часта праз буйную метафару.

Памяць наша – быццам мост пантонны –

[89] Гаўрусёў, С. Збор твораў. Т. 1. – С. 290.
[90] Тамсама. – С. 293.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Берагі злучае пад агнём
І, прыняўшы груз тысячатонны,
Днём і ноччу ходзіць хадуном[91].

Вайна пакінула моцную зарубку ў памяці народа, той памяццю вымяраюцца і многія справы пазнейшага мірнага часу, бо тыя, што выжылі, у тым ліку і дзеці, уласна за якіх і было тое крывае змаганне, не могуць быць абыякавымі не толькі да страт, але і павінны з пашанай адносіцца да ўсіх, хто прайшоў праз тыя страшныя выпрабаванні. Таму аднолькава з гонарам павінны ўспрымацца і героі з узнагародамі на грудзях, што вымушаныя былі ў першыя пасляваенныя гады займацца жабрацтвам, бо дзяржава пра іх проста забыла. Гэта горкія рэаліі вайны, рысы мястэчкаў і невялічкіх гарадоў.

Аслеп? Ці толькі? – Ён жа і бязногі!
Глядзі – абедзвюх нехапае рук!
І – як прадчуванне смутнае трывогі–
Падшыпнікі паскрыпваюць аб брук.

Пусты картуз – жабрацкая скарбонка.
Ды ён сляпы – не бачыць пятака[92].

Праўда, ў дадзеным выпадку можна і з палёгкай уздыхнуць, бо пра калеку не забыліся родныя: жонка і дачка, таму належна і сціпла адзначаецца іх высакароднасць. Аднак тыповым для таго часу было іншае.

Не меншы роздум у паэта выклікае і жыццё на акупаванай тэрыторыі, трывожнае чаканне вызвалення і прадчуванне магчымага вынішчэння ў любую хвіліну, бо ты ў роднай хаце безабаронны і бяссільны. Гэта пераканальна паказаў С. Гаўрусёў у вершы “Жывое ўсё набрыдзь нядобрую чуе…”, адзін не з горшых вынікаў тыповай сітуацыі: сям’я хавае за снапамі сваю ратавацельніцу-карміцельку:

Ні гуку – маўчыць у сляпой
І дыхаць зусім перастала, здаецца.
І толькі як зграя фашысцкая схлыне,
Яна сіратліва сваім абзавецца.

Праўда, заключная страфа некалькі нечаканая: так старанна ахоўваемую кароўку раптам аддаюць, але… сваім. З’яўляюцца партызаны, знямоганыя, “толькі з блакады… Разбіты абозы… І раненых многа…” і вось вынік:

Мой бацька тады не сказаў ані слова

[91] Гаўрусёў, С. Збор твораў. Т. 1. – С. 74.
[92] Тамсама. – С. 225.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

І, узяўшы з запечка абрывак пласконні,
Карміцельку моўчкі прывёў. І карова
Пайшла за санямі ў лясное сутонне[93].

Вядома, спрацавала спрадвечная гуманнасць, гатоўнасць чалавека памагчы папаўшым у бяду, але ўсё ж нешта застаецца недагавораным, бо нярэдка народныя мсціўцы таксама былі не надта разборлівыя ў метадах адносін да мясцовага насельніцтва.

Драма вайны па-свойму выявілася і ў вершах, прысвечаных паэтам-франтавікам А. Пысіну, М. Аўрамчыку, П. Панчанку, а таксама ў вершах пра адыход у іншы свет паэтаў свайго пакалення, якіх, па сутнасці, таксама даганяе вайна. Пра гэтую акалічнасць Ул. Гніламёдаў піша: *“Яму, як рэдка каму з беларускіх паэтаў (якраз за выключэннем А. Пысіна), уласціва ідэя актыўнай стваральнай памяці. <…> Такая акалічнасць зусім не азначае, што аўтар раўнадушны да трывог сучаснага свету. Не, яны зразумелыя яму. <…> Зрэшты, часткаю сучаснага духоўнага вопыту паэта з’яўляецца і яго памяць. Яна падступае ў сне і на яве, на яе экране ўзнікае тое, што адбылося вельмі даўно – у гады мінулай вайны, а таксама ў даваенныя і ў першыя пасляваенныя часы”*[94]. Паэт умее лаканічна перадаць мінулыя падзеі, многае выводзячы ў падтэкст, як у вершы “Імклівы, лёгкі, стрэлавідны…”, дзе ўзлёт рэактыўнага самалёта зноў вяртае яго памяць у гады вайны, калі хлапчук з горыччу назіраў, як гінуць адзінкавыя нашы самалёты, стаўшы на шляху фашысцкай паветранай армады:

Напоўніць ён абсяг блакітны
Шырокім рокатам грудным.

І на дубах у цёмным лісці
Аж скалануцца жалуды:
Каб гэта сіла ды ***калісьці****!*
Каб гэта сіла – ды ***тады****!*[95]

Лірычнае асэнсаванне рэчаіснасці характэрна і для эпічных твораў. Паэма “Іней”, што ўвайшла ў зборнік “На грэбнях хваль” паказала магчымасці аўтара авалодваць шырокім жыццёвым матэрыялам, хоць у аснову твора кладзецца сутнасць узаемаадносін маладых людзей, паэтызацыя вечнага пачуцця – кахання. Але ў сюжэт моцнымі паэтычнымі дэталямі ўплятаецца нялёгкае жыццё беларускай вёскі пяцідзясятых

[93] Гаўрусёў, С. Збор твораў. Т. 1. – С. 214.

[94] Гніламёдаў, Ул. Сучасная беларуская паэзія / Ул. Гніламёдаў. – Мн.: Нав. і тэхн., 1983. – С. 216.

[95] Гаўрусёў, С. Збор твораў. Т. 1. – С. 214.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

гадоў, сутнасць ўзаемаадносін пакаленняў. Асноўная сюжэтная лінія паэмы – каханне Евы і Ягора (дабіўся ад бацькоў, каб звалі Жора, гэта неўзаметкі прыняла і вёска). Праз любоўную лінію аўтару ўдалося паказаць сутнасць характараў. Ева, закаханая ў прыгожага хлопца, чакае яго з войска, хоць яна запала ў сэрца і маладому тэхніку МТС Якубу. Традыцыйны трохкутнік толькі глыбей вызначае высакароднасць дзяўчыны, яе боль, што абранец яе сэрца аказаўся зусім не тым чалавекам, якім бачыўся Еве спачатку. Прывыклы да ўвагі з боку іншых, Жора шукае лёгкага жыцця, абразліва выказваецца пра занятак Евы, бо яе праца даяркі, якую яна любіць, здаецца яе каханаму прыніжэннем асобы. Вядома, праца яе цяжкая, знясільвючая, асабліва ў тыя гады, але ў нейкай ступені і ганаровая. Пра што, урэшце, кажуць і старэйшыя людзі. Праўда, на ўсіх нюансах працоўнага працэсу ў вёсцы паэт не засяроджваецца, паколькі ў полі зроку яго толькі этычна-маральная праблема. Такім чынам, у паэме развенчваецца псіхалогія летуноў, прыхільнікаў лёгкага жыцця, што перадаецца і праз роздум бацькі Жоры селяніна-працаўніка Саўкі, які ў нечым адчувае і сваю віну, што не прывучыў хлопца змалку даражыць працай, многае дараваў адзінаму сыну, бо старшыя загінулі на вайне. У маналогах-зваротах Саўкі ў думках, скіраваных да сына, добра высвечваецца воблік беларускага хлебароба, які ўмее цаніць працу чалавечых рук.

Жыццё такая рэч, сынок,
Што не схаваешся ў канюшні.
Шляі баіцца стрыгунок.
А ўсё ж паставяць у аглоблі.
Не вечна бегаць па лугу,
Шукаць, дзе мяккая атава.
Падумаць трэба пра дугу
І пра хамут, – такая справа[96].

У такіх развагах Саўкі адбіваюцца рысы яго асноўнай працы ў калгасе, усё жыццё звязаную з коньмі.

Трывожыў Саўку тупат громкі
Грывастых д'яблаў-жарабкоў.
А ён
Віў путы і пастромкі
Пад звонкі цокат іх падкоў[97].

Праз увесь твор праходзіць вобраз інею, які ў розных іпастасях па-

[96] Гаўрусёў, С. Збор твораў. Т. 2. – С. 28–29.
[97] Тамсама. – С. 39.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

рознаму высвечвае герояў. У адносінах да Евы іней як бы падкрэслівае фізічную і духоўную прыгажосць, на яе шаліку і бровах ён іскрыцца дыяментамі, у вобразе Жоры сведчыць хутчэй пра яго душэўную пустату, холаднасць і абыякавасць і да людзей, і да іх справы. Іней таксама падсвечвае і няпростыя жыццёвыя варункі людэей, прайшоўшых праз розныя стрэсавыя сітуацыі, таму і лажыцца рана на іх скроні. Усё ж варта заўважыць, што для таго часу праблема перспектывы калгаснай вёскі паэтам не ўзнімалася. Сыход Жоры Высоцкага з вёскі ўспрымаўся як адзінкавы, звязаны хутчэй з этычна-маральнымі аспектамі, а не з сацыяльна-эканамічнымі працэсамі, з той, па сутнасці, бяспраўнасцю калгаснікаў. Зрэшты, адзінкавыя адыходнікі ў тадышняй мнагалюднай вёсцы проста не заўважаліся, з'ява не давала падстаў для трывогі.

Такім жа лірычным струменем пранікнута і паэма "Штодзённы лістапад" (1961). Лірычны герой праходзіць па мясцінах, пэўным чынам звязаных з яго памяццю, таму і ўспрымае яго неадназначна. Пранікнуты павагай да чалавека працы, узвышае яго да боскай велічы, бо на плячах такіх людзей і трымаецца свет. Ён захапляецца ўсім здзейсненым яго аднагодкамі, старэйшым пакаленнем, а памяць усё вяртае да жорсткіх дзён мінулай вайны.

Маленства!
Прайшло ты пад грымотамі вайны,
Пад п'яны рогат дзікага шаленства
Рабаўнікоў бацькоўскай стараны.
Я б не хацеў трывожыць успамінаў,
Але ў дзяцінстве – з дзесяці гадоў! –
Баханак менш мы бачылі, чым мінаў,
Варожых гільзаў больш, чым жалудоў[98].

Але асноўны пафас твора – суладнасць жыцця, паэтызацыя працы, кахання, любові да родных краявідаў, бацькоўскай зямлі. Гэта адзначыў і М. Арочка: "*Паэма ў сваёй аснове саткана з ранішне-чыстых, упершыню разбуджаных пачуццяў любві, успрынятай лірычным героем як нешта непадзельнае і адзінае: бацькоўскі край і юная паплечніца, як зара, умытая малочнай расой. Паэма прагучала як лірычная споведзь грамадзянскага ўзмужнення, авеянага рамантыкай бязмежнай улюбёнасці ў бацькоўскі дом, родны край*"[99].

Іншыя эпічныя творы атрымалі меншы грамадскі рэзананс, хоць

[98] Гаўрусёў, С. Збор твораў. Т. 2. – С. 39.
[99] Арочка, М.М. Беларуская савецкая паэма. – С. 303–304.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

паэт ікнуўся паказаць важныя гістарычныя падзеі. Паэма “Профіль веку” (1969) адкрыта публіцыстычная, складаецца з асобных фрагментаў жыцця правадыра пралетарыяту, па задуме павінна была ўславіць рэвалюцыйныя падзеі, але засталася толькі сведчаннем жадання зрабіць уклад у саюзную ленініяну. Не стала дасягненнем і паэма “Палярная араторыя” (1966), якая рассыпаецца на кароткія эскізы, у публіцыстычнай форме расказвае пра магчымасці маладога героя ў будаўніцтве і ўмацаванні вялікай дзяржавы. “*Цэнтральным героем драматычнай паэмы “Хай спыніцца ўнебе пяро!” (1970) з’яўляецца малы хлапчук Васілёк, спалены разам са сваімі бацькамі і з усёй вёскай Хатынь. Ён вярнуўся з таго свету, каб расказаць тым, хто застаўся жывым, пра сваё радаснае жыццё ў бацькоўскім доме, пра маці і бацьку, братоў і сясцёр, пра пчол і зязюль. Цёплы лірызм і добрая публіцыстыка арганічна спалучаны ў творы. Наіўны, чысты голас дзіцяці, якое шчыра і эмацыянальна апавядае пра мірныя будні свайго даваеннага маленства, цесна пераплятаецца са спачувальным голасам аўтара так, што часам цяжка адрозніць, дзе заціхае адзін і гучыць другі. Кантраст шчаслівых малюнкаў дзяцінства, абуджаных памяццю малога Васілька, і горкіх карцін смерці робіць агульны тон эпічнай паэмы надзвычай драматычным, нават трагічным*”[100].

У паэме “Сушаныя арэхі” (“Водсветы”, 1976) С.Гаўрусёў зноў вяртаецца да першых пасляваенных гадоў, спрабуе паказаць усю складанасць жыцця разбуранай вёскі, эканамічную слабасць калгасаў, жыццё якіх падтрымліваецца непасільнай працай жанчын і падлеткаў ды інвалідаў, адзінкавых мужчын, што вярнуліся з вайны. Твор у нейкай ступені спавядальны, бо ўсе падзеі падаюцца праз успаміны Архіпа, які, страціўшы ў вайну сям’ю, працуе паромшчыкам. Менавіта праз яго ўспрыманне жыцця паэт імкнецца высвеціць псіхалогію розных людзей, іх адносіны да працы, грамадскага набытку. Усё магчымае робіць старшыня калгаса аднарукі Янка Клубень для аднаўлення калгаса, шчыруюць маладыя і старыя, а Аўмен пры магчымасці стараецца ўрваць больш для свайго двара. Прыкметныя дэталі сведчаць пра вялікія страты, пра абыякавасць улады да працаўнікоў, калі прадстаўнікі яе прымушаюць калгаснікаў здаць нарыхтоўку за суседзяў за кошт зерня, што прызначалася на працадні, пры гэтым цынічна заяўляюць, што вяскоўцы пражывуць на бульбе і ўраджаі ўласнага агарода. Адна такая

[100] Драздова, З.У. Сцяпан Гаўрусёў / З.У. Драздова // Гісторыя беларускай літаратуры: у 4 т. – Мн.: Беларус .навука, 2002. – Т. 4. – Кн. 1. – С. 407.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

дэталь яскрава высвечвае жыццё пасляваеннай (і не толькі) вёскі. Ды ўсё ж паэту не ўсё ўдалося паказаць цэласна, на што яшчэ тады звярнуў увагу Ул.Гніламёдаў, зазначыўшы, што "*аўтар не рашыўся назваць яго* (твор. – *Я.К.*) *паэмай, а назваў больш сціпла – "эцюды жыцця". <...> Твор напісаны сакавітаю моваю, але яму яўна нестае эпічнага дыхання, жанравай цэласнасці, эпічных абагульненняў*"[101].

Нават пры некаторых творчых выдатках паэматворчасць С. Гаўрусёва стала значным здабыткам беларускай паэзіі XX стагоддзя.

Актыўным С. Гаўрусёў быў і перакладчыкам. Ён разам з А. Пысіным узнавіў на беларускай мове кнігу М. Джаліля "Маабіцкі сшытак", вершы многіх паэтаў нацыянальных рэспублік.

Цікавы С. Гаўрусёў і як крытык. Сведчанне таму і нешматлікія артыкулы, якія ўвайшлі з Збор твораў. А яшчэ ж паэт, знаходзячыся амаль усё жыццё на творчай рабоце, шмат выконваў заказаў выдавецтваў: пісаў так званыя "закрытыя рэцэнзіі", якія бласлаўлялі або спынялі выданне кнігі. Гэтыя творчыя працы і па сённяшні дзень дзесьці ў архівах, калі наогул захаваліся. Але ў яго многа апублікаваных рэцэнзій, да яго патрабавальнага крытычнага слова прыслухоўваліся. Не абыходзілася і без крыўдаў. У рэцэнзіях і артыкулах С. Гаўрусёў імкнуўся выдзеліць галоўнае ў творчасці паэта, пра якога пісаў. У прыватнасці, разглядаючы зборнік паэзіі А. Бялевіча "Залатыя ключы" (1963), ён зазначыў, што паэт мае свой погляд на жыццё, валодае майстэрствам выкарыстання народнай лексікі, стварэннем ёмкіх вобразаў. Але не заўсёды патрабавальны да сябе, на што рэцэнзент і звярнуў увагу, зазначыўшы, што зборнік атрымаўся ніжэй паэтычных магчымасцей аўтара. У невялікім артыкуле "Бесядзь цячэ ў акіян" С. Гаўрусёў удала вызначыў рысы творчай індывідуальнасці А. Куляшова, у якога Бесядзь становіцца галоўным вузлом памяці, стартавай пляцоўкай да пазнання Сусвету, а ў П. Панчанкі ("Грунтоўнасць думкі і відушчасць сэрца") падкрэслівае "шматфарбнасць у абмалёўцы навакольнага свету", пастаянныя самаправеркі, калі "толькі ў люстэрку чыстага сумлення можна ўбачыць свой сапраўдны твар". Ён дакладна вызначае асаблівасці паэтычнага дару паэтаў розных пакаленняў: ад сваіх аднагодкаў да маладзейшых, сярод якіх П. Макаль, Г. Бураўкін, А. Грачанікаў, К. Камейша і інш.

Творчасць С. Гаўрусёва трывала ўвайшла ў нацыянальны літаратурны працэс.

[101] Гніламёдаў, Ул. Творыць памяць / Ул. Гніламёдаў // Полымя. – 1978. – № 4. – С. 246.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

І І

РАМАНТЫЗАЦЫЯ ГЕРАІЧНАГА ПОДЗВІГУ

Раман І. Шамякіна “Глыбокая плынь”

Вайна размежавала жыццё краіны на дзве няроўныя паловы. Перадваенныя гады былі таксама не самымі лепшымі. Знішчэнне ў канцы 20-х – сярэдзіны 30-х у Савецкай Беларусі мірнага насельніцтва сталінскім рэжымам было страшэнным, рэпрэсіі супраць барацьбітоў за сацыяльную і нацыянальную роўнасць праводзіліся і ў Заходняй Беларусі, але з пачаткам вайны падзеі набылі яшчэ большы драматызм, таму даваеннае трывожна-ціхамірнае жыццё здавалася ўжо амаль ідэальным у параўнанні з новымі пакутамі. Але трэба мець на ўвазе, што ў розных рэгіёнах Беларусі на пачатку нямецкае нашэсце людзьмі ўспрымалася не аднолькава. Жыццё там працякала па-свойму. У Заходняй Беларусі, дзе савецкасць яшчэ амаль не ўмацавалася, а ў памяці захавалася ўяўленне пра германцаў як людзей прыветліва- культурных, успрыманне акупантаў было памяркоўным, хоць далёка і не дружалюбным. Інакш складваліся ўзаемаадносіны мясцовага насельніцтва з прышэльцамі ва ўсходнебеларускіх раёнах. Тут даволі доўга затрымліваўся фронт, мясціны напаўняліся атрадамі разведкі, дыверсійнымі групамі, мясцовым камуністычным падполлем. Усё гэта рабіла жыццё жыхароў вёсак і мястэчкаў трывожным і няпэўным. Але такія нюансы не адразу сталі матэрыялам мастацкага адлюстравання. На самым пачатку ў поле зроку траплялі падзеі жорсткага франтавога сутыкнення. Пісаліся нарысавыя апавяданні, невялікія замалёўкі, у якіх на першы план выводзілася патрыятычная тэматыка, аптымістычная вера ў перамогу над ворагам, аўтары (Ус. Краўчанка, М. Лупсякоў, Г. Шчарбатаў, І. Гурскі і інш.) свядома пазбягалі драматызму і трагізму ў адлюстраванні ваенных падзей.

У 1945–1946 гг. вярнуліся з далёкіх франтавых дарог многія ўдзельнікі вайны, якія рабілі першыя спробы пяра яшчэ перад навальнічнымі гадамі. Браліся пісьменнікі за тэму вогненных гадоў па многіх прычынах: супярэчлівасць мірнага калгаснага жыцця паказваць было нельга. А ў ваеннай тэме быў вечны сацыяльны непрымірымы канфлікт. Можа і таму пісьменнікі ўзяліся па гарачых слядах узнаўляць драматызм тых падзеяў. Ужо вопытныя пісьменнікі (М. Лынькоў, І. Гурскі) і маладыя (І. Мележ, І. Шамякін, А. Кулакоўскі і інш.) прыняліся з энтузіязмам асвойваць дастаткова важны і зусім яшчэ не кранутый жыццёвы матэ-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

рыял. Напісаныя ў час вайны апавяданні лічыліся толькі подступамі да вырашэння тэмы (за выключэннем твораў М. Лынькова і К. Чорнага).

Цікава, што пісьменнікі амаль не засяроджваліся на франтавым жыцці, прынамсі, пачатковага этапу вайны, а сканцэнтравалі ўвагу на партызанскай барацьбе і падполлі. Праўда, апошняе неяк было перыферыйным, нават у такіх творах з замахам на эпапейнасць, як "Векапомныя дні" М. Лынькова і "Мінскі напрамак" І. Мележа.

І. Шамякін, як адзначыў у свой час І. Навуменка, паступіў смела. Напісаў раман пра партызанку, пра якую ведаў толькі з размоў жыхароў. Сустракацца з людзьмі яму прыходзілася часта па грамадскіх абавязках (працаваў сакратаром партыйнай арганізацыі сельсавета), а пісьменніцкія амбіцыі маладога творцы патрабавалі нечага незвычайнага. Так узнік раман "Глыбокая плынь", у нейкай ступені рамантызаваная гісторыя змагання на Палессі супраць акупантаў.

Трэба сказаць, што дэбют у партызанскай тэматыцы атрымаўся ўдалым. Зноў жа І. Навуменка падкрэсліў, што на яго, жыхара гэтага рэгіёна, падпольшчыка і партызана, асаблівае ўражанне зрабіла дакладнае веданне дэталяў жыцця на акупаванай тэрыторыі. І калі пазней даведаўся, што І. Шамякін ваяваў на поўначы, не меў ніякіх дачыненняў да партызанкі, павага да яго яшчэ павялічылася. Сапраўды, "Глыбокая плынь" у канцы саракавых – пачатку пяцідзясятых гадоў успрымалася як дакументальнае сведчанне ўсенароднай барацьбы з фашысцкімі захопнікамі. Аднак ні адзін з раманаў І. Шамякіна не падвяргаўся такім шматлікім перапрацоўкам (дакладней, праўкам), як гэты твор. Неяк у час сустрэчы з чытачамі ў сярэдзіне 60-х, якая адбывалася ў Дзяржаўнай бібліятэцы імя У.І. Леніна (як тады яна называлася), І. Шамякін заявіў, што ён не любіць папраўляць раней напісанае, бо шкада часу: лепш напісаць нешта новае. І ў гэтым ёсць свая ісціна, бо не ўсе творы, над дапрацоўкай якіх мастакі слова карпелі гадамі, сталі літаратурнымі шэдэўрамі. Усё ж пісьменніку прыйшлося неаднаразова вяртацца да свайго ўдалага першынца, каб знімаць выразна кан'юнктурныя моманты, якія дыктаваў сам час. Але пісьменнік не закранаў ні выяўленне самога часу, ні зменаў у характарыстыцы герояў рамана. У гэтым І. Шамякін заставаўся паслядоўным. У 1982 годзе ён запісаў у дзённіку: "*Магчыма, калі я ў будучым вазьмуся за сапраўдныя мемуары, напісанню першага апавядання "У снежнай пустыні", і "Глыбокай плыні", і "Снежных зім"< ...> будзе адведзена ў іх нямала месца*"[102].

[102] Шамякін, І. Карэнні і галіны / І. Шамякін. – Мн.: Маст. літ., 1986. – С. 286.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Яшчэ крыху раней у гутарцы з крытыкам В.Каваленкам пра свой першы раман пісьменнік сказаў наступнае:

“*Сам я не быў партызанам, але калі я вярнуўся з вайны, то апынуўся у акружэнні былых партызан. У час вайны наш раён быў партызанскім. І вось сёння я ўспамінаю надзвычай цікавага чалавека, з якім разам працаваў, – старшыню сельсавета Бібікава Івана Сяргеевіча. Ён быў камандзірам партызанскага атрада, за што немцы расстралялі яго сям’ю – жонку і траіх дзяцей. Дык вось, яго расказы, расказы іншых людзей і дапамаглі мне стварыць раман*”[103].

Сапраўды, раман “Глыбокая плынь” пачынаецца рэалістычна: “*Пераправіўшыся цераз Дняпро, Тацяна з палёгкай уздыхнула. Цяпер яна лічыла сябе ўжо дома. Радасць ахапіла яе. Яна першая выскачыла з лодкі і шпарка пайшла, баючыся глянуць назад, дзе застаўся чатырохсоткіламятровы шлях яе – шлях нечалавечых пакут і смяртэльнай небяспекі*”[104]. Дзяўчына ідзе дадому, калі фронт яе ўжо даўно абагнаў. Праўда, поўнасцю Палессе ў 1941 годзе вораг акупіраваў ў жніўні, бо да 19-га ў Гомелі знаходзіліся беларускія ўрадавыя ўстановы. І. Шамякін гэта ведаў, але ў змесце свайго рамана ён не закранае гэтых звестак. І гэта апраўдана. Для яго неабходна было паказаць у духу часу ўсенароднае змаганне, таму адлюстроўваліся падзеі ў даволі зададзеным напрамку. У адпаведнасці з сацыяльнымі міфамі часу, І. Шамякін паказвае падзеі толькі ў чорна-белым варыянце: сацыяльна-палітычныя акцэнты расстаўлены адназначна ў антанімічнай сувязі “патрыёт – вораг”. Пісьменнікам не бралася пад увагу, што жыццёвыя сітуацыі прымушалі людзей шукаць выйсце, прыстасоўвацца.

Час дыктаваў свае ўмовы выяўлення рэчаіснасці. У сувязі з гэтым В. Каваленка адзначаў наступнае:

“*Раман “Глыбокая плынь”, несучы ў сабе тыповыя адзнакі тагачаснай літаратуры ў адлюстраванні вайны з яе жаданнем ідэальна ўзвысіць учынак чалавека на вайне, з яе агульнай публіцыстычнай, падкрэслена грунтавай маральнай, грамадзянскай і палітычнай адзнакай гэтага ўчынку, быў разам з тым наватарскім творам, наватарскім не толькі ў мастацкім вопыце самога пісьменніка, але і ва ўсёй беларускай прозе пра вайну. Менавіта гэты твор паставіў шмат якія праблемы ідэйна-мастацкага адлюстравання партызанскай барацьбы, да якіх стане ўважлівая пазнейшая беларуская літаратура і будзе паглыбляць*

[103] Шамякін, І. Карэнні і галіны / І. Шамякін. – Мн.: Маст. літ., 1986. – С. 87.

[104] Шамякін, І. Глыбокая плынь / І. Шамякін // Збор тв-аў: у 5 т. Т. 1. – Мн.: Беларусь, 1965. – С. 139.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

іх мастацкае разуменне аж да сённяшняга дня. І адна з важнейшых праблем зместу рамана "Глыбокая плынь" – маральная складанасць і сацыяльна-побытавая своеасаблівасць народнай вайны з ворагам"[105] .

У асноўным з такім сцверджаннем можна пагадзіцца: сапраўды ракурс выяўлення жыцця для таго часу быў новым. І пісьменніку многае што ўдалося раскрыць пераканальна.

Рэалістычным у рамане атрымаўся вобраз Тацяны: камсамольскі імпэт, непрымірымасць, жаданне дзейнасці. Гэта выяўляе пісьменнік праз дзеянні гераіні ў экстрэмальнай сітуацыі, калі яна, рызыкуючы, выратоўвае яўрэйскае дзіця, узяўшы яго ў маладой маці, якую праследуюць фашысты. Ужо на першых старонках рамана І.Шамякін выяўляе сваё ўмельства драматызаваць сюжэт, надаваць развіццю дзеяння імклівасць. Але адчуваецца тут і пэўная зададзенасць. Пісьменнік знарок узвышае сваю гераіню, прымушае астатніх герояў рамана захапляцца яе ўчынкамі. Спантаннае рашэнне Тацяны пра выратаванне дзіцяці не ўсе яе спадарожнікі маглі ўспрымаць аднолькава ўзвышана. Хтосьці, напэўна, і паўшчуваў бы, што так дзяўчына неабачліва ўцягнула ўсіх у смяротную небяспеку. У рамане і намёку на гэта няма. Пакуль усё абышлося: немцы пакінулі ў спакоі выпадковую групу, паколькі Тацяна заявіла, што ў дзіцяці тыф. "*Усе павярнулі галовы да Тацяны, і ў вачах іх засвяцілася захапленне дзяўчынай*"[106].

І далей, калі Тацяна сказала, што будзе выхоўваць дзіця як сваё, то ўспрымаецца заканамерна і тое, што старая жанчына жадае ёй божай дапамогі.

Урэшце, прынцып захаплення як мастацкі прыём пры выяўленні маладых герояў будзе галоўным ва ўсім змесце рамана. Прыкладам можа служыць першая сустрэча чытача з касамольцам Жэнькам Лубянам. Заявіўшыся днём у вёску, ён знаёміць аднавяскоўцаў са становішчам на франтах.

"*Расказваў хлопец так шчыра і падрабязна, што самыя недаверлівыя людзі паверылі яму.*

– Не бачыць гэтым паганцам Масквы, як сваіх вушэй, – звонка і бадзёра гаварыў ён. – Праўда, нядаўна яны захапілі Арол, наблізіліся да Ленінграда… Але гэта часовы поспех у іх, здабыты вельмі дарагой цаною, немцы губляюць штодня тысячы забітымі і параненымі. Незлічоная колькасць тэхнікі абгарэлым ломам застаецца на нашых

[105] Каваленка, В. Іван Шамякін: Нарыс жыцця і творчасці / В. Каваленка. – Мн.: Нар. асвета, 1980. – С. 27.

[106] Шамякін, І. Глыбокая плынь. – С. 142.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

бяскрайніх палях. І прыйдзе час!.. Пакоцяцца яны назад! Яшчэ як пакоцяцца! Я прыйшоў, каб перадаць вам наказ партыі нашай, савецкай улады: не давайце немцам ні грама хлеба, ні кавалка мяса, ні клока сена… Спаліць, закапаць, схаваць, а ім не даць!.. Вады не даць ім напіцца з нашых калодзежаў! Так зрабіць, каб на кожным кроку немцаў чакала справядлівая кара. Вось тады хутка прыйдзе ім канец…"[107].

Нават калі ўлічыць пазнейшыя карэкціроўкі тэксту гэтага рамана, не цяжка заўважыць, што Лубян з вялікім імпэтам пераказвае асноўныя палажэнні з ліпеньскага (1941 г.) выступлення Сталіна па радыё. Вядома, юнак у гэта шчыра верыў. Але пісьменніку, відаць, неяк патрэбна было пракаменціраваць гэтыя словы, хоць, вядома, у саракавыя гады зрабіць гэтага ён не мог. А пры падрыхтоўцы пазнейшых перавыданняў лічыў гэта не актуальным, паколькі дасведчаны чытач другой паловы XX стагоддзя мог зразумець, што кіравала пяром пісьменніка. Тут логіка разгортвання падзей заканамерная. А вось наступныя радкі з рамана здаюцца крыху наіўнымі: "*Людзі слухалі юнака, стаіўшы дыханне. Жанчыны плакалі. Мужчыны задавалі пытанні і ўважліва слухалі пераканаўчыя адказы. Ён смела стаяў на высокім ганку школы і радасна ўсміхаўся. Тацяна не зводзіла з яго вачэй*"[108].

Захапленне дзяўчыны зразумелае, яна рамантызуе свайго героя, у якога нават была крыху закаханая. А вось факт прыняцця на шчырую веру ўсяго сказанага юнаком умудронымі вопытам мужчынамі выклікае сумненне. Ці маглі рэальна выканаць вяскоўцы ўсе рэкамендацыі маладога партызана? Відаць, не. Дарэчы, праз некалькі старонак пісьменнік сам абвяргае гэтыя агітацыйныя заклікі свайго героя. Доказ таму – першы прыезд у вёску каменданта раёна Візэнера. Паколькі акупанты адносна мірнага насельніцтва былі настроены ў нейкай меры міралюбіва, то і сяляне робяць усё магчымае, каб задаволіць іх патрабаванні. Супраць сілы бяззбройнаму чалавеку выступаць проста немагчыма, бо гэта прыводзіла б да неапраўданых страт, што і здарылася пры паўторным з'яўленні той жа групы. Хрысціна, цётка Тацяны, паспрабавала ўпарціцца і яе застрэлілі акупанты. Такое было рэальнае жыццё. У сувязі з гэтым можна паставіць пытанне: ці маглі былыя калгаснікі не выконваць загады новых улад аб пастаўках правіянту? Вядома, не маглі. Як і вымушаны былі, дзесьці і з патрыятычных пачуццяў, забяспечваць партызанаў харчам і адзеннем. Такім чынам, яны жылі між двух агнёў, кожны з іх быў небяспечным. Але пра тое магла сказаць літаратура

[107] Шамякін, І. Глыбокая плынь. – С. 153.
[108] Тамсама.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

толькі на канцы стагоддзя, калі кардынальна памянялася палітычная сітуацыя.

Псіхалагічна непераканаўча паказан і стан Маеўскага ў драматычнай сітуацыі, калі карнікі забіраюць амаль увесь нажыты скарб, а Візэнер у стане нейкага паталагічнага жаху загадвае спаліць сядзібу Маеўскіх. Вельмі ж ужо Карп абыякава паставіўся да знішчэння уласнай гаспадаркі, хоць папярэдне пісьменнік сцвярджае, што гэта разумны, працавіты калгаснік, які ведае цану кожнаму здабытаму зерню. У гэтай сітуацыі больш жыццепадобнай была пазіцыя Пелагеі, якая драматычна ўспрыняла працэс рабавання, хоць з самага пачатку пісьменнік неадназначна падкрэслівае, што дзяўчына адразу ўспрыняла мачыху адмоўна, інтуітыўна адчуўшы ў жанчыны душэўную пустату. Як выявілася пазней, сапраўды Пелагея аказалася без сапраўдных маральных прынцыпаў, уласцівых сялянству.

Як станоўчую з'яву варта ўспрымаць і тое, што пісьменнік не спакусіўся з першых старонак рамана паказваць паспяховую барацьбу партызан на акупаванай тэрыторыі Беларусі. Падзеі ў асноўным разгортваюцца ў палескай вёсцы. Жыхары яе адарваныя ад усяго свету, не ведаюць, што робіцца на франтах і дзе ён наогул. Большасць з іх не верыць ў перамогу немцаў, а старэйшае пакаленне прадчувае, што барацьба будзе зацяжной. Гэтыя роздумы пісьменнік перадае Карпу Маеўскаму. Перад ім не менш востра, чым перад Тацянай, стаяла спрадвечнае гамлетаўскае пытанне: што прадпрымаць у гэтай невядомасці, як размеркаваць свае жыццёвыя клопаты ў такой трывожнай сітуацыі?

"*Вось ужо тры месяцы, як нечакана абарвалася ранейшае жыццё, і ён усё яшчэ не можа зразумець, разабрацца ў імклівым вадавароце нечаканых, страшэнных падзей. Кожны дзень думаў ён усё аб адным і тым жа: чаму адступіла наша армія*?"[109] – клапоціць пажылога селяніна. Характэрна, што І. Шамякін не прыспешвае падзеі, не фарсіруе дзеянне. Драматызацыя сюжэтнага руху пачынаецца, па сутнасці, з першай, пакуль што напаўтрагічнай сутычкі з акупантамі: разрабаваная і спаленая гаспадарка Маеўскіх тут як напамін пра будучыя выпрабаванні. Імкліва ж разгортвацца падзеі пачынаюць з жахлівага вынішчэння акупантамі партызанскіх сем'яў, хоць, здаецца, тут пісьменнік апярэджвае гістарычныя падзеі. На пачатку першай ваеннай зімы акупанты не праводзілі карных экспедыцый, у тым ліку і ў адносінах да партызанскіх сем'яў, паколькі дзеянні лясных салдат былі

[109] Шамякін, І. Глыбокая плынь. – С. 164.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

яшчэ нязначныя. Аднак парушэнне такой лагічнасці у рамане не выглядае самамэтным. Гістарычная праўда бачыцца ў тым, што некаторыя партызаны былі залішне самаўпэўненыя, недаацэньвалі магчымасцей ворага. Ды, здаецца, гэты выпадак, у цэлым бесчалавечны, дазволіў І. Шамякіну даць чытачу дадатковыя факты для роздуму і пераконанасці ў тым, што такія жахлівыя з'явы хутка стануць амаль паўсядзённымі. Зноў жа для першых пасляваенных гадоў пісьменніку шчасліва ўдалося пазбегнуць шаблону ў выяўленні здраднікаў, ўсіх тых, якія апынуліся на службе ў акупантаў.

Сапраўднай творчай удачай пісьменніка неабходна лічыць вобраз Ларывона Бугая. Гэты літаратурны герой істотна выдзяляўся з шэрагу тыпаў, створаных у апавяданнях і аповесцях пра вайну папярэднікамі І. Шамякіна, бо нёс у сабе ўжо зусім іншы зарад. Спачатку празаік характарызуе свайго героя так, што ў чытача павінна скласціся ўражанне, быццам Ларывон пайшоў на службу да акупантаў па перакананні, каб змагацца з былой уладай за нанесеныя яму крыўды. Прынамсі, так яго ўспрымала патрыятычна настроеная моладзь. Пры першым наведванні вёскі Жэнька Лубян з усёй катэгарычнасцю абяцаў старасту павесіць. З такой жа ўнутранай непрыязню і Тацяна сустрэла новага вясковага начальніка, які прыйшоў прапанаваць ёй працаваць у школе афіцыйна, бо да гэтага маладая настаўніца па прапанове партызан вучыла дзяцей як бы падпольна. "*Тацяна разглядала старасту з цікавасцю і агідай, як калісьці першага немца. Да вайны яна проста не заўважала гэтага чалавека, не цікавілася ім*"[110]. Тут камсамольская непрымірымасць гераіні таксама лагічная ў стасунку ўсяго жыцця. Але і ў гэтай сітуацыі ёсць такія рэалістычна пераканаўчыя дэталі, увогуле зноў жа наватарскага, можа, міжвольнага, паказу чалавека, які трапіў у даволі складаную сітуацыю. Яго развагі як сталага чалавека па-добраму зразумелыя: і шкадаванне, што так проста неапраўдана загінула Хрысціна, і меркаванні пра жыццё ў складаных умовах. У іх яскрава праяўляецца спрадвечная хрысціянская ісціна, што ў любой тупіковай сітуацыі трэба знаходзіць дзейснае выйсце. Па-жыццёваму ўспрымаецца і яго прапанова Карпу адбудоўваць новае селішча, бо такое бачылася некаторым ўвогуле магчымым, але ў той жа час і мала перспектыўным. Ёсць логіка і ў яго поглядах на тагачасную сітуацыю, на рэпліку Любы, што пры ўладзе, якая паліць хаты, ці мае сэнс будавацца, ён адказвае па-сялянску даволі мудра:

[110] Шамякін, І. Глыбокая плынь. – С. 213.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

“*Што зробіш, дачка. На вайне ўсялякае бывае. І ўсякія людзі на вайне. Адны – людзі як людзі, другія звярамі робяцца… Але жыццё павінна ісці сваім парадкам… Народ павінен жыць, – па-філасофску разважаў ён*”[111]. Але недавер да яго застаецца ў душах патрыятычна настроенай сям’і Маеўскіх. Каб не складвалася двайное ўражанне пра чалавека, далей пісьменнік тлумачыць тую зацятасць і нелюдзімасць свайго героя, ужо ў перадгісторыі трагічнай сітуацыі, наступным чынам: “*Усё жыццё быў ён чалавекам ціхім,, нелюдзімым, багамольным і, апрача працы, нічым не цікавіўся. Да рэвалюцыі бацька яго і ён былі беднякамі, пасля рэвалюцыі, атрымаўшы зямлю, ён стаў серадняком і нават пачаў багацець: добра адбудаваўся, тройку добрых коней набыў, тры каровы меў. У час калектывізацыі пад уплывам папа рашуча адмовіўся ўступаць у калгас. Яго двойчы абклалі “па-цвёрдаму” – ён сам аддаў усё, а ў калгас усё-такі не пайшоў*”[112]. У дадзеным выпадку лёс гэтага героя рамана падобны да лёсу многіх персанажаў з твораў савецкай літаратуры трыццатых гадоў пра калектывізацыю. А сваёй адчужанасцю ў нейкай ступені нагадвае Лявона Бушмара з аднайменнай аповесці Кузьмы Чорнага. Але для новага часу ў гэтай сітуацыі І. Шамякіну ўдалося сказаць і больш, можа нават паказаць абыякавасць улады да лёсу аднаго канкрэтнага чалавека.

“*А пасля, калі ва ўсім сельсавеце ён застаўся адзіным аднаасобнікам, яму было прыкра і крыўдна, ён глядзеў на працу калгаснікаў, на іх жыццё і зайздросціў ім, але тады ўжо ніхто не агітаваў яго ўступіць у калгас, на яго забыліся і не звярталі ўвагі, а сам ён не мог пайсці і папрасіцца – саромеўся, не меў рашучасці, адвагі*”[113].

Для саракавых гадоў гэта прагучала даволі смела, а, пачынаючы з пяцідзесятых гадоў, больш шырока праблему адчужэння чалавека, ператварэнне яго савецкай уладай у крайняга эгаіста разгорне В. Быкаў. У сітуацыі з жыццём Ларывона можна толькі ўсумніцца ў зайздрасці яго да аднавяскоўцаў, бо зараз вядома, якім раем былі тыя калгасы для чалавека. Пастаўленаму ў экстрэмальныя ўмовы (прымусілі немцы па складзеным імі спісе паказваць хаты, як неўзабаве высветлілася, партызанскіх сем’яў) сумленнаму селяніну Ларывону Бугаю нічога не заставалася іншага, як з годнасцю загінуць.

Цікавая яшчэ адна з’ява ў рамане, якая пацвярджае размежаванне сіл на акупаванй тэрыторыі. У творы няма фігурантаў з фашысцкіх

[111] Шамякін, І. Глыбокая плынь. – С..215.
[112] Тамсама. – С. 221–222.
[113] Тамсама.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

прыслужнікаў, бо агульныя заўвагі пра тое, што партызаны громяць паліцэйскія гарнізоны, нічога не гаворыць. Гэта нейкія агульныя словы. Толькі на першых старонках рамана распавядаецца пра паліцаяў, якія па перакананнях пайшлі на службу да немцаў. Гэта гультай, п'яніца Міцька Заяц і сын сасланага на Салаўкі кулака Сцяпан Храпкевіч. Але і тут не ўсё адназначна. Калі Заяц прымітыў, які акрамя незвычайнай фізічнай сілы за душой нічога не мае, то Храпкевіч прадстаўлены больш глыбокім. Ён пайшоў на службу па перакананнях, бо спадзяваўся, што новая ўлада верне яму гаспадарку, а гэтая паліцэйшчына – з'ява часовая. Храпкевіч крычыць п'янаму Зайцу: "*Ты баішся смерці і я таксама. Я жыць хачу, жыць! Чуеш ты? Я адзінаццаць год чакаў гэтага часу. Я гаспадаром хачу быць! А цяпер я хто? Халуй. Немцы мною ад партызан загарадзіліся. А я жыць хачу*!"[114] Перад намі, па-сутнасці, у нейкай ступені трагічная асоба, чалавек, які падмануўся ў сваіх чаканнях, спадзяваннях на перамены. Разам з тым у яго ёсць і свая мэта, ідэя фікс. Ён лічыць галоўным віноўнікам усіх яго няшчасцяў былога бацькавага парабка Лясніцкага, які зламаў яму жыццё, і зараз пагражае яму смерцю. Таму для яго галоўнае – знішчэнне Лясніцкага, але і гэта яму бачыцца нездзяйсняльным. Ён асуджае і палітыку немцаў па знішчэнні партызанскіх сем'яў. "*І немцы баяцца… І не ведаюць, што рабіць! Дурні! Ці ж гэта работа – дзяцей па начах страляць? Гэта што бомбай пажар тушыць"*[115]. Вядома, яго разважанні выкліканыя не гуманістычнымі памкненнямі, а страхам. Але тут паўстае жывы чалавек, загнаны ў куток жыццёвымі абставінамі, адкуль яму выйсця няма. Гэтае прадчуванне гібелі хутка і спраўдзілася, калі яны пайшлі арыштоўваць Маеўскіх.

З гібеллю гэтых двух са старонак рамана наогул знікаюць паліцэйскія як канкрэтныя дзейсныя сілы.

Інакш у рамане паказаны Мацей Кулеш. Як высвятляецца ў працэсе разгортвання сюжэта, гэта чалавек без трывалага жыццёвага стрыжня: ён каціўся па жыцці, шукаючы для сябе хоць самай малой выгады. Усімі ж аднавяскоўцамі ён успрымаўся як знешне прыстойны чалавек, хоць і не выклікаў у іх вялікай павагі. Працуючы заўсёды далёка ад дома, на лягчэйшых работах, ён нібы страціў для ўсіх хоць якую цікавасць. І зусім лагічна было б, калі б Мацей прыстроіўся на нейкую пасаду ў акупантаў, не вельмі рызыкоўную, але дастаткова хлебную. Каб у пэўнай

[114] Шамякін, І. Глыбокая плынь. – С. 248.
[115] Тамсама. – С. 249.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

меры заінтрыгаваць чытача, пісьменнік на гэтага свайго героя напускае таямнічасць: робіць яго не проста асведаміцелем, але нейкім шпіёнам, які праходзіць спецыяльную падрыхтоўку. Аднак шпіёнскай дзейнасці Куляша ў рамане не відаць. Так, ён робіць злачынствы: падаў спіскі партызанскіх сем'яў ў паліцыю, па неасцярожнасці Карпа Маеўскага даведаўся пра цэнтральную партызанскую базу, пра што паведаміў у камендатуру. За гэта ён заслугоўвае кары ў адпаведнасці з законам. Усё ж фінал слізкага шляху Мацея падаецца ў рамане слаба псіхалагічна абгрунтаваным. Дапушчальна, што ўсімі яго ўчынкамі кіравала пачуццё страху, жаданне любой цаной выжыць, што і павінна было выклікаць у чытача пачуццё агіды. Тут пісьменнік апынуўся на вышыні, паказваючы яго як амаральную істоту. Але сумненне выклікае іншае: Ганна, даведаўшыся пра здрадніцкую дзейнасць мужа, без асаблівых ваганняў прымае рашэнне паведаміць пра гэта партызанам. І ва ўчынку яе нічога дзіўнага не было б, калі б перад гэтым пісьменнік паказаў яе ўнутранае ўзрушэнне, змену хвалі пачуццяў: усё ж ён бацька іхніх дзяцей, блізкі чалавек. Жанчына, відаць, не магла так лёгка катэгарычна асудзіць, бо гэта супярэчыць элементарным законам гуманізму У сталым узросце, ужо вопытны пісьменнік, І. Шамякін падобныя сітуацыі будзе паказваць больш псіхалагічна абгрунтавана, як, напрыклад, у "Снежных зімах", калі Надзея Пятроўна проста моліць, каб прысуд яе былому мужу-здрадніку не выканаў не толькі Іван Васільевіч, якога яна пакахала, але нават і партызаны гэтага, ужо яе, атрада.

Палітычна-сацыяльны канфлікт у рамане прадстаўлены несумненны: у барацьбе з акупантамі прымірэння быць не можа. Але, відаць, каб чытачу было зразумела, чаму так цяжка вялася вайна і выклікала такія вялікія страты з боку партызан, неабходна было паказаць і тых, з кім вялася барацьба, рэалістычна праўдзіва. Але ў той час пра такія праблемы маўчалі, а ворагаў паказвалі толькі ў некалькі шаржыраваным выглядзе. Гэта ўласціва і раману І. Шамякіна "Глыбокая плынь", дзе каменданты рэгіёнаў паказаны або страшэннымі прымітывамі, прыстасаванцамі, як эсэсавец Койфер, або паталагічнымі баязліўцамі, як Візэнер. Калі з Койферам усё ясна, бо трапна пасланая куля Лубянам канчае адначасна яго жаданне знішчыць тутэйшы народ, прымусіць яго да маўклівага падпарадкавання. Як гэты было ў літаратуры саракавых і крыху пазнейшага часу, эсэсаўцы паказваліся абмежаванымі людзьмі, неадукаванымі, выхадцамі з сярэдняга саслоўя, пераважна з мяснікоў і дробных лавачнікаў (праўда, робіць выключэнне з правіл, зазначыўшы,

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

што бацька эсэсаўца дырэктар вялікага завода), увогуле адназначна, плакатна. Візэнер пададзены ў рамане крыху інакш.

Упершыню Генрых Візэнер паяўляецца як злавесная асоба ў аповесці "Помста" як кат сям'і Раманенкі (там згадваюцца і вёскі Прыгары і Арэхаўка), пры гэтым таксама сцвярджаецца, што ён выйшаў з інтэлігентнай нямецкай сям'і. У рамане "Глыбокая плынь" Візэнер ужо не нейкая злавесная даволі міфічная фігура, якую патрэбна неадкладна пакараць, а канкрэтны прадстаўнік новага парадку на акупаванай тэрыторыі. У творы ён з самага пачатку трактуецца негатыўна як абмежаваная істота (абед у хаце Маеўскіх), а далей даецца і даволі знішчальная для яго характарыстыка. Пасля многіх паражэнняў ад партызанаў, ён імкнецца прыстасавацца да абставін, трымацца далей ад партызанскай зоны. А пасля забойства Койфера і зусім страціў натуральны воблік, прыкінуўся хворым. Пісьменнік пра апошняе піша даволі з'едліва: *"Праз гадзіну Генрых Візэнер ехаў у абласны цэнтр. Нягледзячы на ўзмоцненую варту, ён дрыжаў усю дарогу, ажно пакуль не лёг на шпітальны ложак. Толькі на ім адчуў сябе ў небяспецы*"[116]. Гэтым у рамане падкрэсліваўся лёс усіх акупантаў.

Побытавыя сцэны ў рамане пісьменніку, як для таго часу, удалося паказаць пераканаўча, праўда, толькі ў пачатку рамана. Потым пісьменнік ад часу пераходу сям'і Маеўскіх у партызаны пра вёску быццам забывае. Нідзе ў рамане не згадваецца і пра тое, як атрады, а пасля і брыгада забяспечваліся правіянтам, неабходным адзеннем. Відаць, у саракавыя гады пра гэта пісаць не было прынята, а можа, нават, і забаранялася. Само сабой разумелася, што ўсё гэта павінны былі забяспечыць беларускія вяскоўцы. А якім чынам нарыхтоўка праводзілася, асабліва нікога не хвалявала. Такія былі ўмовы жыцця на акупаваных тэрыторыях.

І. Шамякін прытрымліваўся праўды жыцця і ў абмалёўцы партызанскай барацьбы, хоць і тут не абыходзілася без гераізацыі, рамантызацыі подзвігу. Перш за ўсё гэта датычыць паказу кіраўнікоў партызанскага руху – камандзіра Сяргея Фядотавіча Прыборнага і камісара атрада Паўла Сцяпанавіча Лясніцкага, адпаведна да вайны старшыні райвыканкома і першага сакратара райкома партыі. Прыборны старэйшы, яшчэ ў грамадзянскую быў камандзірам, умудроны жыццёвым вопытам чалавек, але тон ва ўсім задае Лясніцкі. Ён ідэальны ва ўсіх адносінах: паходзіў з беззямельнай сялянскай сям'і, працаваў парабкам, потым

[116] Шамякін, І. Глыбокая плынь. – С. 361.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

было жыццё ў рабочым асяроддзі, вучоба, камсамольская, партыйная праца. Першакласная анкета! Таму Лясніцкім захапляюцца ўсе: і камсамольцы-падлеткі, і сталыя людзі. Выключнасць асобы сакратара пісьменнік паказвае і праз успрыняцце яго Прыборным. Вось Прыборны і Лясніцкі вяртаюцца на партызанскую базу пасля шэрагу сустрэч з насельніцтвам, у тым ліку і з Карпам Маеўскім:

"*Хвіліну яны прайшлі моўчкі. А потым Лясніцкі зноў звярнуўся да перарванай гутаркі і пачаў развіваць свой вялікі план разгортвання партызанскага руху. Хоць гутарка гэтая і вялася паміж імі амаль кожны дзень, Прыборны заўсёды слухаў з цікавасцю, бо кожны раз сакратар райкома выказваў усё новыя і новыя, цікавыя думкі. Прыборны захапляўся сваім камісарам і часта думаў: «Але ж і галава! Як ён хутка перастроіўся! Колькі прайшло таго часу, калі ён з такім вось энтузіязмам сеяў і будаваў. А сёння – такі салдат! Нібы ўсё жыццё толькі і займаўся тым, што ваяваў*"[117].

У рамане І.Шамякін не фарсіруе падзеі разгортвання партызанскай вайны. Гэта таксама адна са складаемых яго творчага поспеху, але і не акцэнтуе ўвагі на драматызме пачатковага этапу змагання, калі ўсё атрымлівалася далёка не так, як уяўлялася высокаму начальству і канкрэтным выканаўцам. А паколькі асноўныя падзеі ў творы звязаныя з сям'ёй Маеўскіх, то і маштабны паказ партызанскай барацьбы пачынаецца з прыходам іх у лес. Вясна 1942 года ў рамане – час інтэнсіўнай вучобы партызанаў па ўсіх накірунках: падрыўнікі, разведчыкі, санітары, радавыя байцы пад камандай камандзіраў рыхтуюцца да летніх маштабных баёў.

Пісьменнік паказвае, што супраціўленне ворагу не складвалася з адных толькі пераможных рэляцый. Было таксама многа розных драматычных сітуацый, якія ў значнай ступені ўплывалі на разгортванне партызанскай барацьбы. У лесе былі не толькі патрыёты, але і звычайныя дэзерціры, і проста жулікі, якія рабавалі народ. Але ў час стварэння рамана наўрад ці можна было пра гэта сказаць адкрыта. Таму пісьменнікі апынуліся перад неабходнасцю спісваць усё на нямецкія правакацыі, хоць, як вядома, яны таксама мелі месца на акупаванай тэрыторыі. Несумненна, І. Шамякіну расказвалі і пра такія выпадкі, калі пад выглядам партызанаў паяўляліся карныя акупацыйныя атрады. Празаіку, відаць, дастаткова было такога факта, каб разгарнуць дзеянне пры дапамозе вымыслу. Тое, што псеўдапартызанскі атрад пад кіраўніцтвам

[117] Шамякін, І. Глыбокая плынь. – С. 196.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

немца-каланіста з Украіны Ганса Гопкеля (праўда, зрабіўшы Гопкеля даўнім агентам абвера, пісьменнік выкарыстаў гатовы штамп) жорстка распраўляўся з моладдзю за адказ ісці у яго атрад, падаецца праўдзіва і пераканаўча.

Вось Павел Лясніцкі з Тацянай Маеўскай прыходзяць пасля сустрэч з камсамольцамі ў вёску Межы і даведваюцца пра жахлівую расправу з моладдзю. Гэта родная вёска камісара, таму да яго ўсе адносяцца з асаблівым даверам, што дазволіла цётцы Парасцы расказаць прыбыўшым пра ўсё, што здарылася:

"*Гора наша, гора, – яна пакачала галавой, выцерла рогам хусткі вочы. – Учора пад вечар прыехаў у вёску атрад… Жаўна нейкі…<…> прыехалі, сабралі ўсю вёску на плошчу, перад сельсаветам… і чытае загад, нібыта табою, Павел, падпісаны. Загадваеш ты мабілізаваць усіх маладых хлопцаў у партызаны, а тых, хто не хоча ісці, схаваецца, запісваць у дэзерціры і расстрэльваць іх на месцы… Вось так…*"[118]. Жанчына расказвае ўсе падрабязнасці расправы з моладдзю, якая не паверыла, што гэта сапраўдныя партызаны. Параска выказвае думку і пра паліцэйскі атрад. У гэтым перакананні яе падтрымлівае камісар партызанскага атрада. Вядома, жанчыне хочацца верыць, што такое не могуць зрабіць народныя мсціўцы. Аднак гэта паказана празмерна публіцыстычна, плакатна. Натуральна, што і камісар не верыць, што фактычны разбой мог зрабіць камандзір, якога ён асабіста ведаў як смелага байца. Усё ж пісьменнік, каб пазбавіцца празмернай прамалінейнасці, крыху парушае логіку развіцця падзей і падпускае таямнічасці. Раптам высвятляецца, што Жаўна не быў акружэнцам, прафесійным ваенным, а да вайны працаваў у Чарнігаве буфетчыкам на чыгуначным вакзале. Але і гэта ўрэшце вырашаецца як прыкрае непаразуменне. Сустрэча камісара з партызанам, які добра ведаў Жаўну па даваеннай сумеснай працы, дазваляе зняць усе сумненні. Бяскрыўднае жаданне былога станцыйнага служачага выдаць сябе за афіцэра-кавалерыста, каб узвысіцца ў вачах падначаленых, лёгка даруецца вышэйшым партызанскім кіраўніцтвам.

А вось разгром варожага ўтварэння пісьмекннік паказвае эфектна. Тут ён ужо выкарыстоўвае прыём, уласцівы дэдэктыўна-прыгодніцкай літаратуры. Праўда, і ў гэтым выпадку ён імкнуўся ісці за гістарычнай праўдай, прнамсі, з'яўляўся амаль адкрывальнікам, паколькі ў першыя пасляваенныя гады толькі зрэдку ўпаміналася пра тое, што савецкія пілоты, як правіла, выкідвалі групы парашутыстаў далёка ад вызнача-

[118] Шамякін, І. Глыбокая плынь. – С. 287.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

нага месца. Таму ўпаўне дапускаецца ў дадзеным выпадку: ствараецца амаль трывожна-праблемная сітуацыя, калі пасля паведамлення штурмана пра наяўнасць двух сігнальных агнёў, Буйскі прымае рашэнне скакаць паміж імі. Яму пашанцавала: адразу трапіў да партызанаў. І ў той жа час такая сітуацыя шмат у чым актывізуе дзеянне, прымушае сачыць за падзеямі: нечаканы выхад да варожага атрада Мікалая Маеўскага мог каштаваць яму жыцця, паколькі ён не ведаў пра існаванне правакацыйнага фшысцкага атрада. Але чытач ужо ведае пра рашэнне партызанскага атрада ўнядрыць у псеўдапартызанскі атрад выхаванца Адрэя Буйскага Пятра Майбараду. Таму шчаслівае выратаванне Маеўскага чытач поўнасцю звязвае з вынаходлівасцю гэтага дасціпнага хлопца. Праўда, і знішчэнне шматвопытнага абвераўца Гопкеля, як яго характарызуе пісьменнік, уваход у давер да партызанаў у гэтым эпізодзе Мацея Куляша выглядае наіўным. Вельмі ўжо недацёпамі, абмежаванымі істотамі паказаны гэтыя варожыя элементы, якіх вельмі хутка пераконвае Пятро Майбарада, што Візэнер менавіта яму даручае камандаваць групай. Нарэшце ён выводзіць псеўдапартызан пад удары сапраўднага камандзіра партызанскага атрада Жаўны. Вораг пакараны. Але такія эпізоды выглядаюць у рамане як знарочыстая гераізацыя.

Пісьменнік разумеў, што разгортванне маштабнай партызанскай барацьбы шмат у чым залежыць ад ступені еднасці і ўзаемаразумення злучэнняў народных мсціўцаў і вясковых жыхароў. Для часу напісання рамана такі падыход быў наватарскім, паколькі яшчэ моцна адчувальным быў рэцыдыў погляду афіцыйнай улады на насельніцтва акупаваных тэрыторый як на патэнцыяльных здраднікаў. Таму канцэнтрацыя ўвагі на праблемах узаемаадносін паміж партызанамі і жыхарамі вёсак і мястэчкаў была ўжо і праявай грамадзянскай смеласці. Канцэпцыю такога бачання праблемы пісьменнік імкнецца перадаць праз шматлікія размовы Лясніцкага з Прыборным. У першых выданнях рамана маналогі Лясніцкага былі расцягнутыя, шматслоўныя. У наступных І.Шамякін многае скараціў, нешта ўдакладніў, але засталася ў іх галоўная ідэя: без падтрымкі вёскі разгарнуць змаганне ў шырокім маштабе было немагчыма. Вось што, напрыклад, гаворыць Лясніцкі ў сувязі з гэтым праз некалькі месяцаў ад пачатку вайны, вяртаючыся на базу пасля наведвання вёсак з нагоды двацаць чацвёртай гадавіны рэвалюцыі: "*Сённяшнімі налётамі на вёскі, мітынгамі і сустрэчамі з Маеўскім, Раманавым, Васіленкам, я думаю, мы скончылі першы этап сваёй работы – падрыхтавалі ўмовы для разгортвання сапраўднай вай-*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ны. Трэба каб галоўнае папаўненне атрадаў складалі не абкружэнцы, не адны тыя, хто мае асабістую крыўду на немцаў, а свечасова падрыхтаваная маса калгаснікаў і рабочых"[119].

Праўда, у гэтай частцы рамана гаворка вядзецца толькі пра папаўненне атрадаў баявой сілай, а тое, што вяскоўцы павінны падтрымліваць змагароў, разумеецца як звычайная справа, быццам жыццёвы абавязак кожнага. Нават і пазней, калі ўжо сфармавалася брыгада народных мсціўцаў, пашырылася партызанская зона, а зімой лясныя байцы кватаравалі ў вёсках, пісьменнік ні разу не засяроджвае ўвагу на тым, як сялянам удаецца пракарміць, апрануць такую колькасць людзей. У духу таго часу падобныя праблемы не браліся пад увагу, іх быццам не існавала. Пазней, у іншых творах, у якіх закраналіся пытанні партызанскай барацьбы, І. Шамякін больш увагі надаваў працы гаспадарнікаў, тым, хто і забяспечваў бытавыя патрэбы.

Варта адзначыць яшчэ адну асаблівасць рамана: пісьменнік амаль не паказвае разгорнутых батальных сцэн партызанскай вайны. Гэта, відаць, абумоўлена адсутнасцю ўласнага вопыту. Як ужо адзначалася, асноўны матэрыял браў з роспаведаў старшыні сельсавета, а таксама іншых жыхароў рэгіёна. Аднак нават свежыя ўспаміны пра нядаўна перажытае, падрабязныя расказы пра гераічныя ўдары па ворагу не давалі магчымасці дакладна перадаць усе дэталі, месца кожнага з герояў у шматлікіх баях. У такіх выпадках пісьменнік звяртаецца да публіцыстычных сродкаў выяўлення. Так атрымалася і з раскрыццём вядомых падзей па падтрымцы беларускімі партызанамі вядомага рэйду Каўпака па тылах нямецкіх войск, калі ўкраінскія народныя фарміраванні дайшлі аж да Усходняй Прусіі.

"*Быў зусім звычайны дзень, але для партызан ён быў незвычайны, бо ў іх суровым цяжкім жыцці дзён такіх было нямнога. У гэты дзень толькі некалькі разведчыкаў былі на заданні. Астатнія ўсе адпачывалі і адпчывалі ўжо трэці дзень. Гэта быў самы доўгі адпачынак. Людзі заслужылі яго. Трохі не месяц брыгада знаходзілася ў бесперапынных баях і паходах і сілы яе былі напружаны да крайнасці. Асабліва цяжкімі былі апошнія баі, калі брыгада прыкрывала пераправу рэйдавага злучэння ўкраінскіх партызан. Гітлераўцы любымі сіламі намагаліся сарваць пераправу, і дняпроўцы прынялі на сябе галоўны ўдар, уласнымі грудзьмі прыкрылі ўкраінскіх братоў. Шмат мужных байцоў не далічылі ў брыгадзе пасля гэтых баёў. Шмат хто быў ранены, захварэў, астатнія былі знясілены, зморaны. А таму і на трэці дзень у лагеры было звонку*

[119] Шамякін, І. Глыбокая плынь. – С. 196.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

пуста і ціха. Людзі спалі. Толькі паважна хадзілі вартавыя, ды каля буданоў шпіталю мітусіліся санітары"[120].

Такой мінорнай сцэнай у рамане як бы завяршаўся даволі працяглы перыяд трагічнай вайны, вораг атрымаў сакрушальнае паражэнне пад Сталінградам, а партызаны Гомельшчыны ўваходзілі ў апошні год змагання, хоць пра гэта не ведалі, але шчыра верылі, што хутка ўсё скончыцца. І таму гістарычны факт пісьменнік падае пафасна, пры вялікім сплаве ўмоўнасці і жыццёвай верагоднасці. Найперш узрушае ўсіх прыход у лагер старога рыбака Лаўрэна, які не раз аказваў дапамогу партызанам, у тым ліку персанальна Ляснiцкаму. Ён з'яўляецца свайго роду хадаком ад народа, павінен з першых крыніц даведацца пра вынікі бітвы пад Сталінградам. Пісьменніку хацелася выразна перадаць патрыятычныя настроі насельніцтва на акупаваных тэрыторых, таму яго быццам не цікавіць, адкуль у людзей такія чуткі, калі ўлічыць і тое, што немцы на пачатку старанна замоўчвалі сваё паражэнне. Тут І. Шамякін падкрэсліваў, што народ не можа памыляцца. Прытым гэта і сапраўды неўзабаве пацвердзілася зводкай Савінформбюро.

Многія мясціны ў рамане проста ўрачыстыя. Пісьменнік быццам бы забывае на некаторы час на злыя абставіны вайны. Ён меў на мэце сцвердзіць ісціну, што Жыццё заўсёды мацней за Смерць, хоць апошняя ў экстрэмальных умовах барацьбы магла спатыкацца на кожным кроку. Таму ў рамане шматлікія старонкі прысвечаны каханню, вечным парыванням у будучыню. У асноўным гэта звязана з галоўнымі героямі рамана. Пісьменнік стварае некалькі такіх сюжэтных ліній, у якіх героі вымушаны нейкім чынам адстойваць свае пачуцці, альбо перажываць ад невядомасці. Гэта датычыцца перш за ўсё Тацяны Маеўскай, якой прыходзіцца іграць ролю маладой маці. У такім плане пісьменнік паслядоўны. Дзяўчыне, нядаўняй студэнтцы толькі дзевятнаццаць гадоў, яна яшчэ перад выбарам, поўная рамантычных парыванняў, у тым ліку і ў чаканні сапраўднага шчырага кахання. З першых старонак гераіня прыцягвае ўвагу чытача сваёй неардынарнасцю. У грамадскім значэнні яе асобы І. Шамякін не дапускае ніякіх сумненняў: як і павінна быць выхаванцы ленінскага камсамолу, яна дзейнічае без роздуму, на адным юначым парыванні, відаць, нават не ўяўляючы пакуль што, якія наступствы можа мець яе высакародны ўчынак. Першыя прыступы шкадавання наступяць неўзабаве, але не таму, што такім чынам яна як бы перакрыла ўсе шляхі да ўласнага дзявочага і сямейнага шчасця. Не.

[120] Шамякін, І. Глыбокая плынь. – С. 392.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Як і павінна сябе паводзіць патрыётка, Тацяна міжвольна пашкадавала, што прыёмны яе сын стаў перашкодай у яе будучай партызанскай барацьбе, у немагчымасці зараз жа пайсці у лес, да народных мсціўцаў, пры першай сустрэчы з імі ў роднай вёсцы. Але і тут адразу ж сябе ушчувае, усведамляючы, што яна ў адказе за будучыню гэтага хлопчыка:

"*Першы раз яна пашкадавала аб тым, што ў яе дзіця. «Не было б яго, даўноб я была там з імі», – думала яна. Але глянуўшы на маленькага Віцю, які ляжаў у калысцы і ручкамі дамагаўся злавіць падвешаны на нітцы чырвоны шарык, яна пяшчотна ўсміхалася і адганяла гэтую думку. «Не, я ніколі не кіну яго... Ніколі...»*"[121].

Спатканне з Жэнькам Лубянам нагадала Тацяне школьныя гады. "*Калісьці (ёй здавалася, што гэта было вельмі даўно) яны разам вучыліся ў сямігодцы, разам удзельнічалі ў драматычным гуртку, і ва ўсіх п'есах, якія яны ставілі, ім даводзілася іграць жаніха і нявесту. Але яна, "нявеста", мела не вельмі шчырыя пачуцці да "жаніха". Жэня быў вялікі свавольнік і часта лаяўся з дзяўчатамі. Тацяна не любіла тады яго за "дурны характар", але цяпер гэта ўспамінала з прыязнасцю, сагравaючыся цеплынёй успамінаў*"[122].

Гэта ўжо была першая праява пакуль што не ўсвядомленых пачуццяў. Пісьменнік не спяшаецца падштурхоўваць герояў да ўзаемнасці, хоць крыху з іроніяй падкрэслівае, што ад сустрэч з гэтым хлопцам у дзяўчыны абуджаецца яе ранейшая гарэзлівасць.

З чарговай сустрэчы з маладым партызанам Тацяна ўжо інакш да яго адносіцца, хоць яшчэ проста захапляецца яго зухаватасцю.

"*Яны пайшлі ў глыб лесу. Яна – па сцежцы, а ён на лыжах – побач. Яна з цікавасцю глядзела збоку на прыгожы твар з дзіўнымі вусікамі і прагна лавіла кожнае слова з таго, што Жэнька гаварыў*"[123].

Няпэўнасць у адносінах Тацяны і Яўгена доўгі час была трывалай. Пісьменнік быццам спецыяльна інтрыгуе чытача такой сітуацыяй, магчыма, каб яшчэ раз падкрэсліць сумленнасць партызана, неўзабаве камсамольскага важака ўсёй партызанскай зоны. Ён верыць, што Маеўская замужам, муж на фронце, таму ён не мае права праяўляць свае пачуцці, хоць чытач даўно ведае сапраўдны стан рэчаў. Гэтым фактам пісьменнік яшчэ раз хоча звярнуць увагу на высакароднасць юнака. Толькі значна пазней, калі яе сяброўка Насця выходзіць замуж за партызанскага разведчыка

[121] Шамякін, І. Глыбокая плынь. – С. 154.
[122] Тамсама.
[123] Тамсама. – С. 211.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Андрэя Буйскага, Тацяна прызнаецца Яўгену: ніколі не была замужам і дзіця гэта не яе, ды пра гэта ўсе даўно ведаюць у партызанскім атрадзе.

Так паступова першапачатковая захопленасць Тацяны Маеўскай рамантызаванымі подзвігамі Жэнькі Лубяна перарастае ў каханне, якое аказваецца ўзаемным. Для большай інтрыгі І. Шамякін нават намякае на магчымасць любоўнага трохкутніка, бо Тацяна Маеўская падабаецца і камісару Лясніцкаму. Але аўтар на гэтым не засяроджвае ўвагу, хіба толькі дапускае лёгкі жарт Прыборнага, што камісар упусціў сваё шчасце.

Відавочна, што пісьменнік вытрымлівае ўсе ўстаноўкі на гераізацыю, мэтанакіраванасць сваіх галоўных маладых герояў, паколькі ідзе яшчэ вайна, неабходна перамагчы канчаткова ворага. Вось пасля ўручэння ўзнагарод, прытым у роднай вёсцы, радасны Карп Маеўскі выказвае і свой бацькоўскі клопат:

"*Трэба ж рыхтавацца. Ідзіце вы сталы прынясіце ад суседзяў.*

Але калі яны падняліся і рушылі да дзвярэй, Карп спыніў іх, падышоў, узяў за рукі.

– А можа, дзеці, заадно і вяселле ваша, а? Няхай ужо радасць за радасцю.

Тацяна ўспыхнула, апусціла вочы.

– Што вы, тата...

– А ты не саромейся, дачка.

– Не, дзядзька Карп. Мы дамовіліся – пасля перамогі, – проста і сур'ёзна адказаў Жэнька. – Толькі пасля перамогі"[124].

Што наперадзе чакала маладых людзей, і перш за ўсё Лубяна, чытач мог сабе ўявіць, бо Тацяна з малым дзіцем нават па жаданні не магла апынуцца ў войску пасля вызвалення. Але пісьменнік вытрымлівае прапарцыянальнасць, дазволіўшы жаніцца толькі легендарнаму разведчыку Буйскаму і, відаць, толькі таму, што у адпаведнасці з развіццём сюжэта ён павінен быў загінуць.

Пэўнай рамантыкай ахутаныя і адносіны Мікалая Маеўскага і Алены Зайчук. Зрэшты, пра былую закаханасць гэтых герояў І. Шамякін зазначае толькі пасля таго, як Мікола паявіўся у партызанскім лагеры. Гісторыя іхняга кахання перадаецца сцісла праз успаміны Алены Зайчук у першы момант праз няўласна-простую мову, калі яна пачула і пазнала голас Міколы Маеўскага. Каханне тое пачалося яшчэ ў дзевятым класе, расквітнела ў час іх студэнцтва, хоць вучыліся яны ў аддаленых гарадах.

[124] Шамякін, І. Глыбокая плынь. – С. 402.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

“*Чатыры гады жылі пісьмамі і чаканнем летніх канікул, радасных сустрэч у Арэхаўцы. Апошнія канікулы былі самымі шчаслівымі, светлымі днямі жыцця*”[125].

Але як у большасці здараецца ў жыцці іхняму каханню выпалі немалыя выпрабаванні. Воляй лёсу пасля заканчэння інстытутаў яны апынуліся яшчэ далей адзін ад аднаго. І пачуцці іх паступова згасаюць. Пісьменнік не спыняецца на тым, хто ў гэтым вінаваты, бо пакуль гэты ўспамін толькі дзяўчыны. З яе разважанняў можна зразумець, што першапрычынай усё ж была яна:

“*Яна не зразумела яго захаплення дзівоснай прыродай Урала, начлегамі ў лясных гушчарах, паляваннем. У другім пісьме ён цёпла напісаў аб дзяўчыне-геолагу з іх партыі і тут жа паскардзіўся, што ледзь-ледзь успамінае яе, Аленін, твар, голас, рухі. Яна паказала гэтае пісьмо сваім лепшым сяброўкам, і яны зрабілі страшны для яе вывад*”[126]. Алена рашае чакаць асабістай сустрэчы, каб высветліць адносіны, але ўзніклая рэўнасць паступова змяняла яе першае рашэнне.

“*Спачатку мімаволі, а потым знарок яна пачала пісаць яму суха і коратка – каб ён зразумеў яе роспач, боль сэрца. Але ён не зразумеў ці не хацеў зразумець. Пакрыўджаная і абражаная, яна не адказала на ално з яго пісьмаў, якое здалося ёй асабліва абыякавым. Потым – на другое... Перапіска спынілася. Тры гады яны не бачыліся*”[127].

Ад гэтай першай сустрэчы пісьменнік быццам забывае пра сваіх герояў. Алена працуе галоўным урачом у партызанскім шпіталі, Мікола ўвесь заняты стратэгіяй партызанскай барацьбы, паколькі з’яўляецца начальнікам штаба партызанскай брыгады. І толькі амаль у фінале рамана І. Шамякін урэшце вырашае і гэтае крыху заблытанае пытанне ўзаемаадносінаў Алены і Міколы.

Справа ў тым, што І. Шамякін з першых жа пісьменніцкіх крокаў адразу ж стаў на пазіцыі закручвання сюжэтных рэалій. Застаўся ён верным сваім прыхільнасцям і тут. Менавіта цяжкае раненне Міколы як бы адкідвае ўсе ранейшыя крыўды, якія на гэтым узроўні ўжо здаюцца дробязнымі. Драматычная сітуацыя, калі Алена павінна зрабіць нялёгкі для сябе выбар: ратаваць Міколу, але зрабіць яго ўласнымі рукамі інвалідам, ці змірыцца са стратай любага чалавека. Тут пісьменнік зноў наладжвае для сваіх герояў сур’ёзныя выпрабаванні. Усё ж высвят-

[125] Шамякін, І. Глыбокая плынь. – С. 321.
[126] Тамсама. – С. 321.
[127] Тамсама.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ляецца, што Мікалай застаецца для яе дарагім чалавекам, а сустрэча ў трагічнай сітуацыі ярка абудзіла прыціхлыя пачуцці. У рамане ёсць спроба паказаць стан дзяўчыны, хоць і галоўнага ўрача партызанскай брыгады. Натуральна, што для яе такая аперацыя далася не лёгка, яна ўся ў трапяткім прадчуванні страчанасці ўсіх надзей, таму дапушчальнай з'яўляецца тая сумяціца думак, што мроіцца ў яе:

"*І адразу ж успаміны, думкі, даўнія мары закружыліся ў галаве завірухай.*

Так, была маладосць, вясёлая, шчаслівая, была радасць першага і адзінага кахання, боль разлукі, расчараванне, рэўнасць, пакуты, нечаканае з'яўленне яго, адзіная, бурная размова ў памятную навальнічную ноч, новыя пакуты амаль год. Усё гэта было і ўсё гэта мела права называцца маладосцю. І было ў апошні час яшчэ адно, самае дарагое – надзея. Яна адганяла яе, злавалася, але надзея не пакідала яе, ласкава глядзела ў вочы і шаптала: "Чакай, чакай... Ён яшчэ прыйдзе

І каб ён прыйшоў, як у тую ноч, магчыма, што яна ўсё даравала б яму. Усё магчыма... Але ён больш не прыходзіў"[128].

Тут пісьменнік спрабуе перадаць псіхалагічны стан узрушанай дзяўчыны, яе горкі боль ад страчанасці надзей.

"*Каля воза, схіліўшыся, стаяла Таццяна. Алена раптам пазайздросціла ёй. Няхай бы і яна была яго сястрой! Тады ўсё было б так проста і зразумела і не было б гэтых пакут. Ну, было б шкада яго, бязногага, але ўсё адно ён застаўся б для яе любімым братам А так... Што так?.. А так... раптам ён стане чужым, далёкім, непатрэбным...*"[129]. Але разам з тым І. Шамякін ні на хвіліну не забывае, што перад намі камсамольцы, загартаваныя жорсткай сістэмай трыццатых. Таму часовая слабасць, нават разгубленасць не павінны перамагаць волю барацьбітоў.

"*Чужы? Чаму чужы? Чаму далёкі? – сурова спытала яна ў самае сябе. – Не! Цяпер ён зноў родны, блізкі... Цяпер ён мой, толькі мой. Цяпер я сама пайду да яго. Як гэта ён сказаў? Нельга жыць без галавы, а без ног жыць можна. Так, мы будзем жыць, родны мой, любы, будзем...*"[130].

Сапраўднай рамантыкай ахутаны адносіны Насці Зайчук да легендарнага партызанскага разведчыка Андрэя Буйскага, таму яе захапленне на пачатку не асэнсаванае, паколькі яна быццам не заўважае грозных

[128] Шамякін, І. Глыбокая плынь. – С. 418.
[129] Тамсама.
[130] Тамсама.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

абставін, аддаючыся поўнасцю свайму пачуццю. Дзяўчына выяўляецца чыста ў рамантычным святле. Што ж, гэта можа быць зразумелым: яна толькі ўваходзіць у пару юнацтва. Але і тут пісьменнік імкнецца прытрымлівацца жыццёвай праўды. Наведванні Насці ў засакрэчаную зямлянку Буйскага не адрузу яго закранулі. Толькі праз некаторы час ён зразумеў чысты парыў закаханай дзяўчыны, але вывады робіць чыста рацыянальныя. "*З якой мэтай прыходілі дзяўчаты?" – задумаўся ён і пачаў аналізаваць усе дэталі. І раптам успаміны спыніліся на вачах Насці, на яе прамяністым позірку, і як яна сарамліва пачырванела, спаткаўшыся з ягоным позіркам"*.[131] Далей разважанні знакамітага разведчыка працягваюцца ў адпаведным ключы. У яго, вядома, няма закаханасці, але ёсць цвярозае разуменне сітуацыі. Ідзе вайна, у любы момант ён можв загінуць, а што застанецца пасля яго. "*За час вайны ён ні разу не задумваўся аб гэтым. Але часам адчуваў, што ў яго жыцці чагосьці не хапае. І вось нечакана зразумеў – чаго… "Так, вельмі добра мець зараз сына або дачку… Магу загінуць… Што застанецца пасля мяне?" – з жыццёвай прастатой і суровасцю падумаў ён і, адкінуўшы нагой кнігі, выскачыў з цёмнай зямлянкі*". І далей, каб не дапусціць хоць нейкіх сумненняў у высакароднасці сваіх герояў, пісьменнік рэзюмуе: "…*Увечары іх бачылі разам, вясёлых і шчаслівых. І ўвесь лагер загаварыў аб іх каханні, як аб нечым незвычайным*"[132].

Такая сітуацыя давала магчымасць пісьменніку распавесці гаворку і пра драматычныя сітуацыі, а таксама пастянна даваць чытачу адчуване нязломнасці жыцця, барацьбы за сваю волю, за права жыць самастойна і незалежна, але разгорнута гэтага не мог выявіць, паколькі жыў сваім часам, і ў сваім часе.

Тут відавочная рамантызацыя звычайнага жыццёвага факту, а разам з тым і гераічнага подзвігу. У гэтым эпізодзе усё ўзаемазвязана, падпарадкоўваецца пісьменніцкай логіцы. У напружанасці такой барацьбы чыста сямейнае шчасце бачыцца ненадзейным. Ізноў жа трэба кантаставаць, што маладому на той час пісьменніку надзвычай дакладна ўдалося перадаць вось гэтую ілюзорнасць зорнага шчасця. Але жыццё не спыняецца. Сапраўды, шчаслівыя дні ў Насці даволі скорацечныя. Не прайшло і года, калі ўсё раптоўна, як гэта і бывае на вайне, трагічна перамянілася. Выконваючы заданне па падрыхтоўцы прарыву блакады партызанскай брыгады, Андрэй Буйскі гераічна гіне. Гэтая сапраўды

[131] Шамякін, І. Глыбокая плынь. – С. 344.
[132] Тамсама.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

трагічная падзея ў рамане знаходзіць ажно тры самастойныя сюжэтныя лініі, у многім зноў сімвалічныя: галоўны праслаўлены разведчык гіне ў імя выратавання вялікай колькасці людзей, але ў гэтую ж ноч шчасліва нараджаецца яго нашчадак, што якраз і сцвярджае неўміручасць народа наогул, далей сцвярджаецца ідэя пра немінучасць пакарання здраднікам (пра гэта неабходна сказаць асобна) і, урэшце, пра праніклівасць і ўсёвідушчасць партыйнага кіраўніцтва. І трэба прызнаць, што пісьменніку ў гэтай сітуацыі проста па-мастацку ўдалося ўвязаць чыста бытавое з гераічным, а таксама з сямейна-інтымным. Але справа ў тым, што гэта наогул кладзецца ў агульную кацэпцыю пісьменніка, асноўным у якой, як ужо адзначалася, з'яўляецца падвышэнне сваіх герояў. Ды трэба згадзіцца, што гэтыя сардэчныя справы выпісаны ў рамане з вялікай замілаванасцю: яны пацвярджаюць высакароднасць закаханых, якія і ў цяжкіх, а то і невыносных умовах жыцця застаюцца людзьмі высокай пробы, заўсёды шчырымі і вернымі ў пачуццях. Такое бачыцца як вялікае свята сярод жорсткіх рэалій вайны.

Праўда, святочнасць часам выглядае надуманай, як, напрыклад, эпізоды, калі Насця Зайчук, адпраўляючыся ў госці да Андрэя ў яго засакрэчаную зямлянку апранае шоўкавую сукенку і надзяе свае найлепшыя туфлі. Такое больш нагадвае ўмовы санаторнага адпачынку, а не суровыя абставіны ляснога быту.

У святле рамантычнай прыўзнятасці паказваюцца і некаторыя побытавыя рэаліі, асабліва ў тыя моманты, калі пасля пераможных баёў партызанам ўручаюцца ўзнагароды. Значнасць гэтай з'явы і ў тым, што многія атрымліваюць іх у роднай вёсцы. А гэта істотна ўзвышае і саміх герояў, прыўзнімае ў вачах аднавяскоўцаў іхнюю значнасць. Атрымалі ўзнагароды і Маеўскія. Сваю ўрачыстасць яны адзначаюць у хаце пляменніцы, адкуль ўсе так паспешліва павінны былі выбрацца ў лес. Гэта таксама павінна было пацвярджаць, што гаспадарамі ў мясцовасці, раёне з'яўляюцца народныя мсціўцы. Але свята з'яўляецца толькі невялікім эпізодам, бо пісьменнік імкнецца засяродзіць увагу на іншым, менавіта на ваенных рэаліях. А яны былі дастаткова драматычныя.

У публіцыстычным адступленні ў трэцяй частцы І. Шамякін тлумачыць абставіны партызанскай барацьбы вясной-летам сорак трэцяга года, калі немцам неабходна было абясшкодзіць свае тылавыя камунікацыі перад плануемым летнім наступленнем. Ён падрабязна спыняецца менавіта на дзеяннях карнікаў, на іхняй падрыхтоўцы да вынішчальнай экспедыцыі, блакады партызанскай зоны; стварае пар-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

трэт хітрага і вераломнага генерала фон Адлера. “*Ён меў вялікі ваенны вопыт і сярод генералітэта лічыўся лепшым стратэгам і тактыкам па барацьбе з партызанамі. Ён двойчы камандаваў карнымі экспедыцыямі супраць украінскіх партызан у васемнаццатым годзе, хоць аб гэтых сваіх паходах генерал успамінаў не вельмі. Ён ваяваў у Іспаніі, у Більбао, дзе вайна ў гарах таксама нагадвала партызанскую. Яму ўдалося правесці ўдалую аперацыю супраць югаслаўскіх партызан. За гэтую аперацыю ён атрымаў жалезны крыж і падзяку фюрэра*”[133].

Сур’ёзнасць намераў акупантаў выражалася і ў тым, што на барацьбу з партызанамі былі накіраваныя рэгулярныя войскі. Пісьменніку ўдалося паказаць усю трагедыйнасць сітуацыі, калі брыгада павінна была адступаць перад пераўзыходзячымі сіламі акупантаў, несці вялікія страты.

“*Знясіленая цяжкімі баямі, брыгада не вытрымала націску і пачала адступаць*”[134].

Прыкрываць адступленне асноўных сіл застаецца невялікая група начале з начальнікам штаба партызанскай брыгады Мікалаем Маеўскім. З пункту погляду звычайнай логікі, ар’ергард мог узначаліць любы камандзір узвода ці ў важнейшым выпадку камандзір атрада. Дарэчы, у раманах іншых пісьменнікаў мы гэта і назіраем (Мележ, Кулакоўскі). Але пісьменніку неабходна было стварыць найбольш драматычную сітуацыю, а ў некаторай ступені і праверыць трываласць пачуццяў закаханых, а, можа, правільней, аднавіць напаўзабытае ў новых умовах. Ды галоўнае было ўсё ж у баявых падзеях. Калі пайшлі ў атаку танкі, Маеўскі, убачыўшы разгубленасць сваіх маладых паплечнікаў, рашуча загадвае рабіць звязкі гранат, накіроўвае партызанаў у засады, а сам застаецца ў цэнтры, куды і будуць імкнуцца фашысты. Эпізод гэты напоўнены сапраўдным драматызмам. У непрацяглым баі гінуць маладыя людзі, амаль падлеткі, смерць іхнюю на сваё сумленне бярэ Мікалай, хоць пісьменнік і заўважае, што тут не хапіла самай звычайнай падрыхтоўкі да барацьбы з танкамі. Таксама ў нейкай ступені тактычнае ўпушчэнне партызанскага кіраўніцтва, якое за пару гадоў прывыкла ўжо ваяваць у асноўным з паліцэйскімі гарнізонамі. Развязка трагічная: загінула большасць групы прыкрыцця. Паядынак завяршаецца тым, што ўрэшце ў атаку на танкі ідзе сам кіраўнік ар’ергарду:

“*Танк набліжаўся. Да яго заставаліся лічаныя метры. Марудзіць нельга было ні хвіліны, і Мікалай таксама падхапіўся на ўвесь рост,*

[133] Шамякін, І. Глыбокая плынь. – С. 403.
[134] Тамсама. – С. 394.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

забыўшыся на тое, што трэба нахіліцца, скочыў да танка і кінуў адну, а потым і другую звязку гранат. Перад вачыма бліснула полымя. Нешта гарачае, як струмень вару, пляснула ў твар, балюча ўдарыла па нагах. Ён упаў, адчуваючы, што ляціць у чорную бездань"[135].

Як і павінна было выявіцца ў творы ў час яго напісання, Мікалай Маеўскі не здаецца нават у самай трагічнай сітуацыі, ён упэўнены, што барацьба за сваё жыццё з'яўляецца справай дзяржаўнай, а каб быць дастойным яе сынам, ён павінен змагацца. Не здавацца – гэта таксама было сімвалам савецкай моладзі. Тут, вядома, І.Шамякін не рабіў вялікага адкрыцця: перад вачамі моладзі быў літаратурны ўзор – вобраз Паўкі Карчагіна. Гэта надавала сілы ў змаганні са Смерцю ў час адступлення, і ўжо ў сямейным лагеры, калі надышла пара выбару перад складанай хірургічнай аперацыяй, у выніку якой ён станавіўся інвалідам, ці здацца на волю лёсу, Мікалай выбірае першае. Так у рамане цесна пераплятаецца лёгкая рамантызацыя подзвігу з рэальнымі трагедыямі вайны.

Урэшце брыгаду карнікі зацiснулі на невялікім плацдарме каля Дняпра. У такой, здавалася б, безвыходнай сітуацыі партызаны не губляюць развагі, не паддаюцца паніцы, вераць у празорлівасць сваіх камандзіраў. І яны ўрэшце вырываюцца з блакады дзякуючы гераічнаму ўчынку Андрэя Буйскага, які ўзрывае нямецкі штаб разам з усімі камандзірамі; праўда, праз здраду Куляша, Андрэй гіне і сам. Потым у брыгады будуць яшчэ пераможныя баі, аж да сустрэчы з савецкімі войскамі.

І ў такіх сітуацыях пісьменнік не абыходзіўся без падкрэслівання выключнасці некаторых подзвігаў. Так паказаны Жэня Лубян у эпізодзе, калі эсэсаўскі батальён нападае на амаль безабаронны партызанскі лагер, усё з-за віжоўства таго ж Куляша. Каб папярэдзіць ахову лагера, Лубян на матацыкле прарываецца праз самы цэнтр карных войск, здзяйсняе цуды гераізму як сапраўдны казачны асілак, нанёсшы ворагу значныя страты. Падобную сітуацыю згадвае і Антанюк у рамане "Снежныя зімы", але там пісьменнік драматычную сітуацыю паказвае значна рэалістычней. Праўдзівасць ёсць і ў подзвігу Буйскага: упаўне разведчык мог пранікнуць у штаб, але пададзена пры гэтым усё ў празмерным любаванні героем.

Раман "Глыбокая плынь" завяршаецца поўным вызваленнем раёна ад акупантаў, вяртаннем Маеўскіх на сваю спаленую сядзібу. Фразай Карпа Маеўскага "*Ну, дзеці, будзем будавацца*" пісьменнік, па сутнасці, адкрываў новую старонку ў жыцці краю, нібы прадбачваючы пасляваеннае яго аднаўленне.

[135] Шамякін, І. Глыбокая плынь. – С. 410.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

АНТАНЮК, ЯГО АДНАДУМЦЫ І ПРАЦІЎНІКІ

Раман І. Шамякіна “Снежныя зімы”

Гэты раман І. Шамякіна выклікаў даволі вялікую цікавасць і ў чытачоў, і літаратурных крытыкаў. Такая надзвычайная рэакцыя можа быць вытлумачана, відаць, тым, што перад гэтым выйшаў у пэўнай ступені дыскусійны яго раман “Сэрца на далоні”. Чытачы чакалі нешта накшталт прадаўжэння, але пісьменнік, як і заўсёды, адразу павёў свайго чытача ў іншую сферу, хаця спосаб вырашэння канфліктаў застаўся ранейшым. Тут можна бачыць тую ж мастацкую канструкцыю: і сённяшні герой высвятляе адносіны са сваімі бліжэйшымі сябрамі па партызанскай барацьбе на трываласць душ у новых умовах.

Раман пачынаецца карцінамі бытавога і сімвалічнага значэння: загадчык аддзела Міністэрства сельскай гаспадаркі, змешчаны з пасады, па яго разуменні, з чыста кан’юктурных пазіцый, таму што ён не згаджаецца са скараспелымі рэформамі ў калгаснай вытворчасці, выступае за традыцыйны травападзел, які быў найбольш характэрны для Беларусі, адчувае сябе пакрыўджаным, хоць у гэтым не прызнаецца і самому сабе. Каб душэўна супакоіцца, герой адпраўляецца ў пушчу, нават не на паляванне, а каб адчуць у нейкай ступені сваю свабоду і незалежнасць, якую даваў яму лес у час партызанства. Тут адразу ўсплывае час напісання твора і той ціхі палітычны пераварот, што быў здзейснены старой партыйнай гвардыяй. Першага сакратара ЦК змясцілі толькі за тое, што ён, быццам бы, занядбаў народны спосаб гаспадарання, а захапіўся нейкімі экзатычнымі культурамі, а, прасцей, кукурузай.

Але гэта толькі знешні антураж. Шамякіна ўласна і не цікавіў лёс Хрушчова, таму што ў адпаведнасці са сваёй партыйнай дысцыплінай, ён інакш і не мог мысліць. Але заўсёды трэба помніць пра яго як адміністратара і мастака. У многіх месцах мастак перамагае, але застаецца шмат старонак, дзе ў наяўнасці ідэалагізацыя, публіцыстычная дэкларацыя вялікіх намераў.

Аднак, вернемся да пачатку. Задума рамана выношвалася, як прызнаваўся пісьменнік, даволі доўга. Спачатку намерваўся напісаць яшчэ адзін раман пра народнае змаганне з фашызмам, але турбавалі і сучасныя тэмы, бо, мусіць, гэта былі і вызначальныя рысы таленту. Таму вырашыў паўтарыць апрабаваную сюжэтна-кампазіцыйную знаходку ў час працы над раманам “Сэрца на далоні” – сумясціць два сюжэты. Такім чынам, можна было паказаць сучаснасць праз прызму былога,

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

акрэсліць шляхі змены пазіцый і вобліку саміх удзельнікаў тых падзеяў. Але ў новым творы ён пайшоў далей, дзе ваенныя падзеі не галоўная мэта мастацкага даследавання, а толькі спосаб пацвярджэння жыццёвай пазіцыі галоўнага героя. Ды ўласна партызанскіх сцэн у “Снежных зімах” мала. У асноўным яны падаюцца ва ўспамінах Івана Васільевіча Антанюка, у той час, калі ён знаходзіцца ў высоканапружаным эмацыйным стане, калі яму прыходзіцца прымаць важныя для сябе рашэнні. Ён звярае свае паводзіны, сваіх сяброў у сучаснасці з дзеяннямі іх жа ў падобных сітуацыях часу партызанскага змагання, калі прыходзілася прымаць выключныя рашэнні, нават у нейкай ступені алагічныя. Але ў гэтым, відаць, і заключаецца незвычайнасць, нават экстравагантнасць шамякінскіх герояў, якім часта прыходзіцца дзейнічаць у экстрэмальных умовах.

Варта адзначыць і яшчэ адну асаблівасць таленту пісьменніка. Амаль усе яго творы спароджаныя важнымі для таго часу грамадска-палітычнымі падзеямі, таму ў некай ступені з’яўляюцца кан’юктурнымі, бо грунтуюцца на толькі што прынятых партыйных рашэннях, якія, як высвятляецца з часам, не маюць гістарычнай перспектывы, не атрымліваюць праверкі жыццём. Так было з раманам “Крыніцы”, задума якога ўзнікла пасля вераснёўскага пленума камуністычнай партыі 1953 года, на якім пункцірна намеціліся першыя прыкметы адыходу ад таталітарнага сталінскага кіраўніцтва дзяржавай, павароту да лёсу вёскі, спробай абвысакародзіць даволі непрываблівы тады калгасны лад. Гэта характэрна і для рамана “Снежныя зімы”, які пісаўся неўзабаве пасля кастрычніцкага пленума шэсцьдзесят чацвёртага года, на якім быў асуджаны так званы хрушчоўскі валюнтарызм, нешта падобнае можна заўважыць і ў рамане “Злая зорка”. Гэта адна з каштоўнейшых рысаў таленту творцы, які ідзе ў нагу з жыццём, часам і абганяючы яго, раскрывае надзённыя канфлікты. Але ў такім разе пісьменніка падсцерагае і небяспека быць галоснікам ісцін, якія не пацвярджаюцца гістарычным развіццём. Зыходзячы з такіх меркаванняў, варта глянуць, што ўдалося пісьменніку раскрыць праўдзіва ў тым часе, а што стала толькі данінай увагі да палітычнай сітуацыі, разгорнутых вялікіх гульняў, распачатых крамлёўскімі “мудрацамі”, прынятых на веру пісьменнікам.

І гэты раман І. Шамякіна аразу настройвае чытача на незвычайнасць сітуацыі, пэўнай таямнічасці самога канфлікту. Паступова адыходзячы ад літаратурнай рамантызацыі, узвышэння некаторых нават драматычных дзеяў часу вайны, пісьменніку неабходна было паказваць

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

усе недарэчнасці тагачасных установак і рэгламентацый. Аднак, у яго зноў нідзе няма нават згадкі, што многія парашутныя грузы, прысланыя з-за фронта, траплялі проста ў рукі ворага, у яго няма напамінку і пра тое, як апраўдваліся людзі перад акупантамі, пасля таго, як партызаны адыходзілі са сваёй зоны.

Паколькі ўсё ж партызанскіх старонак у рамане мала, паспрабуем паглядзець, як тыя героі дзейнічаюць сёння, які ў іх маральны запас. З пункту погляду І. Шамякіна гэтаму адпавядае толькі Іван Васільевіч. І пачынаецца мастацкае абгрунтаванне гэтага тэзісу. З самага пачатку Атанюк заяўлены бязгрэшным. У лесе арганізоўваць партызанскі рух павінны былі іншыя кіраўнікі, даверaныя асобы савецкай улады. Але адны альбо спалохаліся і ўцяклі ў невядомым напрамку, альбо свядома перайшлі на службу да акупантаў. У такой сітуацыі Антанюку можна было і разгубіцца. Недзе ў сярэдзіне рамана ён гэта і прызнае, але сутнасць зусім у іншым. Застаючыся нават у стане дэпрэсіі, Іван Васільевіч пастаянна памятаў, хто яго выхаваў і што ад яго патрабуецца. Гэта зноў адзін з тых замбіраваных савецкай уладай і яе камуністычным арсеналам людзей. Але трэба мець на ўвазе і іншае, тое, што падсвядома кіравала людзьмі ў тых складанейшых умовах партызанскай вайны, калі часам самі абставіны вымушалі прымаць непапулярныя рашэнні. Але здаецца, што іншы раз пісьменнік робіць гэта спецыяльна, каб падкрэсліць валявыя якасці сваіх герояў, неардынарнасць створаных сітуацый і калізій.

У час прагулкі ў пушчы Іван Васільевіч раздумвае пра свой лёс, дачыненні з начальствам, нечакана натыркаецца на зубра. Карціна даволі сімвалічная. Валадар лясных прастораў і нядаўні волат міністэрскіх апартаментаў нібы вывучаюць адзін аднаго. "*Зубр стаяў пад старымі елкамі, камлі якіх абраслі сівым мохам. У гэтым глухім кутку пушчы ўсё першабытна замшэлае: елкі мелі такі выгляд, быццам прастаялі тысячу гадоў, старыя пні аплецены мохам, а пад ім усё струхлела. Рэдкія вываратні напамінаюць дагістарычных жывёлін."*[136] Такі міфалагічны пачатак рамана дае падставы меркаваць, што пісьменнік надае свайму герою таксама дастаткова загадкавасці, падкрэслівае неардынарнасць яго асобы, але нібы і падштурхоўвае да разваг пра ўжо дагістарычнасць Антанюка. Між іншым, такія думкі пісьменнік хутка развейвае, бо герой пераходзіць да рэалістычнага асэнсавання свайго

[136] Шамякін, І. Снежныя зімы / І. Шамякін. – Мн.: Беларусь, 1970. – С. 5. Далей старонкі з гэтага выдання ўказваюцца ў тэксце.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

становішча. І. Шамякін сцвярджае, што прырода заўсёды прадстаўляе чалавеку магчымасці для рэальнага погляду на свет, і на ўсё, што ў ім адбываецца. "*Перад веліччу лесу, яго вечнасцю чалавечыя канфлікты, нягоды, турботы, асабліва цяперашнія – мірныя. набывалі зусім іншы сэнс. Так было паўтара гады назад, калі ён прыехаў сюды пасля таго, як яго, дужага, здаровага паслалі на пенсію. Тады ён быў у роспачы. А пагуляў па пушчы – і на другі дзень адчуў, што хочацца пасмяяцца са свайго "гора"* (с. 5). Зубр адзін, ён пакінуў статак ці яго выгнаў маладзейшы і дужэйшы супернік? Гэта немалаважна для разгортвання думкі-ідэі, бо і Антанюк адчувае сябе выгнаным не толькі з пасады, але і з працоўнага калектыву. Сімвалічнасць карціны шматзначная. Зубр хоць адзін, і не малога веку, але здольны адстаяць сваю волю перад новай небяспекай, якая зараз зыходзіць ужо ад чалавека. Самае разумнае ў такой сітуацыі – уцякаць, пакуль не позна. Але зрабіць так Антанюку не дазваляе гонар. З лёгкай іроніяй ён разважае: "*Ніколі ты, Іване, не ўцякаў ні ад якіх зброў. Адступаць – адступаў. Перад мацнейшым, перад ворагам… ды яшчэ часам абыходзіў дурняў"* (с. 6). Аднак, калі ўзнікла сапраўдная пагроза нападу, Антанюк з той мясціны рэціраваўся са спрытам юнака і прыйшоў да невясёлага рэзюмэ ўсё з той жа ўнутранай усмешкай: "*Ну, вось, не хваліся, што ні ад якага зубра не ўцякаў. Прыйшлося, – з невясёлай іроніяй падумаў Іван Васільевіч. – Калі яго, д'ябла, ахоўвае закон, то што другое зробіш? Трэба ўцякаць… Ад закона"* (с. 7). Без сумненняў, у гэтым эпізодзе пісьменнік выдае свайму герою своеасаблівы грамадзянскі аванс, які ён пасля павінен апраўдаць перад чытачом. Па ходзе разгортвання сюжэта такіх магчымасцей у яго будзе дастаткова, хаця і не заўсёды яны пададзены пераканальна. Ужо на самым пачатку ёсць падстава ўсумніцца ў звычайных намерах галоўнага героя толькі прагуляцца па пушчы. Ва ўжо згаданым вышэй эпізодзе Антанюк разважае пра некаторыя паводзіны дзікіх жывёл: адчуваючы прыбліжэнне фіналу свайго жыццёвага веку многія з іх пакідаюць статак, каб памерці годна ў адзіноце. Ён задумваецца над такой сітуацыяй: у выніку свайго жыцця няблага было б пакінуць гэты свет так жа велічна. І ў такім ладзе думак няма нічога надзвычайнага. Але справа ў тым, што Антанюк ужо з самага пачатку становіцца непаслядоўным у сваіх рашэннях. Толькі што пісьменнік сцвярджаў, што Іван Васільевіч хацеў пабыць на адзіноце, узвысіцца духам, не згадзіўся на прапанову дырэктара запаведніка прыняць удзел у паляванні на дзіка. Аднак, пачуўшы яхканне сабак, блізкія стрэлы, адразу адкідае сумныя думкі

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

і накіроўваецца на шум, да людзей, бо ведае, што там будзе сур'ёзная кампанія. Тут, відаць, І.Шамякін хацеў адразу паказаць героя канкрэтнага перыяду грамадскага жыцця, падкрэсліць, што такая зменлівасць у паводзінах матываваная. Ён зазначае, што Антанюк – рэальнасць свайго часу і свайго асяроддзя, сфарміраваны акалічнасцямі і ўмовамі існавання, ідэалагічнай сістэмай дзяржавы.

Сцэна палявання, а пасля і гасцявання з удзелам міністра распаведзеная на першых старонках рамана мае шматзначны сэнс. Менавіта тут завязваюцца ўсе вузлы далейшых канфліктаў, што будуць набіраць усё большы драматызм. У адным месцы сабраліся Сяргей Пятровіч, міністр, ад якога залежыць поспех інстытута, які ўзначальвае Валянцін Будыка, у партызанскім змаганні начальнік штаба атрада, брыгады, дзе адпаведна камандзірам быў Антанюк. Знаёміцца чытач і з Кляпнёвым, памочнікам Будыкі, радаслоўная якога вядзецца ад крапівінскага Зёлкіна, замацаваная ў новым часе макаёнкаўскім Моцкіным.

З'яўленне Івана Васільевіча ў паляўнічай кампаніі дае магчымасці пісьменніку разгортваць сюжэт у адпаведным напрамку. Галоўнаму герою стала адразу зразумела ўся сутнасць пушчанскага адпачынку, паколькі чытачу ўжо дадзена аўтарам яго агульная атэстацыя. І таму, калі Будыка з непаказной шчырасцю хваліць майстэрства госця ў паляванні (а госцем з'яўляецца міністр), то і ўспрымае гэтую навіну даволі скептычна.

"*Не, ты ацані! З двух стрэлаў звaліць такога! – узнёсла гаворыць Будыка. – І не зблізку. Высунуўся з тых кустоў, а Сяргей Пятровіч стаяў за тым дубам. Вунь там. Колькі метраў? Прыкінь!"* (с. 10)

Тут, шчырая альбо не, радасць Будыкі зразумелая. І на першы погляд здаецца, што ўсё гэта павінен прыняць як ісціну кожны. Аднак адбываецца крыху інакш. Усё такі "зубр" павінен апраўдаць выдадзеныя яму пісьменнікам авансы:

"*Антанюк прыкінуў. Усё. З аднаго позірку спрактыкаванага паляўнічага і яшчэ больш вопытнага чалавека, які ўсё бачыў, сам быў у розных абставінах – і гаспадаром і госцем. Здзівіць яго чым-небудзь цяжка было. Але здзівіўся – спрыту і ўменню сябра свайго.*

Бачыў Антанюк арганізаваныя паляванні, у якіх загадзя распісваўся кожны стрэл – дзе, калі, з якой адлегласці – і звяроў трохі што не прывязвалі. Таму заключыў, што шмат якія з тых паляванняў, у наладжванні якіх і ён часам удзельнічаў (няйначай як для маскоўскіх правяральшчыкаў, трэба думаць. – *Я.К.*), *былі, мякка кажучы, бяздарныя*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ў параўнанні з гэтым. Там арганізацыя ўсюды вылазіла, і пра яе самі ж наладжвальнікі расказвалі пасля анекдоты. Пра гэтае ж паляванне анекдота, бадай, не раскажаш” (с. 10).

Такія развагі пісьменніка могуць успрымацца таксама неадназначна. Усё ж раман пісаўся ў канцы шасцідзясятых гадоў, гаварыць так адкрыта пра падхалімаж магло быць небяспечным. Аднак, калі мець на ўвазе тагачасную рэчаіснасць, то можна і пагадзіцца з тым, што пісьменніку тут нічым не пагражала, бо такое даўно стала звычайнай з’явай жыцця, калі правяраючага любога рангу імкнуліся справадзіць як падалей, каб толькі адвесці ўвагу ад яўных правалаў.

Але ў дадзеным выпадку, відаць, пісьменнік меў на ўвазе іншае. Магчыма, каб яшчэ раз падкрэсліць праніклівасць свайго героя, яго ўменне раззбірацца ў самых “тонкіх” сітуацыях, і наіўнасць, як потым высветліцца, разумнага Сяргея Пятровіча, які не заўважыў звчайную паляўнічую падстаўку. Разам з тым, недвухсэнсоўна зроблены намёк, што пэўная хітрасць Будыкі мае далёкі разлік, а ў яго самога ў свядомасці наяўнасць канфармізму.

Разам з тым, Іван Васільевіч вымушаны прызнаць, што Валянцін Будыка нядрэнны псіхолаг, здолеў арганізаваць так справу, каб даставіць радасць патрэбнаму чалавеку: выгнаць дзіка ў патрэбны момант, не даць стрэліць па зверу нікому іншаму, нават самым вопытным паляўнічым.

“*Але,чорт вазьмі, гэта трэба ўмець: даць госцю ўсе сто пакут і радасцей!* – у здзіўленні разважае Антанюк. – *Вывадзіць яго ад світання так, што вунь – паварушыцца не можа, а пасля, пад вечар ужо, выгнаць дурнога дзіка дакладна на яго, на госця, а не на каго другога. Такі заядлы мыслівец, як Сіротка, не стрываў бы, як ні дамаўляйся з ім, – б’е ён без промаху. Дык не ж – адзіны сапраўдны паляўнічы не мог нават стрэліць, быў блакіраваны, нездарма ляжыць цяпер такі пануры”* (с. 10).

Антанюку паступова пачало не падабацца такое Будыкава запабяганне перад госцем, хоць тут жа прызнаецца, што і яму прыходзілася падхалімнічаць перад вышэйшым начальствам, бо, бачыце, ён чыноўнік, а тут вучоны. Гэта мала выратоўвае, таму што ў наяўнасці праявы няшчырасці і ў самога абвінаваўцы, паколькі наводзіць на думку, што такія дробныя грахі можна дараваць толькі яму, але ні ў якім разе іншым. І гэта ў нейкай ступені насцярожвае: ці і праўда ўжо такі прынцыповы і шчыры гэты герой, як пра яго на першых старонках рамана гаворыць пісьменнік.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У экспазіцыі рамана з’яўляюцца і першыя прыкметы разыходжання герояў – Антанюка і Будыкі – у поглядзе на жыццё, у прыватнасці, на тое, што робіцца ў калгаснай вёсцы. З размовы Сяргея Пятровіча і Будыкі (яе выпадкова пачуў і Іван Васільевіч) можна зразумець, што апошні даволі абыякавы да ўсяго таго, што творыцца вакол: яго цікавяць толькі свае ўласныя праблемы. А Іван Васільевіч адчуў у асобе міністра свайго аднадумцу. У далейшым гэта будзе паступова пацвярджацца.

Пачутая размова прыводзіць героя да невясёлых успамінаў пра сутнасць чалавека, пра хамелеонаўскія звычкі некаторых людзей, якіх, здаецца, і ведаеш добра, а ў выніку можаш атрымаць самыя непрыемныя сюрпрызы. На памятным яму высокім пасяджэнні такое разуменне ён адчуў у пазіцыі старшынствуючага, які ставіў на галасаванне прапанову “*аб вызваленні яго, Антанюка, ад абавязкаў… за памылкі, дапушчаныя ў рабоце…*

Даў гэтую мяккую фармуліровачку ён – хто старшынстваваў. А некаторыя з тых, з кім ён, Антанюк, з’еў не адзін пуд солі, хто не раз кляўся ў дружбе, падкідвалі і такое: за нязгоду з палітыкай партыі…” (с. 16). Тады гэта для камуніста было і абражальным, і небяспечным. Партыя як нешта велічнае і неасязальнае прысутнічала хутчэй у душы Антанюка, чым у свядомасці. Дарэчы, у гэтым эпізодзе праявілася і пазіцыя самога пісьменніка, і будзе праяўляцца яшчэ ў многіх сітуацыях у рамане, і не толькі ў гэтым.

Паказальным для далейшага разгортвання падзей з’яўляецца і сцэна ў більярднай. У час гульні ідзе размова пра аўтаматычныя лініі, якія распрацоўвае інстытут пад кіраўніцтвам Будыкі. Пачатая як звычайная жартаўлівая пікіроўка, яна паступова прымае прынцыповае значэнне. Антанюк, спасылаючыся на спецыялістаў, з якімі працуе сумесна ў камісіі парткантролю пры гаркаме, стаў рэзка крытыкаваць гэтыя тэхнічныя сродкі за іх малую прадуктыўнасць. Але вось памочнік Будыкі Кляпнёў нахабна папярэджвае, каб не лез, не мяшаў, бо аўтаматычныя лініі вылучаныя на прэмію, атрыманне якой залежыць і ад пазіцыі Сяргея Пятровіча. “*…Івана Васільевіча моцна ўзлавала, і ён ўвайшоў у більярдную з рашучым намерам прадоўжыць размову пра аўтаматычныя лініі ўжо не ў жарт, а выказаць водгукі, якія пачуў ад спецыялістаў”* (с. 22). Аднак, як гэта часта здараецца з Антанюком, ён мяняе тактыку: “*Але Валянцін глядзеў на яго такімі добрымі вачамі і ўсміхаўся… не, не ліслiва – спакойна, па-сяброўску, хораша так, што Антанюку зрабілася няёмка за сваё жаданне сапсаваць сябру настрой”*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

(с. 22). Пісьменнік такую непаслядоўнасць свайго героя тлумачыць тым, што быццам той хоча даць магчымасць дырэктару інстытута так незапабягаць перад міністрам. Але гэта не пераконвае, бо і ў іншых сітуацыях у Антанюка гэтая рыса будзе праяўляцца можа яшчэ больш, падкрэсліваючы яўную супярэчлівасць характару.

У рамане зроблена заяўка на выяўленне прынцыповага чалавека, дасведчанага кіраўніка, які ўмее прымаць валявыя рашэнні, адстойваць сваю пазіцыю, дабівацца справядлівасці. Увогуле, ідэальнай ва ўсіх адносінах асобы. Аднак, як ужо адзначалася, усім тэкстам рамана гэта не пацвярджаецца.

Вось і ў новай сітуацыі, калі акрэсліваецца магчымасць вярнуцца на працу, Антанюк зноў паводзіць сябе неадэкватна. Па дарозе на прыём у вышэйшай партыйнай установе ён вырашае, што згодзен працаваць на любой пасадзе, абы прынесці карысць сельскай гаспадарцы. У працэсе размовы крута мяняе сваю пазіцыю, зноў адчуўшы крыўду, цяпер ужо ад свайго былога падначаленага Леаніда Мартынавіча, які зараз загадвае адпаведным цэкоўскім сектарам. Можа і праўда, што сыграла і тое: малады партыйны функцыянер павёў сябе дужа фамільярна, што не магло не закрануць гонар чалавека, які звыкся адчуваць сябе сярод першых у наменклатурнай абойме, хоць прызнацца нават сабе ў гэтым не можа. Вось як ён тлумачыць свой адказ заняць прапанаваную пасаду, замест той, якую меў да пенсіі: "*Мне не тоўсты партфель трэба і не высокае крэсла… Я сорак гадоў служу партыі! І вы можаце ўбачыць з анкеты – не на цёплых месцах… А як салдат. Куды партыя загадвала – туды ішоў"* (с. 50). Годны адказ чалавека, якога сфарміравала партыйна-савецкая сістэма: ён з'яўляецца таксама звычайным вінцікам у вялікім дзяржаўным механізме кіравання. Таму і адказ яго бачыцца нелагічным, паколькі супярэчыць яго партыйным перакананням. Ён павінен быў, відаць, згаджацца, абскардзіўшы сваё незаслужанае паніжэнне ў пасадзе ў вышэйшых інстанцыях. Цікава, што пасля вось такой размовы Антанюк разважае якраз у такім накірунку: "*Наліха каму здаліся мая амбіцыя і мой прынцып? Трэба было згаджацца на тое, што прапаноўваюць"* (с. 54). Заканамернасць такога рашэння відавочная, паколькі пацвярджаецца папярэднімі разважаннямі героя. Але пісьменніку неабходна іншае: яму патрэбна было сцвердзіць незвычайнасць характару, выключнасць асобы Івана Васільевіча, яго партыйную прынцыповасць, незалежнасць у прымаемых рашэннях. На справе ж атрымліваецца, што яго ўчынкамі ў

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

большасці выпадкаў кіруе амбітнасць, амаль хваравітая экзальтаванасць. Зараз ён думае не пра справу, не пра складаныя праблемы ў сельскай гаспадарцы, як гэта было дакляравана спачатку, а пра тое, як пра яго падумаюць чыноўнікі, вышэйшае начальства, калегі: "*Не. Цяпер падумаюць, што спалохаўся"* (с. 54).

А далей ідуць разважанні пра тое, што ён ніколі не паступаўся сваімі прынцыпамі, быў ледзь не абаронцам самых істотных высакародных адносін, але павінен прызнаць, што не такі ўжо і правільны. Даказвае сабе, што ніколі не быў здраднікам, хоць тут жа яму ўслужлівая памяць падсоўвае эпізоды гэтай здрады. Знаходзяцца адразу і апраўданні, што звычайнаму чалавеку ўсё ўласціва, а ён быў перш за ўсё чалавек, а потым камандзір. Гэта можна зразумець: так склаліся абставіны, але справа ў тым, што і зараз, праз два дзесяцігоддзі, Антанюк не лічыць сябе вінаватым за тое партызанскае каханне. У такім выпадку яшчэ раз прагледжваецца паслядоўнасць яго характару, яго пастаянная ўпэўненасць, што ўсё вырашалі абставіны, у якія трапляе чалавек. Але як тады зразумець пісьменніцкую логіку, у выніку якой выходзіць, што ўсё даравальна, калі вызначаецца абставінамі. Крыху раней ён сцвярджаў адваротнае.

Выпадкі, калі прыходзілася прымаць рашэнні насуперак логіцы, Іван Васільевіч тлумачыць выключнасцю сітуацый. Нават у моманты, дзе такія ляжаць на паверхні, Атанюк усё выконвае на ўзроўні эмоцый. Можна прыпомніць хоць бы эпізод з часоў партызанства па выратаванні дзяцей. Рызыкуючы, камандзір брыгады пасылае людзей у моцны фашысцкі гарнізон, каб выратаваць дзяцей з дзетдому, у якіх фашысты бяруць кроў для сваіх раненых, у выніку чаго яны знікаюць навечна. Учынак высакародны. Але далей пачынаецца нешта неверагоднае: прынятае раней калектыўнае рашэнне адпраўляць спачатку самых малых дзяцей разам з цяжкапараненымі ў савецкі тыл Антанюк адмяняе, і вырашае пакінуць параненых (адправіць толькі тых, каму патрэбна неадкладная аперацыя), а змясціць у самалёце усіх дзяцей, маладзейшых за дзесяць гадоў. Прыгэтым прадстаўнік Цэнтральнага партызанскага штаба Каралькоў прапаноўвае рэалістычнае рашэнне: большасць дзяцей, якія ў нармальным здароўі, раздаць у вясковыя сем'і, паколькі там іх лёгка выдаць за сваіх. Але Антанюк робіць па-свойму, і пісьменніку гэта спатрэбілася толькі для таго, каб потым, ужо ў шасцідзесятых сутыкнуць Антанюка з Каральковым у час яго аднаўлення на працу. Таму ранейшыя ўчынкі героя выглядаюць нематываванымі.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Увогуле такіх учынкаў у Антанюка набіраецца дастаткова, што дае падставы ўсумніцца ў тых авансах, якія выдае свайму герою пісьменнік.

Сапраўды выклікае спачуванне да героя адчуванне віны перад загінуўшым малодшым братам Паўлам, які зышоў з атрада Антанюка, бо не мог перанесці тое, што яго яшчэ студэцкае каханне да Надзеі Паўлаўны раптам разбіта яго родным старэйшым братам. Ён цярпеў сваё гора, калі яна выйшла замуж за другога, які ў час вайны аказаўся здраднікам. Тут сцярпець не мог, перайшоў у іншы атрад, дзе і загінуў. Прамой віны Івана Васільевіча ў гэтым няма. Але яго мучыць сумленне не таму, што стаў на дарозе закаханага Паўла, а грубае развітанне, за тое, што не стрымаў характару.

"*Можа мне балела б больш, каб ты загінуў у маім атрадзе, на маіх вачах. Даруй мне, Павел, тую ўспышку, тыя дурныя словы: «Ну і каціся на ўсе чатыры! К чортавай мацеры! Слюнцяй! Саплівы рамантык!»*" (с. 67).

Але і ў такой сітуацыі Антанюк шукае для сябе апраўданняў, зноў спасылыецца на складанасць часу, на тое, што галоўным усё ж была барацьба з ворагам, а на асабістыя адносіны можна было пакуль не звяртаць увагі. Гэта таксама пацвярджэнне дваістасці характару галоўнага героя.

У разгалінаванні сюжэтных ліній пісьменнік робіць многа цікавых прыёмаў: уводзіць чытача ў часы вайны, а потым вяртае ў нядаўнія падзеі, якія таксама шмат што значаць у характарыстыцы героя. Адбываецца ўсё ў адной плыні, калі раптам пасля размовы ў вышэйшай інстанцыі Антанюк прымае імпульсіўнае рашэнне ехаць да сына, перад якім таксама адчувае сваю віну. Яму ў нейкай ступені патрабавалася апраўдацца не столькі перад людзьмі, якія, урэшце, нічога пра яго таямніцы не ведаюць, а перад самім сабой. І па волі пісьменніка робіць ён гэта не аднойчы. Такія роздумы быццам павінны былі дапамагаць раскрываць складаны ўнутраны свет героя. Аднак у рамане гэтага не атрымоўваецца. Бо ўсё, пра што распавядае пісьменнік, у нейкай ступені працуе супраць. Вось хоць бы прыклад разважанняў Івана Васільевіча пра віну перад сваім братам, пра тое ж да свайго сына Васі. Ён быццам правярае сваю прынцыповасць тады і зараз. Да якіх жа вывадаў прыходзіць герой? Вельмі да несуцяшальных. Ён не хоча празнавацца нават самому сабе, што ў вызначэнні лёсу свайго сына кіраваўся не столькі разумнымі парывамі бацькі, разуменнем справядлівасці, а хутчэй спалохам, што сын высокапастаўленага чыноўніка раптам апынуўся

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ў шэрагах незадаволеных палітыкай партыі. Няхай сабе ў рамане ўсё зводзіцца толькі да коснасці выкладання нейкіх дысцыплін асобным выкладычкам, але дасведчаны чытач мог адразу зрабіць і некаторыя аналогіі.

Шамякін быў ва ўладзе і пісьменніцкай, і савецкай, паколькі доўгі час з'яўляўся старшынёй Вярхоўнага Савета БССР. Міма яго ўвагі не маглі прайсці непрыкметна тыя грамалзянскія акцыі, якія ўстрайвала аўтарытарная рэспубліка над сваім паслухмяным электаратам. Іван Васільевіч рэзка асуджае свайго сына ў вальнадумстве, лепшым рашэннем лічыць адправіць яго на перавыхавнне ў армію. А вось зараз, як пенсіянер, які не залежыць ні ад якога начальства, пачынае інакш меркаваць пра тыя падзеі. Зразумеў, што памыліўся? Што даверыўся не розуму, а імпульсіўным пачуццям? Не. І тут ён разважае ў сваім ключы, абвінавачваючы іншых, але набліжаючы сябе да іх даволі ўскосна, недзе ў глыбіні душы прызнаючы, што ў той сітуацыі, як зараз бачыцца Антанюку, ён памыліўся. Але сябе вінаватым усё ж не лічыць, ці, па крайняй меры, імкнецца не лічыць. Тут праяўляецца ўся істота Антанюка: ішоў на канфратацыю, толькі тады, калі быў упэўнены ў сваёй праваце. А ці заўсёды яна была справядлівая? Адказу на гэта не паступае, паколькі ў пісьменніка адназначна выведзена, што Іван Васільевч станоўчы герой, бескампрамісны ў сваі памкненнях у барацьбе за справядлівасць. Але тады ўзнікае ў чытача пытанне, за якую справядлівасць ён змагаецца? За партыйную, ці чыста чалавецкую? Наконт апошняга ў рамане нават намёку няма, бо ён быў да канца перакананы, што партыя не памыляецца. А што такое партыя, як разгадаць гэты феномен, відаць, патрэбы ні ў аднаго савецкага камуніста не ўзнікала. Ці не адтуль пачыналіся ўсе беды? Вось Іван Васільевіч даведаўся, што яго сын Вася раптам выступіў супраць коснасці выкладання нейкіх дысцыплін. Якая яго першая рэакцыя? А вось: як гэта без дазволу вышэйшых інстанцый яны адважыліся бунтаваць? Ён проста спалохаўся, прытым спалохаўся, мабыць, не за сваю кар'еру, за якую, па яго ўласных словах, не надта трымаецца, а за існуючую сістэму. Вось па дарозе да сына ў вайсковую часць ён разважае ўжо спакойна і перакананы, што тады пагарачыліся, не ўніклі ў сутнасць справы: "*Разумныя людзі з рэктарата, з гаркома і тады разумелі, што жорстка караць вас няма завошта. Караць трэба было за форму, а не за сутнасць. Каб не распускаліся, не рабіліся анархістамі"* (с. 84). Значыць, каб выраставалі пакорнымі вінцікамі. Але што ўяўляюць тады агульныя развагі героя пра вартасці чалавека, які

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

павінен адстойваць свае правы. Выходзіць, зноў чыстая дэкларацыя, альбо, наадварот, можна даваць права пратэставаць толькі тым, каму дазволена. Ды і гэта дае падставы для ўсялікіх разважвнняў адносна існуючай праўды ў сваёй дзяржаве. Пісьмепнніку ўвесь час хочацца даказаць, што сацыялістычная сістэма самая дэмакратычная, але невытлумачальная ў тых ахвярах, якія прыносіць ёй народ. Значыць, пастаянна трэба апраўдваць ўладу за ўсе яе дзеянні.

Перш за ўсё, відаць, трэба памятаць, як заўважалася вышэй, што І. Шамякін заўсёды знаходзіўся ў высокіх інстанцыях. Як першы сакратар Саюза пісьменікаў павінен быў ведаць пра акцыі, якія адбываліся тады, на пачатку шасцідзесятых гадоў, у адзіным для Беларусі універсітэце, калі вялікую групу студэнтаў абвінавацілі ў нацыяналістычнай дзейнасці, толькі за тое, што патрабавалі выкладання на беларускай мове. Тады яшчэ адчувалася, нахай сабе і ўрэзаная, але дэмакратыя. Студэнты атрымалі чыста маральнае ўшчуванне, хоць у вобразе вельмі прынцыповых выкладчыкаў яны атрымлівалі на экзаменах не болей трох балаў, незалежна ад ведаў і спосабу іх выкладання. У канцы шасцідзесятых ужо было больш жорстка: студэнтаў, якія патрабавалі навучання на беларускай мове, выключылі з універсітэта. Ратаваў іх Максім Танк, старшыня Саюза пісьменікаў. Ведаў пра гэта Шамякін? Несумненна, але ў рамане прыглушыў вострыя нацыянальныя пытанні, перавёўшы канфлікт ў чыста этычны варыянт. Сам Антанюк прызнаецца, што яго раззлавала тое, што гэтыя маладыя людзі, якія жывуць амаль на ўсім гатовым, раптам адважыліся пратэставаць супраць улады, сістэмы ў цэлым. Ён гатовы прызнаць, што не ўсё нармальна ў нашай адукацыі. Дужа многа коснасці, страшэннай замшэласці, але ён пераканаиы, што з гэтым можна змагацца толькі з дазволу вышэйшых партыйных органаў, а ўсё астатняе ўжо ад д'ябла. Вось гэтага пісьменнік ужо ніяк не мог дапусціць, таму і разважанні Антанюка пра коснасць у справах вышэйшай адукацыі і справядлівасць у яе ацэнках таксама не больш чым гульня ў высакароднасць і прынцыповасць.

Варта адзначыць і яшчэ адну акалічнасць, характэрную для творчасці І. Шамякіна. Ён уцягвае ў твор надзвычай многа розных праблем, вядома, актуальных для свайго часу, але проста невырашальных у вызначаным ім самім жанравым аспекце. Хоць бы пытанні сямейных адносін, вечнай праблемы бацькоў і дзяцей. Гэтыя глыбінныя пытанні пісьменнік таксама давярае толькі Антанюку. Бо жонка яму бычыцца толькі квактухай над сваім вывадкам. А ці мае права Іван

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

так меркаваць? Які ўдзел у выхаванні сваіх дзяцей прымаў ён? Забеспячанне рэгламентаванымі пайкамі, дастойнай зарплатай, якой хапала і на раскошнае жыццё яго спадчыннікаў? Вось тут і пачынаюцца ўсе супярэчнасці. Сістэма так закручвала, што на ўласнае жыццё не заставалася часу. Выхадныя выкарыстоўваліся, каб адпачыць ад турбот папярэдняга тыдня. А хто выхоўваў дзяцей? Садкі ў дзень, і змучаныя мамы пасля работы, знерваваныя і знямоганыя. Ці магло ўсё гэта быць паўнацэнным? Ні ў якім разе. Таму многія развагі Івана Васільевіча ў адносінах выхавання дзяцей падаюцца проста дэмагагічнымі. І ён вымушаны ўрэшце прызнаць, што не ведае сваіх дзяцей, якія ў іх маральныя крытэрыі, чаго, урэшце, яны хочуць ад гэтага жыцця.

Ён шкадуе, што нейкай бесхрыбетнай вырасла старэйшая дачка Мая, якая, маючы філалагічную адукацыю, нічым асабліва не цікавіцца, акрамя таго, каб выбіваць сродкі дапамогі ў бацькоў. Але захапляецца Ладай, дужа таленавітым фізікам, на думку Івана Васільевіча. Але інтэлектуалізм яе таксама задужа плакатна прадстаўлены. Акрамя захапленняў самога бацькі, мы не бачым нейкіх важных досведаў у пацвярджэнне сапраўды геіяльнасці Лады. Хіба толькі свайго роду сцверджаненне сапраўднага валявога характару, які выяўляецца ў тым, што ў час яе падрыхтоўкі да заняткаў усе ў хаце павінны сядзець як мышы пад мятлой. Таму яе празвалі ў хаце дэспатам, але таксама з яўным налётам захаплення. Але ў гэта мала верыцца, бо агульна вядома, што геніі звычайна не звяртаюць увагі на пабочныя перашкоды, паколькі яны пастаянна жывуць у свеце сваіх рэалій. Слабасці бацькоў ёсць слабасці, і гэта зразумела, але чамусьці пісьменнік спыняецца толькі на канстатацыі факта.

У гэтым плане можна паразважаць і над некаторымі іншымі эпізодамі. Партызанскае каханне, якое закончылася зноў жа не па волі Антанюка, павінна было сцвердзіць, што і ў тым выпадку ён заставаўся прыстойным, бо катэгарычнае рашэнне прыняла ўсё ж Надзея Паўлаўна. Натуральна ўспрымаецца ўлюбёнасць Надзеі ў гераічнага камандзіра, якая, відаць, пачыналася з самай элементарнай удзячнасці, што ён не адправіў з атрада жонку здрадніка. У далейшым гэта перарасло ў сапраўднае каханне, якое яна пранесла праз усё жыццё. Іншая справа з Іванам Васільевічам. Ён прымае катэгарычнае рашэнне Надзеі разарваць адносіны ў імя яго сям'і, якую яна не хоча разбураць. Тут прасвечваецца ўвесь воблік гэтай жанчыны, па-біблейску раздумлівай і ахвярнай. З боку Івана Васільевіча больш бачыцца рацыянальны разлік: добра будзе мець харошага сябра, які заўсёды падтрымае ў цяжкую хвіліну,

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

бо дзейнічаць яна будзе не па развагах розуму, а з пачуццёвага імпэту. Эгаізм галоўнага героя відавочны, ён праяўляецца, відаць, і ў тым, што Антанюк згадвае Надзею толькі ў самыя крытычныя моманты, калі адчувае сябе пакрыўджаным, адсунутым ад актыўнага ўмяшанне ва ўсе працэсы. Тады ўзнікае пытанне: а кім усё-такі была для яго Надзея? Выратавальным кругам у час дэпрэсій, ці чалавекам, які яго добра разумее? Але пісьменнік таксама пастаянна падрэслівае, што чулай, уважлівай да яго была і жонка, Вольга, якая імгненна рэагавала на малейшыя змены яго настрою. А можа гэтая празмерная клапатлівасць якраз і раздражняла галоўнага героя? Здаецца, не. І. Шамякін заўсёды акцэнтуе ўвагу на тым, што Іван Васільевіч удзячны жонцы, як ужо адзначалася, за паўсядзённы клопат, нават адчувае вінаватасць, што ўзваліў на яе ўвесь цяжар хатняга гаспадарання і выхавання дзяцей. Праўда, вінаватасць гэтая мімалётная і, вядома, спозненая, але і гэтая дэталь паказальная для таго часу. Пісьменнік і тут не адступае ад рэалій жыцця: за гады савецкай улады былі так адшліфаваныя грамадскія адносіны, што ў наменклатурных работнікаў часу на сямейныя справы заставалася мала, дастаткова было таго, што жонкі мелі магчымасць не працаваць, а займацца хатнімі справамі. У шараговага працаўніка не было і такой магчымасці. На першы погляд – гэта нязначныя штрыхі, якія кардынальна не ўплываюць на развіццё дзеяння, але падобных мастацкіх дэталей у рамане дастаткова, якія пашыраюць уражанне чытача пра рэчаіснасць шасцідзясятых гадоў, шмат што дазваляюць дамаляваць ва ўяўленні.

Вось і ў дадзеным выпадку раптоўнае рашэнне ехаць да сына, як і спантаннасць змяніць маршрут, нават пакінуўшы ў вагоне рэчы, сведчыць пра тое, што часцей за ўсё Іван Васільевіч прымае іх не ў працэсе лагічнага роздуму, а на эмацыянальным узроўні, што ў нейкай ступені павінна было б разбураць вобраз высокапастаўленага наменклатурнага работніка. Але ў кантэксце ўсяго рамана такія імпульсіўныя паводзіны выглядаюць заканамернымі. І сам галоўны герой часам ва ўспамінах павінен прызнавацца, што не заўсёды быў паслядоўны ў сваіх прынцыпах: зараз з прыкрасцю думае пра тое, што яму таксама прыходзілася выконваць распараджэнні вышэйшага начальства, да агранаміі якія не мелі ніякага дачынення. Галоўны герой прызнае такія ўступкі, але не апраўдваецца, бо лічыць, што і тады не адступаў ад галоўных перакананняў, ад свайго бачання праблем сельскай гаспадаркі.

З другога боку, такі нечаканы ваяж Івана Васільевіча даваў магчымасць пісьменніку ўводзіць дадатковыя сюжэтныя лініі. Наведванне

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

сына высветліла, што ў яго любай дачкі Лады ёсць жаніх, значна пазней гэта каханне ўрэшце закончыцца вяселлем, а падарожжа ў палескую вёску акрамя ўсяго дало падставы ўвесці ў сюжэт твора дзейснай гераіняй Віту. З гэтага сюжэтнага адгалінавання можна зразумець, якія ўзаемаадносіны складваліся паміж Антанюком і дачкой Надзеі. Ён адзначае для сябе тое, як яна змянілася за час ад іхняй апошняй сустрэчы. "*Каб сустрэў дзе ў горадзе, напэўна, не пазнаў бы – так яна змянілася з таго часу, калі бачыў яе апошні раз. Сем год назад на яго са знявагай і нянавісцю зіркала цыбатае, худое дзяўчо-падлетак. Цяпер стаяла вельмі ладная жанчына. Але, усё ў яе паставе было такое, што, відаць, кожны з першага позірку назваў бы яе жанчынай, а не дзяўчынай. Можа гэта – ад строгасці ўбрання: трыкатажны гарнітур стальнога колеру, гэткія ж, як у маці, гладка прычасаныя валасы, сплеценыя і завязаныя на патыліцы ў куксу"* (с. 176). Відаць, Іван Васільевіч не падумаў, што прафесія накладвае свой адбітак і на знешні выгляд. А Віта, як і яе маці, працавала настаўніцай у той жа школе, а па склаўшыхся ўжо тады патрабаваннях яна павінна была адзявацца строга, мець салідны выгляд. Але тут не гэта галоўнае. Яшчэ больш здзіла яго нейкая халодная непрыязнь, якая адчувалася ва ўсёй яе паставе, у голасе, інтанацыі яе кароткіх адрывістых фраз. Праўда, у хуткім часе Івану Васільевічу ўдалося растапіць гэты лёд адчужанасці, урэшце заявіўшы строга, што яна не мае права нікога судзіць. Але тут відавочна і ўступка Вікі, якая па-даросламу зараз ацэньвала былое. У хуткі часе наступіла і ўзаемаразуменне. А шчырая спавядальнасць пра ранейшыя свае адносіны да Івана Васільевіча нават расчуліла апошняга, калі пачуў: "*Я даравала вам… Сёння, ідучы са школы. І я нічога не буду распытваць пра вашы адносіны з мамай. Разумею. Не маленькая. Але абяцайце, што вы будзеце са мной такім жа шчырым і будзеце гаварыць, як з дарослым чалавекам"* (с. 180). Івану Васільевічу нічога не заставалася іншага ад такой нечаканасці, як толькі моўчкі кіўнуць галавой. А пытанне пра тое, хто яе бацька, і ўвогуле прывяло Антанюка ў стан здранцвення. А пасля прызнання Віты, што яна была ў тым раёне, дзе базіраваўся партызанскі атрад, даведалася толькі, што камісарам быў былы настаўнік Шугановіч, але імя яго было Васіль, а яна Іванаўна, Антанюк гаворыць: "*Твой бацька – я",* – зноў у нейкай ступені пацвярджаючы імпульсіўнасць свайго характару: спачатку дзеянне, потым развагі. Гэта замацавана і ўнутраным маналогам*: "Што ты робіш? Навошта ты гэта робіш? Такая твая шчырасць?" – закрычаў адзін Антанюк.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

“А хіба я не быў за бацьку яе там, калі над усімі вісела смерць? Ёй не будзе сорамна за такога бацьку. І можа праз гэта ёй лягчэй будзе жыць”, – разважліва казаў другі” (с. 182).

Ёсць яшчэ адзін аспект у далікатнай сітуацыі. Паверыўшы, што яе бацькам з’яўляецца Іван Васільевіч, Віта адважваецца параіцца з ім адносна сайго каханага, каб упэўніцца ў правільнасці яе выбару, паколькі яна ведае, што яе абраннік быў жанаты, і яшчэ невялома ў якім статусе знаходзіцца ён зараз. Для гэтага яна як бы вінавата просіць згоды ў новаяўленага бацькі дазволу запрасіць яго на абед у такую ўрачыстую хвіліну. Натуральна, што ў вырашэнні сітуацыі іншага і нельга было чакаць, як толькі згоды апошняга. Але і тут заўважаецца нейкая даістасць у паводзінах галоўнага героя. З першага погляду дырэктар школы не спадабаўся Івану Васільевічу: знайшоў у яго паводінах, манеры гаварыць, трымацца з усімі нешта ненатуральнае, што быццам бы пацвярджала завочнае меркаване Івана Васільевіча пра яго як пра ненадзейнага чалавека, які і мог напісаць ананімку. Тады зразумелая і яго непрыхільнасць на пачатку. Але вось праходзіць некалькі часу, пагутарыўшы з Алегам, Антанюк лёгка мяняе сваю думку адносна маладога чалавека. І тут не было б нічога дзіўнага, калі б падзеі развіваліся лагічна, людзям удалося праз працяглы час высветліць жыццёвыя пазіцыі кожнага. Не. Іван Васільевіч у характэрнай для яго імпудьсіўнасці хутка мяняе свой погляд, пасля нядоўгай размовы, дастаткова пачуць словы Алега Гаўрылавіча: “*Я паўгода працую тут і не ведаў, што Надзея Пятроўна – партызанка*“ (с. 200), – ён ужо гатовы прызнаць яго за свайго.

Здавалася б, высакародная мана (калі яна бывае такой) павінна была расставіць усе кропкі над “і”, вырашыць складаную для Віты праблему станоўча. На першым этапе быццам так і ёсць. Для дзяўчыны наступіла пэўная яснасць з яе з’яўленнем на свет, што павінна было ўнесці адпаведную стабільнасць у яе жыццё. Але далейшае развіццё сюжэтнай лініі набывае нечаканае прадаўжэнне. Выкарыстоўваецца чыста літаратурны прыём, вядомы яшчэ з антычнай літаратуры. Нечакана Віта прыязджае да Антанюка ў Мінск, якраз трапляе на вяселле Лады. Знаёміцца з Васілём, які з першага погляду закахаўся ў яе. Блізкі да сэрца ёй і Васіль, але яна стрымлівае свае пачуцці, ведаючы таямніцу свайго з’яўлення на свет. З дзённіка Віты чытач даведваецца, якія палымяна закаханыя лісты слаў ёй Васіль, што прыносіла ёй дадатковыя душэўныя мукі. Гэта першы знак бяды ад святой маны Антанюка.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Неўзабаве наступіць і другі знак: з дапамогай махінатара Кляпнёва, які помсціць Антанюку за крыўды, быццам нанесеныя яго шэфу Будыку, Віта даведваецца, хто на самай справе з'яўляецца яе бацькам. Гэта ледзь не прывяло да трагічнага выніку, калі Віта, адправіўшыся на лодцы па рацэ, ледзь не загінула.

Аднак такі сюжэтны залом бачыцца непраўдападобным. Па логіцы, у адпаведнасці з літаратурнай традыцыяй, Віта павінна была адчуць палёгку: урэшце ў каханні яе да Васіля няма нічога грэшнага. Прытым, прайшло столькі год пасля вайны, многае змянілася ва ўзаемаадносінах людзей. А калі ўлічыць, што яе маці перад вайной выходзіла замуж не за паліцая, а за савецкага службоўца, даволі высокага рангу ў раённым маштабе, які потым стаў здраднікам, то і ўвогуле не было падстаў для такога трагічнага развароту падзей. Ненатуральнасць такіх калізій заўважыла крытыка адразу пасля выхаду рамана. У прыватнасці І. Навуменка пісаў, што "*ў сюжэтнай лініі Антанюк – Надзея Пятроўна – Віта – нямала ад звычайнай "дэтэктыўнай" займальнасці*"[137].

Дарэчы, яшчэ раз пра дзённік Віты. У сюжэтнай канве рамана дзённік павінен быў выконваць некалькі функцый: драматызаваць сюжэт, раскрываць асаблівасці ўяўленняў сучаснай (для таго часу) моладзі, жыццёвую канкрэтыку. Аднак, гэтага не адбылося. Такія мясціны ў рамане выглядаюць штучнымі, вызначаюцца сваёй зададзенасцю. Пра гэта неўзабаве пасля выхаду рамана пісаў В. Каваленка: "*Не верыцца неяк сур'ёзна ў праўдзівасць зместу дзённіка. Па-першае, стыль яго мала чым адрозніваецца ад аўтарскай апавядальнай манеры. Па-другое, сама Віта выглядае ў дзённіку не вельмі натуральна. Да знаёмства з дзённікам яна ўяўляецца больш тонкай і інтэлектуальнай, больш цнатлівай натурай, хоць знешне трохі падрабляецца пад дзяўчыну без умоўнасцей. Здавалася, за паказной грубасцю яна хавае мяккую, уражлівую душу. Дзённік разбурае гэта ўяўленне. Ёсць у ім мясціны, якія здзіўляюць маральнай бесцырымоннасцю. І справа не ў тым, пра што там пішацца. Ханжаства і прытворства нікому не патрэбны. Маладая дзяўчына мае права думаць, пісаць, гаварыць пра ўсё. Але дзяўчына пра самыя інтымныя і нават адкрыта эратычныя моманты падумае па-свойму, па-дзявочаму. А ў Віты? Вось яна даведваецца, што Алег, які заляцаецца да яе, не разведзены з першай жонкай. У дзённіку так перадаюцца перажыванні гераіні: "**Мне балюча? Не. Болю не адчуваю. Хлушу, аднак. Усё-такі нешта трэснула вось тут – пад**

[137] Навуменка, І. Кніга адкрывае свет / І. Навуменка. – Мн.: Маст. літ., 1978. – С. 176.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

грудзьмі, пад маімі поўнымі і прыгожымі грудзьмі, якія даўно просяць мужчынскай ласкі і… дотыку пяшчотных дзіцячых вуснаў. Не соромна будзе, калі мама прачытае дзённік? Не, не соромна! Нават перад мамай."

Хай сабе сапраўды Віта – дзяўчына без умоўнасцей, але для ўсякай дзяўчыны выказвацца так – грубасць. Залішне па-мужчынску ўсё гэта. Адно "нешта трэснула" чаго варта! А прыведзеная вытрымка з дзённіка яшчэ не самае грубае ў ім.

Пра дзённік Віты ніяк ужо нельга сказаць, што тут аўтар ужыў умоўны прыём. Дзённік пішацца толькі для сябе, і ў ім чалавек раскрываецца такім, якім ён ёсць у сапраўднасці. Дзе-дзе, а тут выразнасць адносін да героя абавязковая. Між тым ніяк немагчыма адчуць, як аўтар адносіцца да грубаватых шчырасцей сваёй гераіні – лічыць іх за станоўчую рысу, паэтызуе, ці проста апісвае іх "нейтральна", пакідаючы чытачу магчымасць літаральна ва ўсім разабрацца самому"[138] .

Магчыма, сучасны чытач не з усімі высновамі крытыка пагодзіцца, але гэтая крыху велікаватая вытрымка неабходна для таго, каб падкрэсліць, што гаворка вядзецца ўсё ж пра моладзь сярэдзіны шасцідзясятых гадоў, калі спрадвечныя традыцыі былі яшчэ большменш трывалымі. Ды і зараз, акрамя, хіба, спецыфічнай кагорты, дзяўчаты не любяць так публічна агаляцца. Разам з тым, варта звярнуць увагу на тое, што ўжо ў сямідзясятых гадах у мастацкай літаратуры пачалі праяўляцца з'явы, якія стануць ледзь не асноўнай тэматыкай масавай поплітаратуры, асабліва расейскай і рускамоўнай такога ж рангу беларускай.

У цэлым у раманах спрадвечныя любоўныя трохкутнікі служылі спружынай развіцця дзеяння, сродкам выяўлення ўзаемадносін герояў. Не выключэнне і разглядваемы раман І. Шамякіна, хаця асноўныя канфлікты яго грунтуюцца на грамадскіх ўзаемадачыненнях. Маторам, калі можна так сказаць, галоўнага сюжэтнага дзейства з'яўляецца ўсё ж Іван Васільевіч, нягледзячы на тое, што ў асобных сюжэтных адгалінаваннях ёсць каларытныя, запамінальныя асобы. І гэта ў творчай манеры Івана Шамякіна – як найбольш у адным творы ахапіць праблем сучаснасці. Сапраўды, вайна з усімі яе жахамі з'яўляецца нібы лакмусавай паперкай, праз якую правяраецца цяперашняя годнасць яе былых удзельнікаў.

[138] Каваленка В. Прага духоўнасці / В. Каваленка. – Мн.: Маст. літ., 1975. – С. 67–68.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Увогуле, усе старонкі рамана пра сучаснасць у І. Шамякіна насычаныя разнастайнымі супярэчлівымі, нетлумачальнымі сітуацыямі, можа нават крыху надуманымі.

Вось хоць бы узяць галоўную лінію сюжэта рамана: Іван Антанюк – Валянцін Будыка. Як высвятляецца, сяброўства іх мацавалася з самага пачатку партызанскай барацьбы. Увесь час сцвярджалася, што мнгія поспехі партызанскіх дзеянняў залежалі ад Будыкі, камандзір Антанюк яму быў удзячны. Не асудзіў Будыка свайго сябра і за часовае гарачае кахане, увогуле не было падстаў для будучых канфрантацый, хоць пісьменнік неаднаразова падкрэслівае, што ў такой цярпімасці ў Валянціна Будыкі быў свой далёкі разлік: ён быццам пастаянна падкрэсліваў сваю маральную перавагу над камандзірам.

Аднак у шасцідзясятыя раптам узніклі рэзкія супярэчнасці паміж сябрамі. Сутнасць іх даволі паказальная: артадаксальны ў сваіх перакананнях Антанюк і вольны ў поглядах Будыка вядуць спрэчкі ўвогуле пра адно і тое ж, але з розным спосабам чыста чалавецкага разумення. Іван Васільевіч быццам бы за прагрэс, навуковае развіццё грамадства. Але разам з тым ён не разумее, як усяго гэтага можна дабіцца. Ён абсалютна не закранае пытанне пра навуку ў той жа сельскай гаспадарцы, праз міністэрства якую ён курыраваў. Хто быў у той навуцы, якія перспектыўныя напрамкі яны рэкамендавалі міністэрству, што ўрэшце выходзіла з тых рэкамендацый? Дужа было б лагічна, каб Іван Антанюк заняўся праверкай менавіта саёй навуковай сістэмы. Аднак ён раптам зацікавіўся праблемамі навукова-даследчага інстытута па стварэнні вытворча-паточных ліній. У гэтым плане пазіцыя Івана Антанюка даволі хісткая, хоць пісьменнік увесь час хоча падкрэсліць прынцыповасць свайго героя.

Ужо гаварылася пра тое, як павёў сябе Антанюк пры паляванні ў пушчы, далей яго паводзіны яшчэ больш непаслядоўныя, таму што ім кіруе нейкая сіла непрымірымага стаўлення да ўсяго, што акружае Будыку. Сутнасць даследаанняў, якія праводзяцца ў інстытуце, які ўзначальвае Будыка, наўрад ці даступныя Антанюку ў поўнай меры. Але тут пісьменнік закрануў адну вельмі важную для савецкай сістэмы праблему – размеркаванне прэмій. Можа і сам пісьменнік не адзін раз крыўдзіўся, што прэмія дасталася не яму. Але што зробіш з тым парадкам размяркавальнасці, які тады існаваў. Відаць, тут пісьменнік якраз і хацеў кінуць каменьчык у гэтыя камітэты па прысуджэннях прэмій, дзе ўжо яўна ў шасцідзясятыя гады пачала праяўляцца тэндэнцыя прызначаць прэміі па чарзе, а не па сапраўднай вартасці кожнага навуковага

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

дасягнення. Таму канфлікт Антанюк – Будыка ў нейкай ступені традыцыйны, і вытокі свае мае яшчэ ў трыццатых гадах. Відазменена ён нагадвае востры канфлікт не лепшай драмы Кандрата Крапівы ”Канец дружбы”, дзе таксама назіраюцца метамарфозы ў клятвах сяброўскай вернасці. Праўда, ужо іншыя часы, фізічнае знішчэнне немагчыма, аднак прывід гэтай знарочыстай злавеснасці прысутнічае. Няма прамой праваты ў дзеяннях Івана Васільевіча, няма падстаў агульна вінаваціць свайго былога ваеннага і апошніх часоў сябра, бо тут дзейнічае адпрацаваны прынцып прызнання сваіх і чужых, так як будзе вызначана партыйнай сістэмай. Складваецца ўражанне, што Антанюка не надта цікавяць тыя аўтаматычныя лініі, а больш праяўляецца патрэба вярнуць свайго сябра ў лона паслушнасці сістэме, з якога той спрабуе вылузнуцца, таму і вельмі часта паводзіць ён сябе неадэкватна, прымітыўна,часам з выклікам. Пра гэта сведчаць якраз тыя немнагалікія вытворчыя, можа правільней, навукова-практычныя, раздзелы рамана. Увогуле такіх мала, паколькі галоўныя звязаныя ў асноўным з лініяй супрацьстаяння Будыкі і Антанюка. Чаго, урэшце. дабіваецца Антанюк? Выкрыць свайго сябра ці паказаць псеўданавуку савецкіх многіх акадэмій? Не. На гэта Шамякін ніяк не адважыўся б, але разам з тым і зрабіў нешта падобнае, праўда, не да канца паслядоўнае. Відаць. пісьменнік хацеў засяродзіць увагу на тым. што савецкая навука не была перадавой, а проста пераймала ўсе замежныя адкрыцці. Можа і так, але тады пісьменнік жорстка памыляўся, бо ўсё было ў паўсядзённасці куды наадварот. Сапраўды, у адпаведнасці з даўно сфармуляванымі прынцыпамі, прызнанымі маглі быць толькі людзі з вышэйшых эшалонаў навуковай іерархіі. Маладым – не вылазь. Многае адвяргалася не таму, што не мела навуковай перспектывы, а таму, што прапаноўвалася нейкім невядомым, які ў колах не засвяціўся. У такім выпадку многія адкрыцці ішлі за рубеж, а пасля вярталіся назад гатовымі прапановамі па ўкараненні ў вытворчасць. У гэтай сувязі заявы Антанюка, што розныя аспекты адкрыццяў новых тэхналогій для ўкаранення ў вытворчасць проста спісаныя з зарубежных аналагаў, не маюць пад сабой трывалага грунту, бо можна смела сцвярджаць, што сюды вярнулася адкрытае раней савецкай навукай, але пакуль праходзіла такія дантавыя кругі выпрабаванняў, паспявала ўстарэць. І пакуль па-новаму распрацоўваліся вернутыя тэхнічныя ідэі, у астатнім свеце ўжо былі новыя адкрыцці. Відаць, пісьменнік пра гэта ведаў. Але яму неабходна было па ходзе сюжэта паказаць перараджэнне, абмяшчаньванне Будыкі. Таму і заявы Антанюка пра яго магчымасці

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

агалосіць, адкуль спісаныя асноўныя формулы, выглядае непераканаўча. Паказальным у гэтым плане з'яўляецца спрэчка Антанюка з Будыкам, у якой Іван Васільевіч спрабуе пераканаць свайго апанента ва ўяўнасці яго навуковых заслуг, і адказы апошняга: "*Ты вырашыў узвесці сабе "помнік нерукатворны" за аўтаматы, скапіраваныя з чужых… І, між іншым, не самых лепшых, ўжо ўстарэлых… За кнігу, дзе формулы тэарэтычных разлікаў спісаны з чужой кнігі… <…> Магу дакладна назваць прозвішча аўтара… назвы тых аўтаматаў і – для прыкладу – некалькі формул з той кнігі і з тваёй… Жадаеш паслухаць?*

Не, не жадаў Валянцін Будыка слухаць пра гэта. Цяжка падняўся, як буйвал. Зачапіў столік. Каб Іван Васільевіч не падтрымаў, перакуліў бы. Груба вылаяўся.

– Злавілі блыху! Ні храна вы не разумееце, а лезеце! Законы Ньютана, Ома, Эйнштэйна выкарыстоўваюць усе! Хто калі лічыў гэта плагіятам? І матэматычныя формулы! Што я ўкраў патэнт? Я ўзяў ідэю. І сэканоміў дзяржаве мільёны рублёў. Мільёны! Хто з вас, правяральшчыкаў, даў іх народу? Вы можаце толькі ўзяць!

– Але не выдавай гэта за вынаходства, вартае вышэйшай узнагароды" (с. 246).

У дадзеным выпадку заўважаецца хісткасць пазіцый абодвух удзельнікаў. Сапраўды, можа ў канструкцыі нешта ўстарэла і ўжо не заслугоўвае дзяржаўнай прэміі, але Іван Васільевіч не бярэ пад увагу ўсю бюракратычную сістэму, якая якраз і глушыла ўсе здаровыя пачынанні. Тут могуць узнікнуць іншыя меркаванні. Магчыма прасцей было б купіць тыя новыя тэхналогіі, а не займацца вынаходніцтвам свайго веласіпеда. Але ў тым процістаянні капіталістычнай і камуністычнай сістэм наўрад ці было б гэта рэальным, адносіны былі даволі напружаныя, бо Захад не хацеў узмацняць свайго праціўніка навейшымі тэхналогіямі, таму і назіралася шмат прыхільнікаў пазіцыі Будыкі. Дробная выгада, але свая, на шмат прэсціжней, здавалася, што тым падымала статус савецкай навукі, хоць і была памылковай, бо адкідвала развіццё індустрыі назад, пазбаўляла канкурэнтнай здольнасці тавараў з вытворчасцю іншых развітых краін. Зрэшты, гэта зразумеў і Будыка, калі ў фінале рамана сцвярджае, што ўнутраны крытычны самааналіз значна глыбейшы за вывады камісіі. Такім чынам, і тут героі застаюцца як бы кожны пры сваёй непарушнай пазіцыі.

Неабходнасць адгукнуцца на самыя актуальныя праблемы набліжаючайся НТР І. Шамякін спрабаваў вырашыць па-свойму, дастатко-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ва наблізіўшы патрэбы вытворчасці да распрацовак навукі. Пісьменнік валодаў моцнай інтуіцыяй, прадчуваннем нейкіх глабальных перамаен, але часта неабачліва заскокваў наперад, абганяў час, некалькі паспешліва ў творах сцвярджаў розныя пераўтварэнні, якія потым не пацвярджаліся практыкай. І гэта было б прыемлема, калі б пісьменнік пісаў філасофскія прытчы з іх надзвычай мнагалікасцю ўспрымання рэчаіснасці. У рэалістычным творы, дзе ўсё прывязана менавіта да канкрэтнага часу, ён не мог пускацца ў філасофскія развагі (такая катэгорыя творчасці І. Шамякіну не ўласціва ўвогуле), а ў публістычнай манеры шчыра пераказвае найноўшыя рашэнні партыі. Несумненна, гэта і павінна было праяўляцца ў творчасці пісьменніка, паколькі ён неадрыўна ішоў за ўсімі падзеямі ў дзяржаве, не заўсёды іх па-мастацку і філасофску асэнсоўваючы. Вось гэты лёгкі знешні налёт аналітычнасці вызначае названы раман І. Шамякіна. Што хацеў даказаць пісьменнік? Што час эксперыментаў закончыўся? Што нам патрэбна стабільнасць? Пастаноўка такіх пытанняў заканамерная для таго часу. І пісьменнік з усёй імпэнтнасцю кінуўся вырашаць яе па гарачых слядах, відаць, адсюль і ўсе творчыя выдаткі. Таму і не ўспрымаецца сур'ёзна перамога Антанюка над Будыкам. Праўда, трэба мець на ўвазе, што Іван Васільевіч не намагаўся звергнуць свайго сябра з п'едэстала, а пасяброўску дапамагчы пазбавіцца ад амяшчаньвання, вярнуцца ў шэрагі навукова-савецкай наменклатуры. У духу тых гадоў гэта было з'явай актуальнай, але час мяняе ўсё, у такім разе мяняюцца і ўспрыняцці самой рэчаіснасці. Раман, па-сутнасці. атрымаўся як велічны гімн новай тэндэнцыі, якая потым гісторыяй будзе абазначана як пачатак застою і вяртанне да сумных часоў таталітарызму ў яго самым горшым варыянце.

Вярнуўшыся з такога раптоўнага і непрадказальнага ваяжу, Іван Васільевіч зноў поўнасцю акунаецца ў гарамадскія праблемы, вырашае давесці да канца распачатую праверку працы даследчага інстытута. Тут з'яўляюцца новыя акалічнасці, у якіх даволі ярка высвечваецца сутнасць савецкай ідэалагічнай сістэмы: усё для краіны, усё для народа, але патрэбы канкрэтнага чалавека дзесьці непрыкметна знікалі. Паказальным у гэтым плане выступае канфлікт Антанюка з сваім зяцем Генадзем, які да гэтага працаваў інжынерам на заводзе. Ён пераходзіць на працу ў інстытут, які ўзначальвае Будыка, паколькі там і большая зарплата, і лепшыя перспектывы росту. Генадзь тлумачыць гэта проста: на трыццаць рублёў большая зарплата, а яшчэ і магчымасць стаць канды-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

датам навук. Магчыма, тут было і не без разліку. Але рэакцыя Антанюка на такія праявы аказалася чыста бальшавіцкая. "*Іван Васільевіч раптам адчуў дзіўную спустошанасць. Не хацелася больш гаварыць, пераконваць, тым больш прасіць. Дарэмная трата сіл. Дрымучы лес. Далей не прабіцца. Завал за завалам. Крыўдна. Тысячы людзей выхоўваў. А зяця за пяць год нікалькі не абчасаў, не прачысціў мазгоў – такі ж кулак, прыватнік, а можа нават горшы стаў. Што за чорт! Якія ж таемныя сілы дзейнічаюць у іншым кірунку? Хто ці што на яго ўплывае? Тыя пятнаццаць гектараў зямлі, якія меў бацька пры Польшчы? Свацця, калі прыязджае, то і цяпер успамінае тую зямельку і кляне нейкага Шуру, які ў трыццаць дзевятым абрэзаў лепшы ўчастак"* (с. 256). І ў гэтым Антанюк паслядоўны. Выхаваны сістэмай, ён нават не дапускае, што чалавек можа жадаць працаваць там, дзе выгадней, дзе большая зарплата, вядома, не паступаючыся сваім гонарам. З сённяшняга пункту погляду, ды і па логіцы таго часу, з'ява ўпаўне заканамерная. Аднак Івана Васільевіча гэта ўзбунтавала, ён палічыў Генадзя прыстасавальнікам, чалавекам без прынцыпаў, які толькі гоніцца за доўгім рублём, а гэта ўжо адзнакі мяшчанства. А яшчэ ўбачыў тут хітры ход Будыкі, які такім чынам быццам бы хацеў збіць праверачны імпэт свайго сябра. Магчыма, было і гэта, але пры чым тут Генадзь? У разважаннях апошняга таксама ёсць свая логіка, калі адказвае на прапанову Івана Васільевіча спачатку падумаць, чым прымаць прапанову: "*А што мне думаць! Вы можаце дружыць, можаце сварыцца. Вам што? Адзін персанальную мае. Другі хутка будзе акадэмікам і лаўрэатам. А мне трэба жыць. З-за вашых капрызаў я павінен адмаўляцца ад выгаднага месца! Будыка не баіцца, што пра яго скажуць. Я так бачу: напляваць яму на вашу камісію. А вы спалохаліся, каб не падумалі, што вы мяне ўладзілі. Чаго вам баяцца? Пенсіі не здымуць*" (257). Можа крыху жарсткавата, але справядліва гаворць Генадзь. Ды тагачаснаму наменклатурнаму чыноўніку, няхай сабе і былому, цяжка было ўявіць, што і іншыя таксама заслугоўваюць лепшай долі.

Па сутнасці, процістаянне Будыка – Антанюк завяршылася нічым. Апошні эмацыянальны наскок Івана Васільевіча на дырэктара інстытута хутчэй пацвердзіў слабыя магчымасці правяральшчыкаў, чым іхнюю катэгарычную доказнасць. Дарэчы, у рамане і няма ніводнага дадатковага факта быццам бы пра наяўнасць у інстытуце нейкіх правальных навуковых даследаванняў, што толькі адкідваюць і навуку, і эканоміку назад. Гэтая сітуацыя спатрэбілася раманісту, каб без лішніх тлумачэнняў

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

паказаць адыход Антанюка ад сваіх ранейшых бескампрамісных рашэнняў і максімалісцкіх патрабаванняў. Вось кульмінацыйная размова былых сяброў, а зараз непрымірымых праціўнікаў у поглядах на многія рэальныя рэчы. Іван Васільевіч прыйшоў да Будыкі ў мінорным настроі: жадаў пазнаёміць калектыў з вывадамі камісіі і адначасова пасябраваць з дырэктарам, усё ж такі даказаць памыковасць яго пазіцыі ў атрыманні прэміі любымі намаганнямі. Непрымірымасць Будыкі, асабліва яго зняважлівая заўвага пра "ханжаскую мараль" новаяўленага "духоўнага ойчы" вывелі Івана Васільевіча з раўнавагі: "*Тады Антанюк з усяе сілы пляснуў папкай па стале, падскочыў, і… сцены шыкоўнага кабінета, мэбля-мадэрн, тоўстыя тамы тэхнічных даведнікаў пачулі словы, якіх ніколі не чулі і наўрад ці пачуюць яшчэ калі, а гаспадар кабінета чуў іх апошні раз дваццаць гадоў назад у зямлянцы ці ў баі, калі камбрыга часам даводзілі вось да такога напалу і ён вось так узрываўся.*

Невядомая сіла… не, вядомая, тая, якая мела над ім уладу там, у лесе, узняла стомленага, размяклага дырэктара з крэсла, і ён выслухаў усё, стоячы амаль "на смірна". Не пярэчыў. Не абураўся. Толькі спалохана пазіраў на дзверы, каб хто не ўвайшоў. Ведаў – цяпер камбрыга нішто і ніхто не спыніць. Няхай хоць дваццаць чалавек уварвецца" (с. 337).

Відаць, такога ўзрыву адчуванняў не чакаў ад сябе і галоўны герой, бо нават сам спалохаўся, што так можна і атрымаць інфаркт. І далей у характэрнай для яго пераходнай плыні пачуццяў ужо больш спакойна разважае: "*Называецца, пазнаёміў дырэктара, партком з заключэннем, якое пісаў у бяссонныя ночы. Папка ляжыць на стале ў кабінеце. Хай застаецца Будыку на памяць. Чорт з ім! Усё. Кропка. Ніхто не прымусіць яго больш прыходзіць сюды, займацца такой праверкай. На якое ліха гэта яму патрэбна!"* (с. 338). Пісьменнік праз увесь твор падкрэслівае вось такую непаслядоўнасць героя, каб лішні раз напомніць пра яго звычайнасць, нават у нейкай ступені шараговасць. Але заўважаецца і іншае: пісьменнік не прамінае любога выпадку, каб чарговы раз не ўкусіць беларускую навуку. Ідучы бязмэтна па горадзе пасля непрыемнага інцыдэнту ў высокай партыйнай установе, Антанюк апынаецца амаль на ўскрайку горада, дзе яго зусім выпадкова сустракае міністэрскі высокі чын, уласна нечым і незычлівец Івану Васільевічу, паколькі некалі заняў яго месца. Аднак той са смяшынкай гаворыць, што Антанюку ён не супраціўнік, паколькі не трымаецца за сваю пасаду. Тут, відаць, варта прывесці іх даволі выразны дыялог: "*Андрэй Пятровіч*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

усё-такі спытаў на развітанне:

– Калі на работу?

Значыцца не ведае. Лаваіў рыбу.

– Не баішся, што запатрабую, каб вярнулі на тое ж месца?

Андрэй Пятровіч хмыкнуў.

– Не баюся.

– Ведаеш, што не вернуць? Ці цэліш вышэй?

– Не ведаю. І не цэлю. Сам прашуся на інстытут.

– У навуку?

– Дарэмна я сляпіў вочы над дысертацыяй?

– Модным стала – ісці ў навуку.

– Больш пэўнасці.

– Гэта праўда: пэўнасці больш. Толькі нешта навукі не больш. Нашай, сельскагаспадарчай.

Андрэй Пятовіч засмяяўся зноў.

– Чакай. Скончылі з валюнтарызмам – рушым навуку" (с. 76).

Далейшыя развагі Івана Васільевіча некалькі супярэчлівыя. Ён прызнае, што можа так будзе і лепш, бо тэарэтычныя неправераныя практыкай рэкамендацыі ўсё ж менш шкодныя, чым непасрэдныя бяздарныя ўказанні міністэрства для безумоўнага ўкаранення, бяздумнага выканання. Тут не толькі скептычнае стаўленне героя да навуковых мажлівасцей свайго суразмоўцы, але і міжвольнае прызнанне, што ў навуку ідуць толькі бяздарнасці, а самыя таленавітыя – толькі ў непасрэднай практыцы. Усё гэта яшчэ раз напамінае пра супярэчлівасць натуры, падкрэсліваюць душэўную стомленасць непрымірымага барацьбіта. Ці не пацвярджаюць гэта і фінальныя сцэны рамана, пачынаючы з апошняй сустрэчы Івана Васільевіча з Сямёнам Сямёнавічам.

Ужо згадвалася пра гэты візіт Івана Васільевіча, які быццам бы павінен быў сцвердзіць да канца справядлівасць яго пазіцыі ў адстойванні традыцыйнага беларускага севазвароту. Але сутнасць, відаць, не ў гэтых агранамічных выкладках, паколькі перад намі не папулярны навуковы трактат, а мастацкі твор. Тут важней усвядоміць грамадзянскую пазіцыю героя. Так, Антанюк у сваіх пераканаццях застаецца непахісным, але разам з тым і не наступальны, у нейкай ступені нават нядоказны, каб сцвердзіць сваю правату. Паблажлівы тон размовы Сямёна Сямёнавіча, крыўдныя намёкі на мінулае даводзяць Івана Васільевіча да стану ўнутранага кіпення, але не больш. Ён зноў адступае, зразумеўшы, што ў былым аддзеле працаваць нават радавым

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

супрацоўнікам яму не свеціць. Адчуўшы сябе ў нейкай ступені зняважаным, ён унутрана напружыўся: “*Ён кіпеў, і гэтае кіпенне, напэўна, адчуў Сямён Сямёнавіч. Узняўся з крэсла, выпрастаўся, акінуў позіркам кабінет, як бы выстаўляючы сваю веліч, свой сан: маўляў, не ўздумай абразіць у службовым кабінеце!* (с. 348)*”*. І што ж з гэтага кіпення выйшла? А вось што. Зноў галоўны герой апраўдвае свае паводзіны, чаму адкрыта не выказаў сваёй нязгоды: “*Іван Васільевіч стрымаўся: на ліха яму лезці на ражон. Выйшаў узрушаны, але, пакуль спускаўся па лесвіцы, амль супакоіўся”* (с. 348). Гэта значыць, канчаткова змірыўся з сваім паражэннем, але ў гэтым не хоча да канца прызнавацца. Паказальнай з’яўляецца фінал яго гутаркі з жонкай, якая даволі меладраматычна зрэагавала на яго расказ пра сустрэчу: “*Івана Васільевіча ў першы міг жончыны слёзы ашаламілі: з-за чаго трагедыя? А пасля – вырвалася злосць.*

– Не рабі з сябе пакутніцу! <…> Упікай за ўсе грахі! Я буду цярпець. Але ні ты, ніхто не прымусіць мяне кланяцца Каралькову ці Сямёну” (с. 349).

Што ж, пачуццё ўласнай годнасці, гонару, мабыць, Антанюк адстаяў, але справу, па сутнасці, прайграў, не пацвердзіў свае заяўленыя якасці непрымірымага барацьбіта. Праўда, выхад з тупіка знойдзены. Іван Васільевіч прымае прапанову Казіміра Захарэвіча, былога свайго супрацоўніка, які дабраахвотна паехаў працаваць дырэктарам саўгаса, прыняць пасаду галоўнага агранома. Але і гэта ў аргументацыі Івана Васільевіча выглядае таксама як маленькая помста свайму праціўніку, Сямёну Сямёнавічу: “*Урэшце, будзе аплявуха таму ж Сямёну Сямёнавічу. У яго, напэўна, спытаюць: дзе Антанюк? Не па сваёй жа ініцыятыве выклікаў на размову. А Антанюк – вунь ужо дзе!”* (с. 351). І тут пісьменнік паслядоўны ў сваіх поглядах на некаторыя грамадскія праблемы: лепш за ўсё сваю тэорыю даказваць практыкай. Вярнуцца на кругі свае, але ўжо ўмудроным жыццёвым вопытам, лагічнае вырашэнне супярэчлівай сітуацыі.

Дарэчы, многія літаратуранаўцы ў той час спрачаліся адносна таго, што ўсё ж адбылося ў гэтых драматычных перапалках Антанюка з вышэйшым начальствам. В.Каваленка лічыў адмову Антанюка пайсці на ніжэйшую пасаду і згоду працаваць галоўным аграномам ў саўгасе як яго паражэнне перад Сямёнам Сямёнавічам, і ўвогуле перад той партыйна-савецкай сістэмай. М. Міншчанчук у той сітуацыі знаходзіць і апраўдальныя аргументы на карысць Антанюка, калі адзначае, што “*ўсё*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ж маральна Антанюк перамог і Сямёна Сямёнавіча, і Каралькова, не згадзіўшыся заняць больш нізкую пасаду"[139]. Але, як заўсёды, відаць, ісціна знаходзіцца недзе пасярэдзіне: магчыма, Антанюк і не пераможца, і не пераможаны. Проціборстваючыя сілы засталіся пры сваіх інтарэсах, але ў такой сітуацыі яму нічога іншага не магло прайсці ў галаву. Антанюку сапраўды ўдалося сцвердзіць ў нейкай ступені незалежнасць сваёй асобы, стабільнасць характару,

Але ў дадзеным выпадку, менавіта звязаным з поглядамі Антанюка-аграрніка, прыхільніка традыцыйных прынцыпаў севазвароту, ярага праціўніка кукурузы як неўласцівай для Беларусі культуры, нешта бачыцца ў яго пазіцыі непераканаўчым. З сённяшняга гаспадарчага вопыту відавочна, што футуралагічныя высновы пісьменніка, заснаваныя на так званай тэорыі НТР, панаваўшай у час напісання рамана, жыццём не пацвердзіліся. Кукуруза стала раўнапраўнай сельскагаспадарчай культурай, зараз у Беларусі яе вырошчваюць нават на зерне. Праўда, на апошніх старонках рамана пісьменнік крыху змякчае катэгарычнасць ранейшых разважанняў, калі Антанюк дэманструе ў саўгасе свае агранамічныя здольнасці. На прапанову Івана Васільевіча на адным з участкаў пасеяць кукурузу на сілас, Захарэвіч са смехам гаворыць: "А ты не такі ўжо антыкукурузнік, Іван Васільевіч, як цябе распісвалі" (с. 359). Не стала панацэяй ад усіх бед і ўсеагульная меліярацыя, за якую так горача выступаў Антанюк. На пачатку новага стагоддзя тыя дасягненні навукова-тэхнічнай рэвалюцыі абярнуліся для людзей вялікай бядой, а для Палесся нават і трагедыяй. А менавіта там у вялікіх маштабах і праводзілася меліярацыя.

Увогуле старонкі рамана пра знаёмства Івана Васільевіча з новай пасадай і дэманстрацыяй сваіх магчымасцей выпісаны даволі патэтычна. На трываласць і дасведчанасць былога міністэрскага работніка правяраюць практыкі дырэктар саўгаса і малады аграном Грыц. Усе застаюцца задаволеныя. Антанюк адчувае дастатковую радасць, што не ўсе веды растрачаны, што сяму-таму могуць пазайздросціць нават маладзейшыя; Захарэвіч, што не памыліўся ў выбары, і, урэшце, Грыц прыстойна прызнае вершнасць заслужанага работніка, які, як яму здавалася спачатку, мог растраціць свае веды ў кабінетнай валакіце. Паходы па ўчастках, калі стары Антанюк фізічна загнаў маладых, павінны былі якраз і сцвердзіць непераможнасць традыцый. Антанюк перакананы, што толькі традыцый-

[139] Мішчанчук, М.І. Беларуская літаратура на сучасным этапе / М.І. Мішчанчук. – Мн.: Выш. школа, 1983. – С. 19.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ныя сродкі вядзення гаспадаркі могуць мець поспех. Але ён не адкідае і навуку, калі гаворыць, што сумленныя вучоныя павінны сказаць сваё слова. Антанюк гаворыць: "*Навука павінна мець запатрабаванні практыкі. І прастор. Базу для эксперыментаў. Безумоўна, калі там, у інстытутах, будуць высмоктвпаць вывады з пальцаў… Калі мы не дамо ніводнай комплекснай задачы…"* (с. 360). Ствараецца ўражанне, што толькі калгасная практыка, кіраўнікі гэтага промыслу ведаюць усё і ўмеюць прадказваць будучыню. Жыццём чамусьці ўсё гэта не пацвердзілася: недзе раптам зніклі калосы калгаснай вытворчасці, людзі апынуліся перад вялікім выбарам: куды кідацца? Да старой гаспадаркі, пра якую ўжо і ўспамінаў не засталося, ці новыя тыя агракомплексы, якія таксама не надта дадаюць радасці? Куды дзецца чалавеку? Такім чынам, высвятляецца, што аптымістычныя прагнозы не апраўдаліся.

Але паказальна спрадвечнае, тое, што заўсёды вяло чалавека і памагала яму пераадолець любыя нягоды. Любоў да зямлі, адчуванне зродненасці з прыродай, узвышанасць пачуццяў – гэтае паэтычнае ўспрыманне жыцця добра перадаецца праз унутраны маналог галоўнага героя: "*Іван Васільевіч вярнуўся да засекаў, дзе пнеўматранспарцёр высмоктваў ячмень. Абапёрся грудзьмі аб дашчатую загарадку, запусціў руку ў зерне. І адчуў незвычайную асалоду – радасць, уздым, пяшчоту, як ад ласкі дзіцяці, – ад непаўторнага дотыку да зерня, ад яго жывой цеплыні. Даўно ўжо не перажываў такога. Раней, на той высокай пасадзе, здаралася наведваўся ў склады, сховішчы, элеватары, праходзіў, аглядаў іх, даваў кіруючыя ўказанні – што зрабіць, дзе расшырыць, як механізаваць. Але, бадай, ніколі не ўдыхаў вось так водару збажыны, не адпачываў душой і не набіраўся сілы для новай працы"* (с. 354).

Гэта сведчанне, што чалавек вяртаецца да свайго першароднага прызвання, да еднасці пасады і душэўнага стану, калі адно і другое дапамагае трымацца ў гэтым свеце. Пісьменнік падкрэслівае, што вяртанне не было ўжо такім бясхмарным, як гэта ўяўлялася Антанюку на самым пачатку. Прыйшлося прайсці праверку і на трываласць, і на веданне, і яшчэ можа быць на чалавечыя якасці. Сярод новых супрацоўнікаў Іван Васільевіч нават праз два тыдні, для яго даволі нялёгкія, здолеў даказаць сваю здольнасць займацца самымі непасрэднымі справамі паляводства. Праўда, пісьменнік робіць яшчэ адно выпрабаванне для героя на маральную стойкасць, калі з негаданым візітам заяўляецца ў саўгас Сямён Сямёнавіч. Ён праходзіць па гаспадарцы як вялікаможны князь, але цікавіцца толькі тымі галінамі вытворчасці, да якіх Антанюк не

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

мае абсалютна ніякіх адносін. Натуральна, апошні адчувае ў гэтым маральны здзек, але вытрымлівае яго высакародна, прыгэтым неяк ускосна спрабуе паказаць, што задума Сямёна Сямёнавіча не здзейснілася. Тут можна бычыць і некаторы мастацкі перабор, бо раней пісьменнік сцвярджаў, што гэты начальнік абсалютна не трымаецца за сваё крэсла. Відаць, І.Шамякіну спатрэбілася гэта, каб яшчэ раз пацвердзіць высакароднасць свайго героя. Але па ходзе развіцця сюжэта такое ўжо не патрабавалася, паколькі дзеянне пераходзіць у іншыя параметры.

І ў заключных раздзелах рамана пісьменнік застаецца паслядоўным: ён бачыць свайго героя толькі ў ідэальных сітуацыях, не дапускаючы хоць малейшых супярэчнасцей у яго дзеяннях і мысленні. Але такое ўжо падаецца непраўдападобным, што вядзе нават да зніжэння асобы галоўнага героя. На гэта звярнуў увагу А. Адамовіч, калі меркаваў адносна непагрэшнасці Антанюка: "*І. Шамякін, які заўсёды імкнецца, "выхопліваць" праблемы з самога кіпення сучаснага жыцця – "з агню, з полымя" рэчаіснасці. Для пераканаўчага, сур'ёзнага мастацкага вырашэння такіх важных праблем патрабуецца, аднак, нешта большае, чым ідэйная і маральная "вышыня", пазіцыя вельмі ўжо задаволенага сабой Антанюка, які ўсё-такі ўвесь у мінулым – калі "ў сядле" быў ён, а не другія. "Другія, а не ён!" – гэта для яго ўсё-такі вельмі важна, ды, здаецца, і наогул – галоўнае. Ці не гэта ў канчатковым выніку вызначае ўсё яго грамадзянскае кіпенне? Думаецца, што аўтар занадта паблажлівы да Антанюка, верыць на слова, што той пражыў бездакорнае "жыццё байца" і хоча, каб чытач верыў самахарактарыстыкам буркліва-самазадаволенага Антанюка"*[140]. Магчыма, тут з такім катэгарычным сцверджаннем не ва ўсім можна пагадзіцца, але, што любаванне сваім героем праходзіць праз увесь раман, застаецца бясспрэчным. Гэта можна заўважыць нават на апошніх старонках рамана, дзе Антанюк выносіць канчатковы маральны прысуд Будыку.

Вядома, у той час многае з імклівага жыцця бачылася інакш, а нешта пісьменнік спрабаваў сцвердзіць як запавет на будучае, прынамсі, многія маральныя катэгорыі. Іншая справа, што грамадства пайшло развівацца некалькі інакш, як гэта ўяўлялася пісьменніку. Трымаць руку на пульсе часу заўсёды цяжка, таму і пахвальнае жаданне пісьменніка быць у самым эпіцэнтры самых актуальных падзей. І. Навуменка адзначае: "*З усіх твораў І. Шамякіна* (маецца на ўвазе напісаных раней. – *Я.К.*) *новы раман, відаць, найбольш публіцыстычны. Яго героі ўвесь час*

[140] Адамовіч, А. Здалёк і зблізку / А. Адамовіч. – Мн.: Маст. літ., 1976. – С. 356.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

у атмасферы вострых маральных пошукаў. Пісьменнік узнімае нямала актуальных праблем сучаснасці, шукае адказу на іх, заве да роздуму і спрэчак. Ужо адно гэта гаворыць аб творчым поспеху празаіка"[141].

Сапраўды, пры ўсіх мастацкіх выдатках пісьменніку ўдалося перадаць супярэчлівасць таго часу, непрадказальнасць руху чалавечых лёсаў, вырашэння спрадвечных задач. Ён змог паказаць грамадства такім, якім яно было, альбо бачылася творцу, адлюстраваў асаблівасці тагачаснай дзяржаўнай сістэмы. І пісьменнік імкнуўся не ставіць катэгарычную кропку ў сваіх мастацкіх высновах. У творы застаецца права дадумваць нешта і чытачу. У прыватнасці, фінал рамана, калі раз'юшаны Іван Васільевіч жорстка развітваецца з Будыкам, даведаўшыся, што ўсе даносы зыходзілі з яго інстытута. Ці такі ўжо зламыснік Будыка, як гэта ўяўляецца Івану Васільевічу. Хутчэй гэта яго бяда, што прыгрэў такога чалавека, як Кляпнёў. Але што тут зробіш: так ужо была сфарміравана сістэма, калі ў кожнага больш-менш значнага начальніка савецка-партыйнай установы быў чалавек на падхваце, які знаходзіў, прабіваў, арганізоўваў, што ў крымінальным свеце лічылася "шасцёркай". Пра якія маральныя прынцыпы тут магла весціся гаворка. Таму максімалізм меркаванняў Антанюка і ў гэтым выпадку падаецца празмерным.

Але ўвогуле раман І.Шамякіна стаў дасягненнем не толькі свайго часу, але мае пэўныя вартасці зараз, бо ў ім выходзяць на пярэдні план сітуацыі і рысы жыцця, якія тады здаваліся перыферыйнымі.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

[141] Навуменка, І. У амасферы духоўных пошукаў / І. Навуменка // Шамякін, І. Снежныя зімы. – Мн.: Беларусь, 1970. – С. 414.

ДАРОГАМІ МУЖНЫХ ЗМАГАРОЎ

Творчасць Івана Новікава

Ваеннае пакаленне пісьменнікаў, якое гартавалася на франтах Другой сусветнай вайны (у нас Вялікай Айчыннай), уваходзіла ў літаратуру па-рознаму. Нехта заявіў пра сябе яшчэ ў час вайны – у гады яе пераможнага шэсця або адразу пасля ўсталявання міру. Іншыя раскрылі свой талент праз дзесяцігоддзе, нібы вывяраючы свой жыццёвы вопыт, апрабіруючы сваё творчае пяро перш за ўсё праз жанры журналістыкі. Сярод апошніх быў і Іван Новікаў.

Іван Рыгоравіч Новікаў нарадзіўся 21 студзеня 1918 года ў вёсцы Незнань цяперашняга Клімавіцкага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і. Бацькі не дужа раскашавалі на невялікім надзеле зямлі, а ў пачатку трыццатых сталі калгаснікамі. На тым прыватніцкім жыцці і ўвогуле на праблемах тагачаснай вёскі Іван Новікаў не засяроджваў увагі. Яго больш цікавілі шырокія грамадскія падзеі, усё тое, што непасрэдна можна было звязваць з будаўніцтвам сацыялізму з перспектывай на блізкі камунізм.

Пасля заканчэння першай Клімавіцкай сямігодкі І. Новікаў па рэкамендацыі Аляксея Кулакоўскага (тады супрацоўніка раённай газеты "Камуна" і члена бюро райкома камсамола) паступіў у Магілёўскі газетны тэхнікум, пасля заканчэння якога вярнуўся ў сваё роднае перыядычнае выданне. Там праходзіў адпаведную школу журналістыкі, але было жаданне вучыцца далей: набыць вышэйшую журналісцкую адукацыю. Спачатку прыйшлося паступаць у 1938 годзе ў Аршанскі настаўніцкі інстытут, бо, як адзначае сам пісьменнік у нататках "Сярод добрых людзей", змешчаных у кнізе біяграфій беларускіх пісьменнікаў "Пра час і пра сябе", не было набору на журналісцкую спецыяльнасць. (Інфармацыя недакладная: у тым жа годзе А.Пысін быў залічаны студэнтам першага курса Мінскага камуністычнага інстытута журналістыкі). У 1939 г. усё ж стаў студэнтам Ленінградскага камуністычнага інстытута журналістыкі, дзе вучобу перарвала вайна. Закончыў ваеннае вучылішча, пасля якога трапіў на службу ў элітны род войск ракетнай артылерыі, машыны-ўстаноўкі якіх на фронце былі любоўна празваны "Кацюшамі". Закончыў вайну ў Аўстрыі, непадалёку ад горада Лінц на пасадзе начальніка разведкі дывізіёна. Дэмабілізаваўся ў 1946 годзе, працаваў у газеце "Советская Белоруссия" літсупрацоўнікам, загадчыкам сельгасаддзела, завочна вучыўся на аддзяленні журналістыкі

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

філалагічнага факультэта БДУ, якое закончыў у 1954 г. У 1957 г. І. Новікаў быў прызначаны карэспандэнтам газеты “Правда” па Беларусі, а з 1965 г. стаў загадчыкам карэспандэнцкага пункта, на гэтай пасадзе працаваў да выхаду на пенсію. Дарэчы, карэспандэнтам газеты “Правда” ў той час працаваў і Генадзь Бураўкін, пра што сведчаць сумесна напісаныя матэрыялы.

Як і амаль усе літаратары, у юнацкім узросце пачынаў з вершаў, але сталая літаратурная праца бярэ адлік ад першых нарысаў, якія выйшлі асобнымі выданнямі – “Герой сацыялістычнай працы Тамара Шкурко” (1948, сааўтар В. Пыжкоў), “Дзесяць тыдняў у Злучаных Штатах Амерыкі”(1958), “Палескае золата”(1959), “Побач сябры” (1960).

Гэтыя творы рознай мастацкай каштоўнасці. І. Новікаў быў выхаваны на ідэалах камсамола і камуністычнай ідэалогіі, якім заставаўся верным усё жыццё, што рабіла істотны ўплыў на яго літаратурную творчасць. Не абышлося без пэўных перакосаў у паказе амерыканскай рэчаіснасці, напрыклад, многае падавалася ў спрошчаным або нават прыдуманым асвятленні. Патрэбна было паказаць капіталізм гнілым, І. Новікаў гэта паспяхова рабіў, не асабліва, відаць, задумваючыся над аб’ектыўнымі фактамі. Нарысам пра працаўнікоў калгасаў і заводаў часам бракавала аналітызму, умення нетрадыцыйна паглядзець на ўсе працэсы ў іх супярэчлівым стане, многае проста ідэалізавалася. Сваё прызванне і прызнанне І. Новікаў знайшоў у іншым: асноўным кірункам мастацкай творчасці стала тэма вайны, асэнсаванне яе ў літаратурна-дакументальнай прозе.

У 60–70-я гады асэнсаванне падзеяў вайны беларускай літаратурай дасягнула значных поспехаў, беларуская проза на гэту тэму стала вядомай далёка за межамі рэспублікі. Зварот да тых віхурных гадоў быў характэрны і для пісьменнікаў старэйшага пакалення, і для пісьменнікаў-франтавікоў, якія прыйшлі ў літаратуру ў сярэдзіне пяцідзясятых, і для маладзейшых сведкаў вайны, як іх пазней назвалі “дзецьмі вайны” або “шасцідзясятнікамі”. Менавіта ў гэты час грамадства, ужо здаволіўшыся паказам гераікі вайны ў глабальных маштабах, хацела ўбачыць ў літаратуры дакументальныя сведчанні пра тое, як гэта ўсё было ў нейкім адным канкрэтым месцы, асабліва на акупаванай тэрыторыі, суаднесці з уласна перажытым. Гэтым тлумачыцца і зацікаўленасць мемуарнымі творамі высокіх военачальнікаў. Аднак і там вайна бычылася толькі з кабінетаў Вярхоўнай стаўкі альбо са штаба камандуючага фронтам. Такім чынам, звычайны чалавек губляўся ў агульных стратэгічных раз-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

важаннях аўтараў падобных твораў. А іменна іхнія лёсы і пачалі найбольш цікавіць чытача з яго жаданнем убачыць праўдзівае сведчанне пра радавых удзельнікаў вайны. Відаць, таму ў 1970-я – пачатку 1980-х пісьменнікі імкнуліся стварыць ілюзію дакументальнага пацверджання ўсяго, што адбылося. Гэта імкненне асабліва характэрна для рамана У. Багамолава "Жнівень 44-га", дзе прыводзяцца многія быццам бы рэальныя сакрэтныя дакументы. Падобную містыфікацыю выкарыстаў і В. Быкаў у аповесці "Яго батальён", змясціўшы замест эпілога даведку з архіва: нібыта маёр Валошын загінуў смерцю героя пад Кёнігбергам. Патрабаваннем выяўлення праўды вайны тлумачыцца і зварот да дакументальнай прозы сярэдняга пакалення літаратараў (Г. Бураўкін "Тры старонкі з легенды", У. Дамашэвіч "Порахам пахла зямля" і інш.).

На збліжэнне мастацкай прозы з дакументальнай звярнуў увагу на пачатку 80-х гадоў П. Дзюбайла. "*Нярэдка бывае так, што дакументальны, мемуарны, аўтабіяграфічны матэрыял пераўтвараецца настолькі, што выглядае самым што ні ёсць вымыслам, а выдумка, імітацыя дакумента – сапраўднай рэальнасцю. Галоўнае – у арганічным сплаўленні двух пачаткаў – рэальнага і прыдуманага, у майстэрстве мантажу. Мадэліраванне і мантаж дазваляюць пісьменніку стварыць нанова адзінства жыццёвага часу і прасторы, паказаць у мастацкіх вобразах ужо новую, мастацкую рэальнасць, паказаць так, каб не адчувалася, што дакумент і вымысел – розныя, нават супрацьлеглыя тыпы адлюстравання рэчаіснасці*"[142]. Асабліва гэта важна пры напісанні дакументальна-мастацкага твора. Дакументалістам часам бракавала гэтага мастацкага вымыслу, знітаванасці яго з канкрэтнай жыццёвай праўдай.

Гэта ўласціва і творам І. Новікава. Прытрымліваючыся канкрэтна зафіксаванага дакументальнага факта, пісьменнік не адважваўся на стварэнне калізій і сітуацый, у якіх найбольш поўна мог бы выразіцца псіхалагічны стан герояў. Разам з тым асаблівасцю твораў І. Новікава з'яўляецца і тое, што ён зусім не закранае лагер праціўнікаў, супраць якіх і вядзецца змаганне. Яны застаюцца, як кажуць, за кадрам, паколькі мэтай празаіка было раскрыць маштабнасць дзеяння і нязломнасць герояў падполля. Першай спробай увасаблення гераічнага характару і драматычных абставін з'явіліся публікацыі пра Веру Харужую. Несумненна, І. Новікаў улічваў вынікі мастацкага выяўлення падзей у былой Заходняй Беларусі (раман П. Пестрака "Сустрэнемся на барыкадах", аповесць А. Бажко "Перад вераснем", Я. Брыля "Сэрца

[142] Дзюбайла, П.К. Беларускі раман: гады 70-я. Мн.: Нав. і тэхн., 1982. – С. 61.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

камуніста”, творы аўтабіяграфічныя і біяграфічны). Журналісцкі вопыт падказаў І. Новікаву сюжэтна-кампазіцыйную будову кнігі “Сэрца інакш не можа: Дакументальная аповесць пра Веру Харужую” (1960). Ён у храналагічнай паслядоўнасці раскрывае станаўленне будучага авангардыста камуністычнага будаўніцтва. У гімназічным узросце часу савецка-польскай вайны 1919–1920 гадоў дзяўчынку страшэнна ўразіў прыход у правінцыйны горад акупантаў, у вніку падзей у яе саспела перакананне аддаць усю сябе для барацьбы за лепшае будучае чалавецтва, якое яна наўрад ці ўяўляла. Але пісьменнік настойліва пераконвае, што якраз тады праявілася надзвычайная праніклівасць дзяўчыны, яе непахісная вера ў шчаслівую будучыню.

У адпаведнасці з тагачаснымі канонамі паказу тыповага бальшавіка пісьменнік вядзе сваю гераіню праз цэлае кола выпрабаванняў, уласна абазначаных самой яе жыццёвай дарогай. Але пад пяром І. Новікава яна ўсё больш атрымлівае рысы “жалезнага камісара”, бо ніколі не дапускае хістанняў. Пры гэтым дзейнічае часта вельмі жорстка, разважае безапеляцыйна яшчэ ў юнацкім узросце, калі з’яўлялася звычайным байцом “ЧОН”а. Несумненна, у яе рана праявіліся здольнасці арганізатара, але светапогляд выяўляў хутчэй кангламерат тагачасных палітычных лозунгаў. Праўда, яна не ведае абсалютна ніякіх сумненняў, прамалінейна вырашае мнагалікія праблемы, і гэта пісьменніку здаецца найлепшым праяўленнем камуністычнай прынцыповасці. Вось яна ўжо у Доме юнацтва вядзе дыскусію з дырэктарам Сакольскім адносна працэсу выхавання моладзі. На заўвагу кіраўніка, што празмерная свабода можа прывесці да анархіі, Вера катэгарычна заяўляе: “*Вы вельмі памыляецеся, Аляксандр Антонавіч. Самакіраўніцтва зусім не закранае Ваш аўтарытэт. Трэба прывучыць членаў камуны самастойна вырашаць свае жыццёвыя пытанні. Што ж скажа пра вас партыя, калі вы выпусціце са свайго калектыву бездапаможных, нясмелых людзей, здольных дзейнічаць толькі па чужой указцы*”[143]. Сапраўды, сказана правільна і гучыць надзённа. Ніхто не будзе спрачацца, што маладое пакаленне павінна расці творчым, ініцыятыўным, мець сваю думку. Аднак, як паказала жыццё, таталітарнай дзяржаве якраз і не патрэбны былі такія асобы, бо цаніліся бяздумныя выканаўцы. Пэўная пісьменніцкая зададзенасць адчуваецца ва ўсім аповедзе пра гэту неардынарную жанчыну. Таму асоба гераіні паўстае ў іпастасі нязломнага бальшавіцкага

[143] Новікаў, Іван. Сэрца інакш не можа: Дакументальная аповесць пра Веру Харужую // Маладосць. – 1960. – № 8. – С. 21.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

камісара, пісьменнік амаль не засяроджвае ўвагу на яе звычайных чалавечых пачуццях і перажываннях. Яго гераіня ўся ў дзеянні, натхнёнай пралетарскай няўрымслівасці. Так, калі В. Харужая апынулася ў польскай турме, дык яе грамадзянская актыўнасць рэалізавалася ва ўдзеле ў шматлікіх акцыях: выкладала палітграмату, навучала рускай мове і літаратуры, іншым прадметам, але ні слова не гаворыцца пра беларускасць, хоць вядома, што В. Харужая пісала на беларускай, польскай і рускай мовах. Замоўчваюцца таксама многія трагічныя выпадкі з жыцця палымянай рэвалюцыянеркі пасля вяртання з Заходняй Беларусі, калі яе, абвінаваціўшы ў здрадніцтве, адправілі ў сталінскія лагеры. Пра гэта сказана бегла, некалькімі сказамі. Непераканаўча раскрыты заключны этап жыцця В. Харужай – уся дзейнасць у час яе знаходжання ў перыяд вайны ў Віцебску паказана неяк плакатна.

У 60-я гады XX ст. беларуская мастацкая літаратура ўпэўнена выходзіла на праўдзівае асэнсаванне ўсіх перыпетый жыцця на акупаванай тэрыторыі, сапраўднага яго драматызму. Не кожнаму пісьменніку тады хапала быкаўскай бескампраміснасці ў паказе чалавека ў экстрэмальнай сітуацыі, калі ён станавіўся перад праблемай выбару. Вялікія цяжкасці ў гэтым плане адчувалі прадстаўнікі мастацка-дакументальнай прозы, калі аўтары былі абмежаваныя ў магчымасцях вольнай інтэрпрэтацыі трагічных сітуацый. Але прыхільнікам такой прозы І. Новікаў якраз і не быў. Яго больш цікавіла гераічна-пераможнае. Таму ён і выкарыстоўвае ў аповесці “Тварам да небяспекі” (1968) апрабаваны мастацкі прыём выяўлення падзей праз біяграфію галоўных герояў Міколу і Таццяну Нагібавых, рэальных удзельнікаў падпольна-партызанскай барацьбы на Віцебшчыне. Тут ён засяроджвае ўвагу ў асноўным на гераічным, на тых момантах, у якіх героям прыходзіцца пераадольваць неймаверныя цяжкасці, рызыкаваць жыццём, перажываць уласныя трагічныя страты, але яны заўсёды выходзяць пераможцамі. Таму і трагізм традыцыйна нейтралізуецца перавагай пафасных сцверджанняў менавіта за кошт апісальнасці, а не паказу ўнутранага жыцця сваіх герояў. І гэта з’яўляецца характэрнай рысай творчасці пісьменніка. Таму і барацьба падпольшчыкаў, смерць многіх праз катаванні ў аповесці не набывае асаблівага трагізму, бо галоўнае – перамога, наступленне мірнага жыцця. Заключны акорд твора напамінае фінальную сцэну шамякінскай “Глыбокай плыні”. Віцебск вызвалены. “*Па дарозе купкамі ішлі людзі. Схуднелыя, змардаваныя жанчыны і дзеці з трывогай глядзелі туды, дзе яшчэ шугала полымя і дыміліся шкілеты камяніц.<…> Горад ляжаў*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

у руінах. Мікола пазнаваў і не пазнаваў знаёмыя мясціны. Ад некаторых будынкаў засталіся толькі груды бітай і абгарэлай цэглы, ад другіх – голыя абгарэлыя сцены з цёмнымі праваламі вокнаў і дзвярэй. Горад быў мёртвы"[144]. У гэтай сумна-ўражлівай сітуацыі Мікола Нагібаў сустракае абласное кіраўніцтва, а Васіль Раманавіч, былы прадстаўнік абкома партыі пры штабе партызанскай брыгады, гаворыць герою: "*Тут ваяваў, тут і будаваць будзеш*"[145].

Значны грамадска-палітычны рэзананс атрымала трылогія І. Новікава "Мінскі фронт" (1977), прысвечаная падзеям гераічнага змагання ў акупаваным Мінску, у якую увайшлі аповесці "Руіны страляюць ва ўпор" (1962), "Дарогі скрыжаваліся ў Мінску" (1964) і "Да світання блізка" (1975). Аповесці неаднолькавыя ў сюжэтна-кампазіцыйнай будове, кампанаванні асобных раздзелаў, прысвечаных падполлю і кіраўніцтву партызанскіх атрадаў. Гэта тлумачыцца як знешнімі, так і ўнутранымі фактарамі. На пачатку перад пісьменнікам паўставала задача змены поглядаў на мінскае падполле, адназначна замацаваных неўзабаве пасля вайны партыйным кіраўніцтвам, на аснове якога вынікала, што нібыта падполле дзейнічала пад эгідай акупантаў, каб вынішчаць патрыятычна настроеных людзей. Пасля неабходна было разгарнуць падзеі ў прасторы, увязаць паказ падпольнага змагання з агульнай партызанскай барацьбой супраць фашысцкіх акупантаў на тэрыторыі Беларусі.

Трылогія ў значнай ступені дапаўняла беларускую мастацкую прозу на тэму вайны. Барацьба мінскіх падпольшчыкаў паказвалася ў раманах 1940-х гадоў М. Лынькова "Векапомныя дні" і І. Мележа "Мінскі напрамак", але ўсе героі былі выдуманыя, хоць за некаторымі ўгадваліся прататыпы. Праблему не вырашалі ні раман У. Карпава "Нямігі крывавыя берагі" (1962), даволі стрымана ўспрыняты крытыкай, ні яго ж зборнік апавяданняў і ўспамінаў "Прызнанне ў нянавісці і любві" (1973), ні аповесць І. Шамякіна "Гандлярка і паэт" (1975), якая выклікала кароткую дыскусію. Дакументальныя аповесці І.Новікава закрывалі даўно пуставаўшую тэматычную нішу і рабілі даволі паспяхова: адзначаныя прэміямі рознага ўзроўню, яны разам з дакументальным аповедам М. Матукоўскага "Тысяча сто дзён" нямала пасадзейнічалі прысваенню Мінску ганаровага звання "Горад-герой".

[144] Новікаў, І. Тварам да небяспекі: Дакументальная аповесць / І. Новікаў. – Мн.: Беларусь, 1968. – С. 350, 351.

[145] Тамсама. – С. 351.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Адметнасць трылогіі ўжо ў тым, што пісьменніку ўдалося ажывіць гераічныя старонкі масавага подзвігу ў акупаваным горадзе, гэта ў той час, калі яшчэ не склаліся адпаведныя традыцыі дакументальнай прозы, а вопыт папярэднікаў быў у большасці недаступным, бо твор "На імперыялістычнай вайне" М. Гарэцкага яшчэ чакаў поўнай рэабілітацыі. Да таго ж, у пісьменніка не было ўласнага вопыту барацьбы ў такіх умовах, калі няясна выражалася мяжа паміж антанімічнымі паняццямі "свой – чужы", таму ён імкнуўся ісці ад факта, дабытага пошукавым шляхам, пазбягаў унутраных псіхалагічных характарыстык, арыентуючыся ў асноўным на апавядальна-апісальны метад. Ды гэта не перашкаджала выяўляць індывідуальнасці, маляваць яркія партрэты тых, з каго фармавалася заканспіраваная армія народнага супраціўлення. Пераважна гэта былі звычайныя гаражане, сяляне, мясцовая інтэлігенцыя з прыгарадных вёсак, якія не лічылі сябе героямі, а проста жылі па законах сумлення, народнай традыцыі, перш за ўсё імкнучыся дапамагчы чалавеку, які мае ў гэтым патрэбу. І героямі станавіліся многія, калі гэтага патрабавала сітуацыя. Так выяўлялася не толькі годнасць чалавека, але і агучвалася гуманістычная ідэя самакаштоўнасці жыцця, паколькі рабілася ўсё дзеля будучыні.

Пісьменнік імкнуўся разгледзець у кожным адзінкавым здабытым факце агульную заканамернасць разгортвання драматычных падзей няроўнага змагання, дайсці да асэнсавання душы народа, усведамлення ім сябе як нацыі, якую знішчыць немагчыма. І. Новікаў падрабязна апісвае, як арганізоўваліся асобныя групы, як і чаму яны пашыраліся. Дакументы, сведчанні жывых удзельнікаў тых падзей давалі магчымасць паказаць дакладную карціну барацьбы, якая сапраўды не супадала з раней прынятамі афіцыйнымі сцверджаннямі. Архіўныя матэрыялы, успаміны выжыўшых удзельнікаў барацьбы засведчылі, што хуткая акупацыя Мінска не дазволіла арганізаваць падполле, пакінуць афіцыйных кіраўнікоў. Як высветліцца пазней, Мінскі падпольны абком размяшчаўся ў балоціста-лясных нетрах Любаншчыны і да сталіцы ніякіх адносін не меў. І пісьменнік пераканаўча паказвае, што ў першую чаргу пасля шокавага стану ад такой хуткай акупацыі Мінска пачынаюць абуджацца патрыятычна настроеныя мінчане. Яны паступова арганізоўваюцца ў асобныя групы, не звязаныя між сабой. Прафесійна не падрыхтаваныя да новых умоў жыцця, яны дапускаюць шмат пралікаў.

Натуральна, першае стыхійнае супраціўленне ворагу, непрызнанне яго вершнасці праявілася ў карэнных мінчукоў старэйшага пакалення, якія мелі сякі-такі вопыт падпольнай дзейнасці з часоў грамадзян-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

скай вайны, а, мажлівей, з расійска-нямецкай і савецка-польскай. Яны разумелі, што толькі строгая канспірацыя засцеражэ ад правалаў. Рознымі шляхамі людзі ўключаліся ў смяротную барацьбу. Як высвятлілася, часцей арганізоўваліся групы па месцы жыхарства, па сумеснай даваеннай працы, паступова сюды ўваходзіла моладзь. Аснову першага гаркома склалі Заяц, Амяльянюк, Нікіфараў, Сямёнаў, Грыгор'еў, пазней Казінец, многія армейскія камандзіры, што па волі лёсу апынуліся ў акупаваным Мінску. Пісьменніку асабліва важна было падкрэсліць, што менавіта камуністы-бальшавікі станавіліся асноўнай цэментуючай сілай. Пры гэтым з твора вынікае, што большасць падпольных груп складалі ўсё ж не карэнныя мінчане, а былыя вайскоўцы, камісары, партыйныя і савецкія служачыя, якія воляй лёсу апынуліся ў акупаваным Мінску. У першай кнізе І. Новікаў раскрыў сістэму стварэння разгалінаванай патрыятычнай арганізацыі. Дзейнічалі групы на чыгунцы, у бальніцы, на некаторых функцыяніуючых фабрыках. У іх склад уцягвалася шмат людзей, часам і выпадковых, або надта амбіцыйных, пераважна з былых ваенных, што неўзабаве прывяло да першага правалу.

Што ўсё ж уздымала людзей на барацьбу? Пэўна ж не толькі вынікі ідэалагічнай апрацоўкі на працягу двух дзесяцігоддзяў, а нешта яшчэ іншае, што прымушала людзей браццца за самыя небяспечныя справы. Сапраўды, прыродны альтруізм беларусаў не мог не праявіцца ў цяжкую хвіліну, каб аказаць дапамогу людзям, што трапілі ў цяжкае, а часам і жахлівае становішча. У некаторых выпадках такая самаахвярнасць наогул выклікае ўтрапенне: як можа жанчына, у якой малыя дзеці, не задумвацца над небяспекай, абумоўленай яе падпольнай дзейнасцю, і для сябе, і для сям'і. Такая безапеляцыйнасць мыслення, рашучасць у меркаваннях і дзеяннях хутчэй уласціва была маладым камсамолкам, калі ўжо адпавядаць праўдзе жыцця. У творы паказваюцца і некаторыя кіраўнікі падполля, якія быццам не заўважаюць усёй трагедыі жанчын: пісьменнік пастаянна напамінае, што найвышэйшай каштоўнасцю з'яўляецца жыццё чалавека. У мастацкай літаратуры ў 1960–1970-х гадоў ужо былі вобразы Маці-пакутніцы, жанчын-ахвярніц, якія адкрыта выяўлялі свой вялікі душэўны боль, нават сардэчны надрыў, калі бласлаўлялі сваіх дзяцей і мужоў на святую барацьбу (раманы А. Адамовіча, Я. Брыля, І. Навуменкі). Магчыма, такая стрыманасць жанчын тлумачыцца і тым, што І. Новікаў не адважваўся паказаць праявы страху ў душах жанчын, каб такой часовай слабасцю не прынізіць загінуўшых гераінь, не пакрыўдзіць іх жывых родзічаў.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Сапраўдныя гераіні ў трылогіі – сувязныя, якія ў любую непагадзь, праз варожыя гарнізоны і вакол іх хадзілі з партызанскіх атрадаў у Мінск, прыносілі адтуль звесткі з Вялікай зямлі, забіралі разведдадзеныя ў падпольшчыкаў, былі сапраўднымі ахвярнікамі. Пісьменнік свядома рамантызуе іх, паэтызуе іх воблік. "*Было іх многа. Дзесяткі, а можа і сотні тысяч. Зараз ніхто не можа сказаць, колькі было іх. Некаторых савецкіх патрыётаў, якія жылі ў стане ворага, ведалі толькі камандзіры атрадаў ды іх намеснікі па разведцы. Гэтага патрабавала канспірацыя. Многія так і загінулі, не пакінуўшы нам свайго імя*"[146]. Праўда, у трылогіі пісьменнік не згадвае тыя выпадкі, калі пасля вайны многія патрыёты адбывалі пакаранне ўжо ў савецкай турме, паколькі не маглі даказаць сваю сувязь з партызанамі.

Са шчырай цеплынёй піша І. Новікаў пра штодзённую рызыку многіх дзяўчат, якія хадзілі з партызанскіх зонаў у Мінск, сустракаліся там з падпольшчыкамі, прыносілі ў атрады важныя звесткі. Ядзя Дубінская, Надзя Траян, Зіна Завістовіч працавалі аддана, ніколі не прасілі адпачынку, бо верылі, што і гэтым прыбліжаюць перамогу над ворагам.

Пра сваіх юных гераінь пісьменнік гаворыць захоплена, з вялікай павагай. Раскрываючы іх трагічны лёс, ён паспяхова дэзавуалюе несправядлвасць ранейшай недааценкі мінскага паполля, падкрэслівае масавасць супраціўлення ворагу.

Праўда, пісьменнік не заўсёды ўлічваў быт многіх людзей, барацьбу большасці за права проста жыць, бо і гэта заўсёды было пад пагрозай.

Пры гэтым трагізм сітуацыі ў творах умела перададзены, ёсць пастаяннае адчуванне, што людзі знаходзяцца на мяжы магчымага, пераадольваюць натуральную разгубленасць пры трагічных абставінах, не паддаюцца стыхіі панікі. Гэта пастаянна ў полі зроку пісьменніка, ён падкрэслівае ахвярнасць і нястомнасць арганізатараў падпольнай барацьбы, але часам ідзе і аблегчанымі шляхамі. Ужо на першых старонках акупанты паказаны фанабэрыстымі істотамі, у большасці страшэнна абмежаванымі. Магчыма, і тут ёсць доля праўды, бо значная частка немцаў на пачатку вайны, апрацаваная фашысцкай ідэалогіяй, адчувала сваю вышэйшасць перад славянамі. Але паказваць іх такімі недарэкамі ўсё ж не правамерна, бо незразумелым тады становіцца першы моцны ўдар ворага па мінскім падполлі.

У сувязі з гэтым варта адзначыць, што адукаваным людзям, у тым ліку і моладзі, была вядома сутнасць фашысцкай ідэалогіі. Яна раскры-

[146] Новікаў, І. Выбр. тв.: у 3 т. / І. Новікаў. – Мн.: Маст. літ., 1988. – Т. 2. – С. 228–229.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

валася ў творах І. Эранбурга, Э. Самуйлёнка, публіцыстыцы Я. Коласа. Несумненна, такія творы служылі патрыятычнаму выхаванню. Таму і стала моладзь у першыя шэрагі змагароў: Іван Кабушкін, Уладзімір Амельянюк, Захар Гала, Саша Макаранка, Васіль Жудро і інш. Для іх не ўзнікала праблемы: ўключацца ў барацьбу ці пачакаць высвятлення многіх абставін. Па перакананнях яны ў многім былі падобныя, хоць кожны вызначаўся сваім характарам, запасам псіхалагічнай раўнавагі, успрыманнем складанай рэчаіснасці. Агульнасць светаўспрымання моладзі найбольш выражана ў разважаннях Володзі Амельянюка. "*Як перакруціла яго жыццё праклятая вайна! Ён ужо закачваў інстытут журналістыкі. <…> Вывучаць жыццё, вывучаць людзей, пісаць аб іх справах горача, з натхненнем – вось запаветная мара… І што асталося ад яго мары*?" Таму ён "*таксама павінен біць ворага магутнай зброяй – праўдзівым словам камуніста*"[147]. Так думала ўся патрыятычна настроеная моладзь, любымі сродкамі імкнучыся ўнесці свой уклад у вялікую барацьбу.

Паказальна, што пісьменніку ўдалося стварыць калектыўны вобраз юных змагароў, нягледзячы на тое, што ён не засяроджвае ўвагу на ўнутраным стане сваіх герояў. Яму дастаткова паказваць знешне выразныя зрухі душы, якія і вызначаюць учынкі. Часам І. Новікаў рамантызуе сваіх герояў, нават у нейкай ступені ідэалізуе, што асабліва вызначальна ў адносінах да Жана – Івана Кабушкіна. Такі герой патрэбны быў літаратуры таго часу. ён увасабляў сабой не толькі ўсё гераічнае паполле, але і сваё пакаленне. Архіўныя звесткі і сведчанні знаёмых гераічнага падпольшчыка даюць магчымасць пісьменніку надзяліць Кабушкіна рысамі супергероя. Разам з тым ён паўстае ў творы надзвычай чуйным, высакародным чалавекам, які не забыў сваіх каранёў, хоць і вырас далёка ад Беларусі. Менавіта на ім трымалася разведка і контрразведка ў падполлі, а таксама ў партызанскім атрадзе, на Лагойшчыне, дзе быў намеснікам камандзіра атрада па разведцы. Выключныя якасьці характару Кабушкіна праяўляліся ў дачыненнях з рознымі людзьмі, як патрыятычна настроенымі, актыўнымі змагарамі, так і проста сумленнымі людзьмі, што маглі выручыць у цяжкую хвіліну. А такіх, вядома, была большасць. На падставе выяўленых у архівах запісак, успамінаў застаўшыхся ў жывых удзельнікаў падполля І. Новікаву ўдалося ўсебакова раскрыць характар героя. Мужнасць гэтага чалавека яскрава праявілася, калі ён праз маладушнасць сувязной

[147] Новікаў, І. Выбр.творы, – Т. 1. – С. 27.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

апынуўся ў засценках СД. Ён працягваў барацьбу, вытрымліваў жорсткія катаванні, але не назваў ніводнага прозвішча, узнімаў дух нязломнасці ў іншых вязняў, не пакідаў надзеі вырвацца з засценкаў. Пра гэтага героя пісьменнік піша ўзвышана: "*Надзея на ўцёкі не пакідала Жана. Пакуль білася яго сэрца, пакуль яшчэ светлы быў розум, не знікала прага да барацьбы, воля да перамогі. <…> Прыслухоўваючыся да кожнага гуку, Жан рыхтаваў уцёкі. Усё было ўжо гатова, толькі арыштаваныя латышы пачулі падазроны шум у яго камеры і выклікалі варту.*

Жана перавялі ў другую камеру, якая зачынялася моцным замком. Цяпер у яго не было нават тых просценькіх прылад, якія перадалі яму падпольшчыкі…"[148]. Спадзяванне на выратаванне абрывалася, але гэта не скарыла яго духу, пра што сведчыць яго апошняя запіска на волю, змешчаная ў тэксце твора: "*Родныя! Дык вось прамень зноў асвятліў маю "келлю". Я рад, што вы жывыя. Так, настрой некалькі пагоршыўся. Як тут весяліцца, калі ў адзін дзень сядзелі ўсе мае, я – дзесяты. Усе ж мае родныя, зразумей!.. Я ж гуляў, а тут ужо талмуды на мяне заведзены з 1941 года…*

Ну, у адносінах мяне – зацішша. Я мяркую так, што новага яны не дабіліся, усе катаванні не ўвянчаліся поспехам, і рашылі, відавочна, да 1 Мая вывесіць як "падарунак" для народа. Ну, зразумей, як інакш? Яны ж ніводнага чалавека не атрымалі, а супраць мяне матэрыял з 1941 года і даволі-такі салідны.

А што мне рабіць? Я ж рашыў цвёрда: усё сваё жыццё прысвяціць барацьбе з ворагам усяго прагрэсіўнага чалавецтва, за народ, за Радзіму! І раптам, калі даводзіцца аддаць жыццё, стаць нягоднікам?..

Ты гаворыш – яшчэ мала паработалі і жыццё трэба берагчы. Ну, а калі няма выйсця, і каб маё імя не было зняважана будучымі шчасліўцамі! Вось так і трэба ставіць пытанне – памерці, дык з музыкай!.. Усё зраблю і раблю, толькі каб ніхто не пацярпеў.

Ну, ты нешта маўчыш пра Радзіму, дай знаць пра яе… Трывогі чую, і для мяне гэта вялікі і прыемны канцэрт…"[149].

Нават калі дапусціць, што тэкст запіскі крыху падшліфаваны стылістычна, то і ў гэтым выпадку адчуваецца сіла волі, прага да жыцця і вера ў канчатковую перамогу прагрэсіўных сіл.

Як ужо адзначалася, І.Новікаў асноўную ўвагу ўдзяляе выяўленню гераічнага, прычым робіць гэта пераважна апісальна. Такое заўважаецца

[148] Новікаў, І. Выбр. творы. – Т. 1. – С. 348, 349.
[149] Тамсама. – С. 349–350.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А.Кулешова

пры паказе гераічных спраў маладых падпольшчыкаў Валодзі Амельянюка, Васіля Жудро, Аляксандра Макаранкі і многіх іншых. Акцэнтуецца ўвага на іх бясстрашшы, вялікай любові да Радзімы, нянавісці да ворагаў, што, несумненна, ішло ад камсамольскага выхавання, на гэта пастаянна і спасылаецца пісьменнік. Многія маладыя хлопцы і дзяўчаты адразу варожа паставіліся да акупантаў, іх светапогляд не змяніўся, а ўмацавалася вера ў свае ідэалы. Яны верылі, што неўзабаве ўсё павінна перамяніцца, варта толькі быць непахіснымі, пацвердзіць свае словы справамі, не даць права нікому ўсумніцца ў іх магчымасцях. А межаў, здаецца, не існавала. Праўда, пісьменнік не заўсёды лічыў патрэбным падрабязна расказваць пра іх непасрэдныя справы, ён больш засяроджвае сваю ўвагу на розных пасяджэннях падпольных груп, дзе прымаюцца важныя рашэнні пра разгортванне падпольнай барацьбы, перасылцы байцоў у партызанскія атрады, падборы сувязных і асабліва па разгортванні актыўнай агітацыі сярод насельніцтва: падрыхтоўка і друкаванне лістовак, распаўсюджванне іх, захады па арганізацыі падпольных друкарняў, перадачы шрыфтоў у партызанскія атрады.

У мастацкай літаратуры на пачатку 1960-х гадоў заўважаецца тэндэнцыя для скрупулёзнага выяўлення прычын нарастання барацьбы з ворагам. Пры паказе паступовага ўцягвання людзей ў справу агульнанароднага значэння адзначаецца асцярожны і ўдумлівы падыход старэйшага пакалення, максімалізм у дзеяннях моладзі, нават некаторае пазёрства і заліхвацкасць у адносінах да акупантаў на першых тыднях акупацыі (творы І. Навуменкі і А. Адамовіча). Нешта падобнае паказвае і Новікаў у паводзінах Ул. Амельянюка. Гэты мужны юнак, каб паздзекавацца з фашыстаў-манекенаў, раптам выкрыквае вядомае фашыстоўскае прывітанне, а потым задаволена рагоча, калі немцы спуджана дранцвеюць. Такую нечаканую і небяспечную гарэзлівасць юнака можна было б зразумець, калі б гэта давала нешта да яго асноўнай падпольнай працы. А тут атрымліваецца наадварот. Рызыкоўная бравада магла закончыцца арыштам, а гераічная справа выдання падпольнай газеты застацца праблематычнай. А ўвогуле ў аповесці пісьменніку ўдалося стварыць абаяльны вобраз маладога падпольшчыка, таленавітага пачынаючага журналіста, умелага канспіратара.

Ненсумненна, трылогія І. Новікава створана па законах сацыялістычнага рэалізму, дзе відавочная тэндэнцыя выяўлення не як было альбо магло быць, а толькі як павінна быць. Таму героі аднолькава дысцыплінаваныя, усе адносіліся з разуменнем да даручэнняў, і роля

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

кожнага ў барацьбе была выключная, і аднаму яму, як здавалася, магчымая. І гінулі яны ў засценках паліцыі з пачуццём гонару за выкананыя абавязкі. Юнакі і дзяўчаты хацелі жыць, і ў імя дастойнага жыцця ішлі на змаганне. Менавіта гэта меў на ўвазе пісьменнік, калі па кропельках узнаўляў тыя гераічныя дзеянні. Аднак прыём рэтраспекцыі ў паказе часу станаўлення светапогляду моладзі ў сваім падабенстве недзе надае творам аднастайнасць.

Для выяўлення маштабнасці супраціўлення ворагу І. Новікаву неабходна было пашыраць прасторавыя рамкі, бо зацятая барацьба не абмяжоўвалася адно Мінскам, але паказ яе не выходзіў за межы вобласці, дзе размяшчаліся партызанскія атрады. Больш за тое, у першай кнізе пастаянна падкрэсліваецца, што большасць з іх фарміравалася ў Мінску, у прыватнасці, іх ядро з мясцовых патрыётаў і вызваленых ваеннапалонных, а пасля ўжо яны разрасталіся ў баявыя адзінкі, але як гэта адбывалася пісьменніка быццам і не цікавіла. Можа і заканамерна, бо ўвагу, пра што ўжо гаварылася вышэй, у асноўным прыцягвала праца падпольнага камітэта. Праўда, часам не хапае аўтарскіх тлумачэнняў. Напрыклад, дзе бралася адзенне для змагароў, асабліва зімой, хто забяспечваў іх правіянтам. Так, ён паведамляе, што сувязныя, выдаючы сябе за сялян, былі па-сялянску дыхтоўна апранутыя, для канспірацыі ў санях або возе знаходзіліся торбы з каўбасамі, добрымі пластамі сала, нават з вэнджанымі кумпякамі. Адкуль усё гэта бралася, пісьменнік не тлумачыць. Але ў сённяшняга дасведчанага чытача гэта можа выклікаць роздум пра многія тагачасныя супярэчнасці. Вядома, што ў час вайны плён працы на сваіх сялянскіх надзелах выратоўвала не толькі саміх жыхароў, але і вялікую армію народных абаронцаў. І гэта трэба было вытрымаць, прыстасоўвацца да суровых абставінаў жыцця.

Зрэшты, трылогія не гістарычнае даследаванне народнага змагання, а дакументальна-мастацкі твор, таму пісьменнік мог і не абцяжарваць выклад матэрыялу залішнімі тлумачэннямі. Разам з тым ён імкнуўся самастойна развіваць пэўныя сюжэтныя лініі, выкарыстоўваць ужо апрабаваныя іншымі мастацкія прыёмы раскрыцця падзей, ствараючы паралельныя карціны, у якіх героі твора маглі самахарактарызавацца, мяняць храналагічную паслядоўнасць асобных эпізодаў падпольнай барацьбы. Праўда, ён павінен быў няўхільна прытрымлівацца дзяржаўных пастаноў адносна разгортвання змагання ў Вялікай Айчыннай вайне, што пазней пачыналі вызначаць усю стратэгію змагання.Таму І. Новікаў вымушаны сцвярджаць, што з 1943 года кіраўніцтва ўсім падполлем і

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

партызанскім рухам перайшло да Цэнтральнага партызанскага штаба. У сувязі з гэтым мяняецца і форма падачы матэрыялу. Менавіта ў гэты час на акупаваныя землі Беларусі засылаюцца мнагалікія групы розных ведамстваў, якія не толькі не ўзаемадзейнічалі паміж сабой, а ў некаторай ступені нават супернічалі, і не заўсёды разумна, што прыводзіла да трагічных развязак. Аднак І. Новікаў не акцэнтуе ўвагі на гэтых аспектах, а проста канстатуе, што з Цэнтра засылаліся мнагалікія групы, якія бралі пад кантроль і працу падпольшчыкаў таксама. Прытым, кожная група выстаўляла свае прэтэнзіі і патрабаванні, жорстка дабіваючыся выканання, не задумваючыся, чым усё гэта закончыцца для выканаўцаў. Замоўчвае ён і той факт, што групы энкаведыстаў засылаліся не столькі для барацьбы з ворагам, колькі сачыць за неблаганадзейнымі, а прасцей, збіраць капрамат на ўсіх, хто жыў на акупаванай тэрыторыі. Недзе ў гэтым плане вычытваецца ў творах і негатыўныя адносіны савецкай улады да ўсіх, хто заставаўся на акупаванай тэрыторыі. Такім чынам, поўнай карціны тагачаснага змагання пісьменнік, магчыма, і не раскрываў, але зрабіў галоўнае для свайго часу – паказаў, што падполле было патрыятычнае, а тое, што ворагі засылалі ў іх асяроддзе сваіх агентаў, толькі пацвярджала трагічнасць і напружанасць барацьбы.

Пісьменніку ўдалося выявіць шмат праўдзівых адметнасцей гэтай няроўнай і драматычнай барацьбы, засведчыць неардынарнасць кожнай асобы падпольшчыкаў, непрадказальнасць падзей з іх удзелам, хоць да глыбінных прычынаў многіх з'яў так і не даходзіць, задаволіўшыся знешнім апісаннем трагедыйных момантаў. Зусім натуральна, што ў пісьменніка, які ваяваў на фронце, было мала ўяўленняў пра падпольную барацьбу. Тым не менш, на падставе дакументаў ён узнаўляе многія стронкі таго жыцця, імкнецца спасцігнуць парадаксальную логіку многіх сітуацый, але недзе спыняецца на паўдарозе. Нават, здаецца, стрымлівае сябе. Так, Валодзя Вучыцель, адзін з чэкістаў, атрымаў заданне ўстанавіць даўнейшыя сувязі. Пераканаы ў тым, што савецкая ідэалогія стала свядомасцю кожнага чалавека, ён верыць, што амаль усе безаглядна гатовы падтрымаць любую засланую з Вялікай зямлі ў Беларусь групу. Але рэчаіснасць падносіла сюрпрызы (у нечым заканамерныя). Людзі з засцярогай ставіліся да ўсякіх засланцаў, горкія кур'ёзы здараліся з ранейшымі паслужнікамі НКУС, што прыводзіла ледзь не да правалу, бо тыя сексоты станавіліся такімі ж і для акупацыйнай улады. Валодзя пераканаўся ў гэтым, калі паслаў сувязную да адной такой "нкусаўскай патрыёткі". Пісьменніку спарэбіліся гэтыя факты, каб

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

лішні раз падкрэсліць, што вельмі часта станавіліся героямі сціплыя, непрыкметныя людзі, якія не білі сябе ў грудзі на шматлікіх сходах, не прысягалі ў вернасці ўладзе. Напрошвалася думка, што людзьмі кіравала не толькі ідэалогія ды вернасць пралетарскім ідэалам, а і тое важнае, глыбіннае, што перадавалася ад пакалення да пакалення праз гены і называлася этычнай прыстойнасцю народа.

Пра тое, што трылогія не задумвалася як адзіны сюжэтна прадуманы твор, сведчыць некаторая веернасць паказу падзей. Па сутнасці, пісьменнік распавядае пра адны і тыя ж падзеі, толькі ў кожным разе быццам пашыраючы межы дзеяння, уводзячы новых герояў, разгортваючы сферу дзеяння. Адсюль і тая ілюзія паўтарэнняў, і нават нечаканасцей, калі героі, якія загінулі ў часавым абсягу першай кнігі, дзейнічаюць у другой, а потым і ў трэцяй. Аднак і гэтыя мастацкія прыёмы былі вымушаныя, бо прыходзілася распавядаць пра людзей, якія не траплялі ў поле зроку раней, але дзейнічалі, сустракаліся, аказвалі значны ўплыў на ўсё, што адбывалася.

Праўдзівасць выяўлення жыцця характэрна для твораў. Пісьменнік справядліва сцвярджае, што ўсе групы разведчыкаў нібы прыкрываліся патрыятычным падполлем: сядзелі ў цэнтры партызанскіх зонаў і патрабавалі ад падпольшчыкаў, сувязных усё новых і новых звестак, падвяргаючы іх неверагоднай небяспецы і за гэта атрымліваючы ўзнагароды. Аднак не даводзіць да лагічнага завяршэння, многае не дагаворвае. Абыходзячы гэтую важную ў гуманістычным плане праблему, пісьменнік шмат спрашчае складанасць той барацьбы.

У 1960–1970-я гады беларуская літаратура побач з асэнсаваннем праблем гераічнага і трагічнага на вайне пачала звяртацца і да пачуцця віны за ўсё, што адбылося ў той час. І хоць у развязванні вайны звычайны чалавек не быў вінаваты, але ад яе вогненных віхураў нікому не ўдалося схавацца ні за каменнымі мурамі, ні ў вежах са слановай косці. В. Каваленка адзначаў: “*Асэнсаванне вайны ў сучаснай літаратуры вельмі часта адбываецца блізка ад паняцця віны.*

Але калі ёсць віна, то павінна быць і збавенне ад віны. У тым выпадку, калі б жыццё не давала ў сваім вечным бесперапынным развіцці магчымасць маральнага пакаяння, прадаўжэнне жыцця пасля вайны, пасля віны апынулася б у маральнай перспектыве проста немагчымым. Жыццё спынілася б. такі чалавек – оанімае, хрупкае, савестлівае тварэнне (создание). Ён не можа жыць з вечным цяжарам віны і граху ў душы”[150].

[150] Коваленко, В.А. Общность судеб и сердец / В.А. Коваленко – Мн.: Наука и техн., 1985. – С. 277.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Ці не гэта зразумеў адзін з герояў трылогіі немец Штрубэ, які сам знайшоў сувязь з падпольшчыкамі, актыўна ім дапамагаў, урэшце заплаціў сваім жыццём за ўсеагульную віну нямецкага народа. Праўда, яго смерць знаходзіцца на сумленні партызанскіх кіраўнікоў, якія аддавалі бяздумна-рызыкоўныя загады. Пісьменнік пра гэта піша са шчырым шкадаваннем.

У трылогіі шмат увагі удзелена падпольнай дзейнасці Захара Галы. У першай кнізе І. Новікаў у асноўным канстатуе, што Гала, учарашні школьнік, праяўляе мудрасць, становіцца дасканалым канспіратарам, патрабавальным кіраўніком, знешне застаючыся сціплым і непрыкметным юнаком. Праўда, гэта выяўляецца ў наратыўным плане, а не пакаваецца ў падзеях і роздумах. Але і так многае пісьменніку ўдалося, ад кнігі да кнігі больш поўна раскрываецца характар героя. Падкрэсліваецца, што за знешняй далікатнасцю Галы хаваецца моцнасць натуры, і гэта міжволі прымушала прызнаваць яго перавагу нават старэйшымі людзьмі.

Вядома, няўдзячная справа для пісьменніка спрабаваць угадаць думкі любога канкрэтнга чалавека ў тых экстрэмальных умовах, але і адмова ад выяўлення ўнутранага стану, яго роздумаў над праявамі жыцця таксама не на карысць і дакументальным аповесцям.

У адносінах да Захара Галы партызанскае кіраўніцтва праявіла небяспечную некарэктнасць, запатрабаваўшы ад яго поўнай справаздачы пра дзейнасць падпольных груп. І не толькі ахарактарызаваць асобна працу кожнага падпольшчыка, але яшчэ і даць дакладныя спіскі. Пра гэта пісьменнік піша вельмі асцярожна, і яго можна зразумець, бо ў той час, калі ствараласа трылогія, большасць былых партызанскіх кіраўнікоў былі пры высокіх пасадах, таму і прозвішчы іх у кнігах замоўчваюцца ці падаюцца пад псеўданімамі.

Значнае месца ў трылогіі займаюць вобразы старэйшага пакалення беларускай інтэлігенцыі. Выпісаны яны з вялікай сімпатыяй і павагай. Перш за ўсё падкрэслены іх гуманізм, маральная прынцыповасць, непрыняцце акупацыі, чапавеканенавісніцкай філасофіі. Велічнымі паўстаюць вобразы прафесара Клумава, дацэнта Зубковіча, якія прынялі актыўны ўдзел у падпольным змаганні, кожны па-свойму ўнёс значны ўклад у перамогу над ворагам. Хірург прафесар Я. Клумаў разам з іншымі медыкамі ўжо абяссмерціў сваё імя хоць бы і тым, што вярнуў да актыўнага жыцця, барацьбы шмат патрыётаў, проста сумленных людзей, якія, у сваю чаргу, выручалі адзін аднаго ў ліхую гадзіну. Акра-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

мя таго, яго група забяспечвала партызанскія атрады медыкаментамі, вяла разведку і прапаганду. Такой жа выдатнай асобай быў і Я. Зубковіч, які не скарыўся, не пайшоў на службу да ворага, заняўся разведкай. Не зламаўся пры арышце, які адбыўся 30 чэрвеня 1944 года. Правал здарыўся па нейкай недарэчнасці: камандаванне, закапаўшы частку штабных дакументаў у час апошняй блакады, астатнія, у якіх былі спіскі і адрасы падпольшчыкаў, загадала выносіць праз кальцо акружэння, дзе яны і трапілі ў рукі ворага. Разам з вялікай групай патрыётаў Я. Зубковіч велічна прыняў жахлівую смерць. І гэта тады, калі да вызвалення Мінска заставалася часу менш за тыдзень.

Таксама вельмі цёпла расказваецца ў аповесцях і пра акадэмікаў і прафесараў, якія спачатку і не ўключыліся ў актыўную барацьбу, але і не прынялі прапанову ворага аб супрцоўніцтве. Акадэміку Прыляжаеву і прафесара Вятохіну ў кнізе адведзена не шмат месца. Згадваецца, напрыклад такі факт: група чэкістаў, даведаўшыся, што ў атрадзе ёсць выведзеныя з мінска свяцілы навукі, сустракаюцца з імі. Але вучоныя не валодалі так званай аператыўнай інфармацыяй і нічога істотнага пра абстаноўку ў горадзе сказаць не маглі, таму разведчыкі вельмі хутка страцілі да іх усякую цікавасць. Затое акупанты доўга не маглі забыць дзёрзкасці падпольшчыкаў, якія вывезлі з горада знакамітых вучоных, таму праверкі на дарогах сталі проста драконаўскімі. У іншым аспекце пададзены вобраз буйнага вучонага М.М. Нікольскага, які прайшоў шлях ад звычайнага непрыняцця акупацыйнага "новага парадку" да актыўнага ўдзельніка падпольнай барацьбы. Пісьменнік выбраў цікавы ракурс асвятлення гэтай неардынарнай асобы: на пачатку успрымаецца дзейнасць яго праз ацэнкі звычайнага хлопца, партызана-сувязнога Івана Красоўскага (Прытычына), якога прывяла на кватэру да акадэміка яго былая аспірантка, таксама падпольшчыца Завістовіч. У сустрэчах і размовах раскрываецца грамадзянская пазіцыя вучонага: ён не згаджаецца на прапанову акупантаў нават не працаваць, а проста заявіць пра лаяльнасць да новай улады. Значнасць асобы вучонага-патрыёта добра выўяляецца праз яго роздумы над праблемамі сучаснасці і гісторыі, пра вечнасць гуманістычных ідэалаў. І.Новікаў прыводзіць некаторыя вытрымкі з працы акадэміка пра даўнюю гісторыю фінікійцаў, як бы ўвязваючы тыя трагедыі з не менш драматчнымі сітуацыямі сучаснасці. Вываз вучоных з акупаванага Мінска быў, несумненна, гуманістычнай акцыяй, у якой заключаўся і важны палітычны падтэкст: усяму славянскаму свету дэманстравалася, як савецкі ўрад клапоціцца пра сваіх

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

вучоных нават ў такія цяжкія для краіны часы, нават на акупаванай фашыстамі тэрыторыі.

Многія старонкі трылогіі сёння ўспрымаюцца неадназначна. Заідэалагізаванасць відавочна была ў некаторай спрошчанасці паказу гераізму, які выражаўся занадта прамалінейна, ігнаравалася ўспрыняцце ворага як небяспечнага праціўніка, увогуле непрымальна выводзіліся персанажы старой інтэлігенцыі, якая не прыняла ідэі бальшавізму. Карыкатурнасць у рэалістычных творах на такую тэму не дадае мастацкасці. Тут няйначай прыходзіла ў супярэчнасць праца журналіста цэнтральнай партыйнай газеты і пісьменніка-дакументаліста. Спрашчае істотна пісьменнік і расстаноўку процістаячых сіл, паколькі ігнаруе іншыя палітычныя рухі, якія таксама імкнуліся замацавацца ў акупаваным Мінску.

З дакументальнымі аповесцямі ідэйна звязана і апавяданне “Страх”, у якім раскрываецца лёс маладушнага эгаістычнага чалавека, які з-за жадання выжыць любой цаной становіцца не толькі здраднікам, але і здзічэлым садыстам. Пакаранне за злачынства насцігне абавязкова – гэтая аўтарская маральная выснова прачытваецца без асаблівай цяжкасці.

Журналісцкая дзейнасць і ўласна мастацкая творчасць І.Новікава цесна звязана з яго жыццёвым шляхам. Ваенныя дарогі, згадкі пра франтавыя здарэнні сталі тэмай многіх апавяданняў. Яго цікавіць лёс самых звычайных людзей, якія і ў баявых умовах часцей выглядалі рахманымі сялянамі, чым бравымі воінамі. Але на іх трымалася вайсковая справа. Знешне нехлямяжыя, нават нечым раздражальныя для вока начальства, у складаных сітуацыях яны былі самыя надзейныя (“Андрэй Глазуноў”). Выяўленне драмтычнага лёсу маладых, якім ён наканаваў няспраўджанасць надзей на шчасце, прысвечаны апавяданні “Шукаю Кацю”, “Пісьмы”, “Узнагарода”.

Гэтыя творы прасякнуты шчырым спачуваннем тым юнакам і дзяўчатам, жыццёвая біяграія якіх супала з пачаткам вайны. Яна не магла перашкодзіць нараджэнню кахання, чыстых і светлых пачуццяў, затое магла перакрэсліць усё гэта смяротным выракам.

У апавяданні “Гарбузовая каша”, па танальнасці набліжаным да згаданых, складаная сюжэтная структура. Яго галоўны герой атрымлівае заданне напісаць пра вялікі машынабудаўнічы завод. Прыбыўшы на прадпрыемства, у яго дырэктары ён пазнае былога танкіста, з якім звёў яго ваенны лёс на некалькі сутак у самы драматычны час адступлення войскаў да Волгі. А запомніўся гэты чалавек тым, што яго, Міколу Зайцава, баявога танкіста, недалёкі камандзір палка, беспрычынна

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

абазваўшы баязліўцам, накіроўвае на “перавыхаванне” на назіральны пункт разведчыкаў-артылерыстаў. Там лейтэнант, камандзір узвода разведкі, беларус, і корміць усіх экзатычнай беларускай стравай – гарбузовай кашай. Гісторыя мела працяг. Прыступіўшы да выканання абавязкаў дырэктара завода, былы танкіст не без здзіўлення – праўду кажуць, што свет цесны, – даведваецца, што былы камандзір палка Бразгуноў таксама працуе тут намеснікам дырэктара завода па гаспадарчай частцы. Паспеў добра-такі пракрасціся. Новы дырэктар мог адправіць яго ў турму, але паступіў па-чалавечы: прымусіў звольніцца па ўласным жаданні, перад гэтым дабіўшыся аплаты за нанесеныя страты.

Падзеі Вялікай Айчыннай вайны да канца жыцця засталіся галоўнымі ў творчасці І. Новікава. з цягам часу ў іх асэнсаванні з'явіліся пэўныя карэктывы, змяшчаюцца акцэнты ранейшых поглядаў, не так катэгарчна сцвярджаюцца маральныя імператывы.

У аповесці “Рыжая Галка” і рамане “Ачышчэнне” І. Новікаў прадоўжыў даследаванне гераізму мінскага падполля, але ўжо чыста мастацкімі сродкамі. Яго больш цяпер цікавяць характары людзей, магчымасць іх волевыяўлення ў драматычны час. Вядома, і гэтыя творы маюць выразныя прыкметы публіцыстычнасці, але ўжо менш прывязаныя да канкрэтнага факта. У аповесці “Рыжая Галка” пісьменнік стварае вобраз непахіснай барацьбіткі, вартай іншых герояў мінскага падполля, але зараз ужо надае больш увагі раскрыццю псіхалагічнага стану сваёй гераіні, яе асабістым перажыванням. І. Новікаў закрануў адну даволі балючую старонку народнай барацьбы, калі многія яе актыўныя ўдзельнікі пасля вайны павінны былі апраўдвацца, альбо і проста прызнаваць сваю віну, бо не было адкрытых доказаў адваротнага. Распавядаючы пра драматычны лёс адной самай звычайнай змагаркі, сувязной партызанскага атрада, пісьменнік стварае абаяльны вобраз маладой жанчыны, не асабліва напіраючы на нейкія выключныя эпітэты. Можна адзначыць пэўныя фабульныя супадзенні з ранейшымі творамі. Да прыкладу, сцэны з затрыманнем у краме, калі ў гераіні знайшлі новенькія купюры марак. Эпізод выратавання ідэнтычны з тым, які адбыўся з сувязной Ядзяй Дубінскай з дакументальнага твора “Дарогі скрыжаваліся ў Мінску”, з тым толькі адрозненнем, што пачак хрусткіх нямецкіх марак у адным выпадку сувязной даюць у партызанскім штабе, у другім – рэзідэнт пры сустрэчы на явачнай кватэры. Аднак у цэлым аповесць “Рыжая Галка” прынцыпова адрозніваецца ад папярэдніх твораў. У ёй раскрываецца

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

драма чалавека пакрыўджанага недаверам, падазронасцю. Напрыклад, Галіна Забоева, колішняя партызанская сувязная, якой у 1960-я гады вярнулі-пацвердзілі годнасць актыўнай змагаркі з акупантамі, як бы праходіць праз свае фізічныя, а потым і маральныя пакуты паўторна. Вяртаецца са своеасаблівага небыцця, бо некалі абражаная недаверам, вымушана была на доўгія гады знікнуць.

Праз успаміны Галкі аўтару ўдаецца стварыць непаўторныя вобразы людзей, якія ў крытычную хвіліну прыходзілі на дапамогу, рызыкуючы уласным жыццём і ўсяго сямейства. Адысея Рыжай Галкі – гэта як зрэз усяго драматычнага з яго непрадказальнасцю падполля і партызанскай барацьбы, гераічнай і часам несправядлівай у ацэнках. Пісьменнік сваю гераіню праводзіць праз жорсткія выпрабаванні, паказвае яе патрыятызм і прагу да змагання, уменне з гонарам выходзіць са складаных сітуацый і выжыць. Ён рэзка асуджае звычайную дробязную мяшчанскую зайздрасць і недавер перастрахоўшчыкаў, якія не верылі, што нехта можа прайсці праз выключныя выпрабаванні і не запляміць сябе. Пісьменнік падкрэслівае ў творы, што звычайна такімі недаверкамі аказваліся людзі па прыродзе сваёй баязлівыя і двурушныя. Натуральна, яны не выклікаюць у аўтара ніякай сімпатыі, затое яму імпануе высакароднасць, напрыклад, Івана Іванавіча, які першым падтрымаў знявечаную падпольшчыцу, якой цудам удалося вырвацца з СД. Вядома, ён не мог не сімпатызаваць маладой жанчыне Адарцы, якая, маючы малых дзяцей, прыняла, аказала першую дапамогу ахвярам акупантаў, урэшце Раману Васільевічу, які перапраўіў яе ў партызансую зону.

Пісьменнік не імкнецца даваць глыбокія псіхалагічныя характарыстыкі такім героям, толькі падкрэслівае звычайнасць пачуццяў звычайных людзей. Не заглыбляецца ён і ў характары адмоўных герояў аповесці – камандзіра партызанскага атрада, якому процістаіць начальнік разведкі. Недаверлівасць і падазронасць першага пісьменнік тлумачыць ускосна, праз некаторыя выказванні партызан, харатэрныя рэплікі, з якіх вынікае, што гэта звычайны баязлівец і прыстасаванец, але не паглыбляецца ў даследаванне яго душы, светапогляду, матываў дзеянняў. Што можа дазволіць сабе гэты чалавек, у нейкай ступені вынікае са слоў начальніка разведкі: "*Бачу, табе закліпіла на падазрэнні… Крый божа застрэліш Галку – скардзіся на сябе. Не пагяджу, што камандзір. Самасуд нікому не дазволен…*"[151].

[151] Новікаў, І. Параненая памяць: Аповесць і апавяданні / І. Новікаў. – Мн.: Юнацтва, 1990. – С. 111.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Жорсткасць, несправядлівасць, абыякавасць да чалавека, якія сустракаліся ў партызанскім асяроддзі, пісьменнік лічыць з'явай нетыповай. Дзеля пацвярджэння свайго меркавання ён абапіраецца на вопыт іншых партызанскіх злучэнняў, прыводзіць патрыятычныя, узнёслыя словы некаторых высокіх кіраўнікоў. Аналізуючы асаблівасць ваеннай прозы І. Новікава, Т. Грамадчанка заўважыла: "*Канфлікт у творы даследуецца пісьменнікам не на ўзроўні характараў (як у Быкава), а на ўзроўні сітуацыі, што само па сабе прыкметна збядняе каціну жыцця. У гэтым, відаць, прычына, што твор, несучы адчувальны зарад новага, усё ж не стаў з'явай у сучаснай прозе пра вайну, што адбылося, скажам, з аповесцю "У тумане" В. Быкава*"[152].

Даследчыца зусім невыпадкова параўноўвае аповесці І. Новікава і В. Быкава. Гэтыя мастацкія творы выяўляюць тэндэнцыю другой паловы мінулага стагоддзя: падзеі вайны паказваліся праз успаіны ўдзельнікаў яе ўжо ў новы час, калі многае сцерлася ў памяці, болі і трывогі быццам адышлі на другі план. Гэты мастацкі прыём дазваляе пісьменніку праз дыстанцыю часу стварыць уяўленне прысутнасці двух вымярэнняў: эмацыянальнае ўспрыняцце ўсіх падзей у непасрэдным тым часе і філасофскае стрыманае іх асэнсаванне ўжо ў новым часе. І пісьменніка ў такім разе больш цікавіць менавіта тое, як героі падполля ўвайшлі ў пасляваеннае жыццё, а болей за ўсё, ці ўсім дадзена па іх заслугах, ці ўсе высветлены цёмныя плямы, ці няма ў гісторыі перакосаў, калі адным дадзена не па заслугах надта многа, а іншыя героі проста прыніжаныя, несправядліва забытыя, ці нават у многім і зняважаныя.

У аповесці "Рыжая Галка" пісьменнік адлюстраваў адну з драматычных сітуацый на акупаванай тэрыторыі, калі ад нейкага абмежаванага чалавека залежаў лёс сумленных людзей, сапраўдных патрыётаў Радзімы. Зноў ускосна заўважаецца, што гэта быў чалавек прышлы. Пасля вайны ён недзе растварыўся ў шматлікай ветэранскіх шэрагах, і там, у сваім рэгіёне прадстаўляўся сапраўдным героем, справядлівым вырашальнікам чалавечых лёсаў. Нават такім невялічкім акцэнтам І. Новікаў рабіў ужо многае, бо ставіў пад сумненне псеўдагерояў той страшнай вайны.

Апошні буйны твор І. Новікава раман "Ачышчэнне" больш складаны па кампазіцыі, хоць у нечым, як ужо адзначалася, адлюстроўваў тэндэнцыю таго часу: сюжэтна спалучаюцца трагедыйныя гады вайны

[152] Грамадчанка, Т.К. Перад праўдай высокай і вечнай: Беларуская проза сёння / Т.К. Грамадчанка. – Мн.: Нав. і тэхн., 1991. – С. 49.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

і ўжо зусім мірнае жыццё шасцідзясятых, калі многае з тых страшных гадоў забылася, прыцярпелася. Прынамсі, дзеці вайну ўспрымалі ўжо ўсё больш як гісторыю. Аднак заглыбленне ў мінулае прымушае не толькі пісьменніка, але і чытача адчуваць, што тыя далёкія гады – гэта нібыта і сучаснасць, бо не ўсё перабалела, адышло, згінула.

Асноўнае кола падзей падаецца праз успрыняцце знакамітага журналіста Алеся Раманавіча Караневіча. Сюжэтныя калізіі завязаныя на падполлі ў Мінску, а франтавік Караневіч, не дужа мог разабрацца у дэталях такой складанай справы. Адзінае, што ратавала, як сцвярджае пісьменнік, – гэта журналісцкая этыка, якая патрабавала аб'ектыўнасці. І. Новікаў паспрабаваў паказаць усю псіхалагічную складанасць становішча героя, якому трэба было ў сваіх матэрыялах-публікацыях пацвярджаць гераічнасць паводзін любімай жанчыны, ад якой ён некалі адмовіўся, прыняўшы на веру паклёпніцкя сведчанні Раісы Самуленкавай, былой каляжанкі яго жонкі. Ён ніяк не мог пазбыцца адчування віны, што не здолеў разабрацца ў складанай сітуацыі, у якую патрапіла яго Ніна Ягораўна як актыўная падпольшчыца.

На самым пачатку пісьменнік неаднаразова падкрэслівае станоўчасць свайго героя, выдаючы яму авансам ідэальныя характарыстыкі. Вось словы сакратара ЦК, які прапаноўвае Караневічу прыняць удзел у пераацэнцы спраў падпольнага гаркома: "*Чалавек вы вопытны, прынцыповы і справядлівы, гэта мы даўно ведаем, таму ваша дапамога нам вельмі патрэбна*"[153]. Высокай думкі пра яго былі таксама блізкія родзічы: "*Сыны верылі, што іх бацька справядзівы. Ён ніколі нікога не пакрыўдзіў без прычыны і падставы*"[154]. Праўда, дзеля аб'ектыўнасці пісьменнік паспрабаваў даць і некалькі крытычных заўваг у адрас свайго героя, заключаных у словах яго былой жонкі. Калі тая даведалася, што Алесь Караневіч таксама ўключаны ў камісію, яна не без горычы сказала: "*Герояў шукаць будзе. Чысценькіх, як шкло. Ён такі: кампрамісаў не прымае. у яго – як у малога дзіцяці: адны людзі благія, а другія добрыя, свае і ворагі, нашы і вашы. Без адценняў. Так і крочыць па жыцці рафінірaваны праведнік*»[155]. Вось такім роўным, без малейшых адмоўных штрыхоў і рысаў і праведзены ў рамане гэты герой. З гэтага выпадку Т. Грамадчанка адзначыла, што "*мастацкае увасабленне характараў і канфліктаў аўтару ўдалося не ў поўнай*

[153] Новікаў, І. Ачышчэнне: раман / І. Новікаў. – Мн.: Маст. літ., 1987. – С. 25.
[154] Тамсама. – С. 51.
[155] Тамсама. – С. 17.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

меры, заўважаецца апісальнасць, не заўсёды глыбокае пранікненне ва ўнутраны свет герояў, ідэалізаванасць вобраза Алеся Караневіча"[156]. На думку ж пісьменніка, такая крыштальная біяграфія павінна была сімвалізаваць сабой праўдзівасць усяго ім здзейсненага, у тым ліку і пра новае слова пра мінскае падполле, яго ядро і мазгавы цэнтр – падпольны гаркам камуністычнай партыі.

Такім чынам, асноўная сюжэтная лінія рамана – змаганне з ворагам у акупаваным Мінску; другая – праца камісіі і пошук жывых сведкаў, надзённыя праблемы сучаснасці, непасрэдна звязаныя з журналісцкай дзейнасцю Караневіча: жыццё вёскі, паэтызацыя стваральнай працы, выхаванне дзяцей у працоўных сельскіх сем'ях, барацьба з рознымі бюракратамі, якія стрымліваюць тэхнічны прагрэс, але сапраўдныя праблемы тагачаснай вёскі не выяўлены; трэцяя – змаганне Алеся Караневіча на фронце. Усе яны пэўным чынам пераплятаюцца, як бы сімвалізуючы ўсю складанасць жыццёвых калізій. Усё ж франтавое жыццё ў рамане, пры многіх драматычных сітуацыях падаецца некалькі парадна, паколькі складаюцца з адных пераможных падзей. Падпольна-партызанскае жыццё паказана з большай аб'ектыўнасцю. У асноўным гэта звязана з Нінай Ягораўнай Караневіч, якой прыходзіцца душэўна прайсці праз новыя пакуты, паколькі сюжэт драматызуецца яшчэ і тым, што супрацоўнікі органаў затрымалі былога начальніка СД фон Файта, які істотна прычыніўся да пакутлівай драмы жанчыны. Праз пошукі, сустрэчы з людзьмі вымалёўваюцца драматычныя і гераічныя дні змагання, воблікі герояў, жывых і загінуўшых, многія сітуацыі ў рамане нагадваюць ужо вядомыя рэаліі з ранейшых дакументальных твораў.

Да заслуг аўтара рамана варта аднесці тое, што ён адкрыта назваў прычыну, чаму не так проста было праводзіць рэабілітацыю падпольшчыкаў: супраць гэтага выступаў уплывовы партыйны функцыянер, які аднойчы ўжо даў спапяляльную ацэнку змагарам мінскага падполля. Тым большая заслуга сіл, якія змагаліся за праўду. У фінальных сцэнах рамана, назіраючы працэс суда над былым фашысцкім палачом, Алесь Караневіч перажывае найскладанейшую гаму пачуццяў. Ён калі і не дараваў Ніне Ягораўне, то і ва ўсякім выпадку не лічыць яе вінаватай, выказвае ёй спачуванне і шкадаванне, што так жорстка абышлося з ёй жыццё, бязлітасна паламаўшы яе лёс.

Мае рацыю Т. Грамадчанка, калі сцвярджае, што "*творы, падобныя "Ачышчэнню" і "Рыжай Галцы" маюць свае бясспрэчныя вартасці і*

[156] Грамадчанка, Т.К. Перад праўдай высокай і вечнай. – С. 47.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

не павінны заставацца па-за ўвагай. Яны ўдзельнічаюць у выпрцоўцы новых аспектаў разумення жыццёвай праўды, а ў пэўнай меры – і яе ўзнаўлення ў мастацтве слова”[157].

Такім чынам, І.Р. Новікаў унёс пасільны ўклад ў літаратурны працэс Беларусі другой паловы XX ст. Асабліва каштоўнымі застаюцца яго публіцыстычныя, дакументальныя і мастацкія рэчы пра мінскае падполле. У яго асобе гарманічна спалучыліся мастак слова і грамадзянін, для якога катэгорыя камуністычнай справядлівасці заўсёды мела найвышэйшы аксіялагічны кшталт. Гэты маральны імператыў і дазволіў пісьменіку напісаць шэраг твораў, у якіх праўда жыцця выяўлялася вольна і арганічна.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

[157] Грамадчанка, Т.К. Перад праўдай высокай і вечнай. – С. 49.

ПРА СВОЙ КРАЙ І ЛЮДЗЕЙ

Проза Віктара Карамазава

Віктар Карамазаў належыць да пакалення “шасцідзясятнікаў”, а яшчэ іх называлі “дзяцьмі вайны”, “філалагічным пакаленнем”, хоць апошняе вызначэнне і не зусім дакладнае, бо і наступныя шэрагі беларускіх пісьменнікаў у большасці мелі філалагічную адукацыю.

Віктар Філімонавіч Карамазаў нарадзіўся 27 чэрвеня 1934 года ў Чэрыкаве ў сям’і настаўнікаў. Бацька яго Філімон Сяргеевіч на працягу 50-ці гадоў выкладаў беларускую мову і літаратуру ў школе, маці працавала ў пачатковых класах. У час вайны сям’я падалася ў бежанства, дабралася да берагоў Волгі, жылі ў сяле Тургенева Ульянаўскай вобласці, дзе бацька загадваў сямігодкай. Пасля вызвалення Беларусі пасяліліся ў Крычаве. Там В. Карамазаў закончыў дзесяць класаў і ў 1953 г. паступіў на аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта БДУ, а пасля завяршэння вучобы быў накіраваны на пасаду сакратара чэрыкаўскай раённай газеты “Сацыялістычная перамога”, у 1959–1961 гг. працаваў сакратаром крычаўскай раённай газеты “Шлях сацыялізма”, потым да 1964 года – уласны карэспандэнт “Магілёўскай праўды” па ўсходнім рэгіёне, неўзабаве быў запрошаны ў рэспубліканскую газету “Звязда”, а далей – “ЛіМ”, часопіс “Полымя”, некаторы час меў абавязкі кансультанта СП Беларусі. З 1986 года – на творчай рабоце.

Як пісьменнік В. Карамазаў пачынаў з нарысаў. Але і тады яны ўжо мелі прыкметы апавяданняў, выдзяляліся стройнасцю сюжэта, выяўленнем складаных сітуацый, абмалёўкай характараў. Ды і раннія апавяданні ў нейкай ступені яшчэ захавалі ў сабе рысы нарысавасці.

Па жанравых асаблівасцях малую прозу В. Карамазава можна звесці ў пэўныя групы: апавяданні з разгорнутым сюжэтам; аўтабіяграфічна-апавядальныя творы; падарожныя апавяданні з прыкметамі нарысавасці; эсэ і лірычна-дзённікавыя развагі. Вядома, такое вызначэнне чыста ўмоўнае, бо прозу пісьменніка цяжка змясціць у адно нейкае жанравае вызначэнне. Відаць, не варта і размяжоўваць творы па групах, бо гэта справа даволі няўдзячная. Усё ж у працэсе разляду творчасці пісьменніка паспрабуем паглядзець на апавяданні менавіта з гэтага пункту погляду.

Усе гэтыя мастацкія рэчы, напісаныя амаль на працягу дваццаці гадоў, розняцца і мастацкім асэнсаваннем матэрыялу і ўзроўнем яго рэалізацыі. У гэтай жанравай малой форме пісьменнік імкнецца абстрагавана глянуць на жыццё звычайных людзей, што праявілася і ў

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

першым зборніку “Падранак” (1968). І што яшчэ. Усе героі яго твораў жывуць, пакутуюць і радуюцца ў родных для пісьменніка мясцінах – на ўзбярэжжах Сожа. Сітуацыі, на першы погляд, ён выбірае ардынарныя, мала чым прыкметныя. Сапраўды, будзённа ідзе жыццё ў апавяданнях “Навальніца ў паводку”, “Запозненыя паязды”, “Зялёныя тоні”. У гэтых і іншых творах пісьменнік імкнуўся паказаць не столькі знешнюю падзейнасць, колькі душэўны стан чалавека, адносіны іх да працы. Людзі часта пападаюць у крызісныя сітуацыі, без належнай увагі адчуваюць пэўны дыскамфорт, сваю неўладкаванасць і нават адчужанасць ад усяго свету. У герояў гэтых апавяданняў у кожнага свая драма жыцця, але яны ў нечым і падобныя, хоць розныя па ўзросце і жыццёвым вопыце. Адарванасць ад звыклага ўкладу жыцця, няўвага маладзейшых прыгнятаюць і Данілу (“Навальніца ў паводку”), і Бамбалу (“Зялёныя тоні”). Зрэшты, яны знаходзяць выхад са становішча ў тым, што зноў уліваюцца ў калектыў, адчуваюць задавальненне, што іх вопыт, прынцыповасць у вырашэнні складаных пытанняў нарэшце сталі запатрабаванымі. Праўда, некалькі штучна драматызуецца фінал у апавяданні “Навальніца ў паводку”. Варта пагадзіцца з І. Навуменкам, які рэцэнзаваў першую кнігу пісьменніка: “*Заслугоўвае ўсялякай пахвалы тое, што Карамазаў імкнецца раскрыць псіхалогію простага чалавека, радавога ўдзельніка жыцця, шукае і знаходзіць паэзію ў звычайным, будзённым*”[158]. Менш пісьменніку ўдаваліся творы, не звязаныя з роднымі мясцінамі,: “Запозненыя паязды”, “Каштаны”, “Алюшні брыз”, хоць у іх таксама, асабліва ў першым, ёсць праявы драмы душы чалавека.

Пісьменніка пастаянна цікавіць чалавек з яго паўсядзённымі турботамі. Але ў далейшым ён будзе больш увагі ўдзяляць псіхалагічнаму абгрунтаванню ўчынкаў і дзеянняў кожнага. Гэта асабліва выразна выявілася ў апавяданнях “Жаваранак”, “Гарадскія”, “Дзяльба кабанчыка”, “Супраць неба – на зямлі”, “Жанчына ў чорным і Афган”. На думку А. Яскевіча, першыя тры апавяданні ў своеасаблівы трыпціх аб’ядноўвае галоўны герой Сцяпан. Прытым, два з іх (“Жаваранак” і “Дзяльба кабанчыка”) не звязаныя з Магілёўшчынай. Сцяпан пасля заканчэння школы прыязджае з свайго Наднямоння ў Мінск з намерам паступіць у політэхнічны інстытут і заходзіць да сястры. Ён здзіўляе яе нейкай неразгаданай сур’ёзнасцю, сялянскай заглыбленасцю ў праблемы вёскі. Развагі пра жыццё выклікаюць жаданне і ў Волькі паехаць у вёску, быць, як некалі, вольнай, з радасцю працаваць на сенажаці, ку-

[158] Навуменка, І. Кніга адкрывае свет / І. Навуменка. – Мн.: Маст.літ., 1978. – С. 218.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

пацца ў Нёмане. Але час няўмольны: не стаў земляробам Сцяпан, (пасля войска стаў працаваць на велазаводзе), не спраўдзіліся душэўныя спадзяванні і Волькі, якая канчаткова страціла сувязь з роднымі мясцінамі, ператварыўшыся ў звычайную гарадскую абываталь ку. Сувязь з роднай зямлёй, вернасць бацькоўскім запаветам захоўвае ў душы Сцяпан, нават стаўшы таксама гарадскім чалавекам. Тут пісьменнік, як імногія яго калегі з таго пакалення, закрануў складаную праблему псіхалагічнай устойлівасці ўчарашняга вяскоўца. Менавіта повязь з роднай зямлёй дапамагае Сцяпану не ачарствець, захаваць прывязанасць да прыроды, да ўсяго жывога ў ёй. Таму і ўгаворвае сваіх сяброў (“Гарадскія”) Цырлю і Лясятава (па мянушцы Дзіч) не ехаць на шабашку ў далёкія краі, а звярнуцца ў які-небудзь калгас, дзе можна зарабіць тыя самыя грошы. “*Сцяпан зманьваў да сябе на Нёман, але Дзіч і Цырля перамаглі, яны былі з адной вёскі і зацягнулі ў свой край на Сож*”[159]. Ён пранікнуты клопатам пра ўраджай, пра жыццё селяніна, а разам і пра ўсю дзяржаву: “*Летась касілі ў дождж, ліло і ліло, не перастаючы, усе травы на сенаж пусцілі, пад цэлафанавую плёнку схавалі. А сёлета і сенажу хопіць, і сена – ужо стагоў панастаўлялі. Хоць дождж патрэбны. Жыта налілося, яму суш не страшная, а ярына, лён пачалі гарэць. І бульбу, дзе на пяску, прысушыць. Трэба дождж*”[160], – па-гаспадарску разважае Сцяпан, ідучы наперадзе статка.

У яго моцна трымаецца спрадвечная сялянская этыка. Можа таму яго так і палохае Дзіч, старэйшы ў іх групе, сваёй апантанасцю, дзікай жорсткасцю, непрадказальным круцельствам. Нядаўні ветурач выкарыстоўвае набытыя прафесійныя якасці не на карысць усяму жывому. Менавіта праз успрыманне Сцяпана пісьменнік асуджае бездухоўнасць, папярэджвае грамадства пра магчымасць скатвання ў маральнае бяздонне пры страце рысаў чалавечнасці. А.С. Яскевіч адзначае: “*Са Сцяпанавых паплечнікаў па вольных заробках, калі яшчэ Цырля момантамі паддаецца голасу сумлення, то старэйшы за іх Дзіч ужо закончаны марадзёр жыцця,няўлоўны і неадольны ў сваім круцельстве. Дзіўна, як хутка, пакінуты без сусветна-духоўных арыенціраў чалавек пры ўсёй сучаснай цывілізаванасці ўвачавідкі мізарнее, забывае выхаваную цяжкай працай жыццёвую адказнасць, робіцца адно круцелістым спажыўцом і ад таго бязрадасным, злосным на людзей і свет*”[161].

[159] Карамазаў, В. Дома / В. Карамазаў. – Мн.: Маст. літ., 1984. – С. 178.

[160] Тамсама. – С. 177.

[161] Яскевіч, А.С. Віктар Карамазаў / А.С. Яскевіч // Гісторыя беларускай літаратуры ХХ ст. Т. 4. Кн. 1. – С. 584.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Гэтую праблему духоўнага збяднення даследуе В. Карамазаў і ў апавяданні “Дзяльба кабанчыка”. Сцяпан не можа стрываць чэрствасць сваіх сясцёр, іх абыякавасць, калі прыязджаюць да маці, каб толькі забраць вырашчанае ёю ў агародзе, нарыхтаване яе хворымі рукамі. Як у знак нейкага ўнутранага пратэсту Сцяпан адмаўляецца ехаць разам з імі, вяртаецца ў хату, памагае маці рэзаць сечку. І гэта не проста часовы парыў, а, верыцца, што так праяўляецца глыбінная яго сувязь з родным краем, малой радзімай. І калі нават ён не вернецца ў родную вёску, то можна быць упэўненымі, што адтуль будзе пастаянна чэрпаць духоўныя сілы. Вядома, калі і вёска выжыве.

На мяжы 1980–1990-х гг. пашыраецца тэматычны дыяпазон і грамадская значнасць апавяданняў. Іх было нямнога, але кожнае станавілася з’явай. Пісьменніка перш за ўсё цікавілі праявы чалавечых паводзін у новым часе, калі з’явілася магчымасць выказацца пра тыя праблемы, што глыбінна закраналі жыццё грамадства. Дзве страшныя беды абрынуліся на людзей па віне дзяржаўнага кіраўніцтва: тайная афганская вайна і чарнобыльская катастрофа. Калі праўду пра першую яшчэ ўдавалася хаваць ад народа, то ў другой стараліся не паказваць усіх трагічных наступстваў, што ў абодвых выпадках, несумненна, з’яўляецца злачынствам. І гэта пісьменніку ўдалося спалучыць у апавяданні “Супраць неба – на зямлі”. Герой вайны ў Афганістане малады інвалід Іван Калядка прыязджае ў родную вёску Ходарава, дзе спадзяецца адпачыць душой сярод аднавяскоўцаў, забыць кашмары, але злавесная рэчаіснасць хутка нішчыць яго мары. Пісьменнік некалькімі дэталямі паказвае змены родных мясцін, якія на пачатку герой не можа зразумець. Угнявіла яго і бяздушнасць мясцовых кіраўнікоў – старшыні калгаса Ананіча і брыгадзіра Бочкі, які проста здзекуецца са старых, што не пакінулі вёску. Яны застаюцца на месцы, таму што пераканаными: перасяляюць на такія ж радыцыйныя землі. А яшчэ і немагчыма на схіле дзён пакінуць спрадвечныя котлішчы. Калядка лічыў, што ўсе праявы бесчалавечнасці засталіся там, на той незразумелай вайне, але тут бачыць яшчэ і горшае. Ён па-свойму спрабуе навесці справядлівасць: б’е брыгадзіра, ідзе ў цэнтр калгаса Лукам’е, каб падобным чынам даказаць і старшыні, што здзекваццa з людзей нельга. Калядка не задумваецца над законнасцю сваіх учынкаў, і гэта таксама адзін з вынікаў той невядомай вайны: калечыліся не толькі целы, але і душы яе маладых удзельнікаў. І адказваць за ўчыненую тую вайну, быццам і няма каму. Гэта вынікае ўжо з апавядання “Жанчына ў чорным і Афган”, у якім Маці носіць вечную

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

жалобу па загінуўшым сыне. “*Каму спатрэбілася гэтая вайна?.. Каб ён, той, хто яе пачаў, сваіх дзетак не бачыў!..*

І што ёй адкажаш?

– Той… ужо там, адкуль не ўбачыць нікога”[162].

Гэта немы папрок і тым, хто моўчкі бласлаўляў такія рашэнні, і ўсім, хто не пратэстуе супраць розных антыгуманных акцый.

Саркастычна-з’едліва высмейвае пісьменнік новых дзеячоў у апавяданні “Маладзічок дэмакратыі”. Там Іван Данілавіч, былы навуковец, вялікі ваяр за маральнасць, лёгка забываецца пра ўсё, здабыўшы дэпутацкі білет, гэтую індульгенцыю на адпушчэнне грахоў у посткамуністычным грамадстве. Аўтар напамінае, што карозія мінулых гадоў цяжка вытраўляецца з душаў нават, здавалася б, упаўне прыстойных людзей.

Як ужо адзначалася, апавяданні В. Карамазава тэматычна шырокага абсягу і розныя па майстэрству ўвасаблення жыццёвага матэрыялу, раннія часам нагадваюць замалёўкі з натуры, у якіх відавочна выявілася жаданне пісьменніка расказаць пра харошых людзей, з якімі ў свой час яго звёў журналісцкі лёс (“Галуба”, “Сямёнаўна”, “Букініч”), ці проста ўзнавіць нейкія даўнія чыста сяброўскія дачыненні, але непасрэдна звязаныя з прыродай (“Прыліпала”, “Па слончыну песню”), асабліва ў рамнтычным арэоле выдзяляецца апавяданне “Векавое”, гімн у гонар вартаўнікоў лесу, людзей, без астатку ўлюбёных у яго. З апавяданняэсэ “Гарэла свечачка”, з гэтага твора на сумежжы жанраў, па сутнасці, пачынаецца шэраг твораў пісьменніка пра паэтаў і мастакоў, пра што гаворка пойдзе крыху пазней.

І ў аповесцях В. Карамазаў імкнецца паказаць звычайнага чалавека з яго паўсядзённымі клопатамі, якія ў значнай ступені становяцца вырашальнымі ў лёсе. Напрыклад, сюжэт твора “Пагоннік” (1971) разгортваецца даволі непаспешліва, а дзеянне, па сутнасці, адбываецца на працягу адных сутак, але пашыраецца ў прасторы і часе за кошт успамінаў і роздумаў герояў, у якіх і раскрываюцца іх жыццёвыя шляхі. У цэнтры твора Ягор Кавалёк і Юлька, якія вырашаюць нарэшце наладзіць сумеснае жыццё. Але тут ёсць і свае цяжкасці, бо Юльцы яшчэ трэба ўзяць развод з мужам-адыходнікам. Традыцыйны трохкутнік Юлька – Павел Анкуда – Ягор Кавалёк значна высвечвае характары, падыходы да жыццёвых праблем кожнага з іх. Пісьменнік імкнецца нікога не ўзвышаць, а паказваць іх у паўсядзённых турботах.

[162] Карамазаў, В. Аброчны крыж / В. Карамазаў. – Мн.: Маст. літ., 1994. – С. 346.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Сціплы, памяркоўны Кавалёк на пачатку значна праігрываў напорыстаму, удачліваму Анкуду, таму Юлька і схіляецца да вясёлага, крыху нахрапістага Паўла. Час паступова расстаўляе акцэнты, высвятляе стрыжнёвыя рысы кожнага. Моцна прывязаны да роднай зямлі, да сваёй цяжкай працы плытніка, Ягор выклікае сімпатыю ў адрозненне ад Анкуды, які ў пагоні за доўгім рублём растрос і тыя мізэрныя душэўныя запасы, што прывіваліся сямейным выхаваннем. Некамфортна адчувае сябе і маладая жанчына, дакараючы сябе, што ў маладосці дапусціла памылку, не разгледзела ў Паўла тыя чарвяточынкі, якія вялі да канчатковага спусташэння душы. Драматычная развязка ўсіх вузлоў у аповесці наступае раптоўна, пры збегу ракавых выпадковасцей: Юлька, каб вырашыць пытанне з разводам, скокнула з берага на плыт да Кавалька, каб даехаць да райцэнтра, хоць браць пастаронніх катэгарычна забаранялася. Калі плыт зачапіўся за вываранень, а плытагон заснуў, жанчына рашае зрабіць падарунак свайму новаму абранніку – самастойна спіхнуць плыт. Да гэтага ўчынку яе прыспешвае і гук матацыкла: ёй падалося, што за ёй гоніцца Анкуда, які прыехаў з Поўначы. Усё гэта і прыводзіць да фатальнага выніку. Пісьменнік яўна асуджае людзей без стрыжня, якія небяспечныя, як тыя вятры пагоннікі, якія ўзнікаюць невядома адкуль, у адзін момант могуць скрышыць усё на да гэтага спакойнай рацэ. У нейкай ступені гэта выступае і як сімвал-папярэджанне чалавеку.

Сімвалічнай была і назва наступнай аповесці В. Карамазава “Бярозавыя венікі” (1973). У аснову сюжэта пісьменнік паклаў многія жыццёвыя факты, назіранні, роздумы з часу яшчэ працы ў раённай газеце, але асэнасваныя з пазіцый новага часу. У гэтым творы можна таксама заўважыць некаторыя рэмінісцэнцыі з яго апавяданняў і мастацкіх нарысаў. Але гэта не паўтарэнне пройдзенага. Проста ў новым часе многія сітуацыі бачыліся інакш, і было жаданне выявіць: з чаго пачынаецца змізарненне душы, чым можна патлумачыць адступленне ад вызначаных у юнацтве ідэалаў.

Наступае аднойчы такі момант, калі з’яўляецца жаданне падвесці папярэднія рахункі, а іншы раз гэта атрымліваецца і спантанна. Вось сяброўкі праз многа гадоў пасля заканчэння школы збіраюцца ў родных Крайцах. З трох сяброў толькі Арсен пасля заканчэння медыцынскага інстытута вярнуўся ў родныя мясціны. Гена і Сцяпан апынуліся ў сталіцы, і ў гэтым нічога заганнага няма. Іншая справа, як выкіраваліся іх жыццёвыя дарогі. А тут якраз не ўсё найлепшым чынам. Сцяпан дзеля выгады толькі крышку, як ён лічыў, адступіў ад маральных прынцыпаў:

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

апрацаваў матэрыялы для дысертацыі свайго начальніка, за што атрымаў павышэнне па службе, кватэру. Але ўтрымацца на ранейшых пазіцыях ужо немагчыма, таму што пачынае дзейнічаць свеасаблівая ланцуговая рэакцыя, дзе адна слабінка цягне за сабой другую. Ключавым момантам тут становіцца сустрэча сяброў з старэйшымі апекунамі, свайго роду духоўнымі абярэгамі – прарабам Лукічом, Герасімам, якія ў цяжкія пасляваенныя гады былі для іх амаль што бацькамі. Вось перад імі ідзе свайго роду споведзь, а для Сцяпана яшчэ і пакаянне, бо ён адчувае сябе вінаватым. Значыць, і для яго яшчэ не ўсё страчана ў гэтым жыцці. Драматычная развязка сюжэта, калі ў лазні, хвошчучы венікам Сцяпана, змываючы з яго фізічны і душэўны бруд, Герасім падае ад інфаркту, служыць нейкім чынам напамінкам усім, хто адступаецца ад запаветаў.

Аповесць “Спіраль” (1974) некалькі ўбаку знаходзіцца ад магістральнай лініі творчасці пісьменніка. Сюжэт твора ўзнік, як заўважае аўтар, у час журналісцкай паездкі ў Запарожжа, дзе працавалі Белазы: там праводзіліся выпрабаванні новых мадэляў у вытворчых умовах. Мужнасць, сумленнасць вадзіцеляў захапіла пісьменніка. У выніку ён напісаў сцэнарый дакументальнага фільма і мастацкі твор.

Галоўны канфлікт аповесці – узаемаадносіны шафёраў-выпрабавальнікаў Пракопчыка і Белахвосціка. Пракопчык, маючы папярэднюю сялянскую загартоўку, да ўсяго адносіцца з душой, рызыкоўная праца па выпрабаванні машын у экстрэмальных умовах для яго – сэнс жыцця, чаго нельга сказаць пра былога інжынера, а зараз таксама шафёра, Белахвосціка. Ён перайшоў у выпрабальнікі з карыслівай мэты: тут большая зарплата, а ён марыць купіць уласны аўтамабіль. І ў гэтым нічога недарэчнага няма: многія так тады рабілі, бо да гэтага падштурхоўвала сама тагачасная сістэма. І пісьменнік у нейкай ступені адлюстраваў гэты імператыў, па традыцыі асуджаючы імкненне да дабрабыту як абмяшчаньванне. Усё ж асновай канфлікту служыць не гэта жыццёвая дробязь, а пазіцыя герояў. Белахвосцік новую працу не любіць, прыстасоўваецца, выконвае абавязкі настолькі, каб прыстойна выглядаць перад начальствам. Вось гэтага і не можа сцярпець Пракопчык. Аднак канфлікт не набывае грамадскага рэзанансу, выражаецца толькі ў знешняй адчужанасці герояў. Нават драматычная сітуацыя, калі па віне Белахвосціка ледзь не здарылася аварыя, значна не паўплывала на сутнасць адносін. Яны затаюцца такімі ж халаднавата-роўнымі. Тут, напэўна пісьменніку бракавала ведання сутнасці вытворчых адносін, у якіх праяўляюцца характары людзей. Пра тое, што аповесці не хапае

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

глыбіні распрацоўкі праблемы, В.Каваленка адзначыў яшчэ ў сярэдзіне сямідзясятых мінулага стагоддзя: "*І ўсё ж, магчыма, па той прычыне, што канфлікт паміж Пракопчыкам і Белахвосцікам "замарожаны" пісьменнікам на ўзроўні бытавой верагоднасці, не абвостраны, а праца герояў паказана са шматлікімі тэхнічнымі падрабязнасцямі, многія характары ў творы не раскрыты глыбока. Асабліва праставатымі выглядаюць маладыя выпрабавальнікі, ім не хапае шырыні погляду на свет*"[163]. Нязгоду тут можа выклікаць толькі апошняя заўвага крытыка адносна маладых. Усё ж такі неправамерна патрабаваць ад іх глыбокай праніклівасці ў складаныя праблемы жыцця на ўзроўні людзей сталага веку.

Талент В. Карамазава адчувае сябе няўтульна на адыходных дзялянках. Пісьменніку заўсёды ёсць што сказаць пра родныя мясціны, пра жыхароў Прысожжа, прымусіць чытача задумацца над многімі жыццёвымі працэсамі.

Аповесць пісьменіка "Дзень Барыса і Глеба" (1980) стала істотным поступам наперад ва ўсёй беларускай прозе. Яна была рызыкоўнай для таго часу ўжо пастаноўкай самой праблемы: нізкі маральны ўзровень работнікаў самай важнай галіны дзяржаўнай ідэалагічнай сістэмы – тэлебачання. Не мае значэння, што пісьменнік ўзяў для разгляду яго перыферыйную дзялянку – групу кінадакументалістаў. Першасная характарыстыка героям падаецца праз успрыманне іх капітанам рачнога цеплахода, далёка не станоўчая. Капітана здзіўляла, што тэлевізійшчыкі выехалі здымаць фільм, але ні кім не цікавіліся, акрамя віна, якога закуплялі ў вялікіх бутэльках, "бомбах". Ён разважае пра сваіх пасажыраў пасля прыбыцця ў в. Сычыкі, адчуваючы некаторую нават няёмкасць: "*Быццам ён вінен, што ўжо два дні і дзве ночы на століку нішто іншае не ляжала і не стаяла, акрамя чорных "бомбаў", шклянкі, адной на траіх, пашарпаных карт і попельніцы, заўсёды завалена бычкамі*"[164]. Гэтыя трое – Васіль Мазепа, Цімка Мурашка і малады хлопец Раман – сваёй нязвычнасцю здзівілі вёску, у якую трапілі выпадкова, толькі таму, што ў лоцманскай кнізе Цімка нечакана ўбачыў назву прыбярэжнай вёскі Сычыкі, што нагадала яму далёкае і ўжо быццам не рэальнае дзяцінства, дзеда Акіма, і яшчэ нешта роднае, што ён сам не мог усвядоміць, бо ўсё маладое жыццё прайшло ў пераездах у след за бацькавай ваеннай службай.

І Мазепа, і Цімка – не адмоўныя тыпы, але ўжо з устаялымі звычкамі прыстасаванцаў, асабліва ў гэтым плане выдзяляецца Мазепа,

[163] Каваленка, В. Жывое аблічча дзён / В. Каваленка. – Мн.: Маст.літ., 1979. – С. 59.
[164] Карамазаў, В. Дома. – С. 5.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

які, здаецца, ужо і не супраціўляецца плыні жыцця. Цімка-Князь таксама падаўся ў кіношнікі не па прызванні, а каб мець добрыя грошы, таму працаваў без напругі: няхай высільваюцца дурні. І вось, апынуўшыся ў Сычыках, ён са здзіўленнем убачыў, што людзі жывуць зусім па іншых законах, не так глядзяць на даброты жыцця. Яны працуюць, гадуюць дзяцей, даглядаюць сваю гаспадарку і маюць ад гэтага вялікае шчасце. Сустрэчы з родзічамі, з хроснай маці Аляксандрай, дзядзькам Кузьмой і іншымі вяскоўцамі робяць пэўны зрух у свядомасці Цімкі. Ён пачынае шкадаваць, што не ведаў гэтых людзей раней, што забыў дзеда Акіма, які гадаваў яго ў ваеннае ліхалецце і першыя галодныя гады аднаўлення гаспадаркі. Крытыкі і літаратуразнаўцы адразу звярнулі ўвагу на гэты важны этычна-маральны аспект аповесці. А. Марціновіч пісаў: "*Пісьменнік не спяшаецца вось так адразу "перавыхаваць" свайго героя, зрабіць яго іншым – дабрэйшым, шчырэйшым. Увогуле, ён не ставіць перад сабой такую мэту. В. Карамазаў проста паказвае, як сённяшні Цімафей Мурашка, узіраючыся ў сябе ранейшага, неяк непрыкметна пачынае ставіцца крытычна да ўсяго таго, што было з ім раней. Свет яго жыцця, у якім, здавалася б, ужо даўно трывала вызначаны ўсе абсягі і далягляды, гэты свет нечакана значна пашырае свае межы*"[165]. Да падобнай высновы прыходзіць і П. Дзюбайла: "*Дакрануўся чалавек да сваіх каранёў – і пачала абуджацца душа. Нялёгка ў дадзеным выпадку перайначыцца. Але, відаць, не будзе ўжо спакойнага "лёгкага жыцця", будуць працягвацца пошукі маральных каштоўнасцяў, сэнсу жыцця*"[166]. Сапраўды, аповесць дае падставы для такіх вывадаў. Асабліва гэта выразна акрэсліваецца ў фінале, у апошняй сустрэчы з дзедам Акімам, які быццам спецыяльна чакаў Цімку, каб сказаць яму самае важнае, перадаць нейкі запавет і памерці якраз у вызначаны ім Дзень Барыса і Глеба. Усведамленне важнасці жыццёвай эстафеты прыходзіць да Цімкі на беразе Старыка, у якім ён пазнае свой з дзіцячых гадоў Сож. І тут ён раптаў уявіў, пачуў яго голас, як яму расказвае дзед Акім казку пра кавалачак хлеба, Анёлаў і Дабрыню: "*Гэта мне расказала мая мама. Пра анёлаў і кавалачак. Пра беднага чалавека. А маме – яе мама. А ўжо я – табе. А ты – сваім дзеткам. Гэтак і будзе хадзіць па зямлі дабрыня чалавечая…*"[167]. Вось гэты ўспамін і становіцца свайго роду паваротным момантам, які даваў даследчыкам

165 Марціновіч, А. Сіла вытокаў / А. Марціновіч // Полымя. – 1982. – № 4..– С. 202–203.

166 Дзюбайла, П.К. У пошуку духоўных каштоўнасцей / П.К. Дзюбайла. – Мн.: Нав. і тэхн., 1987. – С. 111.

167 Карамазаў, В. Дома. – С. 112.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

падставы выказваць меркаванні пра магчымыя змены поглядаў героя на жыццё. “*Цімка захваляваўся, але не так, як ад сонца, вады, травы, кветак. Не было светлай радасці ў яго цяперашнім хваляванні, а быў нейкі жах. Было адчуванне, што ўся тая дабрыня, якая хадзіла па свеце ад дзеда Акіма, яго мамы, мамы яго мамы, замкнулася на ім, Ціму, і ад яго залежала, жыць ёй ці памерці. Ён не быў упэўнены, што яна будзе жыць далей, што ад яго пойдзе па зямлі, спужаўся, што вось тут яна і памрэ, назаўсёды. Бо ён забыў гэтую дзедаву казку. Калі і ўспомніў – заўтра зноў забудзе. Ды і каму перадасць яе, дзе тыя яго дзеці*?”[168]. Цімка на раздарожжы, знаходзіцца перад важным выбарам. Пісьменнік зноў канчаткова не расстаўляе кропкі.

Аднак, варта сказаць пра тое, што тады засталося па-за ўвагай літаратуразнаўцаў. На мяжы 70–80-х гадоў В. Карамазаў уздымаў трывожную тэму будучыні вёскі. Знешне, здаецца, усё нармальна: Сычыкі поўняцца дзіцячымі галасамі, хапае рук для працы на ферме і ў полі. Але ўжо акрэсліваецца і будучы заняпад, паніщчэнне. Гэта вынікае і з гаворкі Веры, стрыечнай сястры Цімкі, настаўніцы, што няма ў вёсцы сапраўдных хлопцаў, адны дзяўчаты. Паяўляюцца першыя хаты з забітымі вокнамі, што большасць жыхароў у вёсцы – пенсіянеры. І нішчыць вёску яшчэ адна страшная бяда – п’янства. Трывога гэта гучыць ў словах Ксені, жонкі Івана Селянка, сумленнага працаўніка: “*Я кажу Цімафею, якія ў нас мужыкі. Цяпер у калгасе ўсё машыны робяць, на іх уся надзея, а ў чыіх руках машыны? У руках Пончыка. Мікіткі, Суглоба. Ад іх машын ужо не саляркаю, а гарэлкаю смярдзіць*”[169]. Тут якраз і напрошваецца паралель з сітуацыяй пачатку аповесці: прадстаўнікі тэлебачання мала чым адрозніваюцца ў сваіх паводзінах ад трактарыстаў. Дык якая будучыня ў грамадства ў цэлым?

Яшчэ з большым напалам ставіць набалеўшыя праблемя В. Карамазаў у аповесці “Краем белага шляху” (1992), можа ці не самы балючы твор пісьменніка, бо тут тыя ж праблемы экалогіі, ужо пачарнобальскай, акрэсленай яшчэ і экалогіяй душы. Падзеі зноў разгортваюцца ў родных мясцінах аўтара, у беларускіх вёсках Прысожжа. Сюжэт аповесці даволі просты. Хірург раённай бальніцы Валетаў Васіль Паўлавіч, ці проста Палыч, хірург ад Бога, нават хацелі перацягнуць у вобласць (успомнім Арсена з “Бярозавых венікаў”), праводзіць свой традыцыйны аб’езд. Афіцыйна гэта называлася – наведаць сваіх пацыентаў, праверыць іх

[168] Карамазаў, В. Дома. – С. 112.
[169] Тамсама. – С. 69.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

здароўе, а на самай справе – збіраць даніну, пакорм. Дома галодныя дзеці. Жонка – п'яніца, за домам не глядзіць. Валетаў звыкся са сваім становішчам, ужо не заўважае таго прыніжэння, у якое ўвергнуў сябе. Але ці толькі сам? Бюджэтнікаў у такія ўмовы ставіла дзяржава. Каб мець прыстойную зарплату, прыходзілася працаваць у дзве змены. Знясіленасць падмацоўваць спіртам, хоць ведаў, што такое да дабра не прывядзе. Але дзе выхад? Бязладдзе ў краіне пачалося даўно, народ ва ўсім разуверыўся, не бачыць выратавання і ў перабудове. Пра гэта з жорсткай праўдзівасцю, наглядаючы за нейкімі канвульсійнымі дзеяннямі жука, гаворыць дырэктар домабудаўнічага заводзіка збеларушчаны Франц Карлавіч Шнэйдар:

– Бачыш? Без галавы, а нешта вырабляе,– загаварыў Шнэйдар і, нарэшце, падняўшы вочы, паверх акуляраў глянуў на Валеттава. – Ведаю, што ты тут. У акно бачыў твой "мерседэс", – зноў утаропіўся ў жука. – Сядай і глядзі. Гэтая істота падобная на нашу з табой дзяржаву. Без галавы, а жывая. Адно тулава. Яшчэ і нагамі дрыгае. Некуды пнецца. А куды? Без галавы?

Параўнанне збянтэжыла Валетава:

– Ну, вы скажаце, Франц Карлавіч. Як гэта дзяржава без галавы?

Не адрываючы вачэй ад жучка, Шнэйдар даваў яму ногцем пад хвост і далей разважаў з тым самым спакоем:

– А калі яна, тая галава была? То вісельнік Сталін, то Булганін, курыны маршал, то шут кукурузны Хрушчоў. А Брэжнеў ці Чарненка? Ад гэтакіх у вёсцы запалкі хаваюць, каб яе не спалілі. Дзе ж ты бачыў галовы? Га, доктар?"[170]

Песімізм такіх прагнозаў пісьменнік пацвярджае развагамі і абласнога хірурга, словы якога таксама прыходзяць на памяць Валетаву. Той проста крычаў яму:

– Спілася краіна! Чуеш?.. І Гарбач яе з гаўна не выцягне! Калі ўжо маткі спяваюцца – канец усяму, Валетаў!.."[171].

Вядома, можна запярэчыць пісьменніку, што лёгка пісаць постфактум. Але справа ў тым, што ўсе падобныя глабальныя праблемы для беларусаў застаюцца актуальнымі. Паўсюднае каманднае безгалоўе не надае нашаму грамадству аптымізму. Аўтарская пазіцыя тут бескампрамісная. Таму аповесць трэба ўспрымаць не толькі як рэакцыю на чарнобыльскуя трагедыю. У ёй закранаюцца такія пласты

[170] Карамазаў, В. Аброчны крыж. – С. 28.
[171] Тамсама. – С. 17.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

жыцця, якія высвечваюць і беларускі нацыянальны характар, і сучасны менталітэт. Пісьменнік быццам задае пытанне: ці такая ўжо і станоўчая рыса нашага народа – цярплівасць, памяркоўнасць.

Праблема выжывання ў хаосе быцця не надае чалавеку адчування ўзвышанасці, а, хутчэй, болю прыніжанасці, нікчэмнасці ўласнай персоны. Да гэтай высновы прыходзіць і Валетаў, хоць душа яго і супраціўляецца, не хоча пагадзіцца. Ён бачыць гібельную сітуацыю: з нечыей падачы ўсе ад радыяцыі ратуюцца віном, яно стала нейкай панацэяй. Сам жа Валетаў ведае, што гэта не выхад з сітуацыі. Але што рабіць? Чаму людзі апынуліся ў такім становішчы, хто вінаваты? Герой адказу на такія пытанні не знаходзіць, але наглядна бачыць першыя вынікі. Некалі людныя і багатыя мясціны апусцелі, зніклі вёскі, засталіся толькі дзе-нідзе адзінкавыя хаціны, у якіх людзі дажываюць свой век, як адзін з іх – Міцька Будавей. Пасля наведання яго Валетаў разважае: "*Што зробіш, галубок, калі ўлада і лінію выбрала на вынішчэнне ўсяго, чым жывеш? І лесу, і поля, і паветра, і крыжоў святых, і лазенак на берагах Калымкі і Бразгуна. Навошта ўладзе гэткае вынішчэнне? А каб душа чалавека здзервянела, задыхнулася. Улада баіцца душы, бо душа таемная, жытку разумее не як хоча ўлада, часта – наадварот*"[172]. У зоне, сярод разбурэння і заняпаду, Валетаў нарэшце зразумеў, здаецца, ісціну: "*Вось калі дайшло, за што ён яе* (ўладу. – *Я.К.*) *не любіў: яна супраць душы*"[173]. Аднак і ўсведамленне такой ісціны не прыносіць палёгкі, бо не падказвае выхаду. Людзі жывуць на тэрыторыі, засыпанай цэзіем, завуць сябе Цэзарамі, змірыліся з сваім трагічным лёсам. Збіраючы сваю даніну, з роспачы п'е і сам Валетаў. Ён таксама адчувае, што амаль не жыве, а існуе. Можа таму і згаджаецца памагаць Будавею паставіць Аброчны крыж, свайго роду абярэг спакон веку, пра які забыліся людзі, а, дакладней, адвучыла ўлада. І ён салідарны з развагамі Будавея пра чалавека: "*Яго рабавалі, спойвалі, травілі дустам і цэзіем, білі па галаве, пакуль мазгі адбілі, зрабілі Цэзарам. Ён даўно не Богу моліцца, а шлунку. Яму адбілі ахвоту глядзець на неба і зоркі. А мы зноў дарогу да Бога пакажам. Аброку хай моліцца. Аброк – Бог*"[174].

Зварот да міфалогіі як сродку выратавання ад гібелі, адраджэння духоўнасці наогул характэрна для творчасці В. Карамазава. Зоркі-сімвалы іскрацца ва ўсіх творах пісьменніка, па-свойму высвечваючы душы лю-

[172] Карамазаў, В. Аброчны крыж. – С. 66.
[173] Тамсама. – С. 67.
[174] Тамсама. – С. 73.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

дзей. Ці не таму і Валетаву здаецца, што яго душа адлятае да зор краем Белага шляху. Ён сам адчувае, што стаіць на мяжы распаду як асоба. Зараз яго яшчэ выратуе медсястра Кірылаўна, працвярэзіць пад душам, паставіць да аперацыйнага стала, бо замяніць яго некім у тэрміновай аперацыі. Але як знайсці агульнае выратаванне, што тэрмінова трэба рабіць? Адказы на такія пытанні і павінна шукаць грамадства.

Аповесць "Краем Белага шляху" вызначаецца многімі поліфанічнымі рысамі. Тут і ўзнёслая патэтыка ў гонар прыгажосці Прысожжа, і сарказм у выяўленні бяздарнасці многіх палітыкаў і гаспадарнікаў, і шкадаванне, што народ дайшоў да такога стану. А яшчэ твор можа ўспрымацца як антыўтопія, як развенчванне ідэі пабудовы камуністычнага горада Сонца, увасобленым ў Ленінскім пасёлку, збудаваным сярод радыяцыйнай зоны і зарослы быльнягом.

Плённымі самі па сабе былі жанравыя пошукі В.Карамазава. Пісьменнік, магчыма, імкнуўся ў сваёй творчасці паяднаць прыземлена-бытавое з духоўна-ўзнёслым, прыгожым, уласцівым рысам Беларусі. Дзе б ні быў, пра што б ні пісаў – усё суадносіў з родным краем. Тут для яго мог быць прыкладам Янка Брыль з яго нарысам "Душа – не падарожніца". Сапраўды, аповесць-эсэ "Глядзіце ў вочы лемуру" (1986) – пра роднасць людзей, пра сілу мастацтв, пра любоў чалавека да роднага краю. Трэба мець зрок мастака, каб прыкмеціць у экзатычных краінах нешта роднае, якое адразу напамінае пра свае краявіды. Пісьменнік заўважае пэўную заканамернасць у жыццёвых працэсах, лучнасць людзей свету. Дарэчы, уменне бачыць адметнае ў агульным, выключнае ў прыватным праявілася яшчэ ў падарожных нататках "Руны мараны" (1972). Зараз убачанае пісьменнік падае ў значным філасофскім асэнсаванні.

У далёкіх экзатычных краінах пісьменнік заўважае прысутнасць славянства. У Каіры бываў і пісаў пра яго І. Бунін, на Мадагаскары, знаёмячыся з гісторыяй пірацтва, раптам чуе ад Ранавалоны, абарыгенкі, якая вучылася ў Маскве, што героі Гогаля таксама піраты, з чым, вядома, аўтар не можа пагадзіцца, але такая заява прыводзіць да роздуму: "*Ёсць, вядома, штосьці агульнае ў нашай славянскай казацкай вольніцы з вольніцаю піратаў: прага прасторы для душы, мужчынскага брацтва, дзе ні рабоў, ні панства, ні скнарнасці, ні страху перад лёсам і богам, прага жыць па-людску і змагацца за гэта жыццё, хоць і цаною крыві*"[175]. Або, знаёмячыся з літаратурна-мастацкімі традыцыямі Маўрыкіі, даведваючыся, што пісьменнікі гэтага мільённага наро-

[175] Карамазаў, В. Проста ўспомніў я цябе / В. Карамазаў. – Мн.: Маст. літ., 1989. – С. 15.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

да да святкаванню юбілею Тагора напісалі і паставілі звыш ста п'ес, зноў вяртаецца да ўласных праблем: "*Як у святле ўсяго гэтага зразумець хоць бы той факт, што ў нашых тэатрах не ўбачыш ніводнай пастаноўкі пра свайго – не запазычанага, а свайго! – найбуйнейшага асветніка і гуманіста Францішка Скарыну*?"[176]. Пісьменнік сцвярджае, што здалёку больш ярка відаць сваё, не менш каларытнае і ўражлівае, вартае сусветнага прызнання. І вось у аповесці-даследаванні "Проста ўспомніў я цябе" (1983) В. Карамазаў піша пра парадаксальныя рэчы: трэба зноў апынуцца далёка ад дому, каб настальгічна ўспомніць сваё, блізкае, а, разам, у гэтай плыні і выдатнага паэта. "*Дзіва дзіўнае, – піша пісьменнік: – трэба вось апынуцца ў Парыжы, пасяліцца на бульвары Гарыбальдзі ў атэлі "Сегюр" у маленькім утульным пакойчыку на мансардзе з акенцамі ў чысты ружовы дварок, <…> адчыніць акно ў цёплую, хоць ужо амаль палова лістапада,ноч, пагасіць святло… <…> запаліць на стале высокую, на высокай ножцы падсвечніка, свечку і толькі тады… паплысці. <…> У начным акне за свечкаю, за яе жаўтлявым агеньчыкам, з халоднай чужой цемені выплываюць абрысы рачнога берага – цёплага, светлага, высокага.*

І – плыўкая. Нібы рака, музыка. З таго яшчэ нявяснага берага. Музыка роднае мовы"[177].

В. Карамазаў стварае вобраз Паэта, Грамадзяніна, Чалавека, імкнучыся спасцігнуць яго душу праз сэнс паэзіі. Краснапольшчына, Крычаўшчына, Чэрыкаўшчына, лічыць пісьменнік, прарастаюць праз вершы А. Пысіна, ён з тымі мясцінамі звязаны навек. Толькі так можна спазнаць глыбіннасць яго паэзіі. Па словах аўтара, А. Пысін быў маўчун, любіў слухаць і запамінаць яркае гаваркое народнае слова, якое па-новаму святілася ў яго паэтычным радку. Ён быў суровы ў сваіх учынках, дзеяннях, не дараваў злачынных дзеяў, заўсёды быў непахісны. "*Такі быў характар. Ён яго не мяняў да скону. Не згладжваў вострыя вуглы сваёй натуры пад уплывам узросту і абставін. І ніякія вятры, ніякія дажджы, ніякія нягоды не малі абабіць ці размыць гэтыя няўтульныя вострыя вуглы. Пад ім якраз і жылі моцныя палярныя пачуцці: дабрата, чуласць, спагада, дзіўная ў сваёй шчырасці, і разам з тым непахісная рашучасць, варожасць да варожага, таксама дзіўная ў сваёй шчырасці*"[178]. Усё, прапушчанае праз уласнае сэрца, скарачала жыццёвыя шляхі. Але інакш ён

[176] Карамазаў, В. Проста ўспомніў я цябе. – С. 36–37.
[177] Тамсама. – С. 91–92.
[178] Тамсама. – С. 118.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

не мог. Таму і лічыць В. Карамазаў, што паэтаў, як сказаў А. Куляшоў, забіваюць не хваробы, не вайна, а паэзія. І воблік паэта бачыцца яму ў адзінстве з прыродай, што цудоўна выказаў А. Пысін у вершы-прысвячэнні памяці А. Куляшова "Калі б вясне, Дняпру і чайцы..", бо і ўся прырода была таксама самым сапраўдным сааўтарам і А. Пысіну: "*Да Магілёўшчыны Пысін быў прывязаны моцна, як селянін да свайго поля. Тым самым сялянскім вузлом. Тут усё, самая нязначная дробязь, нараджала ў ім нечаканыя асацыяцыі. Думкі, абагульненні. Ну дзе ж яшчэ, як не тут, ён мог падумаць і напісаць такое:*

Вось мой край, мая радзіма!

І можа таму, перш за ўсё – таму неверагодна цікава і зманліва хадзіць паэтавымі сцежкамі па гэтым краі"[179].

Знаходзячыся зноў даволі далёка ад родных мясцін, у сонечнай Ялце, дзе завяршыў свой зямны шлях Максім Багдановіч, В. Карамазаў згадвае яшчэ аднаго творцу з драматычным лёсам – Міхася Стральцова, ствараючы прывабліві вобраз творцы ў апавяданні-эсэ "Гарэла свечачка". Праз год пасля яго адыходу ў іншы свет В. Карамазаву раптам уяўляецца постаць асобы з чыста стральцоўскімі звычкамі і слоўкамі, дасціпнымі, аднаму яму ўласцівымі зваротамі. Такая форма падачы матэрыялу дазволіла пісьменніку коратка перадаць сутнасць рэдкіх размоў з вялікім паэтам на родных ім абодвум берагах Сожа пра сутнасць паэзіі, урэшце і пра той знакаміты яго верш "Стаяў і я на гэтай кручы…", пра што ён быццам і напамінае зараз. Як з'явіўся, так і знік. *"Яго ўжо не было. Тое, апошняе, мне пачулася з неба. Ягоны голас быў ужо там, пад поўняй срэбра. А за Максімавай хвояй, дзе стаяў дагэтуль, вакол Ягоных слядоў круцілася Лісачка, і над ёю ў акне гарэла свечачка*"[180]. У Максімавым акне.

В. Карамазаў, відаць, адзіны з беларускіх пісьменнікаў, хто шмат піша пра мастакоў і жывапіс. І ў гэтым ёсць свая заканамернасць. З дзіцячых гадоў для яго рукі было сваім не толькі пяро, але алоўкі і пэндзель. У дзённіку 1993 года ён згадвае карціну, напісаную алеем на палатне – Чорнае возера за крычаўскім Сожам. Да слова, некаторыя пейзажы В. Карамазава знаходзяцца ў Бялыніцкім музеі. Удзел у плэнэрах на радзіме Бялыніцкага-Бірулі, блізкае знаёмства з яго творчасцю, мусіць, падштурхнулі яго напісаць аповесць-эсэ – жыццяпіс вялікага мастака.

[179] Карамазаў, В. Проста ўспомніў я цябе. – С. 121–122.
[180] Карамазаў, В. Аброчны крыж. – С. 370.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Аповесць-эсэ “Крыж назямлі і поўня ў небе” ў першай публікацыі ў назве мела даволі істотны прыдомак: “Эскізы, эцюды і споведзь Духу, альбо Аповесць-эсэ жыцця жывапісца і паляўнічага Бялыніцкага-Бірулі”. У гэтым выслоўі раскрыта жанравая сутнасць і змест твора. менавіта ў такой сукупнасці рысаў хацеў В. Карамазаў падаць усяму свету, а ў першую чаргу беларусам, вобраз мастака, які стаў гонарам двух народаў. і стварае яго ў трох іпастасях: Біруля-мастак, Біруля-грамадзянін, Біруля-Чалавек і мысліцель, а ў цэлым – Творца. Каб зразумець душу мастака, пісьменніку прыйшлося прайсціся яго сцежкамі, сустрэцца з людзьмі, якія помнілі Бірулю ў яго “Чайцы” над Удомляю, вывучаць архівы, спадчыну мастака, у тым ліку і літаратурную. У сугуччы ўсяго пісьменніку ўсё больш адкрываўся вобраз Бялыніцкага-Бірулі, па сваёй сутнасці беларуса, які пасяліўся ля возера Удомля толькі таму, што яно нагадвала Няшчарду на Віцебшчыне і бялыніцкія ўзгоркавыя мясціны, дзе калісьці былі яго родныя Крынкі. Сутнасць яго характару бачыцца пісьменніку ў яго суладнасці з прыродай, бо яна была для мастака не проста натурай для пейзажаў, а сапраўдным Пантэонам, дзе ён адчуваў сябе роднасным кожнай травінцы і лісточку. Мастакоўскія прынцыпы яго правяраліся і праз сяброўства з калегамі і настаўнікамі, а душа раскрывалася ў лістах да сяброў, і перш за ўсё да Любачкі, дачкі, актрысы, чалавека далікатнай душы. Яе заўчасная смерць была незагойнай ранай мастака. І таму, падкрэслівае пісьменнік, на сконе дзён Бялыніцкі-Біруля нібы правярае правільнасць свайго жыцця праз размовы з яе прывідам, прысутнасцю ў пакоі адзінокага яго існавання.

У аповесці постаць Бірулі паўстае ў асяродку яго папярэднікаў і настаўнікаў Паленава, Левітана, Заранкі, Сцяпанава, знакамітага аб’яднання мастакоў-перадзвіжнікаў, куды і сам быў неўзабаве прыняты, сяброў па мастацкім вучылішчы Жукоўскага, Маравава, Багданава-Бельскага. Вобраз Бялыніцкага-Бірулі ствараецца пісьменнікам праз успрыманне мастакоў, свет і колер яго палотнаў і мемуарна-літаратурныя запісы, эпісталярную спадчыну. Мастак праз уласнае слова дапамагаў В. Карамзаву зразумець душу яго палотнаў, перадаць сілу ўздзеяння карцін на чалавека.

У аповесці раскрываюцца прычыны творчых узлётаў і момантаў застою, драматычных узаемадносін з новымі ўладамі, з якімі за сорак год, да самай смерці так і не змог паразумецца, бо вольны дух мастака не дазваляў яму ісці на адкрытае ўслужэнне рэжыму. Пісьменніку ўдалося перадаць асаблівасць мастацкай манеры жывапісца.”*Вітольд*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Каятанавіч быў чалавекам святла. Гэта відавочна пры самай першай, нават мімалётнай, сустрэчы з ім, з кожнай яго карцінай, з кожным эцюдам. Можа таму і пісаў усё жыццё пейзажы, адны чыстыя, як кажуць, пейзажы, што ў свеце не засталося нічога больш чыстага, як прырода"[181]. Тут адбываецца паяднанне душ: мастака Бірулі і пісьменніка Карамазава, ля якога прырода таксама боскі храм.

Зацікаўленасць лёсам Бялыніцкага-Бірулі прывяла В. Карамазава да жадання раскрыць жыццёвыя варункі яшчэ аднаго вялікага мастака – Станіслава Жукоўскага, таксама беларуса, чалавека з няпростым і драматычным лёсам, што і здзейсніў у аповесці-эсэ "Мой брат духоўны". Мастак, паляўнічы, бліжэйшы сябра Бірулі, ён не раз гасцяваў у "Чайцы", хадзіў разам з ім на натурныя эцюдныя замалёўкі. Пісьменнік шукае ў сваіх героях агульнае і адметнае, акрэслівае іх шляхі ў вялікае мастацтва. Апантанасць ім у пэўнай ступені прымушае Жукоўскага падацца ў Маскву, што выклікала страшэннае незадавальненне бацькі, які ў гэтым рашэнні ўбачыў здраду сямейным традыцыям, і перш за ўсё памяці дзядзькі, які загінуў ад рук маскалёў у час паўстання пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага. Пісьменнік якраз і акцэнтуе ўвагу на неўрымслівасці характару будучага мастака, які быў пераканаы, што не здраджвае, а шукае сваю дарогу ў жыццё. Вось гэтая незалежнасць якраз і падабалася Бірулю, у іх былі блізкія погляды на жыццё, але неаднолькавыя ў жывапісе: *"Бывала, што яны, сябры, пісалі адзін, пад адным небам і сонцам, матыў, але такія непадобныя выходзілі эцюды. Бо кожны мастак мае свой градус цяпла і свой градус холаду. А ў выніку? Кожны выяўляе свой твар, сваю душу. Біруля глыбей бачыць блакіт і срэбра, а ён – чырвань і золата"*[182]. В. Карамазаў паказвае, што, як і Біруля, С. Жукоўскі застаецца ў адзіноце і на сваёй радзіме, куды ён выехаў у 20-я гады мінулага стагоддзя. Ён так і не памірыўся з бацькам, апантана піша пейзажы свайго роднага Палесся, але і тут не знаходзіць паразумення ў асяроддзі мастакоў, ды застаецца верным даўнейшым дэмакратычным поглядам, гіне на барыкадах паўстаўшай Варшавы. Таму і гучаць апафеозам заключныя радкі аппвесці пра жывапісца: "*Пасля вайны хтосьці скажа і хтосьці напіша, што Станіслаў Жукоўскі ўсё ж знайшоў прымірэнне з бацькам. Хтосьці скажа і хтосьці напіша, што яго, сына, знайшоў, каб прымірыцца, бацька. У любым выпадку гэта адбылося ўжо на тым свеце, і было прымірэннем душ. Бо душа, хрыш-*

[181] Карамазаў, В. З вясною ў адным вагоне / В. Карамазаў. – Мн.: Юнацтва, 2002. – С. 171.
[182] Тамсама. – С. 49.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

чоная пад штандарамі Яські з-пад Вільні, магла прымірыцца толькі з душою, што ўзяла на сябе пакуты і крыж пад штандарамі Волі і Бацькаўшчыны"[183].

Калі ў працы над папярэднімі творамі пісьменніку ў асноўным прыходзілася працаваць з дакументамі, каб увасобіць воблікі вялікіх мастакоў, то ў кароткай аповесці-эсэ "Зачараваная душа" ён выкарыстоўвае ўласныя назіранні, гутаркі ў часы сумесных жывапісных плэнараў. Перад намі таксама паўстае неардынарная асоба мастака, ураджэнца Магілёўшчыны, Антона Бархаткова. Цяпер гэта ўжо вучань Бялыніцкага-Бірулі, з сваёй уласнай манерай жывапісу, творыць цуды на палатне, але таксама павінен праходзіць праз пакуты. "*Душа, зачараваная прыгажосцю да самазабыцця, жыве ды хвалюецца ў кожным яго пейзажы. Пісаць іначай ён не можа – настаўнікі, якія выдаліся на яго долю, пісаць іначай не вучылі, за плячыма іх сістэма, метады, прынцыпы, мараль. Хоць пісаць усё жыццё душой зачараванай – толькі радасць, але і праца катаржная, асабліва ў гэтакай рэальнасці, як наша нацыянальная. Дзе над мастаком і вакол яго цівуны ды грамілы пільнуюць душу зачараваную*"[184].

Пісьменніку ўдалося паказаць сам працэс нараджэння карціны, выбар натуры, бачанне самой прыроды вокам мастака. І гэта ў кожнага сваё, кожны бачыць у адным і тым жа куточку менавіта сваё, свае светлацені і майстэрства пакласці яго на палатно. Асаблівасць жывапіснай манеры выявіў пісьменнік і мастакоў Анатоля Бараноўскага (эсэ "Жавараначкам блаславёнае"), Гаўрылы Вашчанкі (эсэ "Скарбы чырвонай брамы").

Лёс вядомага расійскага жывапісца Мікалая Васільевіча Неўрава становіцца асновай рамана В. Карамазава "Мастак і парабкі" (2011). Упершыню, як тлумачыць сам пісьменнік, імя яго ён сустрэў чыста выпадкова, апынуўшыся ў в. Лыскаўшчына на Кругляншчыне па журналісцкіх справах у маі 1964 года. "*Абыходзячы па сівым купніку заліты вадою бальшак, я выскачыў на вясковыя могілкі і там нечакана спыніўся перад вільготна-бурым курганком з дошчачкай на крыжы: "Мікалай Васільевіч Неўраў" <...> Карціну Неўрава "Гандаль", як пан пану прадаваў прыгонную сялянку, я памятаў са школьных гадоў, з падручніка па літаратуры, але мяне вельмі здзівіла, што вялікі расійскі мастак тут, у нашай вёсачцы жыў, пісаў карціны і чамусьці застрэліўся*"[185]. Людзі, якія прыбіралі магілкі да Раданіцы сёе-тое

[183] Карамазаў, В. З вясною ў адным вагоне. – С. 60.
[184] Тамсама. – С. 267–268.
[185] Карамазаў, В. Мастак і парабкі / В. Карамазаў. – Мн.: Медысонт, 2011. – С. 3.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

паведамілі і падказалі з кім сустрэцца. У тыя гады запісаныя ад старэйшага пакалення ўспаміны чакалі сваёй мастацкай рэалізацыі амаль паўстагоддзя. Такая вось творчая гісторыя рамана. па многіх прыкметах яго таксама можна вызначыць як раман-эсэ. У ім таксама сцвярджаецца неабходнасць свабоды для мастака, прастору для выявы яго душы. Ці не таму яны імкнуліся вырвацца з тлумных сталіц, пасяліцца на ўлонні прыроды сярод працавітых людзей. У канцы XIX стагоддзя Бялыніцкі-Біруля пасяляецца на беразе возера Удомля, Рэпін купляе маёнтак Здраўнева на Віцебшчыне, Неўраў апынаецца на Магілёўшчыне, у вёсцы недалёка ад родных Бірулю Крынак. Пісьменнік у гэтым бачыць пэўную заканамернасць пры ўсёй выпадковасці: сюды прывёз мастака генерал Чарняеў, ураджэнец гэтых мясцінаў, аматар жывапісу і прыхільнік творчасці Неўрава. Што ж прывяло знакамітага майстра пэндзля Расіі ў такую правінцыйную глуш? Магчыма, толькі адно: шукаў свабоды, прататыпаў моцных і свабодалюбівых герояў, пра якіх, відаць, ведаў з размоў з Бялыніцкім-Бірулем і Жукоўскім. В.Карамазаў сцвярджае, што мастак расчараваўся, бо ўбачыў у вёсках мясцовага пана Лупандзіна, самага выразнага нашчадка мураўёўцаў-вешальнікаў, нязвычную пакору пад бізуном цемрашала. Шукаў вольных духам людзей і не знаходзіў, пра сваю бяду гаварыў з мясцовым святаром у Друцку Максімам, пра немагчымасць зразумець гэтых людзей: піша партрэты Пракопа, яго сыноў, больш незалежных, бо адносна заможных, а яго жонка Аўгіня распаўсюджвае чуткі, што мастак – д'ябал.

Праз размовы бацюшкі Максіма і Неўрава, праз роздумы апошняга пісьменнік падае сваё бачанне некаторых гістрычных працэсаў. Пасля паўстанняў беларускую эліту вынішчалі, замяняючы прысланцамі з усходу. Найбольш вольналюбівых сялян або знішчылі, альбо саслалі ў Сібір. Але і палітыка перамяшчэнняў не дала чаканага плёну: усё ж больш тут апынулася такіх, як айцец Максім, генерал Чарняеў, ужо патрыёты свайго краю, трэцяе пакаленне тых засланцаў, якія ў некай ступені пераймалі мясцовы ўклад жыцця. Неўраў з парады айца Максіма чытае кнігі пра даўніну, дзе спрабуе знайсці адказы на свае пытанні. Што тварылася на гэтых землях? Чаму акаталічаныя магнаты так жорстка каралі праваслаўных за бунт супраць уніі, свае білі сваіх, у той час як украінскія гетманы баранілі вольнасць казакаў. "*Задумаўся зноў Неўраў: што за народ – казакі? Суседзі-мужыкі, як мужыкі ў Лыскаўшчыне, у Грыбіне, у Красулі? Зямлю аралі, сеялі, касілі, дзяцей гадавалі. Але і ваявалі, бо не хацелі быць ні парабкамі, ні рабамі. Жыццё*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

чым вымяралі? Хіба кавалкам? Воляй! Бо ведалі: не будзе волі – не будзе і кавалка, жыцця не будзе. А тут, у Лыскаўшчыне? За дзесяць гадоў хоць ад каго пачуў пра волю?"[186].

Яму згадваюцца зневажлівыя словы Лупандзіна, што тутэйшае "быдла" жыць без бізуна не можа, бо жыхары нашчадкі тых рабоў, якіх некалі ў Друцку прадаваў мінскі князь Глеб, за што і быў пакараны Ярославічамі, не могуць жадаць волі. Але ж Неўраў вычытаў у даўніх кнігах, што некалі Друцк быў магутным княствам, гараджане ў часы навалы станавіліся воямі, не даваалі скарыць сябе любой навале. А што зараз? Мастак шукае ў сучасніках той даўняй ваярскай моцы. Ён разважае: ці знайшоў бы Рэпін сярод тутэйшых прататыпаў для карціны "Казакі пішуць пісьмо султану", бо замалёўкі мясцовых сялян яму такой упэўненасці не даюць. Усё ж, зацікавіўшыся гераічнай гісторыяй Друцка, рашае напісаць карціну пра тое, як дручане сустракаюць Рагвалода, за нешта прагнанага вечам з Полацка. Прататыпамі князя, вояў, гараджан становяцца той жа Пракоп, яго сыны, Восіп, стары Гіра ды іншыя, мастак адчувае, што карціна жыве, тым самым і перакрэсліваючы свае нядаўнія сумненні. Аднак не задаволены вобразам князёўны, бо пісаў з даўняга эцюда. У стане дэпрэсіі, магчыма з разладу з Лупандзіным, які высяляе матака з дома, ад творчых няўдач, Неўраў нішчыць карціну і ўсе эцюды, канчае жыццё самагубствам. Тут ужо малаважна была такая карціна ці не, магчыма гэта і містыфікацыя, звычайны літаратурны прыём, даволі распаўсюджаны ў красным пісьменстве. Як бы там ні было, а пісьменнік падказвае, што трэба ведаць сваю гісторыю, помніць тых інтэлігентаў, якія на пачатку мінулага стагоддзя імкнуліся абудзіць у прыгнечанага чалавека пачуццё годнасці.

Усе падзеі ў вялікіх эпічных творах В.Карамазава адбываюцца зноў у Прысожжы. У рамане "Пушча" (1979) можна заўважыць некаторыя рэмінісцэнцыі ранніх яго апавяданняў. Пісьменніка цікавіць чалавек у яго дачыненнях да прыроды. Як змяняецца пад павевамі няўмольнага часу, што адбываецца ў цэлым у грамадстве. Паколькі твор напісаны у перыяд так званага "застою", то ў ім, натуральна, адбіліся ўсемагчымыя яго рысы: захапленне НТР як панацэяй ад усіх бедаў, трыўмф сацыялістычнай формы гаспадарання з яе грандыёзнымі псеўданавуковымі праектамі.

Кампазіцыйна раман прывязаны да каляндарнага цыклу года, але задзейнічаны толькі дзе яго сферы – Зіма і Вясна. У адпаведнасці з гэтым

[186] Карамазаў, В. Мастак і парабкі. – С. 129.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

развіваецца і сюжэт рамана, галоўнымі рухаючымі сіламі якога з'яўляюцца героі-антыподы Міхась Валошка і Васіль Зімавец. Трэцяй вельмі важнай дзеючай асобай з'яўляецца Пушча, яна ўсімі героямі ўспрымаецца як жывая істота. Маральна-этычныя якасці людзей вызначаюцца іх адносінамі да лесу, да прыроды, па гэтым прынцыпе яны падзяляюцца на пэўныя групы, што абвастраюць канфлікт, узмацняюць дзеянне твора.

Носьбітамі высокай маралі, выразнікамі жыцця пушчы і ўсяго існага з'яўляюцца старыя Кулаш і Тамш Заржэцкі, па мянушцы Гарох, тыповы народны герой. Кулаш – сапраўдны сімвал пушчы, ён служыць звязуючым звяном паміж сучаснікамі і паўлегендарным лесніком Нікодымам, які сваімі клопатамі захаваў пушчу для нашчадкаў у час яе няшчаднага вынішчэння на рубяжы XIX–XX стагоддзяў. Згадкі пра Нікодыма – гэта зварот да гісторыі, пошукі фундамента сённяшняй жыццядзейнасці і спроба праектавання будучыні. На гэта ў свой час звярнуў увагу П.К. Дзюбайла: "*Твор В. Карамазава ўздымае вельмі важныя, востра надзённыя пытанні жыцця чалавека, яго мінулага і будучага, складаных узаемаадносін з прыродай, з тым жывёльным і раслінным светам, які вакол яго і без якога ён таксама не можа нармальна жыць*"[187]. Сучаснае і будучае ў іх лепшых праявах асэнсоўваецца перш за ўсё праз дзейнасць многіх людзей, такіх, як ляснічы Міхась Валошка, яго прыхільнікі і паслядоўнікі: ляснік Курнопа, егер Міна і яго юны памочнік Сашка Курнопа, таксатар Андрэй Старапольны, Ракіцёнак, начальнік лесапункта і многа іншых. Ім процістаяць дырэктар лясгаса ВасільЗімавец, ляснік Рысеў, інжынер лясной аховы Марцыёнак, намеснік ляснічага Вайцюк. Гэтых людзей, вядома, значна менш, але яны страшэнна агрэсіўныя, таму і небяспечныя, бо і некаторыя з іх і пры высокай уладзе.

Міхась Валошка прыезджы, але вырас у блізкіх мясцінах, засвоіў глыбока народныя ісціны. Увесь адданы лесу, ён разумее, што дрэва патрэбна на будоўлю ў гарадах і вёсках, урэшце і для ацяплення ўласнай хаты. Але ён супраць бяздумнага і жорсткага выкарыстання лесу, таму і злуецца, калі некаторыя начальнікі паблажліва глядзяць на яго клопаты пра пасадку лесу, карпенне над лесапасадачнай машынай. Так ён адносіцца і да жывёл, ухваляе дзеянне Курнопы, калі той пераганяе двух прыблудных ласёў, даведаўшыся, што на іх участку будзе паляванне з удзелам абласнога начальства.

Такога глыбокага разумення прыроды няма ў прагматычнага Зімаўца. З-за дробязнай выгады ён гатовы на ўсё. Таму эпагею

[187] Дзюбайла, П.К. Беларускі раман: Гады 70-я. – С. 33.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

процістаянне ляснічага і дырэктара леспрамгаса дасягае тады, калі апошні прымае рашэнне дзеля выканання плана зрэзаць дубы на калодкі і адправіць іх у Магадан. Ён і сам разумее абсурднасць такіх дзеянняў, бо з Сібіры тыя калодкі было дастаўляць хутчэй і танней. Але такія прыёмы былі дапушчальныя ў планавай савецкай эканоміцы, і яму дастаткова аргументаў планавіка Шамрына пра выгаднасць такой здзелкі: лёгка перакрыюць план, які можа сарвацца з-за маруднага вырабу паркетнай дошчачкі. Таму яго вельмі здзівіла, што ў абарону дубровы выступілі не толькі жыхары Лісані, але і аддаленых вёсак. А справа ў тым, што дуброва стала сімвалам жыцця, асабліва векавечны дуб, празваны Святым. Калі ўлады панішчылі цэрквы, людзі ў апошні шлях выпраўлялі чалавека ад дуба, быццам вяртаючыся ў час язычніцтва. Пра гэта напамінае Зімаўцу і стары Кулаш, гаворачы, што адсюль праводзілі і яго бабку Марылю: *“А гэтага не ведаючы, можна і яго, Святы, звaліць… Дзела не хітрае…*”[188].

Па сутнасці, гэта канчатковая развязка канфлікту: пастаўлены праблемы, над якімі разважаюць і галоўныя героі і ўсе, хто мае дачыненне да пушчы. Але роздумы гэтыя ў кожнага ідуць па-рознаму. Валошка працягвае разважанні гуманістычнага плану, асуджаючы прынцыпы аднадзёншчыны, што перанялі і некаторыя маладыя, тыпу яго намесніка Вайцюка: “*Няма, пэўна, нічога страшней, – разважае Валошка, – як калі памяць знікае. Калі чалавек забывае, што будзе пасля яго, нават мо і пры ім, але пасля, пазней. нібы курыца, грабецца ён у сваёй яме, пад сабою. Абы зараз, у гэты міг, было як след, а далей, навокал – нібы чужое. Страшней няма, як жыць гэтак*”[189]. Пісьменнік прадстаўляе магчымасць падумаць кожнаму, хто ажыццяўляе гэтую спажывецкую псіхалогію.

Пэўныя зрухі ў свядомасці, у душы адбываюцца і ў Зімаўца, які можа ўпершыню паспрабаваў паглядзець на сябе і здзівіўся, чаму ён такі. Ён жа таксама вырас у гэтых мясцінах, любіў пушчу і ўсё жывое, але вось не прыняў да сэрца так блізка, як іншы. Чаму для яго абыякавыя легенды пра яго дзеда Нікодыма, пра жывога Кулаша? Ён спрабуе высветліць у бацькі і дазнаецца, што ў вайну Кулаш выратаваў іх абоіх. В. Карамазаў паступова пераводзіць развагі ў філасофскі план, даследуе, якія фактары ўплываюць на фарміраванне асобы. Спроба Сямёна Зімаўца адгарадзіцца ад мінулага абарочваецца бядой для яго сына, але

[188] Карамазаў, В. Пушча / В. Карамазаў. – Мн.: Маст. літ., 19.. . – С. 367.
[189] Тамсама. – С. 378.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

гэтага ён не заўважае: “*Некалі пушчаю правіў пан. Тады казалі, што пан ды воўк – два цары ў пушчы. А Зімаўцы былі ў пана парабкамі. Паздзекаваўся ён і з твайго дзеда Нікодыма, і з твае прабабкі Марылі. <…> Былі Зімаўцы парабкамі. А цяпер? Хто ў пушчы гаспадар? Зімавец! І я цяпер магу паміраць з лёгкаю душою. Бо даказаў. І нішто, ніводзін чорны дзень успамінаць не хачу. Што было – як не было. Быллём парасло. Гэтак хачу жыць. І каб ты гэта жыў!..*”[190]. Аднак цяпер словы бацькі Васіль успрымае інакш, ён спрабуе аналізаваць свае дзеянні. Не давалі спакою думкі: “*Што гэта са мною? Перад кім вінаваты? Перад Кулашам? Але столькі гадоў мінула, як была вайна! Ніхто дагэтуль не казаў, што я вінаваты. Сам чалавек хіба можа ўзяць на сябе віну*?”[191]. Зімавец яшчэ спрабуе знайсці сабе апраўданні, раскласці сваю віну на многіх, але ўжо беспаспяхова. Ён адчувае сябе адрынутым, бо не можа зразумець людзей, іх адносін да акаляючага свету, ледзь не паганскага пакланення лесу. В.А. Каваленка адзначаў, што “*пушча ў рамане В. Карамазава выступае як дом чалавека і як святыня. Аўтарам выказана шкадаванне, што знікае векавая некранутасць пушчанскіх нетраў пад непрадуманым уздзеяннем тэхнічна ўзброенага чалавека, які нішчыць багацці прыроды*”[192].

Раман В. Карамазава густа населены, патрэбна было выявіць вялікае майстэрства, каб не паўтарыцца, кожнага надзяліць індывідуальнымі рысамі. Героі апынаюцца перад важнымі сацыяльнымі і маральнымі праблемамі, якія адначасна вырашыць немагчыма. Запамінальнымі ў сваіх жыццёвых турботах становяцца і дзед Гарох, Міця з Насцяй, ляснік Рысеў з усёй яго беспрынцыповасцю і сквапнасцю і іншыя героі. Увогуле ўжо ў тыя гады набывала актуальнасць экалагічная праблема, таму раман В. Карамазава “Пушча” разам з раманам “Неруш” В. Казько падымалі вельмі важную ў беларускай літаратуры тэму.

Раман “Бежанцы” – самы аўтабіяграфічны і кампазіцыйна ўскладнёны твор пісьменніка. У ім пераплятаюцца падзеі сучаснасці і часу вайны, рэтрэспектыўныя адыходы ў дарэвалюцыйныя гады і першыя дзесяцігоддзі савецкай улады. Усе гэтыя перыяды звязваюцца ў адзіны вузел галоўнымі героямі твора – Захара Макаравіча Падабеда і яго сына Васі. Менавта праз іх успрыманне падаюцца ўсе надзённыя падзеі пачатку вайны. Старэйшы глядзіць больш аналітычна, хоць не ўсё адразу

[190] Карамазаў, В. Пушча. – С. 374.

[191] Тамсама. – С. 374–375.

[192] Каваленка, В.А. Міфа-паэтычныя матывы ў беларускай літаратуры / В.А. Каваленка. – Мн.: Нав. і тэхн., 1981. – С. 281.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

можа вытлумачыць. Асэнсаванне часу дзіцячымі вачыма больш уражліва эмацыянальнае, асабліва ў тых мясцінах, калі па збегу абставін хлопчык застаецца адзін. Тут яўна не хапае псіхалагічнай пераканаўчасці у магчымасці зафіксаваць усё ў такой падрабязнасці і ацаніць сямігадовым хлапчуком. Але усё ж галоўнае тут пакуль што не вайна, а роздум пра лёс нацыі, народа, што выяўляецца на факце жыцця адной сям'і Асташонкаў. Захар ніяк не мог зразумець той адчужанасці, якая наступіла ў некалі дружнай сям'і, пакуль не згадаў недалёкае мінулае: рэвалюцыя разбурыла адзінства сям'і. Браты Асташонкі апынуліся па розных баках барыкад, чырвоны Ілля не дараваў брату Усеваладу яго навучанне ў кадэцкім вучылішчы. За тыя даўнія гады вінаватым сябе адчувае і Захар, калі ўжо настаўнікам вымушаны быў у мнагадзетнай раскулачанай сям'і выграбаць апошні мяшок зерня. Яго нярадасная выснова: жыццё беларусаў – нейкі суцэльны ланцуг трагічных абставін, не маюць шчасця ў роднай старане, заўсёдныя бежанцы. І вось зараз, дарослы Васіль і яго сын, унук Захара, Сярожа таксама бежанцы, але ўжо ад іншай бяды – Чарнобыльскай.

Раману зададзены яўна эпапейны характар развіцця падзей, як яны будуць развівацца – пакажа час.

Творчасць В. Карамазава стала значнай з'явай у літаратурным працэсе другой паловы XX стагоддзя.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ГЛЫБІННАЕ ЎЗНАЎЛЕННЕ ЖЫЦЦЯ

Творчасць Івана Чыгрынава

Гэтае пакаленне пісьменнікаў пазнавала кошт жыцця ў самыя трагічныя для радзімы часы, калі на кон ставілася само існаванне народа. Тыя памятныя драматычныя гады навечна ўрэзаліся ў памяць, заўсёды турбавалі, патрабавалі выйсця, што потым знайшлі яркае выяўленне ў мастацкіх творах. Так сталася і ў творчым лёсе Івана Чыгрынава. Ён таксама з таго ж філалагічнага пакалення, што зрабіла значны ўклад у літаратурны працэс.

Іван Гаўрылавіч Чыгрынаў нарадзіўся 21 снежня 1934 года ў вёсцы Вялікі Бор Касцюковіцкага раёна ў сям'і калгаснікаў. Акрамя акупантаў і партызанаў, запомніўся адзін драматычны эпізод: нямецкі самалёт наладзіў паляванне на хлапчука, які бег на поле да маці. І да пошніх дзён ён так і не змог зразумець намераў нямецкага лётчыка. Чаго той дабіваўся? Забіць? Напалохаць? Бо адчапіўся толькі тады, калі ўцекачу ўдалося схавацца ў рове пад лазовы куст. Ужо ў гэтым была трагедыя вайны. Пасля вызвалення родных мясцін ад акупантаў спачатку вучыўся ў мясцовай школе, а потым у Саматэвіцкай сярэдняй школе. Там настаўнік матэматыкі Сцяпан Андрэевіч Брыльянтаў, які, дарэчы, вучыў і Аркадзя Куляшова, пазнаёміў яго, тады ўжо дзесяцікласніка, пачынаючага паэта, са знакамітым земляком. Станоўчыя водгукі мэтра паэзіі акрылілі юнака.

Пасля заканчэння школы І. Чыгрынаў у 1952 г. паступіў на адзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта БДУ і ў 1957 з дыпломам журналіста быў накіраваны на працу ў выдавецтва АН БССР, дзе працаваў спачатку рэдактарам, а потым загадчыкам аддзела літаратуры і мастацтва, сумесна з Бандарчыкам напісаў манаграфію "Н.Я. Никифоровский" (1960), а ў 1965 г. перайшоў у часопіс "Полымя" на пасаду рэдактара аддзела публіцыстыкі і нарыса, а з 1975 г. працаваў у апараце Саюза пісьменнікаў БССР, спачатку намеснікам старшыні, а ў 1976–1986 – сакратром праўлення. У 1987 г. І.Г. Чыгрынава выбралі старшынёй праўлення Беларускага фонду культуры, а з 1989 г. адначасова быў і галоўным рэдактарам часопіса "Спадчына". Ён – народны пісьменнік Беларусі (1994).

Як ужо адзначалася, літаратурную творчсць І. Чыгрынаў пачынаў з вершаў, уласна, як і ўсе маладыя, друкаваўся ў раённай газеце. Пазней, ужо ў студэнцкія гады, яго вершы змяшчаліся ў абласным і рэспубліканскім друку. У 1952 годзе ў часопісе "Полымя" быў надрука-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ваны верш “Сон трактарыста”, вытрыманы ў духу часу, у ім перадаецца радасны тастрой хлопца, які і ў сне бачыць раздольныя калгасныя палі, яго весела вітае сонца:

І калыша над палямі
Дзень многагалосы,
Песню жаўранка сплятае
З песняю калосся[193].

Потым былі апублікаваны вершы “На змярканні палявой сцежкай”, “Смуглянка”, у якіх таксама выявіліся рысы афіцыйнага аптымізму, пацверджаныя шчодра яркімі дэталямі: тут і ясныя зоры, і лямпачкі ільічовы, і росныя сенажаці, і гудкі фабрык і заводаў, якія суправаджаюць закаханых – юную ўдарніцу палёў і прадстаўніка тэхнічнага прагрэсу. Праўда, верш “Смуглянка” вызначаецца большай лірычнасцю, у ім натуральна перадаецца пачуццё-перажыванне лірычнага героя, які ніяк не адважыцца прызнацца ў каханні сваёй абранніцы-будаўніцы, ходзіць вакол будоўлі, пакуль з акна дома не пачынае ўсміхацца яму другая чараўніца, але ён не можа забыць тую, што ўпершыню растрывожыла яго сэрца:

І цяпер
Удзень ці ўранку,
Дзе ні здарыцца бываць,
Чарнавокую смуглянку
Ўсё спрабую адшукаць[194].

У гэты ж час І.Чыгрынаў напісаў верш-прысвячэнне “З песняй Якуба Коласа”, таксама з прыкметамі планетарнасці, але ў ім ёсць і захапленне асобай народнага песняра:

З той самай часіны,
Як з кнігай спазнаўся,
Я зпесняй Коласа не разлучаўся,
Бо ў ёй пазнаваў дарагую краіну,
Калгасныя вёскі, лугі і палі,
На Волзе вялікай плаціны,
Багацці савецкай зямлі.
І з песнямі тымі, што сёння спяваюць
Горнам прызыўным над роднай зямлёй[195].

[193] Чыгрынаў, І. Сон Трактарыста / І. Чыгрынаў // Полымя. – 1952. – № 12. – С. 110.

[194] Чыгрынаў, І. Смуглянка / І.Чыгрынаў // Чырвоная змена, 1953. – 12 лістапада.

[195] Чыгрынаў, І. З песняй Якуба Коласа / І. Чыгрынаў // Жыццё для народа. – Мн.: Выд. АН БССР, 1962. – С. 265.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У 1956 годзе ў “Магілёўскай праўдзе” быў змешчаны верш “Жураўлі”, у якім паэтычна распавядалася пра вечны кругазварот сустрэч і растанняў. Больш у друку вершаў І. Чыгрынавва не з’яўлялася.

Пачынаючы з 1958 года, з часу публікацыі першага апавядання І. Чыгрынаў піша пераважна прозу, зрэдку заглядваючы ў суседні драматургічны цэх. Напісаныя ім за пятанццаць гадоў апавяданні склалі зборнікі “Птушкі ляцяць на волю” (1965), “Самы шчаслівы чалавек” (1967), “Ішоў на вайну чалавек” (1973). У творах адбіўся асабісты вопыт пісьмееніка, бачанае ім, перажытае. У большасці апавяданняў героямі з’яўляюцца дзеці вайны. Гэта яны сучасным дарослым часам зноў перажываюць мінулае, сваёй памяццю вяртаюцца ў тыя пякельныя дні, альбо ў самыя галодныя часы адразу пасля вызвалення Прыбесяддзя. Паказальным у гэтым плане з’яўляецца апавяданне “За сто кіламетраў на абед”. Пра тыя ўжо далёкія падзеі напісана ў рэтраспектыўным плане, праз смугу дзесяцігоддзяў згадваюцца толькі галоўныя рысы, але запамінальныя і ўражваючыя. *“Нам тады было па дзесяць гадоў – адным трохі болей, другі трохі меней. І мы былі дзеці вайны. але тады мы амаль усё ведалі, і мне часам здаецца, што ведалі куды больш, чым нават цяпер, калі нам па трыццаць ужо. Ведалі, якія кулі ў што пафарбаваны – звычайныя, разрыўныя, бронеразрыўныя, бранябойныя, трасіруючыя…”*[196]. Яны маглі па гуку вызначаць свае і чужыя самалёты, былі самастойныя і рашучыя, бо не баяліся амаль за сто кіламетраў адпраўляцца на абед у дзіцячы дом, дзе іх кармілі смачным, як ім здавалася, абедам. Але ўсё ж галоўным персанажам тут з’яўляецца той дырэктар дзіцячага дома, інвалід вайны, які, нават разгадаўшы хітрыкі дзяцей, корміць іх, бо інакш не можа. Так пісьменнік узвялічвае чалавека-ахвярніка, які не можа пакінуць у бядзе тых, на каго і будзе некалі спадзяванне дзяржавы.

Ужо ў самых першых апавяданнях пісьменніа праявілася асаблівасць яго творчай манеры: амаль усе апавяданні маюць падарожныя сюжэты. Гэта можа быць сведчаннем, што пісьменніку найбольш яскрава ўдаецца выказаць тое, што ён бачыў уласнымі вачыма, перажыў, пераасэнсаваў разам з многімі расказчыкамі, якія перадаюць яму самыя задушэўныя, надзвычай асабістыя жыццёвыя падзеі і звязаныя з імі выключныя перажыванні. Тут, відаць, спрацоўвала і прафесійная дадзенасць: сам І.Чыгрынаў любіў падараожнічаць, па некалькі разоў абышоў сваё роднае Прыбесяддзе, як і па справах журналісцкіх, так і з жадання лепш пазнаць свой край. Таму і ў апавяданнях, звычайна

[196] Чыгрынаў, І. Апавяданні / І. Чыгрынаў. – Мн.: Маст. літ., 2007. – С. 77.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

не густа населеных, дзейнічаюць выразна непадобныя героі, хоць і духоўна блізкія: падарожнік, які нечакана можа апынуцца каля кастра на лузе, герой-апавядальнік і героі, непасрэдныя ўдзельнікі падзеяў. Так арганізавныя ў сюжэтнай аснове апавяданні “Ля вогнішча” (пазнейшая назва “Бульба”), “У баку ад дарогі”, “На пыльнай дарозе”, “Праз гады”. Менавіта ў апошнім і развіваецца даволі драматычная гісторыя з часоў партызанства. Ляснік Даўгалёў расказвае пра ўжо даўнія падзеі ляснога супраціўлення, калі не адразу можна было разабрацца хто ёсць хто. Ён не можа сабе дараваць, што некалі пакрыўдзілі недаверам настаўніка, сапраўднага патрыёта, якога палічылі прыстасаванцам, патэнцыяльным здраднікам, а ён пайшоў разам з імі, па-геройску змагаўся, калі трапілі ў засаду, і загінуў. Пісьменнік імкнецца перадаць псіхалагічны стан свайго героя, падкрэсліць, што душэўныя раны загойваюцца значна цяжэй, і ў большай часці смыляць вечна.

У гэтым плане можна згадаць і апавяданне “Маці” (у ранейшых выданнях “У ціхім тумане”), таксама напоўнена сапраўдным драматызмам. Старая жанчына прыходзіць у вёску шукаць магілу свайго сына. Пакуты яе павялічваюцца яшчэ і тым, што яе сын здраднік, паліў гэтую вёску, быў пакараны мсціўцамі. Яна адчувае сваю віну, і гэта выяўляецца ва ўсёй яе паставе: “*Згорбленая, маленькая Рэйдзіха стаяла перад Ганнаю босая – ногі былі парэпаныя, з пакручанымі пальцамі, як у вялікай птушкі, скінутай аднекуль з гнязда: яна цяпер чаплялася сваімі кіпцюрамі, каб перастаць нарэшце падаць, каб неяк затрымацца хоць тут, на зямлі. Палаплены зялёны андарак ледзь не даставаў ёй да пятак*”[197]. Яна ўжо даўно прымірылася з тым, што людзі будуць яе дакараць, і таму вельмі ўдзячная Ганне, калі тая не толькі заклікае яе на начлег, але і пасылае суседскага хлопчыка паказаць, дзе магла быць магіла. Пісьменнік тут праводзіць гуманістычную лінію, што і ў цяжкіх сітуацыях павінна знаходзіцца ў людзей магчымасць для спагады, асабліва, калі віна ў нейкай ступені ўскосная.

Галоўнае ў літаратуры – даследаваць стан душы чалавека, нюансы яго паводзін, а ў нейкай ступені і яго адносіны да таго, што ўжо даўно адбылося. У апавяданні “За трэцім разам” якраз у полі зроку такая сітуацыя: усіх крыху здзіўляла, што Парфен па-рознаму з цягам часу расказвае адзін і той жа выпадак. Спачатку гаворыць, што тут, на Бесядзі, у час наступлення ён забіў немца, прыняўшы яго за “факельшчыка”, другі раз кажа, што стралялі ўсе. І, урэшце, “*апынуўся*

[197] Чыгрынаў, І. Апавяданні. – С. 103.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

я сведкам, як расстрэльвалі ў вайну чалавека”[198]. Гэта ўжо ў нейкай ступені адчуванне віны за тыя часы, калі часам забойствы, нават ворага, рабіліся без патрэбы. Нешта падобнае адбываецца з конюхам Антонам з апавядання “Коні”, калі ўспамінае час ратавання з блакады: каб коні не выдалі іржаннем, часова прывязаў іх да сасны. А вярнуцца назад тады не ўдалося. Гібель ні ўчым не вінных істот мучыць яго. Значыць, чалавек за ўсё у адказе, і тэрміну даўнасці для душы няма. У гэтай сувязі А. Марціновіч выказвае наступную думку пра гэтыя творы: “*Напісаныя пасля таго, як ён стаў прызнаным раманістам, тым не менш, пісьменнік, па сутнасці, вярнуўся назад. І не толькі да жанру, пра які ўжо “забыўся”. І. Чыгрынаў вярнуўся да таго зыходнага пункта, з якога ён і пачынаў глядзець на вайну – бачыць у вайне не толькі мужнасць, гераізм людзей, але і надзвычайнае выпрабаванне, калі чалавек здае “экзамен” не на адну стойкасць, але і на маральнасць. Яна ж, у сваю чаргу, мацуецца і на адданасці радзіме, зямлі, якая ўзгадавала цябе і выхавала, але разам з тым убірае ў сябе само паняцце чалавечнасці, ненмагчымае без дабрыні і спагады*”[199].

Уздымае І. Чыгрынаў і праблемы сучаснасці. Ужо тады, на мяжы шасцідзясятых-сямідзясятых гадоў сталі весціся гаворкі пра неперспектыўныя вёскі, адзінокую старасць некалі заслужаных людзей, нясмела пакуль закраналіся пытанні антычалавечай палітыкі раззямельвання, што прымушала жыхароў многіх паселішчаў пакідаць родныя месцы, што асабліва спарадзіла міграцыю моладзі. Гэта апавяданні “Адна ноч”, “Ці бываюць у выраі ластаўкі”, “Усціння” і іншыя. Празаік абазначыў праблему, якая патрабавала неадкладнага вырашэння. На жаль, тады гэта трывога засталася не пачутай кіраўніцтвам дзяржавы. Менавіта такія якасці малой прозы пісменніка прыцягнулі ўвагу грамадскасці. На гэта ў свой час звярнула ўвагу А. Сямёнава, адзначыўшы: “*Шчырасць і праўдзівасць, назіральнасць, неаднапланавасць, непросталінейнасць падыходу да жыццёвых з’яў, уменне як бы проста апавядаць, а на самай справе паказаць самае істотнае, сацыяльна важнае, пільная ўвага да чалавека – усё гэта характарызуе апавяданні Івана Чыгрынава, калі паспрабаваць абагульніць уражанні ад іх*”[200].

Усё ж апавяданні нават пры дастатковым заглыбленні пісьменніка ў свет чалавека не давалі магчымасці раскрыць праўду пра жыццё народа, яго змаганне за жыццё ў часы вялікіх ваенных выпрабаванняў.

[198] Чыгрынаў, І. Апавяданні. – С. 199.

[199] Марціновіч, А. За трэцім разам / А. Марціновіч // Полымя. – 1994. – № 12. – С. 202.

[200] Сямёнава, А. Гарачы след таленту / А. Сямёнава. – Мн.: Маст. літ., 1979. – С. 3.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Так выкрышталізавалася ідэя стварэння “*цыкла раманаў аб вайне, паказаць вайну галоўным чынам праз лёс жыхароў адной беларускай вёскі*”[201]. У яго ўвайшлі “Плач перапёлкі” (1972), “Апраўданне крыві” (1977), “Свае і чужынцы” (1984), “Вяртанне да віны” (1994), “Не ўсе мы згінем” (1996). Творы пісаліся на працягу чвэрці стагоддзя, часу неадназначнага ў грамадскіх падзеях, што не магло не адбіцца на сутнасці паказу драматызму жыцця, пашырэнні геаграфіі дзеяння. Але асноўныя прынцыпы адлюстравання падзей заставаліся ранейшымі. У раманах “Плач перапёлкі” і “Апраўданне крыві” жыццё працякае ў той жа няспешнай паўсядзённай плыні, хоць ужо ёсць і першыя пагрозлівыя прыкметы: у Верамейках застаюцца толькі жанчыны, старыя ды хворыя і дзеці, увесь калгасны набытак адпраўляюць на ўсход, з’яўляюцца першыя дэзерціры. І хоць абстаноўка ўжо трывожная, але мала чым адрозніваецца ад мірнай. Людзі жывуць сваімі пастаяннымі бытавымі клопатамі, хоць няпэўнасць спакою адчувальная. Пра гэта і вядзецца гаворка мужчын, якія выпадкова сабраліся на калгасным двары. Перад гэтым адбываецца першая сутычка Дзяніса Зазыбы з Раманам Сёмачкіным, які ўцёк з фронту, прывёў з сабою татарына Рахіма, спрабаваў разабраць калгасную маёмасць. Зазыба пакуль спыняе жанчын, прымушае вярнуць узятае, пакуль не ведаючы, што праз некаторы час сам будзе дзяліць палеткі для збору ўраджаю. Зараз мужчыны Іван Падзерын, Сілка Хрупчык, Парфен Вяршкоў і Раман Сёмачкін гутараць амаль дабразычліва, вядома, не без з’едлівасці ў адрас Сёмачкіна. Ды і ў гэтай мірнай сцэне ўжо намячаецца першая трэшчынка, якая потым будзе расшырацца да грамадскага процістаяння, пакуль яшчэ бяскроўнага.

Галоўнымі дзеючымі асобамі раманаў намячаюцца Радзівон Чубар і Дзяніс Зазыба, па сваім характары людзі процілеглыя: першы прывык толькі выконваць інструкцыі, маючы загады, адчувае сябе ўпэўнена, але ўстойлівасць адразу парушаецца, калі ўказаў не паступае, Зазыба ж, наадварот, прывык да ўсяго прыходзіць уласным розумам. Гэта вынікае і з дыялогу Чубара і Зазыбы, калі яны гавораць пра надзённыя пытанні: выкананне дырэктыў і клопат пра жыццё людзей. Чубар бескампрамісны ў меркаваннях: “*Калгасы павінны выганяць жывёлу, а хлеб здаваць пад ахоўнасць дзяржаўных органаў. А тая маёмасць, якую нельга вывезці, павінна, безумоўна, знішчацца. Знішчацца, разумееш? Каб не пакінуць ворагу. Адну спустошаную зямлю трэба пакінуць. Адну спустошаную зямлю!*

[201] Дзюбайла, П.К. Беларускі раман: Гады 70-я. – С. 90.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

– А людзей? – хмура спытаў Зазыба.

– Што людзей?

– А тое, што людзі ж застаюцца на гэтай зямлі. Ім жа есць патрэбна нешта будзе?”[202]. Вось гэтую пазіцыю пазней пацвердзіць і сакратар райкама партыі Маштакоў: “*Фашыстам і сапраўды нельга нашага хлеба аддаваць. Ён яшчэ самім спатрэбіцца”*[203].

Такім чынам, інтуітыўная палітыка хлебароба аказваецца больш моцнай у параўнанні з афіцыйнымі дырэктывамі. Між іншым, вось гэты статус Зазабы, на якім у далейшым будзе трымацца многае, даследчык беларускай літаратуры В.А. Каваленка, прадбачыў яшчэ пры погляд-зе на першыя раманы: *“Такім чынам, у раманах І. Чыгрынава “Плач перапёлкі” і “Апраўданне крыві” вобраз Зазыбы вырастае ў вельмі тыповую на акупіраванай тэрыторыі фігуру чалавека, які, не належачы арганізацыйна да пэўнай арганізацыі людзей, тым не менш аказвае канкрэтную дапамогу ўсім, хто змагаецца з ворагам, і сам пастаянна жыве і дзейнічае насуперак планам і намерам акупантаў, ствараючы агульную атмасферу непрыняцця ўсяго таго, што нясе з сабою вораг*”[204].

Адной з мастацкіх асаблівасцей раманаў І. Чыгрынава з’яўляецца разгорнутае выяўленне жыцця на акупаванай тэрыторыі Забесяддзя, але ва ўсёй пенталогіі адсутнічаюць сур’ёзныя ваенныя дзеянні. Яшчэ і ў рамне “Свае і чужынцы” (1984) толькі намячаюцца нейкія аспекты партызанскага супраціўлення, праўда, пісьменнік ужо імкнецца ў пэўнай ступені акрэсліць тыя сілы, што будуць процістаяць акупантам. Аўтар імкнуўся аб’ектыўна паказаць усе цяжкасці ў арганізацыі партызанскай вайны, паколькі не было вопыту ні ў мясцовага кіраўніцтва, ні ў вайсковых начальнікаў. Агульнадзяржаўныя дырэктывы хутчэй уносілі дэзарганізацыю, чым памагалі ў станаўленні пачынаючагася руху. Адсюль здараліся ўсялякія недарэчнасці, як у выпадку з атрадам пад кіраўніцтвам Мітрафана Назарчука, які накіроўваюць узрываць неіснуючы мост на Сажы, на што былі патрачаны дарэмна і сілы, і час. Ужо ў гэтым рамане пісьменнік засяроджваецца на такіх праблемах, калі неабдуманасць у рашэннях прыводзіла нават да трагедый, лішніх неапраўданых страт. Так паталагічна схільны да разбою Патоля з разведатрада Карханава злаўмысным забойствам жонкі бургамістра

[202] Чыгрынаў, І. Плач перапёлкі / І. Чыгрынаў. – Мн.: Маст. літ., 1979. – С. 9.

[203] Тамсама. – С. 15.

[204] Каваленка, В. Жывое аблічча дзён: Літаратурна-крытычныя артыкулы / В. Канаваленка. – Мн.: Маст.літ., 1979. – С. 274–275.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

прыводзіць да правалу падпольнага райкома, калі забітыя былі легальныя члены яго Рыгайла і Яфрэменка. І ўвогуле з усталеваннем сваіх людзей на акупаванай тэрыторыі адбываліся проста непаразумені: унядралі сваіх разведчыкаў у асяроддзе ворагаў, але ніколі не клапаціліся пра іх абарону. Таму і адчувае сябе Зазыба пастаянна вінаватым у смерці разведчыцы Марылі, дастатковую абарону ёй так і не забяспечылі, бяздумна пасяліўшы яе ў пустым доме, куды явілася сям'я яўрэеў пасля няўдалай эвакуацыі. Пісьменнік засяроджвае ўвагу на асобных прыватных эпізодах вайны, каб падкрэсліць, наколькі цяжка было на самым пачатку здзейсніць нешта істотна важнае, што вызначала і сам далейшы характар гэтага страшнага процістаяння. Але ўсім пафасам раманаў пісьменнік падкрэслівае сваё разуменне жыцця адной мясцовасці з яе мінулай гісторыяй, сучаснасцю і блізкай будучыняй, і бачанне яе ў крайне драматычнай сітуацыі. Усе героі па сваёй прыроджанасці – аптымісты. Нават у складаных сітуацях яны застаюцца ўстойлівымі, спакойнымі, бо гэта заключана ў іх генах. Таму пісьменнік і не імкнецца фарсіраваць падзеі, ствараючы ўражанне яго незалежнай плыні.

Аднак сапраўднай вайны на акупаванай тэрыторыі пісьменнік пакуль не засведчыў, больш увагі ўдзелена жыццю Верамеек і прылеглых вёсак. І гэта заканамерна, бо, узяўшы за прынцып дэталёвае і няспешнае развіццё падзей, у полі зроку яго якраз і знаходзяцца звычайныя людзі з іх паўсядзённымі клопатамі, што ў значнай ступені адрознівала яго творы ад падобных палотнаў папярэднікаў. Верамейкаўцы жывуць пастаянным патрабаваннем каляндарнага года: аруць, сеюць, вырошчваюць ураджай, усёй вёскай выходзяць на луг у час сенакосу. На першы погляд можа скласціся ўражанне, што ім увогуле вайна зусім не абыходзіць. На самай справе яна напамінае пра сябе пастаянна нават, здавалася б, дробнымі эпізодамі: нагадвае пра сябе як старасту Раман Сёмачкін, недзе з вінтоўкай брындае Брава-Жыватоўскі, напамінаюць пра сябе і партызаны: патрэбен харч, адзенне, звесткі пра акупантаў. І ўсё гэта падаецца праз роздумы, гаворкі, меркаванні сяльчан. Пры розных поглядах на драматычныя падзеі, суадносіны сілаў на акупаванай тэрыторыі ў канчатковым выніку вяскоўцы ўсё ж не вераць у магчымасць канчатковай перамогі ворага, нягледзячы на іх часовыя поспехі на другім годзе вайны. Але яны спадзяюцца, што пасля такіх выпрабаванняў павінны змяніцца і адносіны сваёй улады да чалавека. Таму пісьменнік і згадвае распаўсюджаную легенду часу вызвалення акупаваных раёнаў, што быццам маршал Жукаў абяцаў пасля Перамогі зліквідваць калгасы.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Пакуль што падзеі разгортваюцца павольна, баёў каля Верамеек пакуль няма, але адчуванне раз'яднанасці людзей ужо намячаецца, што ў нейкай ступені вынікае з размовы партызана Пацюпы і суседа Зазыбы Кузьмы Прыбыткова, які сваёй заўвагай пра вінтоўку ў руках партызана прыгадвае і паліцэйскага з такой жа зброяй:

"*– Што ваш паліцэйскі? – насцярожана перапыніў старога Кузьму Пацюпа.*

– Дак таксама не выпускае з рук вінтоўкі. Можа цяпера недзе тута, на лузе. Ці вы па дамоўленасці так – спярша з вінтоўкай адзін пройдзе, пасля другі? Спярша паліцэйскі, пасля партызан, няйначай, каб дарогі не скрыжаваць?" І ўжо на заўвагу партызана, што паліцэйскі сваё атрымае, кажа: "*Ага, забівай свой свайго, каб чужыя баяліся*". І зноў, як погляд у будучыню, словы таго ж Прыбыткова: "*Бойцеся вы, маладзейшыя. Вам жыць пасля. Пастраляеце вось так адзін аднаго, пасля і дзеці вашы не разбяруцца, што да чаго. А немцам ета, нябось, на руку*"[205]. Народ бачыў, што барацьба ўсё больш набывала выгляд вайны сваіх супраць сваіх. І не толькі партызанаў з паліцэйскімі , але і партызанаў з мірным насельніцтвам, асабліва "*чужых*", што прыходзілі з-за лініі фронту. Вось як згадваецца з'яўленне іх у вёсцы, напалохаўшых сям'ю паліцэйскага: "*Але і да звычайных людзей наведваліся – у Міколіхі Макавеевай забралі восеньскае сала; у Гаўрыліхі – мужаў кажух; дарэмна Гаўрыліха маліла-прасіла, так і не вярнулі кабеце кажух, дарма што Гаўрыла старшынёй сельсавета быў; ну а ў Ляксейкі памянялі каня – свайго, кажуць, нейкага шалудзівага паставілі ў хлеў, а Ляксейкавага пад сядло ўзялі; словам, новыя партызаны, што прыйшлі аднекуль здалёку, ці не з-за лініі фронту, паказалі сябе такім вось чынам…*"[206]. Пра такія адмоўныя выдаткі вайны згадваў і Чубар: на месцы дзеяння партызанаў тут жа з'яўляліся карнікі, заўсёды знаходзілі вінаватых, каралі, забіралі маёмасць. "*Партызаны таксама ажыццяўлялі рэквізіцыі – спярша, вядома, бралі для сябе, пасля ўжо для брата, для цешчы і свата… Асабліва ў тых вёсках, што размяшчаліся ў так званай нейтральнай паласе, дарэчы, вельмі ўмоўнай, але ж сапраўды паміж нямецка-паліцэйскімі станамі ў населеных пунктах і партызанскімі стаянкамі ў лясах…*"[207].

У далейшым падзеі развіваюцца па сваіх унутраных законах, але Зазыба і Чубар пастаянна ў полі зроку пісьменніка. Прытым, роля іх

[205] Чыгрынаў, І. Вяртанне да віны / І. Чыгрынаў. – Мн.: Юнацтва, 1994. – С. 69, 70.
[206] Чыгрынаў, І. Вяртанне да віны. – С. 107–108.
[207] Тамсама. – С. 157.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ад рамана да рамана будзе павялічвацца ў высвятленні многіх жыццёвых з'яў. Але яны ўжо і ўключаныя ў агульную сістэму дзеянняў, якая шмат у чым ужо ад іх і не залежыць. Але яны застаюцца цэнтральнымі рухаючымі сіламі ў развіцці сюжэту, бо альбо ўдзельнічаюць у канкрэтных падзеях, альбо з'яўляюцца непасрэднымі сведкамі. Выхаваныя розным часам, жывучы ў адной сацыяльнай сферы, і Чубар, і Зазыба выконваюць адны і тыя ж заданні, але зноў жа з свайго пункту погляду рэальнай карысці і значэння. Нават пагутарыўшы з франтавым начальствам, атрымаўшы заданні вярнуцца ў родныя мясціны для арганізацыі народнай барацьбы, Чубар прадаўжае дзейнічаць па прынцыпе заведзенай машыны. Вось ён у знаёмых мясцінах, бачыць у Кулігаеўцы на палетках састаўленыя копы зжатага жыта, таму, верны ўстаноўкам, іх падпальвае, упэўнены ў праваце сваіх дзеянняў, і страшэнна здзіўляецца, пачуўшы праклёны ў адрас падпальшчыка ад сваёй сужыцельніцы. У дальнейшым, усё больш уключаючыся ў барацьбу, Радзівон Чубар праходзіць драматычны шлях пазнання ісціны, яго погляды шмат у чым эвалюцыянуюць, хоць ў сваіх асноўных перакананнях застаецца непахісным. Ён усё больш пачынае раздумваць пра ўзаемасувязь усіх дзеянняў, нічога не знікае бясследна, і вось, апынуўшыся ў палоне, раптам згадвае зусім іншага чалавека, настаўніка, потым дзянікінскага афіцэра, зноў настаўніка, які таксама сядзеў звязаны на возе, чакаў свайго выраку, але тое было даўно, у часы калектывізацыі, калі Віцебшчына ўскалыхнулася ад паўстанняў: "*Дык вось ад тае цяжкой чалавечай тугі ў вачах асуджанага на смерць ворага калгаснага ладу, значыць, разам і савецкай улады, у маладога Чубара як не халадзела ў сярэдзіне, дарма што класавае пачуццё было выхавана ў ім яшчэ змалку. Відаць, дзянікінскі афіцэр таксама думаў тады аб збаўленні, можа, таксама ў душы песціў надзею вырвацца з-пад варты на волю. Але ён, як і Чубар цяпер, не мог разлічваць на поспех*…"[208]. Аднак безвыходнасць становішча не зламала героя: ён выкідваецца з самалёта, калі карнікі прымушаюць яго паказаць базы партызанскіх атрадаў.

Многае пераасэнсоўвае ў жыцці і Дзяніс Зазыба, трапляючы ў складаныя жыццёвыя сітуацыі. Першае, што здарылася,– гэта вяртанне сына Масея з турмы, якое бацьку ўзрушыла, што "не па чыстай прыйшоў", а адпушчаны канвойным. У доўгіх размовах з сынам Зазыба спрабаваў высветліць, ці мае той крыўду на савецкую ўладу, якая для яго самога была як глыток чыстага паветра. І спатрэбілася яму пражыць многа

[208] Чыгрынаў, І. Вяртанне да віны. – С. 178.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

драматычных сітуацый, каб зразумець і праўду сына, які застаўся нейтральным, не прыняўшы, як прыгодны для сябе, ні акупацыйны лад, ні партызанскі. Таму і бласлаўляе сына ў апошнім рамане на вымушаную эміграцыю.

Увогуле ў апошніх раманах цыкла асабліва многа праводзіцца аналогій з мінулым часам, дзе пісьменнік быццам шукаў пацвярджэнне сучасным меркаваням, даць мастацкае асэнсаванне складанага і драматычнага часу першай паловы мінулага стагоддзя. У рамане "Не ўсе мы згінем" пададзены падзеі ў рэтрэспектыўным плане ў асноўным праз успрыняцце Дзяніса Зазыбы. Па волі лёсу апынуўшыся ў тылах наступаючай арміі, ён шмат чаго наглядзеўся, прыйшоў да перакананння, што вайна яшчэ доўга будзе адгукацца крывавымі дзеямі, як адгукаецца і нядаўняе мінулае, калі крыўды часоў калектывізацыі і часу вайны прыводзяць да самаўпраўнага знішчэння непавінных сем'яў.

Яшчэ адна асаблівасць раманаў І.Чыгрынава: для надання шырокай маштабнасці дзеяння ён уводзіць архіўныя дакументы, розныя справаздачы акупацыйныў уладаў пра барацьбу з партызанамі. Праўда, гэтыя матэрыялы не заўсёды арганічна ўваходзяць у мастацкую фактуру твораў. Некаторыя падзеі і наогул успрымаюцца як выпадковыя, напрыклад, звязаныя з генералам Лазарэнкам, паспешліва, у агульным плане расказана і пра падзеі ў акупаваным Мінску, пра дзейнасць калабарацыяністаў. Але на гэта, відаць, меліся пэўныя аб'ектыўныя прычыны.

Цікавы І. Чыгрынаў і як драматург. Ён напісаў гістарычныя драмы "Судовая справа Вашчылы", "Звон – не малітва", "Прымак", "Осцей – Альгердаў унук", "Зайграй, зайграй, хлопча малы", "Савіцкі", пра нядаўнюю гісторыю "Ігракі", пра сучаснасць "Госці", "Толькі мёртвыя не вяртаюцца" і іншыя. Пісьменнік па-свойму трактуе некаторыя старонкі нашай гісторыі, спрабуе раскрыць ролю гістарычных асобаў у мінулым лёсе нашай Айчыны, раскрыць супярэчнасці часу перабудовы і наступных гадоў. Не ўсе творы роўныя ў мастацкіх адносінах.

Памёр пісьменнік 05.01.1996 года.

Творчасць І. Чыгрынава займае значнае месца ў літаратурным працэсе Беларусі.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ІІІ

ПАТРЫЯРХ ДЗІЦЯЧАЙ ПАЭЗІІ

Творчасць Уладзіміра Дубоўкі

Уладзімір Дубоўка ўваходзіў у літаратуру ў самыя бурлівыя гады пачатку мінулага стагоддзя. Ён і спазнаў усе супярэчнасці, узлёты і трагедыі таго часу на ўласным лёсе, як і многія яго старэйшыя і маладзейшыя сябры. Яму пашанцавала болей, чым некаторым: разам з нямногімі ён вярнуўся да творчасці ў сярэдзіне 1950-х гадоў. І менавіта ў гэты час пісьменнік найбольш прысвяціў часу напісанню твораў для дзяцей, упэўнены, што ў гэтым яго абавязак перад дзеткамі, будучым краіны.

Уладзімір Мікалаевіч Дубоўка нарадзіўся 15.07.1900 г. у в. Агароднікі (зараз Пастаўскі раён Віцебскай вобласці) у сялянскай сям'і. Вялікая сям'я (шэсць сыноў і дачка) мела толькі шэсць дзесяцін зямлі, таму бацька больш працаваў на адыходніцтве, а ў 1915 г. з набліжэннем фронту перавёз усю сям'ю ў Маскву, дзе да гэтага ўжо стала ўладкаваўся рабочым-інструментальшчыкам чыгуначнага дэпо. З гэтага часу Масква стала месцам пастаяннага жыхарства Уладзіміра Дубоўкі (за выключэннем гадоў, праведзеных у лагеры і высылцы). Аднак дзіцячыя гады будучага паэта прайшлі ў вёсцы. З ранняга дзяцінства ён захапляўся прыгажосцю роднага краю, багаццем фальклору, асаблівае ўражанне на яго рабілі песні і казкі. Ён закончыў Манькаўскую народную школу, у 1912–1914 гг. вучыўся ў Мядзельскім двухкласным вучылішчы і ў кастрычніку гэтага ж года паступіў у Нова-Вілейскую настаўніцкую семінарыю, якая ў 1915 г. з прыфрантавой паласы была эвакуіравана ў г. Невель. У 1918 г. у сувязі з наступленнем немцаў у семінарыі быў праведзены датэрміновы выпуск, Ул. Дубоўка паехаў да бацькоў у Маскву. Паступіў у Маскоўскі універсітэт імя М.В. Ламаносава на гісторыка-філалагічны факультэт, але ў час разрухі вымушаны быў паехаць працаваць настаўнікам у Тульскую губерню. Служыў у войску, пасля дэмабілізацыі працаваў інспектарам і метадыстам беларускіх школ у Наркамаце асветы РСФСР і вучыўся ў Вышэйшым літаратурна-мастацкім інстытуце імя В. Брусава; быў рэдактарам беларускага тэксту Збору законаў Саюза, чытаў лекцыі ў Камуністычным універсітэце народаў Захаду, для студэнтаў Беларускай сельгасакадэміі (г. Горкі

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Магілёўскай вобласці), знаходзіўся на іншых працах. Ул. Дубоўка – адзін са стваральнікаў літаратурнага аб'яднання "Маладняк" (1923–1928), некаторы час з'яўляўся рэдактарам часопіса "Беларускі піянер", уваходзіў у Цэнтральнае бюро "Маладняка", узначальваў у Маскве яго філію, аказваў дапамогу ў наладжванні працы і выданні альманаха "Аршанскі Маладняк". З 1926 г. быў у аб'яднанні "Узвышша", шмат у чым пасадзейнічаў яго літаратурнай рэпутацыі, паколькі ў той жа час быў найактыўнейшым паэтам, літаратурным крытыкам і навукоўцам. Аднак у 1929 г. яго дзейнасць была спынена па надуманай справе, ён абвінавачаны, пакараны, на доўгія гады быў адарваны ад творчасці і радзімы. Рэабілітаваны ў 1957 г., прыняты ў Саюз пісьменнікаў у 1958 г. Пасля вяртання Ул. Дубоўка пісаў вершы пра родны край, яго прыгажосць, з пэўных дыдактычных мэтаў звярнуўся да апрацоўкі народных казак, напісання твораў на сюжэты з фальклору народаў свету.

У дваццатыя гады Ул. Дубоўка не пісаў вершаў, непасрэдна прызначаных для дзяцячага чытання, нават нягледзячы на тое, што некаторы час узначальваў адпаведны часопіс. У "Беларускім піянеры" былі апублікаваны толькі вершы "Навальніцы над лясамі", "Нас спавівалі" і ў "Іскрах Ільіча" – "Ліпнёвы гімн". Аднак і ў гэтых вершах малады паэт не імкнецца падрабіцца пад свайго малога чытача, а жадае раскрыць прыгажосць прыроды, узвышанасць пачуццяў, выражаных у эмацыянальнай захопленасці надзвычайнымі праявамі свету.

Усё ж многія рэчы, напісаныя Ул. Дубоўкам у той час, можна адрасаваць дзецям: напрыклад, некаторыя ўстаўкі да паэмаў "І пурпуровых ветразяў узвівы", "Штурмуйце будучыні аванпосты". Але бліжэй для дзіцячага ўспрымання знаходзіцца паэма "Кругі", хоць яна таксама мае ў аснове сюжэт філасофскай накіраванасці, аднак жа галоўнае дзеянне, якое ўсё ж выяўляе фальклорнае, казачнае паходжанне, будзе блізкім дзіцячаму ўспрыманню. Сюжэт займальна-просты: хлопец з васільковымі вачамі Цікаўны ідзе да Сонца, каб атрымаць адказ, калі ў іхняй старане наступіць шчаслівае жыццё. Па дарозе ён сустракае розныя дзіўныя і недарэчныя з'явы (жанчыны пераліваюць ваду ў рэчцы, дзядзька падпірае гнілы плот і інш.). Кожны з іх таксама просіць хлопца, каб той спытаў у Сонца, як ім пазбавіцца сваёй бяды. Цікаўны дабіваецца сваёй мэты, сустракаецца з Сонцам, у гэтым яму дапамагае сонцава дачка Мілавіца. Сонца адкрывае праўду, але папярэджвае, што ад гэтай дасведчанасці Цікаўны можа згарэць, яго мозг не вытрымае такога жудаснага цяжару. Але і тут аказвае дапамогу Мілавіца, якой

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

спадабаўся хлапчына з васільковымі вачамі. Яна суправаджае Цікаўнага па яго шляху дамоў. Ён цяпер прасветлены, ведае ўсе адказы на зласчасныя пытанні. У парадах Цікаўнага заключаны вялікія этычна-маральныя каштоўнасці. Напрыклад, таму баламуту, што бязмэтна перабіраў смецце, ён гаворыць:

Час дарма
Ты траціш, кожны пасмяецца
У парахне няма дабра.
Заўсёды смецце будзе смеццем.
Ствараючы, – дабрашукай,
Задавальненне знойдзкш з працы.
Прыдбае рупная рука
Сабе і нашчадкам багацце.”[209]

Паэт засяроджвае ўвагу на неабходнасці стваральнай працы, разумнага падыходу да кожнай з’явы, выступае супраць марнатраўства, бяздзейнасці, марнай траты дарагога часу. Жанчынам, пераліваючым ваду, Цікаўны гаворыць, што *“ў вашай справе галава павінна б кіраваць рукою...”*, падпіраючаму тын раіць:”*Ідзі здаровае стварай, дапамагай тварыць здаровым...”*[210] Усе ўспрымаюць парады як належыць, за выключэннем хіба творцы, які надта пакрыўдзіўся. Паэма мае глыбокі філасофскі сэнс, нягледзячы на тое, што твор напісаны з нагоды канкрэтных умоў дваццатых гадоў мінулага стагоддзя, яго ідэі актуальныя і па сённяшні дзень, перш за ўсё іх гуманістычнай накіраванасцю, сцвярджаннем працоўнай вартасці і гонару чалавека-стваральніка.

Цікаўны прынёс адказ і ўсім, хто праводзіўў яго да Сонца. Згодна з фальклорным сюжэтам, людзі будуць жыць шчасліва, калі змогуць разбурыць драўлянае, медзяное і залатое дно, якія хаваюць жывую ваду ад народа. Мара пра шчаслівае жыццё, такім чынам, павінна здзейсніцца.

Гэта ў свой час адзначыў Дз. Бугаёў, падкрэсліўшы, што *“ў паэме “Кругі” Уладзімір Дубоўка ставіў перад сабой задачу сродкамі паэзіі, прытым абапіраючыся на народную творчасць, сцвердзіць думку, што чалавечае шчасце магчыма толькі ў новым грамадстве, у выніку знішчэння саміх асноў старога свету, яго маралі і этыкі, заснаваных на ўладзе грошай, на ўладзе золата.”*[211] Калі адкінуць некаторую празмерную катэгарычнасць, то вывады даследчыка гучаць таксама актуальна.

[209] Дубоўка, У. Збор твораў: у 2 т. / У. Дубоўка. – Мінск: Беларусь, 1965. – Т. 2. – С. 212.
[210] Дубоўка, Ул. Збор твораў. Т. 2. – С. 212.
[211] Бугаёў Дз. Талент і праца. – С. 10.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Пагібельнай для чалавека з'яўляецца пагоня за ўзбагачэннем, калі ў душы не застаецца месца для гуманістычнага суперажывання, сардэчнай спагады да бліжняга.

Народныя казкі, у літаратурнай апрацоўцы аўтара, уведзеныя ў кантэкст паэмаў "І пурпуровых ветразяў узвівы...", "Штурмуйце будучыні аванпосты", паглыблялі філасофскі сэнс твораў, шмат у якой ступені пацвярджалі або абвяргалі тэзісы спрэчнікаў: Лірыка і Матэматыка, Пасажыра і Кандуктара. Гэтыя сюжэты, узятыя асобна, могуць выкарыстоўвацца ў дзіцячым чытанні. Асабліва такія, як "Народнае апавяданне пра тое, як бог стварыў людзіну і як чорт сапсаваў усю гэтую работу", а таксама "Народнае апавяданне пра музыку і пра тое, як ён прадаваў чорту сваю скрыпку", "Народнае апавяданне пра тое, як Салімонава дачка памерла... ды зноў аджыла".

Спрадвечныя ісціны Ул. Дубоўка спрабаваў увесці ў кантэкст твораў, каб даказаць, што нічога спантаннага ніколі не было. У цэлым трэба разумець, што пісьменнік арыентаваўся на маладое пакаленне, якое і павінна рыхтаваць будучыню. Тут заўважаецца менавіта дыдактычная ўстаноўка: толькі здзяйсненне дабра можа прывесці да разумнага існавання, годнага развіцця грамадства, здольнасці перамагаць у сабе адмоўнае, і ўзвялічыць боскае. Вядома, у кантэксце паэм гэта яшчэ мела на ўвазе тое, што таталітарнае ўрыванне ў заканамерны працэс развіцця можа прывесці да самых страшных вынікаў. Малому (маладому) чытачу тут падказвалася, што імкненне да ўлады, да знішчэння волі іншага мае перш за ўсё д'ябальскі пачатак. Чалавек ад нараджэння павінен змагацца з рознымі заганамі жыцця, што яго акружаюць. Апасродкавана гэтыя ўстаўныя аблітаратураныя казкі павінны былі выпрацоўваць у малых пачуццё непрыймальнасці фальшу, інтрыгаў, уменне адстаяць сваю праўду, агульначалавечыя каштоўнасці. Акрамя таго, у той даволі неспрыяльны час паэт апасродкавана падводзіў чытача да разумення, што найвышэйшай высакароднасцю з'яўляецца ўменне зразумець учынкі іншых і знайсці ў сабе сілы даравання таму, хто здзейсніў нейкія памылкі. Уменне дараваць ці не найвялікшы вопыт і навука чалавецтва.

Пасля звароту з вымушаных вандровак Ул. Дубоўка большую частку пісьменніцкага часу аддае творчасці для дзяцей. Ён ставіць перад сабой мэту выхавання ў іх патрыятызму, любові да роднага краю, працягам той вялікай праграмы, якую распачынаў Янка Маўр у дваццатыя гады. Найбольш прыдатным для гэтай мэты Ул. Дубоўка лічыў казку з яе выключнай вобразнасцю і этычна-маральным сэнсам.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Тым не менш, паэт не адступіў ад вызначанай ім творчай праграмы 20-х гадоў. Час, натуральна, унёс карэктывы ў многае з грамдскага жыцця; паэт пасля звароту бачыў, што сёе-тое ў дзяржаве змянілася, але ў цэлым рэжым заставаўся таталітарным, небяспечным, як і раней. І Ул. Дубоўка не стаў прадаўжаць свае эксперыменты, аднак ад высноў сваёй маладосці не адмовіўся ў тым сэнсе, што ўсё ж супольнасць павінна шукаць шляхі да дэмакратызацыі ўкладу жыцця. Шмат чаго з страчанага пры арышце ў новы час ён аднавіў як самастойныя мастацкія творы, акрэсліўшы, што гэта апрацоўка казак розных народаў.

У другой палове 1950-х гг. пачалі з'яўляцца ў друку апавяданні Ул. Дубоўкі мемуарнага характару. Апавяданні сцісла падавалі нейкую жыццёвую з'яву, якая ў аснове мела заўсёды павучальны характар. Пазней гэтыя апавяданні ўвайшлі ў зборнік "Пялёсткі" (1973). Галоўнае ў творах – напомніць юнаму чытачу, што нічога не даецца само па сабе, змалку трэба прывучацца да працы, таму што толькі так і можа сцвердзіць сябе чалавек. Пазнавальнасць такіх твораў выключная. У апавяданні "Мой першы працоўны дзень" Ул. Дубоўка крыху з гумарам распавядае пра першыя жыццёвыя ўрокі: у першы ж дзень, калі хлапчуку (шасцігадоваму) даверылі пасвіць гусей, то і здарылася першая непрыемнасць. Не па яго віне, бо нейкі лайдак не закрыў вароты з выгану, гусі з'елі суседчын гарох, за што гора-пастушку дасталася добрая луцоўка ад яе. Тут першы ўрок адказнасці за справу падаў бацька. Ён не сварыўся, а прапанаваў задумацца над такой праявай: "*Сынок! Сцеражыся! У людзей зямлі мала. Нівы малыя. Калі іх выпасьвіць гусьмі, коньмі, авечкамі, дык што ж людзі нажнуць, што яны намалоцяць, з чаго ж яны хлеб будуць есці?!. Вароты павінен зачыняць той, хто першы пабачыць расчыненымі, каб пазбегнуць шкоды...*

Зачыняў пасля. Зачыняю і цяпер, калі дзе бачу адчыненыя..."[212].

Для пісьменніка было асноўным, каб чалавек усвядоміў сваё месца ў грамадстве, каб навучыўся разумець складанасці жыцця, адчуваў адказнасць за даручаную яму працу.

Кожны твор Ул. Дубоўкі мае дыдактычнае значэнне. Гэта першыя падыходы да стварэння ўласнай працоўнай энцыклапедыі, замацавання чалавечага жыццёвага вопыту. Пісьменнік не імкнецца да ідэалізацыі дзяцінства, паказвае ўсе навацыі, часам няўдалыя задумкі і рашэнні, выяўляе гэта нават у гумарыстычным святле. Але заўсёды ў яго на першым плане жаданне падказаць малому чытачу напрамкі для ўласных

[212] Дубоўка Ул. Пялёсткі / У. Дубоўка. – Мн.: Маст. літ., 1973. – С. 16–17.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

пошукаў. Ул. Дубоўка неяк далікатна падводзіць чытача да разумення неабходнасці набыцця ведаў, ён сцвярджае, што толькі адукаваны чалавек можа прынесці карысць сабе і дзяржаве. Пісьменнік выкарыстоўвае займальна-прыгодніцкі элемент у сюжэце апавядання, каб падвесці свайго чытача да высновы, што толькі праз вучобу можна дасягнуць пастаўленай мэты. У замалёўцы "Незвычайныя візіцёры" гаворыцца пра тое, што некалі гэтая прага да навукі абмяжоўвалася, вучоба мала каму была даступнай. Вось дзеці апынуліся ў панскім палацы, дайшлі да бібліятэкі, хоць не надта што зразумелі ў тых старадаўніх кнігах, але на ўсё жыццё ў іх засталася павага да кнігі. Дарэчы, прыгодніцкі элемент узмацняе цікавасць чытача да распаведзенай гісторыі. У кожнай з'яве твора ёсць і гістарычны аспект. Пісьменнік гаворыць, што ўсё гэта адбывалася даўно, гэта проста ўспаміны, згадкі дзяцінства чалавекам паважных гадоў, але галоўны сэнс усяго напісанага скіраваны ў сучаснасць і будучыню. Тут і шчымлівае шкадаванне, што людзі так неабачліва абышліся з вялікім кніжным скарбам, калі ў часы вядомых палітычных падзеяў той таямнічы дом разам з кніжным скарбам быў дашчэнту разбураны і спалены.

У большасці апавяданняў Ул. Дубоўка тактоўна напамінае сваім чытачам пра неабходнасць набыцця ведаў, падмурку, які дае перспектывы жыцця. Ад недасведчанасці пра самыя простыя навуковыя адкрыцці ствараюцца міфы, розныя непаразуменні. Абмежаванасць людзей спарадзіла амаль магічны страх перад з'яўленнем звычайнага даследчага шара ("Канец свету"). Яшчэ добра праглядваецца пісьменніцкая скруха і ад таго, што ў неспрыяльных умовах немагчыма развіццё таленту, яго рэалізацыі ў жыцці: прагматычная, практычная супольнасць няздольна ў побытавай сферы зразумець талент і адпаведна ацаніць тонкія зрухі душы іншага, у многім адметнага чалавека. Адсюль і спрадвечнае шкадаванне пра загубленыя дараванні ("Янук Біюцкі"). Пісьменнік настойліва даводзіць свайму малому чытачу, што неабходна сябраваць з кнігай, спазнаваць яе мудрую назапашанасць. У таямніча прыгодніцкім і гумарыстычным святле пісьменнік паказвае жаданне спазнаць таямніцы друкаванага слова ("Незапрошаныя візіцёры", "Знакаміты пакупнік"). Разам з тым ён даводзіць, што маральнасць, чалавечая спагада спрадвеку мацавалася ў народзе. Урокі чалавечнасці падаюцца ў апавяданні "Як старадаўнія рымскія пісьменнікі гасцявалі ў нашых Агародніках". Сюжэт твора таксама нескладаны. Стары чалавек Якуб сядзеў суботнім вечарам на прызбе, чакаючы, калі сын падрыхтуе лазню. У падарожным

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

жабраку ён пазнае быццам мясцовага ганарыстага магната, які на чацвярыку заўсёды пралятаў міма, не заўважаючы нікога. Якуб запрашае незнёмца адпачыць, пасля прапаноўвае памыцца ў лазні, на некаторы час затрымацца ў вёсцы. Ад такой душэўнасці Юстын урэшце распавядае пра сваю трагедыю: як быў багаты, то шчодра раздаваў грошы ўсім сваім сябрукам, пакуль такім чынам не растраціў паловы сваёй маёмасці. Рэшткі праз шляхецкі суд забралі родзічы, ад беднага Юстына адмовіліся колішнія сябрукі. У знак удзячнасці Юстын абяцае навучыць Якубавага Тодара лацінскай мове, што неўзабаве і здзяйсняе. З маёнтка родзічы дазволілі Юстыну ўзяць кнігі, так у Агародніках з'явіліся Гарацый, Вергілій, Авідзій і Апулей. У вольны час творы гэтых пісьменнікаў чытаў Тодар вяскоўцам, перакладаў на беларускую мову. І пасля смерці сяляне ўшанавалі Юстына, пахаваўшы на сваіх могілках і паставіўшы адпаведны помнік: на крыж прыбілі дзве дошчачкі, "*маляваныя пад выгляд кніг. На адной напісалі "Vergilius", а на другой "Ovidius"*[213]. Такім чынам, пісьменнік вырашае некалькі праблем: падкрэслівае, што спагада, чалавечнасць выпраўляюць нават высакамерныя душы, што навука не абцяжарвае, а наадварот, узвышае чалавека, і заклікае свайго чытача спазнаваць з кніг накоплены шматвяковы вопыт чалавецтва. Ён далікатна напамінае, што ўсё здабываецца толькі ў працэсе пастаяннага пазнання і ўзбагачэння сваіх ведаў. Падаецца гэта не без лёгкага гумару, з ціхай усмешкай пра некаторыя прыгоды сваіх герояў.

Навука жыцця выяўляецца і ў творах пра жывую прыроду. Пісьменнік амаль непрыкметна здзяйсняе пераход ад праблемаў побытавых да маштабных. З пазіцый дасведчанага дзеда-ўсяведа ён адкрывае для свайго чытача шматлікія таямніцы прыроды. З высокага жыццёвага вопыту Ул. Дубоўка заўсёды імкнецца гаварыць са сваім слухачом і чытачом даступнай мовай, умее засяродзіць увагу на самых актуальных пытаннях, уздзейнічаць на яшчэ не кранутыя струны пачуццяў, падкрэсліць, што жывая прырода, як і чалавек, здольна перажываць, адчуваць. Развіццю ўспрымання рэчаіснасці можа садзейнічаць і фактар здзіўлення. Дзеці сапраўды вераць, што дзед можа размаўляць з бацянамі, што тыя ў яго гутарках шмат чаго разумеюць і адказваюць яму ўзаемнасцю. Буслоў здаўна шанавалі ў вёсках, верылі, калі птушак пакрыўдзіць, то яны могуць адпомсціць, прынёсшы на страху агонь. Гэта ўжо з легенды, але ў такім выпадку пісьменнік вучыць дзяцей разуменню прыроды, асцярожным і далікатным адносінам да яе. Тут жа

[213] Дубоўка У. Пялёсткі. – С. 51.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

згадваецца, што дзед некалі рапамог параненаму буслу, і той, кульгавы, штогод прылятаў на гняздо.

Уменне назіраць за прыроднымі з'вамі, паводзінамі звяроў – таксама сур'ёзная жыццёвая навука. Пісьменнік часцей за ўсё дзеліцца з чытачом вопытам, атрыманым у дзяцінстве, тым самым развіваючы ў яго дапытлівасць. Ул. Дубоўка як бы між іншым заўважае, што многае незвычайна дзіўнае, убачанае ім, растлумачвалі старэйшыя, многае ён спасцігаў уласным розумам. Пісьменнік каторы раз звяртае ўвагу на пераемнасць жыццёвага вопыту, на тыя добрыя ўрокі мудрасці, што зыходзілі ад старэйшын вёскі ("Як зайцы на ямішчы гулялі", "Лось на Кухтавай гары", "Мядзведзь"). Падзеі ў творах адбываюцца ў розныя часы: нешта ўспамінаецца з дзяцінства, падлеткавага ўзросту, штосьці з гадоў вымушаных вандровак. Праўда, на апошнім пісьменнік не засяроджвае ўвагу, не тлумачыць, чаму ён апынуўся ў Сібірскай тайзе ці на беразе забайкальскай рэчкі. Тым не менш, кожнае невялікае па аб'ёме апавяданне мае глыбокі дыдактычны сэнс. У творы пра гульні зайцаў, падгледжаных хлапчуком, распавядаецца пра скокі гэтых звяркоў праз закінутыя бульбяныя ямы, калі малыя зайчыкі нават падалі ў іх. Ад такой іхняй гарэзлівасці нават хлапчуку захацелася паўдзельнічаць у гульнях, але сваім жаданнем ён толькі напалохаў іх. У фінале апавядання заўсёды падаецца вывад, разгадка: "*Дома, пры вячэры я расказаў пра гэтую гульню. Бацька і растлумачыў, што адзіны зайцаў паратунак – ногі. Вось звяры і практыкуюцца, каб у іх ногі былі моцнымі"*[214].

Апавяданне "Лось на Кухтавай гары" з падзеяў часу першай сусветнай вайны. Калі фронт наблізіўся да родных мясцін будучага пісьменніка, аднавяскоўцы ўбачылі дзіўную карціну: у промнях ранішняга сонца на гары ў велічнай паставе з'явіўся рагаты лось. Людзі, зачараваныя відовішчам, спачуваюць зверу, што і ён выгнаны вайною з родных мясцін. Вартасці ўсіх пазнаюцца ў бядзе; так і тут людзі не далі хіжаму чалавеку стрэліць у лася. Ён зарыентаваўся і пайшоў у процілеглы бок ад фронту ў напрамку пушчы. *"Найлепшымі пажаданнямі праводзілі мае аднавяскоўцы лясніка земляка ў ягонае выгнанне..."*[215] На такой аптымістычнай ноце завяршае апавяданне пісьменнік. Жывёлы таксама адчуваюць гуманныя да сябе адносіны ("Буланы конь"). Пісьменнік не абыходзіць і камічныя сітуацыі ("Мядзведзь"), але і тут падае ўрокі

[214] Дубоўка У. Пялёсткі. – С. 29.
[215] Тамсама. – С. 73.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

асцярожнасці і абачлівасці: апавядальнік прыняў абгарэлы пень за мядзведзя, зноў такі па асацыяцыі, бо толькі што ішоў па свежым следзе звера на беразе рэчкі. У такім выпадку, напамінае пісьменнік, лепш перастрахавацца, чым потым трапіць у трагічную сітуацыю.

Каштоўнасць зборніка апавяданняў-успамінаў, адрасаваных дзецям , адзначыў Дз. Бугаёў: *“Гэтыя абразкі добра пераконваюць, што заўсёды – і ў свае шчаслівыя, зорныя хвіліны, і ў час сур’ёзных выпрабаванняў, якія асабліва шчодра выпалі на долю Дубоўкі ў яго нялёгкай жыццёвай дарозе, – чалавек павінен заставацца самім сабой, ніколі не губляць цвярозага розуму і яснай думкі, душэўнай дабраты і спагадлівасці, здольнасці адгукнуцца на чужыя радасці і беды, як на свае ўласныя, і ўвогуле цвёрда стаяць на зямлі, каб ніякая нечаканасць не магла пахіснуць яго, збіць з тропу. Такі адзін з самых галоўных маральна-этычных вывадаў зборніка “Пялёсткі”.*

Гэтая кніга надзвычай павучальная не толькі прамымі высновамі і заключнымі абагульненнямі, што даюцца амаль у кожным абразку, але яшчэ і тым, як стрымана, спакойна, мудра-разважліва расказваў паэт пра самыя цяжкія моманты сваёй біяграфіі, якія крута не раз перайначвалі яго лёс, аднак не маглі адолець сілы яго духу, яго веры ў людзей, у свой народ, яго вялікай павагі да чалавека працы і любой карыснай справы, зробленай умелымі рукамі.

І ў гэтым таксама адзін з важных павучальных урокаў жыцця паэта і яго творчасці”[216].

Такой жа мудрай засяроджанасцю вызначаюцца і аповесці “Жоўтая акацыя” (1967), “Ганна Алелька” (1969). Ул. Дубоўка заахвочвае сваіх чытачоў да эксперыменту, заклікае здзейсніць ледзь не фантастычныя справы, зрабіць казку явай. Нездарма яшчэ ў паэме “Кругі” паэт вадзіў свайго Цікаўнага па Сонцавым садзе, своеасаблівым правобразе біблейскага раю, дзе назіраліся розныя дзівосы, напрыклад, на вярбе раслі грушы і г.д. У новых умовах пісьменнік распавядае пра цікавую працу школьнага юнатаўскага гуртка “Жоўтая акацыя”, пра іхнюю навуковую захопленасць, і ў пэўнай ступені фантастычныя іх планы. У дзейнасці дзяцей назіраецца нават некаторая доля авантурнасці, што вельмі трывожыць бацькоў. Але калі яны бачаць карысць ад доследаў, то і самі падтрымліваюць сваіх нашчадкаў. Асабліва сімпатычнай у жаданні дзяцей з’яўляецца мара прышчапіць да беларускай сасны сібірскі кедр, каб такім чынам і ў Беларусі культываваць гэтую расліну, арэхі якой багатыя на алей.

[216] Бугаёў Дз. Талент і праца. – С. 47.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Характэрна для твораў і арыентацыя дзяцей на вывучэнне і захаванне роднай прыроды. У аповесці “Ганна Алелька” даходліва і займальна расказваецца пра беларускія дрэвы, кусты, кветкі і травы, пра карысныя і лячэбныя іх якасці. Ганна Алелька захапляе дзяцей аднаўленнем крыніц, у выніку чаго дзеці адкрылі для сябе і дарослых гістарычную тайну: першую крынічку ўпарадкаваў амаль сто гадоў таму жыхар іхняй вёскі, вядомы майстар ва ўсёй акрузе.

У аповесцях Ул. Дубоўка паспяхова выкарыстоўвае апрабаваны ім яшчэ ў 20-я гады мастацкі прыём: свабодны выхад у лірычна-публіцыстычных адступленнях да размовы з чытачом, палемікі з сваімі магчымымі апанентамі. Гэта дазваляла пісьменніку актуалізаваць акрэсленыя ў мастацкім творы праблемы, асцярожна адхіліць верагодныя закіды аб распаўсюджванні рэлігійнага цемрашальства, асабліва ў сувязі з фактам аднаўлення святой крыніцы, як яе называлі мясцовыя людзі.

Варта звярнуць увагу на яшчэ адну мастацкую асаблівасць гэтых твораў. Усе вобразы ў аповесцях не падаюцца ў развіцці, яны ў пэўнай ступені статычныя і з’яўляюцца толькі сродкам выказвання аўтарскіх мастацкіх ідэй. Але, на думку Дз.Бугаёва, пісьменнік і не ставіў перад сабой такой задачы, у яго было найпершым жаданне абудзіць у вучняў імкненне да самастойнасці, уласнага навуковага пошуку.

“*І ў “Жоўтай акацыі”, і ў кнізе “Ганна Алелька” вельмі добрая, каларытная і сапраўды народная мова. Яна істотна ўзмацняе прывабнасць абодвух твораў. Нельга не сказаць таксама пра шчырую любоў пісьменніка да дзяцей і прыроды, пра яго вялікае і арганічнае патрыятычнае пачуццё, якое ўжо знутры, сілай аўтарскага пафасу аб’ядноўвае і цэментуе ўвесь вельмі разнастайны матэрыял аповесцей, твораў, яшчэ раз падкрэслім, вельмі арыгінальных, змястоўных і па-свойму непаўторных, бо непаўторнай была сама асоба пісьменніка, іх аўтара.”* [217]

Некалькі іншую накіраванасць мае аповесць “Як Алік у тайзе заблудзіўся”. У адрозненне ад папярэдніх гэты твор заснаваны на дакументальных фактах. Аднак пісьменнік ператварыў аповесць у навуку, як трэба паводзіць сябе ў лесе. Калі трапляеш у экстрэмальную сітуацыю, то трэба ведаць, што рабіць. А значыць, трэба ведаць і прыроду. Пісьменнік дэталёва выпісвае кожны крок хлапчука, які зусім нечакана апынуўся ў тайзе. Усе сімпатыі аўтара на баку маленькага хлоп-

[217] Бугаёў Дз. Талент і праца. – С. 46.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

чыка. І гэта натуральна: ён не спалохаўся стыхіі, а пачаў аналізаваць і, вядома, шукаць выйсце. Тут пісьменнік выканаў дзве дыдактычныя задачы: паказаў, як хлопчык, які перад гэтым добра вывучыў тайгу, не разгубіўся, пайшоў дарогай сваіх ведаў; з другога боку – у творы адлюстравана актуальная праблема для маладога пакалення: трэба ведаць свой край, добра ў ім арыентавацца.

Для сямігадовага Аліка такая дасведчанасць стала звычайнай справай, бо з самага дзяцінства бацька вучыў яго разумець і любіць прыроду. Але, вядома, для мастацкага твора гэтага недастаткова. Кожная кніжка павінна мець займальны сюжэт. Каб трымаць чытача ў напружанасці, пісьменнік накіроўвае свайго героя ў зусім невядомыя месцы. Дык вось у гэтай жыццёвай сітуацыя Алік вытрымлівае экзамен на сталасць: ён успомніў, як трэба арыентавацца, згадаў, чаго трэба найбольш засцерагацца, а галоўнае, як знайсці кірунак дахаты. З гэтым хлапчук цудоўна справіўся, разам з аўтарам, вядома, ён расказвае, што назіраў, што разумеў, а што не мог, і такім чынам назапашваў пытанні, каб потым патрабаваць на іх адказу. Пісьменнік дабіўся галоўнага: ён здолеў паказаць і даказаць свайму малому чытачу, што безвыходных сітуацый у жыцці бывае мала. Пакуль ёсць надзея, вучыць пісьменнік, ты павінен змагацца за сваё жыццё і за гонар, каб не стаць аб'ектам смеху або, яшчэ горш, – знявагі за тое, што разгубіўся ў нейкі момант. Праўда, часам на падставе фактаў твора ўзнікае падазронасць: чаму гэты хлапчук так рацыянальна разважае, абсалютна не праяўляе ніякіх эмоцый, перажыванняў. Ды адказ можна знайсці толькі адзін: кожны дыдактычны мастацкі твор адкідае канкрэтыку, дробязнасць сітуацый, а выпукляе менавіта тое, што павінна працаваць на загартоўку характару, агульную назіральнасць і запамінальнасць.

Цікавасць да твора выклікаецца і тым, што пісьменнік звярнуўся да матэрыялу, мала вядомага беларускаму школьніку. Назвы раслін будуць запамінацца, параўноўвацца з беларускімі, што таксама павялічвае пазнавальнае значэнне кнігі. Т. Нікіціна адзначае, што *"аўтар вучыць дзяцей не толькі чытаць кнігу прроды, ён дае ім і ўрокі чалавечнасці. Не выпадкова Алік у тайзе думае не толькі пра сябе, а і пра іншых, пра тых, хто, магчыма, праз колькі дзён пойдзе яго дарогай"*[218]. Сапраўды, Алік ловіць рыбу ў затоцы, папярэдне засыпаўшы выхад пяском. Пасля пратоку прачышчае, каб гэтай заваддзю мог пакарыстацца яшчэ хтонебудзь. Гэта ўжо не проста аўтаматычнае дзеянне, а вынік асэнсаван-

[218] Нікіціна, Т. Пазнавальна, дасціпна / Т. Нікіціна // ЛіМ. – 1975. – 21 сак.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ня дадзеных бацькам навыкаў. Значыць, аповесць замацоўвае ўрокі маральнасці, атрыманыя дзецьмі ў школе і дома.

І ўсё ж у творчасці Ул. Дубоўкі пераважае паэзія. За дваццаць гадоў пасля вяртання паэт напісаў і апрацаваў больш паўсотні казак. Праўда, у жанравых адносінах іх не ўсе можна кваліфікаваць як казкі. Ёсць у яго творы, напісаныя на аснове народнага анекдота, знойдуцца і проста сатырычныя вершы і байкі ці напісаныя на аснове розных паданняў невялікія паэтычныя творы, што захавалі ў сюжэце ранейшыя прыкметы.

Як і ўсе творы казачнага кшталту, у зборніках Ул. Дубоўкі яны маюць і адпаведных герояў. Ды найперш імі становяцца дзеці, бо для іх і творыць паэт. Ён па-свойму трактуе адказ на спрадвечнае пытанне, адкуль бяруцца казкі. Адназначна, іх прывозіць казачны Бай; аднак Ул. Дубоўка дае магчымасць сваім юным героям самім адкрыць шлях з'яўлення казак і іх мнагалікіх насельнікаў. Зборнік "Цудоўная знаходка" (1960) і адкрываецца аднайменнай казкай-быллю. Пачатак твора рэалістычны, нават паўсядзённа-бытавы: хлапчукі збіраюцца на Кромань – *"возера лясное. А прыгожае якое!"*. У час купання знаходзяць ключык, а пасля – і куфэрак. Адкрыўшы таямнічую скрыначку, яны здагадаліся, што там сабраны ўсе казкі. З кожным выданнем паэт мяняў фінальную частку, надаючы ёй большай паэтычнай вобразнасці, метафарычнасці. У першым выданні перад паглядам хлапчукоў паўстаюць шматлікія героі казак, дзеці спадзяюцца разам з імі стварыць новыя сюжэты. У апошнім прыжыццёвым выданні (зб. "Залатыя зярняты", 1975) хлапчукі бачаць ужо іншае. Адзін *"старэйшы, і дужэйшы, і смялейшы"* хлапчук адкрыў куфэрак і

века ўзняў ён нецярпліва,
а пад ім такое дзіва

заззіхцела прамяніста,
што завойкалі ўсе чыста:

там зярняты залатыя,
а дзівосныя якія!
Казкі ў іх занатаваны
ды ў куфэрачак сабраны [219].

Ул.Дубоўка, перапрацоўваючы гэтую казку, імкнуўся зрабіць больш актуальным сам працэс збірання народнай мудрасці. У новым варыян-

[219] Дубоўка, У. Залатыя зярняты: казкі / У. Дубоўка. – Мінск: Маст. літ., 1975. – С. 11.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

це да хлапчукоў звяртаецца сам Бай. Гэтыя яго словы паэт выносіць у прысвячэнне:

На папасах, на супынках,
на рабочых перапынках,

на начлезе, у паходзе
скарб збіраў вам па драбніцы
па аднюсенькай адзінцы.

Залатыя ўсё зярняты
на спажытак вам узяты!

Хай у кожным вашым сэрцы
па адным хоць застанецца.

З аднаго таго зярняці
будзе плён багаты ў хаце,

красавала каб няспынна
наша любая Айчына[220].

Залатыя зярняты набываюць у казцы шырокі сэнс, метафарычны. Яны пачынаюць сімвалізаваць не толькі зашыфраваныя там казкі, але і ўвогуле словы народнай мудрасці. Заклік накапляць гэту мудрасць у кожнай хаце – гэта і напамін пра неабходнасць вучыцца, удасканальваць спадчынныя веды праз навуку.

Ул. Дубоўка звярнуўся да народнай творчасці невыпадкова. Як ужо адзначалася, многія філасофскія ісціны ў эпічных творах дваццатых гадоў ён пацвярджаў выкарыстаннем стылізаваных паданняў, легендаў і казак. У новы перыяд творчасці паэт прадоўжыў гэтую традыцыю, але ўжо стаў выдаваць як асобныя творы, далучыўшы і тыя ўстаўкі, адпаведна дапрацаваныя. У час публікацый у перыядычных выданнях паэт вызначаў жанр кожнага твора, пазней у зборніках падаваліся ў адзіным жанравым вызначэнні – казкі.

Тэматыка твораў таксама разнастайная: пра чалавечы розум і дасціпнасць, пра ляноту і зайздрасць, пра ганарыстасць і нядобразычлівасць і г.д. Такія склалі кнігі “Цудоўная знаходка” (1960), “Як Сінячок да сонца лётаў” (1961), “Мілавіца” (1962), “Кветкі – сонцавы дзеткі” (1963),

[220] Дубоўка, У. Залатыя зярняты. – С. 12.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

“Дзівосныя прыгоды” (1963), а таксама ў нейкай ступені выбранае для дзяцей: “Казкі” (1968), “Залатыя зярняты” (1975). У кожным гэтым зборніку паэт побач з новымі творамі публікаваў і тыя, што ўваходзілі ў ранейшыя выданні, гэта абумоўлена пэўнымі педагагічнымі мэтамі: як найбольш далучыць маладых чытачоў да глыбіні анродных высноў, выкладзеных паэтычнай мовай, – такім чынам пісьменнік рабіў вялікую грамадзянскую справу, паставіўшы сваё пяро на службу Айчыне.

У вершах, байках, казках Ул. Дубоўка закрануў шмат праблем, якія тычацца ўзаемаадносін паміж людзьмі, іхняй узаемнасці з прыродай. Такія творы вызначаюцца вялікай сілай маральна-этычнага і эстэтычнага ўздзеяння. Таму яны з цікавасцю чытаюцца не толькі малым чытачом. Пра свет прыроды ў нашай літаратуры напісана нямала, але Ул. Дубоўка заўсёды знаходзіць свой ракурс адлюстравання, сваё мастацкае ўменне адкрываць для чытача акно ў прыроду. У вершы “Зіма і Лета” паэт з характэрнай для яго дасціпнасцю паказаў адносіны людзей да зменаў пораў года, супярэчлівасць у жаданнях і памкненнях чалавека. Сапраўды, у жыцці заўважаецца нейкая непаслядоўнасць у паводзінах людзей: летам стамляюцца, просяць, каб хутчэй прыйшла зіма, а зімой клянуць маразы і не могуць дачакацца цяпла. Вядома, кожная пара года прыгожая і карысная сама па сабе. Але, закранаючы гэтую з’яву, паэт раптам пераводзіць само дзеянне ў іншы план, надаючы яму яшчэ і этычна-маральны аспект. У спрэчцы Зіма і Лета прыводзяць шмат аргументаў на сваю карысць, аргументаў важкіх, вядомых кожнаму чалавеку. Зіма папракае Лета, што ад яго ўсе стараюцца схавацца ў цянёк, значыць, не любяць. Зіму ж, наадварот, любяць, бо яна і малога, і старога змушае не стаяць на месцы, скакаць, варушыцца.

Смяялася Лета ў адказ: –
Не знаю мілейшы хто з нас!

Ніяк зразумець не магу:
чаму ад цябе ўсе бягуць?[221]

Вывад можна рабіць адназначны: толькі лагоднасць і спагада, дабразычлівасць упрыгожваюць і з’яву, і істоту, тым больш чалавека. У казках “Хто дужэйшы”, “Вожыкаў суд”, “Драздовыя каралікі”, “Барсук і Мядзведзь”, “Чаму куртаты заяц” паэт працягвае сцвярджаць менавіта гэты, выпрацаваны на працягу вякоў маральны кодэкс: узаемапавага і высакароднасць. Любое махлярства ў рэшце рэшт заўсёды

[221] Дубоўка, У. Залатыя зярняты. – С. 43.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

выкрываецца. Як бы герой ні хацеў сябе ўзвысіць незаслужана, у выніку жаданне становіцца марным. Ухвалу атрымліваюць заўсёды толькі да брачынныя паводзіны.

Амаль у кожнай казцы Ул. Дубоўкі ёсць дачыненні герояў да прыроды, менавіта ў такой сферы паэт імкнецца сфарміраваць для свайго чытача адпаведныя маральныя ісціны. І ў напісаных па матывах народных казак і паданняў розных народаў, і ў непасрэдна літаратурных творах, сюжэты якіх народжаны чыстай фантазіяй аўтара, высновы караняцца на даўніх народных трыдыцыях. Спрадвеку ў народзе выпрацоўваліся спаважлівыя, амаль абрадавыя адносіны да прыроды, доказ таму – розныя народныя вераванні.

Казкі Ул. Дубоўкі заклікаюць тварыць Дабро. Вядома, паэт паказвае, што і ў дадзеным выпадку патрэбны намаганні, мабілізацыя ўнутраных сілаў. А гэта даецца толькі праз перакананне ў неабходнасці тых або іншых высокіх учынкаў. Такое выхоўваецца спакваля. І пачынаецца ўсё са звычайнай спагады. Спагада, жаданне дапамагчы падштурхоўвае да ўчынкаў, якія стаяць у вытоках гераізму і самаахвярнасці. У легендах, паданнях заўсёды ёсць незвычайныя міфалагічныя героі, якія сваёй магутнасцю непараўнальна выдзяляюцца сярод звычайных людзей. Ул. Дубоўка ў сваіх казках-легендах выбірае іншы аспект. Гераічныя ўчынкі ў яго здзяйсняюць найчасцей непрыкметныя істоты, але яны маюць вялікую сілу духу. Маленькая птушачка Сінячок (“Як Сінячок да сонца лётаў”) прыносіць людзям агонь, каб яны маглі пагрэцца лютай зімой. Сінячок хоць сам і абгарэў, але выканаў свой абавязак. Тут знайшло адлюстраванне старажытнагрэчаскі міф пра Праметэя, які даў людзям агонь, але быў пакараны вярхоўным богам. У казцы Ул. Дубоўкі сэнс некалькі іншы: спачувае Сінячку і Сонца, раіць яму не ляцець хутка, каб не згарэў. Спачувальна аднесліся і птушкі, хоць спачатку асуджалі: аддалі па адным пяры, каб Сінячок зноў набыў апярэнне (адмовіўся толькі ўдод, за што птушкі яго пакаралі, білі, шчыпалі, прымусіўшы схавацца ў дупло, пасля чаго ўдод адважваўся вылятаць толькі ноччу). Хоць Сінячок страціў сваю ранейшую афарбоўку, стаў стракатым, але за свой учынак захаваў ранейшае імя. Шануюць сінячка і людзі, заўсёды зімой даюць прытулак у вёсцы. Такой жа спагадлівасцю вызначаецца і “Мілавіца” з аднайменнай казкі. У паэме “Кругі” Мілавіца дапамагае Цікаўнаму знайсці праўдзівы адказ на запытанне, куды прапала жывая вада. У новым творы Мілавіца, таксама дачка сонца, бытуе на Палессі. “*Хлопец з васільковымі вачыма”* хоча разгадаць тайну, чаму над Палес-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

сем прастаяла Сонца аж тры гадзіны. Так хлопец сустрэў прыгажуню, якая згадзілася ісці ў прнёманскі край, калі хлопец зробіць ёй чаравічкі з рачнога пяску. З дапамогай сонца герою гэта ўдалося выканаць, Мілавіца ідзе з хлопцам, каб і там памагаць людзям. Тая ж ідэя самаахвярнасці пакладзена і ў аснову казкі "Суд кветак". Шыпшына, Чабор і Стракотка спазніліся на сход кветак, дзе павінна было вызначыцца, якая з іх самая прыгожая. Як высветлілася: спазненне было выклікана тым, што яны сустрэлі на полі бою герояў, якія змагаліся за волю і незалежнасць і ўсе палеглі там. Апошнія іхнія хвіліны і ўшанавалі кветкі: закрывала раны ад сонца Шыпшына, слалі пасцель Чабор і Стракотка. За гэту спагаду і прызналі іх кветкі прыгажэйшымі ў свеце.

Зрэшты, тэматычны падзел у казках Ул. Дубоўкі зрабіць няпроста, бо ў адным і тым жа творы заключаецца шмат этычна-маральных адценняў. Сумленнасць і працавітасць – тыя якасці, якія ўхваляюцца ў фальклоры ўсіх народаў свету. Праца дае чалавеку дастатак, гонар, павагу сярод людзей. Таму паэт засяроджвае ўвагу на вечных ісцінах: сумленнасці, дабразычлівасці, гатоўнасці прыйсці на дапамогу, – тых рысах, якія спрадвеку ўпрыгожвалі станоўчых герояў. І гэта выказваецца не толькі ў рэалістычных, сацыяльна-бытавых казках, але і ў алегарычных, фантастычных, казках пра жывёл. Узятыя ў розных народаў сюжэты на адну тэму, сведчаць, што ва ўсім свеце ганаруецца самая лепшая якасць – працавітасць. Павучальнымі з'яўляюцца вынікі спрэчкі індыйскіх вяльможных красунь пра самыя прыгожыя рукі ("Чые рукі прыгажэйшыя"), калі высвятляецца, што сапраўднай прыгажосцю вызначаюцца якраз знешне не прывабныя, але працавітыя рукі. Яны высвечваюць і прыгажосць душы: вяльможныя паненкі не адгукнуліся на гора старой зняможанай жанчыны, а бедная накарміла бабулю, чым магла. Няма нічога прыгажэй за працавіыя рукі, сцвярджае паэт.

Выхаванню працавітасці, сціпласці, настойлівасці і сумленнасці садзейнічаюць і казкі пра братоў, пра сына, які ўпершыню ідзе на заработкі. Гультайства, непавага да матчынага хлеба прыводзіць да паражэння старэйшага і сярэдняга брата (нянецкая казка "Тры браты"), тое ж напаткала братоў і ў беларускіх казках "Найдаражэйшы скарб", "Хто шукае – той знаходзіць". Асуджэнне бацькі атрымліваюць старэйшы і сярэдні сыны ("Найдаражэйшы скарб") за несумленна здабытае багацце: старэйшы ўкраў, сярэдні зарабіў таксама несумленным шляхам, бо дапамагаў жорсткаму валадару забіваць і рабаваць, прысвойваючы частку нарабаванага сабе. І толькі малодшы заслугоўвае ўхвалу за тое, што

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

зарабляў грошы набытымі ў час вандровак рамёствамі, а потым раздаваў іх бедным. У выніку бацька пакідае ў спадчыну яму ўсю гаспадарку.

У другой казцы малодшы брат, узяўшы з хаты толькі цвік ("Хто шукае – той знаходзіць"), прайшоўшы ці мала дарог, праз дапамогу іншым асвоіў многія спецыяльнасці, зарабіў грошай столькі, што мог нават выкупіць прададзеныя рэчы старэйшых братоў, якія бацькі давалі ім на разжытак. Праца робіць чалавека вартым ухвалы, зробленае ўласнымі намаганнямі становіцца найбольш каштоўным ("Першы заработак"). Удача, дабрабыт прыходзяць да тых, хто не спыняецца перад цяжкасцямі, ім садзейнічае і сама прырода ("Як Газель крыніцу капала"), занятых стваральнай працай ушаноўвае і калектыў, грамада ("Драздовыя каралікі"). Часам Ул. Дубоўка надае апавяданню філасофскі накірунак. Паляшук годна вядзе гаворку з наймагутнейшымі сіламі прыроды – Сонцам, Ветрам, Хмарамі, Марозам – хто дужэйшы. Дасціпнасць, прыродны розум дапамагаюць палешуку знайсці выхад з цяжкага становішча. Урэшце ён даказвае, хто з'яўляецца самым дужым. У працы мужык не адчуваў і марозу:

Тады пазнаў вялікі сход,
што ні Мароз, ні Снег, ні Лёд,

ні Вецер з Хмарай начале,
ні Сонца ў казачным святле

не перамогуць сілы той,
якая ў працы ёсць людской.

Людская праца – уладар.
Яна на свеце гаспадар![222]

Вывады Ул. Дубоўка падае афарыстычна. Сцверджанні яго нагадваюць народныя прыказкі і прымаўкі, некаторыя з іх адпаведна аўтарскай задуме перафразіраваныя. Усё гэта скіравана да малога чытача, дапамагае яму лепш засвоіць ідэйны сэнс, рабіць самастойныя высновы. Як адзначаюць М. Мішчанчук і М. Шаўлоўская, Ул. Дубоўка "*ўнутранай логікай апісання наводзіць маленькага чытача на роздум пра тое, "што такое добра і што такое дрэнна". Адсюль вынікае такая асаблівасць твораў паэта: ідэйны сэнс іх выходзіць за рамкі вершаваных радкоў, за рамкі стрымліваючага яго славеснага афармлення."*[223]

[222] Дубоўка, У. Казкі / У. Дубоўка. – Мн.: Беларусь, 1968. – С. 22.

[223] Мішчанчук, М. Чароўнае слова паэта / М. Мішчанчук, М. Шаўлоўская // ЛіМ. – 1975. – 12 сн. – С. 4.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У кожным з твораў, у якіх услаўляецца чалавек працы, заўсёды прысутнічае яго антыпод: несумленны, гультай, непачцівы, зазнайлівы персанаж. Ды паэт адкрыта не асуджае антыгероя, але ўсім зместам мастацкага падкрэслівае яго мізэрнасць. Асуджаюцца звяры ў афрыканскай казцы пра газель, бо адмовіліся памагаць ёй адкопваць крыніцу; не выклікаюць захаплення старэйшы і сярэдні браты; развенчваецца спрадвечная хітрасць лісы, калі яна падманам захацела пакарыстацца плёнам працы Крата і Мурашкі, гэтых сімвалаў нястомнасці (байка “Крот, Мурашка і Лісіца”); заканамернае і пакаранне хцівага і багатага бурата (“Крошачка хлеба”), бо ён непачціва аднёсся да хлеба, шпурнуўшы ў прорву бохан, калі ўбачыў, што крошка, якую імкнуўся падняць бедны, дазволіла таму спакойна спусціцца па камянях. Такія ж матывы многіх прыказак і прымавак і ў беларусаў: нават калі выпадкова ўпадзе ў чалавека кусочак хлеба, то ён павінен падняць, прасіць у яго прабачэння. Хлеб – аснова жыцця, вянец працы чалавека.

Шмат казак напісаў Ул.Дубоўка па матывах фальклорных сюжэтаў розных народаў, у якіх галоўнымі героямі з’яўляюцца людзі з адмоўнымі рысамі характару, а таксама многія жывёлы. Звяртаючыся да займальнай фабулы, Ул.Дубоўка не проста хоча зацікавіць свайго чытача, але перш за ўсё імкнецца акцэнтаваць увагу на сур’ёзных з’явах, у даступнай форме даць багаты матэрыял для роздуму, асэнсавання. У раннім узросце, калі фарміруецца адпаведны тып адносін да рэчаіснасці, вельмі важна правільна расстаўляць маральныя акцэнты. Выклікаюць смех і асуджэнне паводзіны мядзведзікаў, якія ніяк не маглі падзяліць каўбасу, таму іх лёгка абхітрыла ліса (“Сквапныя мядзведзікі”); творы пісьменніка садзейнічаюць выхаванню негатыўных адносінаў да зайздрасці, грубасці, падману і здзеку. Істотам хіжым аўтар надае рысы вядзьмарства (“Пра народную лякарку і пра хіжую вядзьмарку”), у тым ліку жанчыне Ягавіцы і яе дачцы Драцяніцы (“Казка пра зачараваную Лілю”). Заманіўшы прытворнай ласкай у сваю хаціну сіраціну Лілю, маці з дачкою здзекуюцца з яе, а пасля нават спрабуюць адабраць у яе прыгажосць. Зноў прырода абараняе справядлівасць. Птушкі і вада, расліны прымаюць Лілю да сябе, ператварыўшы ў прыгожую кветку, а злых яе праследавальнікаў навек схавалі пад вадою. Гультайства і падман – ганебныя рысы характару, таму Ул.Дубоўка шмат удзяляе гэтаму ўвагі, у многіх творах развенчваюцца менавіта такія носьбіты заганных рысаў. Аўтар часам тактоўна напамінае і старэйшым, што не трэба дапускаць недахопаў у выхаванні. Нанайская дзяўчына Айо-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

га (“Айога”) паверыла, што яна – самая прыгожая, таму адмаўляецца ад працы, толькі любуецца сабою, а ў выніку ператвараецца ў гусь. Асуджаецца ганарыстасць (“Ганарысты конь”), падман і вераломства, калі дашчэнту разбураецца сяброўства, як гэта адбылося ў Месяца і Сонца, калі першы парушыў дамову, пашкадаваў і схаваў свае зоркі, а Сонца высакародна рассыпала па ўсёй Зямлі і сталі яны кветкамі (“Кветкі – Сонцавы дзеткі”). Сквапнасць, дробязны разлік разбураюць сяброўства, таму Сонца і Месяц так і ходзяць сваімі шляхамі, ніколі не могуць з’явіцца разам, а зоркамі Месяц можа любавацца толькі ноччу. Зазнайства, фанабэрыстасць таксама не надта ўпрыгожваюць асобу – пра гэта тактоўна даводзіць свайму чытачу Ул. Дубоўка (“Вяльможны Пых”). У адным выпадку паэт у фінале прыводзіць парушальніка да пакарання, у іншым дае яму магчымасць выпраўлення, як гэта адбылося з тым ганарыстым канём (“Ганарысты конь”). Падман, подласць не могуць надаць прыгажосць любой істоце, з падобных дзеянняў іншых заўсёды трэба рабіць адпаведныя вывады. За дабрату палешука, які схаваў у мяшку ваўка, калі той ратаваўся ад мядзведзя, воўк гразіцца свайго выратавальніка з’есці. Сумленна вырашае справу вожык, які трапіўся ў гэты час. Ён хітрасцю засоўвае ваўка зноў у мяшок (“Вожыкаў суд”); пакаранымі застаюцца і зайцы: у адным выпадку за гультайства: не пайшлі на раздачу хвастоў, спалохаўшыся дажджу і холаду, спадзеючыся, што нехта з сяброў прынясе (“А чаму куртаты заяц”); у другім варыянце за падман. Па легендзе некалі ў зайцаў былі доўгія хвасты; даўгахвостыя гулялі, карміліся на беразе ракі. Уздумалася ім перабрацца на другі бераг, дзе было больш прастору, але ж не ўмелі плаваць. Тады рашылі выкарыстаць самоў, прапанавалі, каб тыя сабраліся ўсе ў адно месца, нібыта для высвятлення, каго болей – самоў ці зайцоў. Самы згадзіліся, перагарадзілі рэчку, а па іх спінах зайцы пабеглі праз рэчку, смеючыся з сваіх сяброў. Але ў апошні момант самы паспелі схапіць за хвосты і адарвалі іх (“Чаму ў зайцаў кароткія хвасты”). Ненадзейнасць у сяброўстве можа абярнуцца ліхой бядой, таму трэба быць шчырымі, інакш не праміне пакаранне (“Пузыр, Саломінка і Лапаць”), і наадварот, адданасць у сяброўстве перамагае ўсе перашкоды (“Шчырае сяброўства”). Калі паэт і глядзіць крыху іранічна на сваіх персанажаў, то сяброўства ўвекавечвае афарыстычнай песенькай з пэўным філасофскім падтэкстам:

Наша дружба не загіне,
нас ніколі не пакіне.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Гора прыйдзе – перабудзем,
шчасце згубім – зноў здабудзем.

Хто ж другім капае ямы –
ляжа ў яму першы самы[224].

Падхалімства, ліслівасць таксама не ўпрыгожваюць (“Лісіца, Леў і Воўк”), заўсёды можна знайсці лекі ад зазнайства (“Барсук і Мядзведзь”). Уласна кожны твор Ул. Дубоўкі закранае важныя этычна-маральныя праблемы. Недарэмна паэт збіраў мудрасць народаў свету, і сам, як той казачны Бай, дае свайму чытачу парады, тактоўна падводзіць да вывадаў, ш т о трэба ўшаноўваць, а ад ч а г о найлепш як хутчэй адмовіцца.

Натуральна, ухвалення заслугоўваюць толькі высакароднасць, цярплівасць, павага да іншых. Сумленнасць – самая каштоўная рыса характару. Недарэмна менавіта на гэтым выпрабоўвае хлапчукоў Мудрэц, калі хацеў выбраць сабе выхаванца. Даўшы няўсхожыя зярняты амаль сотні прэтэндэнтаў, ён пераканаўся, што сумленны сярод іх толькі адзін, бо прынёс гаршчочак без расліны, у той час, калі астатнія прынеслі самыя прыгожыя вазоны (“Праўдзівы хлопчык”). Цаніўся ў народзе заўсёды розум, дасведчанасць, умельства, імкненне да справядлівасці – усё гэта былі спрадвеку вялікія каштоўнасці. Уменне прадбачыць сітуацыю, выкарыстаць усе магчымасці рэалізацыі свайго умельства заслугоўвала самай шчырай павагі, такія якасці могуць выратаваць і з бяды (“Разумная дачка”, “Чаму ў тыгра перапялёсая шкура”).

Ул. Дубоўка сапраўды здолеў сабраць зярняты мудрасці народаў свету і ў адпаведнасці з беларускім менталітэтам добра прышчапіць іх на беларускую глебу, захаваўшы іх першапачатковае харство і арыгінальнасць. Трэба пагадзіцца з Дз. Бугаёвым, што ў апрацаваных творах Ул. Дубоўка “*заўсёды ўмеў зберагчы іх душу, захаваць іх сапраўдны народны характар, нанава адкрыць іх ёмістую, адшліфаваную стагоддзямі павучальнасць і зрабіць яе нашым сённяшнім духоўным здабыткам.*”[225]

Не меншай каштоўнасцю з’яўляюцца і ўласна літаратурныя казкі “Зайцы і страшны Боўць”, “Кветка шчасця”, “Старобінская казка – салігорская быль”, “Аленняя сцежка”. Праўда, яны ў жанравых адносінах не вытрымліваюць усіх казачных прыкмет, але з’яўляюцца

[224] Дубоўка, У. Залатыя зярняты. – С. 301.
[225] Бугаёў, Дз. Талент і праца. – С. 29.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

яркім прыкладам працягу традыцыі, што бярэ пачатак у творчасці Ядвігіна Ш. і Якуба Коласа. Паэт імкнуўся давесці, што і сучаснасць у нейкай ступені становіцца казкай. Аднак у некаторых творах, дзе паэт хацеў зрабіць публіцыстычна-лірычныя адступленні на выхад у сучаснасць, напомніць, што ўсе згаданыя адмоўныя з'явы даўно прапалі ў вечнасці ("Тры браты", "Пра дзяўчыну і кілім", "Кветка шчасця", "Аленняя сцежка", "Старобінская казка – салігорская быль"), праяўляюцца выразныя прыкметы ідэалагізацыі.

Творчасць Ул. Дубоўкі для дзяцей – цэлая эпоха ў гісторыі беларускай літаратуры. Працягнуўшы традыцыі беларускіх пісьменнікаў пачатку XX стагоддзя, ён стварыў свой казачна-міфалагічны непаўторны свет, які стаў сапраўднай школай для творцаў наступных пакаленняў.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

З МАЙСТЭРСТВАМ ПРА ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

Паэзія Аляксея Пысіна

Заслужаны дзеяч культуры Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Янкі Купалы. Аляксей Васільевіч Пысін – адзін з выдатнейшых беларускіх паэтаў XX стагоддзя. Ён стаў пачынальнікам і заканадаўцам многіх тэматычных кірункаў у паэзіі.

Нарадзіўся А.В. Пысін 22 сакавіка 1920 года ў в. Высокі Барок (Борак) у сялянскай сям"і. Продкі паэта па бацькавай лініі перасяліліся на Краснапольшчыну ў XIX ст. з Браншчыны на купчыя землі. Па маці рынскай лініі, па сведчанні самога паэта, продкі выходзяць з сучаснай Гомельшчыны, тады Магілёўскай губерні. Бацька паэта, Васіль Пятровіч, нарадзіўся і пражыў усё жыццё ў в. Высокі Барок, маці, Хрысціна Рыгораўна (у дзявоцтве Вяржбіцкая), – з суседняй в. Мануйлы.

Ужо навучаючыся ў Палужскай сярэдняй школе, А. Пысін становіцца актыўным селькорам, падае першыя вершы ў раённую газету "Чырвоны сцяг". Пасля заканчэння школы (1938) А. Пысіна як актыўнага селькора райкам камсамола накіраваў на вучобу ў Мінскі камуністычны інстытут журналістыкі, дзе паэт правучыўся да 1939 г. і быў прызваны ў войска. У званні радавога прайшоў усю вайну, атрымаў некалькі раненняў, перажыў шмат драматычных часін. Пасля дэмабілізацыі ў 1946 г. вярнуўся на Радзіму, стаў працаваць у сваёй раённай газеце адказным сакратаром. Пасля была праца ў розных газетах, у тым ліку і на пасадзе рэдактара чэрыкаўскай раёнкі. У 1956–1958 гг. вучыўся на Вышэйшых літаратурных курсах у Маскве. З 1958 г.– у рэдакцыі абласной газеты "Магілёўская праўда", з 1971 г. і да апошніх дзён быў сакратаром Магілёўскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў БССР (зараз Саюз беларускіх пісьменнікаў).

Першыя паэтычныя творы А. Пысін напісаў яшчэ калі быў вучнем Высокаборкаўскай сямігодкі, а ў 1938 г. аднёс падборку вершаў тады вядомаму на Краснапольшчыне маладому паэту Петрусю Бядуліну, які і адправіў некалькі з іх у рэспубліканскую "Чырвоную змену", дзе адзін пад назвай "Ураджай" і быў апублікаваны. З таго часу вобраз Радзімы, роднага краю і прыроды становіцца для А. Пысіна галоўным у яго творчасці, а ў пасляваенны час за ім замацавалася і тэма гераізму і трагізму чалавека на апошняй вайне. У лірыцы паэта назіраецца пэўны сінтэз выяўлення: услаўленне мірнага жыцця, еднасці чалавека з прыродай і трагічных выпрабаванняў яго франтавой рэчаіснасцю пры

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

непахіснай веры ў будучыню. Ваенная тэматыка і жыццё чалавека на ўлонні прыроды стала вызначальнай рысай і паэзіі для дзяцей.

Размаітасць свету на розных жыццёвых этапах успрымаецца неаднолькава. А. Пысіну ўдалося ўлавіць не толькі гэту розніцу, але ў нечым і падкрэсліць агульнасць захаплення дзівосамі прыроды дарослага чалавека і дзіцяці. Калі ў дарослага чалавека акаляючае асяроддзе часцей за ўсё ўспрымаецца як разумова-асэнсаванае, то ў дзіцячым захапленні праяўляецца большая непасрэднасць. Не апускаючыся да падробак пад дзіцячае ўспрыманне, А. Пысін здолеў паказаць уражлівасць жыццёвых з'яў, якія захапляюць як дарослага, так і малога чытача. Але выпісаная прыгажосць вымушае не толькі захапляцца, але і задумвацца над жыццёвымі праблемамі. Вобразнасці карцін дапамагаюць выявіцца і па-майстэрску падабраныя алітэрацыі:

А пад аркай ходзіць хмарка
Плешча плёс.

І канцоўка верша натуральна засяроджаная:

Дожджык добры, працавіты
Сёння быў.
І пшаніцу ён і жыта
Напаіў"[226].

Прыродныя з'явы паэт умее падаць з тонкім пачуццём гумару. Такі прыём дапамагае далучыць чытача да роздуму над усімі вонкавымі працэсамі прыроды і грамадскага жыцця. Паказальнымі ў гэтым плане з'яўляюцца вершы "Туман", "Базар", "Журавіны", у якіх А. Пысіну ўдалося ненавязліва, з усмешкай перадаць неабходнасць разумець прыроду і шанаваць яе. Пазнавальны аспект вершаў надзвычай грунтоўны. Праз вобразнае адлюстраванне з'яў дзецям лепш запамінаюцца законы прыроды і чалавечых узаемаадносінаў. Адухаўленне прыроды ў паэзіі дае магчымасць засвоіць ісціну, што ўся прырода жывая, і да яе трэба адносіцца беражліва. Усмешку выклікае зайчыкава адкрыццё, адкуль бярэцца туман:

Дзівіцца адважны зай:
У гарлачыкаў на ўлонні
Жабяняты цёплы чай
П'юць са сподачкаў зялёных.

Мчыцца заяц да палян,
Сам з сабою размаўляе:

[226] Пысін, А. Вясёлка над плёсам / А. Пысін. – Мн.: Беларусь, 1964. – С. 4.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

– Знаю ад чаго туман
Па-над рэчкаю бывае”[227].

Прырода ў вершах А. Пысіна для дзяцей паўстае як жывая істота, Персаніфікацыя[228] ўсіх з’яў тым не менш не з’яўляецца знарочыстай, а ўспрымаецца як натуральны адбітак. Спасціжэнне законаў прыроды адбываецца праз супастаўленне з жыццём людзей, праз высвечванне іх узаемаадносін. Паэт прымушае свайго чытача задумацца над шматлікімі праблемамі, перш за ўсё прывучаючы да чуйных узаемаадносін паміж сабою, да ўзвышанага ўспрыняцця асяроддзя. Міфалагічныя матывы, элементы фантастычнага, якія няўлоўна прысутнічаюць у вершах, робяць іх прыцягальнымі, падзеі становяцца інтрыгуючымі. Гэта прысутнічае ў творах пра садовыя і лясныя расліны, пра кветкі і жывую ваду. Вобразнасць у многіх вершах узмацняецца праз розныя адценні колераў і разнастайнасць гукаў (“Вішня”, “Сланечнік”, “Пчолка”, “Зайцава капуста”). У вершах адбіваюцца розныя жыццёвыя з’явы, але свет прыроды паэт лепіць дасканала, з вершаў вынікае вялікая пазнавальная сіла, а разам з усім гэтым яны заключаюць у сабе значны выхаваўчы змест. Прамое павучанне аб тым, што трэба берагчы прыроду, не заўсёды паспяхова дзейнічае на гэтую узроставую катэгорыю. А вось паўфантастычная з’ява становіцца ўражлівай. Косціку (“Вішня”) прысніўся сон, што ён стаў вішняй, бо праглынуў костачку. Стаўшы дрэвам, ён адчувае на сабе ўсе негатыўныя прыродныя і чалавечыя праявы.

Гром. Маланка. Лівень.
Гул вады.
Уцякаюць людзі
Хто куды.

Толькі ён павінен мокнуць пад дажджом. Хлопчыкі б’юць па галінах з рагатак, нехта ломіць галіну на пугаўё, козы аб’ядаюць бакі і г.д., хлопчык з жаху прачынаецца :

І ніяк не можа
Сон забыць. –
Цяжка, вельмі цяжка
Вішняй быць[229].

Прыём пераўвасаблення ўзмацняе сілу ўздзеяння на розум і пачуцці маленькага чытача, прымушае задумацца над шматлікімі даступнымі

[227] Пысін, А. Вясёлка над плёсам. – С. 20.

[228] Адухаўленне, наданне жывёлам, раслінам, прыродным з’явам і абстрактным паняццям чалавечых уласцівасцяў.

[229] Пысін, А. Колькі сонцаў / А. Пысін. – Мн.: Маст. літ., 1979. – С. 51.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

праблемамі, а гэта садзейнічае засваенню патрабаванняў спагадлівых адносін да прыроды.

Пейзажныя вершы А. Пысіна не толькі ўзвелічаюць і паэтызуюць акаляючы свет, але і маюць у аснове вялікі патэнцыял духоўнасці, бо паэт умее ўключыць сваіх герояў ва ўсе жыццёвыя працэсы, давесці да свядомасці, што само па сабе нічога не ўзнікае; каб здабыць нейкі вынік, неабходна прыкласці намаганні, трэба працаваць. Зайчык пасадзіў капусту, але не дагледзеў агарод, таму не атрымаў качаноў, а толькі лісцікі (“Заечая капуста”), а працавітая пчолка шые сабе фартушок, за яе стараннасць ёй дапамагаюць усе насельнікі лугу. Дасціпна і арыгінальна паэт вытлумачвае паласатасць пчолкі – гэта ад рознакаляровасці траў, з якіх яна сшыла сабе апратку.

Дзеці ўспрымаюць прыроду па-свойму, у іх больш фантазіі ў аргументаванні знешніх праяў свету. Паэт улічвае такую якасць, калі піша пра нейкія падзеі. Звычайна тут дзейнічаюць хлапчукі і дзяўчынкі ва ўзаемадзеянні з дрэвамі, раслінамі, звярамі і птушкамі. Такая сінкрэтычнасць адлюстравання найбольш праявілася ў сюжэтных вершах “Трывога ў бары”, ”Спрэчка з драчом” і інш. Хлапчукі прыходзяць у лес, раскладваюць вогнішча, гуляюць, жартуюць, скачуць, а калі здаволіліся, накіраваліся дамоў, не задумваючыся над учынкамі і магчымымі наступствамі сваіх дурослікаў. Паэт напамінае, што неразважлівае абыходжанне ў лесе з агнём можа прывесці да бяды. Так і здарылася: агонь разбушаваўся, хоча перакінуцца на кусты і дрэвы. Вобразна пададзена ў творы лютасць і агрэсіўнасць агню, які пагражае спаліць увесь лес, калі яму не падкінуць галля. І далей пачынаецца казачнае прадстаўленне: сосны просяць ветрык прыслаць на дапамогу хмаркі з бочкамі вады, што вецер і выконвае. Адчайна змагаецца з агнём берасцянка, бо побач яе гняздзечка. На дапамогу ёй прыходзяць хмары, нарэшце ў лесе зноў спакой.

Спалучэнне рэальнага (хлапчукі) і фантастычнага (стыхія, прырода – у кантэксце гэтага верша) стварае пераканаўчую карціну штодзённага жыцця з яго многімі нечаканасцямі, якія часцей за ўсё здараюцца ад бесклапотнасці. Прыёмы рэалістычнага адлюстравання ў спалучэнні с персаніфікацыяй стварае адпаведную ўражлівую карціну, якая адначасова захапляе і прымушае задумацца над шматлікімі праявамі свету, узбагачае жыццёвы вопыт першымі неабходнымі звесткамі. Неадназначныя дачыненні да прыроды ў вершы “Спрэчка з драчом” заключаюцца ў тым, што маленькая Таня выяўляе рысы высакароднасці, не згаджаючыся з крыкамі драча, які быццам бы дражніцца з дзедам, бо ў пра-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

цяглым спеве птушкі летнім вечарам дзяўчынцы чуецца *“ба-ра-дач”*. Майстэрства паэта тут праявілася ва ўменні імітацыі гукаў, ствараць мастацкую карціну падабенства праз удала падабраныя алітэрацыі. Дзед прымае гульню, раіць не звязвацца з задавакам, які нават пагражае перакуліць паром, бо яго ў спрэчках не пераможаш, такі ўжо ён ад прыроды. Паэту ўдалося дакладна перадаць непасрэднасць мыслення і ўчынкаў дзяўчынкі, мудрую ўсмешлівасць дзеда, які садзейнічае развіццю фантазіі ўнучкі.

Паэтызацыя дзяцінства – найбольш характэрная рыса творчасці А. Пысіна. Звароты да ўласных гадоў такога ўзросту хоць і маюць пэўнае адценне настальгіі па незваротным, тым не менш перадаюць багацце фантазіі дзяцей і ўменне *“свет свой па-свойму ляпіць”*. Напластаванні ўласных успамінаў, паходаў у прыроду добра выяўляюцца пры перадачы зацікаўленасці светам прыроды дзецьмі новага часу, больш інфармаванымі і урбанізаванымі. Тым больш зараз, пры такой тэхналагізацыі жыцця, нешта ўжо страчвае сваю першасную інфармацыйную аснову, але эстэтычныя якасці паэзіі застаюцца нязменнымі.

Анімалістычная[230] паэзія А. Пысіна вызначаецца адпаведным інтэлектуалізмам, філасафічнасцю, але яна не страчвае сваіх уласна паэтычных якасцей, паколькі застаецца займальнай і прыцягальнай. Каб лепей распавесці пра жыццёвы чалавечы досвед, паэт многія ўласцівыя людзям звычкі і адносіны пераносіць у асяроддзе лясных насельнікаў. Жыва разгортваюцца падзеі ў вершаваным апавяданні “Базар”. Незвычайная для птушак справа адбываецца ў глухім лесе. Усё ўзнаўляецца ў дзівосна-казачным арэоле: нечуваная дагэтуль з’яўляецца ў лесе абвестка аб адкрыцці базару. Непрызвычаеныя да такіх навін яго спрадвечныя жыхары ўспрымаюць іх з трывогаю, улавіўшы ў сугучнасці слоў небяспечную для сябе, так і для людзей, справу – пажар. Абыгрываецца ў творы і вядомая прымаўка пра сароку, якая разносіць гэтую вестку па лесе.”*Можа на хвасце ты слых прынесла гэты*”, сумняваецца сівая варона. Іншыя ж, як гэта і характэрна грамадству, успрымаюць вестку з аптымізмам. Як заўсёды бывае ў такіх выпадках, знаходзяцца і свае штатныя прамоўцы, напрыклад, верабей, які ў слове да гасцей расхвальвае парадкі ў лясной дзяржаве:

У добрай згодзе мы жывём,
У лагодзе
Гнёзды ўём.

[230] Творы, у якіх дзейнымі асобамі з’яўляюцца жывёлы, птушкі.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Нашы – нівы, нашы стрэхі,
Нашы плёсы, нашы рэкі
І крутыя берагі,
І балоты, і лугі.
Добра жыць, добра жыць,
Ёсць што есці, ёсць што піць[231].

Праз такі маналог паэт сцвярджае гуманістычную ідэю агульнажыцця і добрасуседства, так характэрнага для нашага народа. Тут прасочваецца і пэўная спрадвечная традыцыя: перадача ўласнага жыццёвага вопыту ад пакалення да пакалення, якая бярэ пачатак у беларускім фальклоры, перш за ўсё ў казках. Улюбёнасць у родны край, маральныя крытэрыі ўзаемаадносін – ісціны вечныя. І тут паэт не адступае ад праўды жыцця, хоць крыху прыўздымае і паэтызуе рэчаіснасць. Непасрэдна аўтар улічвае псіхалогію аўдыторыі, якой і адрасуюцца паэтычныя радкі.

Павучальнасць, скрыты дыдактызм заключаны ў раздзеле "Хто што купляў". Спрадвеку ў народзе існавала ісціна, што без адукацыі, вучобы чалавек мала чаго варты. Нават тады, калі яшчэ не было школаў, ужо існавала народная педагогіка, сканцэнтраваная ў амаль усіх жанрах фальклору. У новым часе галоўнай крыніцай ведаў стала кніга. Паэт і засяроджвае на гэтым увагу. Ён пераасэнсоўвае некаторыя сімвалы і вобразы. Напрыклад, за дзятлам спрадвеку замацаваўся вобраз ляснога тэлеграфіста. У А. Пысіна дзятлы становяцца друкарамі і прысутным прапаноўваюць сваю прадукцыю.

Найбольшым попытам у наведвальнікаў карыстаюцца буквары, іншыя школьныя прыналежнасці, што таксама з'яўляецца натуральным і выконвае канкрэтную дыдактычную задачу. Паэт разгортвае падзеі ўшыркі, ён сканцэнтроўвае ўвагу на эстэтычным выхаванні. Ёсць на кірмашы скрыпкі, іншыя музычныя інструменты, розныя спеўнікі, якія прадаюць лясныя і хатнія спевакі. Бусел гандлюе глобусамі і геаграфічнымі картамі ("*Без іх хоць плач, – гаворыць драч*"). Гэтым аўтар даходліва гаворыць пра неабходнасць добра ведаць сваю старонку, цікавіцца далёкімі землямі. Такая паэтычная павучальнасць становіцца ўражлівай, яна захапляе і фарміруе светапогляд у неабходным кірунку.

Разгорнуты сюжэтны верш "Лясная газета" дапаўняе, а ў нейкай ступені і падводзіць вынікі папярэдняга твора. Зноў тут у сваёй іпастасі выступае дзяцел, які зараз на сасновай кары друкуе газету. Насельнікаў

[231] Пысін, А. Вясёлка над плёсам. – С. 35.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

гэта вельмі дзівіць, таму што яны ў навінах пазнаюць саміх сябе, падзеі на базары, чым уразіўся нават сыч, прачытаўшы звесткі пра набытыя ім у аптэцы акуляры. Зноў жа дзецям займальна падаецца калі не тэхналогія, то знешні працэс стварэння газеты, падобнай да тых, якія штодзённа бачаць, а, можа, і чытаюць дзеці.

Па-свойму наватарства А.Пысіна ў гэтых творах вытлумачвае літаратуразнаўца Л. Гарэлік: "*Часцей за ўсё ў кнігах для дзяцей дзяцел выступае ў ролі доктара лесу. А. Пысін знаходзіць для яго іншую, не менш ганаровую і лагічна матываваную "пасаду" – друкара"*[232].

Загадкі прыроды людзі раскрываюць на працягу ўсяго свайго жыцця. Паэтычнай творчасцю А. Пысін дапамагае дзецям спазнаць таямніцы свету, падказаць, дзе можна шукаць дары прыроды ("Грыбы"), у казачнай форме паведамляючы, адкуль яны маглі з'явіцца, прымушаючы тым самым задумацца над праявай. Сутнасць кожнай рэчы вытлумачваецца яе ўнутранымі якасцямі, якія неабходна спазнаць. Маленькая дзяўчынка захапляецца прыгожымі ягадамі, якія прынесла ёй сястрычка, але не ведае, як яны называюцца. Старэйшая кажа: "*Вочкі закрываюцца*". І сапраўды, пакаштаваўшы іх, дзяўчынка зажмурылася, бо ягады аказаліся вельмі кіслымі ("Журавіны"). Законы прыроды, зменлівасць пораў года таксама па-свойму паэтычна вытлумачвае А. Пысін, стварыўшы вобразы розных дажджоў ("Якія бываюць дажджы"). Паэт акцэнтуе ўвагу на тым, што таямніцы прыроды бясконцыя, шукаць разгадак іх будуць усё новыя і новыя пакаленні.

Этычна-маральная праблематыка ў творах для дзяцей у А.Пысіна займае значнае месца. У пейзажнай лірыцы ён выяўляе пачуццё калектывізму ("Як страказу ратавалі"), спагады бліжняму, узаемаразуменне паміж таварышамі, неабходнасць дапамогі ў бядзе ("Сіняя бальніца", у пўнай ступені "Шчупак на якары"). А.Пысін прадоўжыў літаратурную традыцыю, стварыўшы вобраз адмысловага доктара, казачнага заступніка за ўсіх пацярпелых, своеасаблівага беларускага Айбаліта, у асобе якога выступае Рак-вусач.

Годнасць чалавека выхоўваецца з малых гадоў. Маральныя яго якасці фарміруюцца ў раннім маленстве. І тут вялікую ролю адыгрывае кніга з яе моцным этычным зарадам. А. Пысін імкнецца сцвярджаць высакароднае і велічнае праз паэтызацыю станоўчых учынкаў, але не забывае і пра дробязі, якія могуць ператварыцца ў вялікія беды

[232] Гарэлік, Л.М. Аляксей Пысін. Нарыс жыцця і творчасці / Л.М. Гарэлік – Мн.: Нав. і тэхн., 1981. – С. 123.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

для чалавека і грамадства. Галоўнае – своечасова папярэдзіць, падказаць правільны ход развіцця, прымусіць змяніць паводзіны. Часцей гэта зноў жа падаецца праз умоўна-казачны сюжэт. Нявыхаванасць, няветлівасць – заганныя рысы. Петрык не вітаўся з сонцам увесь дзень, а значыць, і з людзьмі, за што і быў пакараны: ранкам пачалася навальніца з жахлівымі маланкамі, нагнаўшы на Петрыка страх, таму што "*сонца ў небе не відно: разлавалася яно*". Хлопчык зразумеў свой дрэнны ўчынак ("Петрык і сонца"). Засяроджваючы ўвагу на негатывах, паэт сцвярджае дабро. Не можа выклікаць спагады той, хто разбурае вакол сябе ўсё, нішчыць жывы свет ("Ігнатка і рагатка", "Незвычайнае падарожжа"). Ігнатка і Хамель – роднасныя душы. У іх моцны разбуральны пачатак, калі іх не спыніць на гэтым этапе, то ў далейшым іхняя даслая дзейнасць можа набыць непрадказальныя негатыўныя маштабы. Хлопцы пакуль што атрымліваюць першыя маральныя ўрокі: чмель скідвае Хамеля проста ў асінае гняздо. Але ці зробіць Хамель вывады на будучае?

У кожным асобным выпадку А.Пысін знаходзіць арыгінальнае паэтычнае рашэнне, з досціпам выяўляе маленькія хітрасці дзяцей. Паэт імкнецца паказваць сваіх герояў у адпаведнасці з іх узростам і сітуацыі стварае псіхалагічна пераканаўча. Унукі ("Госці") перавярнулі ўсё ў хаце. Але сябе абсалютна вінаватымі не лічаць, бо ім не было куды падзець сваю энергію. Гэтым паэт напамінае і старэйшым, што ў любым узросце дзецям патрэбны канкрэтныя заданні, што неабходна зрабіць, як сябе паводзіць, нават калі і не спадзяешся на патрэбны вынік. Для паэта галоўнае, каб дзеці зразумелі недарэчнасць бяздумных, дрэнных учынкаў. Станоўчыя якасці развіваюцца і праз усведамленне негатыўных паводзін. Верачка з дзіцячай непасрэднасцю махлюе бабцы: яны не снедалі, карова перакуліла вядро з малаком, кот скінуў рэшата з яйкамі – дзяўчынка падманвае, каб атрымаць ад бабулі пачастункі. Бабка ва ўсё гэта мудра "*верыць*" і абяцае пакараць ката. Прысаромленая Верачка ўрэшце разумее, што зрабіла дрэнны ўчынак:

Да бабулі Верка з ласкай: –
Лепш даруем мы кату.
Адпачні ты, каліласка,
А я хату падмяту[233].

Аднак выхаванне з дапамогай мастацкай літаратуры адбываецца не толькі праз асуджэнне негатыўных учынкаў ці дрэнных звычак, але і праз

[233] Пысін, А. Вясёлка над плёсам. – С. 19.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

сцверджанне якасцей станоўчых. У многіх вершах паэт далікатна падказвае напрамкі дзейнасці, фарміравання пачуцця чалавечай годнасці. Праграмным творам гэтага плану можна лічыць верш “З чаго чалавек пачынаецца”. Гэта ў нейкай ступені верш-загадка, верш-прытча, верш-роздум. Перад чытачом ставіцца пытанне, на якое адказ трэба шукаць усё жыццё.

З чаго чалавек пачынаецца?
У калысцы ён калыхаецца.

А пакідае калыску –
Бярэцца за лыжку і міску.
Добра трымаючы лыжку,
Пачынае глядзець у кніжку.
Што яшчэ возьмеце ў свеце?
Скажаце, як падрасце[234].

Праблема, па сутнасці, пастаўлена філасофская. Дарога да пазнання аб’ектыўнага свету, асэнсаванае яго ўспрыняцце якраз і пачынаецца са школьнага ўзросту, бо да гэтага было толькі апрыорнае накапленне ведаў, механічнае назапашванне найбольш яскравых фактаў. Станаўленне ж асобы адзначаецца і тымі карыснымі справамі, якія здзяйсняюцца на працягу ўсяго жыцця. Пачынаецца ўсё з драбніцы, з узростам павялічваюцца аб’ёмы здзейсненага і грунтоўнасць створанага. Але такі вынік можа быць станоўчым толькі ў тым выпадку, калі чалавеку змалку прывіты пачуцці высокай маральнай адказнасці за ўчынкі. А. Пысін паэтызуе добрыя пачынанні: дзеці ўстанаўліваюць у садзе шпакоўні (“На прадвесні”), імкнуцца да актыўнай дзейнасці па азеляненні свайго роднага паселішча (“Каштаны”). Уменне тварыць дабро з’яўляецца ці не самай характэрнай рысай высокамаральнага чалавека, але да гэтага яго трэба рыхтаваць з самага дзяцінства, таму большасць вершаў А. Пысіна якраз і скіроўваюць выхаваўчы працэс у гэтым кірунку. Наяўнасць пазнавальнасці таксама вызначае паэтычную значнасць твораў для дзяцей. Паэт умее засяродзіцца на такіх з’явах, якія затрымліваюць увагу, прымушаюць здзівіцца, і тым самым робіць іх уражлівымі і запамінальнымі (“Мост ідзе па вадзе” “Ці маленькі самалёт”). Паэт выкарыстоўвае эфект нечаканасці. Рэальнае ўспрыняцце самалёта ў паветры традыцыйна параўноўваецца з палётам птушкі. Для малога самалёт можа ўявіцца і той цацкай, якую ён часта бачыць і якая

[234] Пысін, А. Аляксей, Дзяніс, Алёнка. – Мн.: Юнацтва, 1984. – С. 17.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

становіцца звыклай. На такой звыкласці і акцэнтуе ўвагу паэт на пачатку верша:

Як гудзе ён над дамамі,
То маленькі – бачым самі.
Уляцеў бы і ў акно,
Бо шырокае яно[235].

Рэальнасць жа выклікае іншыя асацыяцыі. Самалёт здзіўляе сваімі памерамі, прытым здзіўленне гэта грунтуецца на канкрэтным матэрыяле, на ўжо набытым жыццёвым вопыце. Запас назіранняў паэт выкарыстоўвае з найбольшай эфектыўнасцю, канстатуючы з'яву як такую.

А прыйшлі на аэрадром,
Самалёт – сапраўдны дом.
Лесвіца каля парога,
І на ёй прыступак многа[236].

Дасягнуты пазнавальны вынік замацоўваецца кантрасным супастаўленнем рэалій з іншага пункту назірання: у ілюмінатары дзяўчынка бачыць дзівосны свет наадварот, усё прапарцыянальна памяншаецца:

Як у кніжцы на малюнку,
Бачым рэчку і чыгунку.

Добра домікі відны,
Быццам кубікі яны.
Не маленькі самалёт,
А хутчэй наадварот[237].

Пазнанне акаляючага свету адбываецца не толькі праз засваенне прадметаў побыту, рэчаў і з'яў штодзённасці, але і праз паняцці адцягненыя, мысліцельна-вобразнага парадку, праз асэнсаванне часу і прасторы. Годнасць чалавека вызначаецца і яго ўменнем паважаць іншага, шанаваць дружбу. Аднак вечныя ісціны ў нас былі ідэалагізаваныя, часам можна было назіраць перакосы ў асвятленні такіх важных праблем. Патрабавалася адназначнае ўхваленне еднасці народаў, важнейшых рысаў інтэрнацыяналізму, стварэння нацыі – савецкі народ. Ідэалагічныя схемы адкінуты, але засталіся вечныя памкненні народаў да дружбы і ўзаемаразумення. Зараз гэта стала надзвычай актуальным, бо пад пагрозу ставіцца само існаванне чалавецтва. Таму і сёння з цікавасцю

[235] Пысін, А. Колькі сонцаў. – С. 6.
[236] Тамсама.
[237] Тамсама.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

будуць успрымацца вершы А.Пысіна, у якіх ён паэтызуе міжнародную дружбу і ўзаемаразуменне. Верш “Мой сябар” пацвярджае гэту ісціну. Хлапчукі – латыш і беларус – пасябравалі, і гэта застаецца на ўсё жыццё асновай іхніх жыццёвых прынцыпаў.

Мы з Валдысам у ранак росны
Віталі Райнісавы сосны.
На дзюнах замак будавалі
І хлебам чаек частавалі[238].

Прыцягальнасць балтыйскіх краявідаў была для Пысіна не толькі ўвагай да экзотыкі, але мела і выразна аўтабіяграфічны пачатак. На гэтыя дзюны ў тыя страшэнныя ваенныя гады падалі яго сябры *“пад біўні зломленых грымот*”, таму паэт шчыра ўслаўляе добрасуседства. Інтэрнацыянальнае заўсёды вырастае з нацыянальнага: чым большае адчуванне ў чалавеку нацыянальнай годнасці, тым больш ён будзе пачціва адносіцца да іншых народаў. Гэтую высакароднасць А. Пысін імкнуўся прывіць сваім малым чытачам, бо іначай усё можа абярнуцца звычайным дзікунствам. Можа, і таму ён імкнуўся пашырыць зацікаўленасць малога чытача да геаграфіі, да імкнення спазнаць усе таямніцы далёкіх кантынентаў. Далучае А. Пысін сваіх герояў да тых мясцін амаль праз прыгодніцкі змест, выкарыстаўшы пры гэтым традыцыйную баладу, пейзажны верш, настраёвую лірыку (“Імяніны”, “Драчова запрашэнне”, “Буслава ўказка”).

Алёшку дзед прысылае віншавальную тэлеграму з такімі крыху незвычайнымі словамі:

Мой унучак з Прыдняпроўя,
З днём тваім
Цябе вітаю
І сібірскага здароўя
Ад усёй душы жадаю.
З юбілеем, Аляксей!
Я, Твой дзед, і Енісей[239].

Чатырохгадоваму дапытліваму хлапчуку ўяўляецца, што Енісей таксама дзед, таму хацелася б ведаць, ці добры ён чалавек:

Енісей, сказала мама, –
Дзед усіх Сібірскіх рэк.
Ён прыгожы, ён магутны,
На сабе нясе ён судны,

[238] Пысін, А. Аляксей, Дзяніс, Алёнка, 1984. – С. 5.
[239] Тамсама. – С. 7.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Круціць дзень і ноч турбіны.
І дае ён для краіны
Шмат энергіі, святла,
Добрай рыбы для стала [240].

Далёкая сібірская рака не можа не выклікаць захаплення, бо гэта надта незвычайна і інтрыгуюча. Натуральна, што ў героя ўзнікае імгненнае жаданне ехаць туды, як толькі вырасце. Такая мастацкая арыентацыя абсалютна не павінна выклікаць спрэчак, таму што верш напісаны ў духу часу, калі ўся рамантычна настроеная моладзь ехала "*за туманам і за пахамі тайгі*". Так што жаданне ўнука, як вырасце, ехаць у Сібір уяўляецца заканамерным.

Даючы маладому чытачу мастацкае ўяўленне пра далёкія экзатычныя краявіды, А.Пысін не забывае пра родны край. Ён перш за ўсё акцэнтуе ўвагу на яго прыгажосці, шматлікіх рэках і азёрах, якія таксама трэба ведаць, і ў першую чаргу, каб адчуваць сябе годна перад іншымі. З гэтага і пачынае гутарку драч з сурком ("Драчова запрашэнне"). Прасядзець усё жыццё ў адной норцы – хвала невялікая. Трэба пабачыць свет, каб зразумець прыгажосць свайго краю. Гэта ненавязліва прапануе паэт сваім чытачам. Тут ён прадаўжае традыцыю Янкі Маўра, які настойліва адкрываў экзатычныя мясціны Беларусі. Таму паэт і падкрэслівае, што добра ведаць усё далёкае, але, відаць, у першую чаргу трэба зведаць тое, што вакол нас, нашыя прыгожыя краявіды. Пысін дасціпна і павучальна перадае ўяўную гутарку драча з сурком:

І сказаў сурочку драч: –
Бачу, у цябе аселасць.
А каб зведаць свет, прабач,
Перш за ўсё патрэбна смеласць!
Скокнеш з норачкі, пасвішчаш,
Ды з пужліваю" аглядкай.
А скажы, дзе рэчка Іслач?
І, напэўна, нават Свіслач
Для цябе пакуль загадкай?
Чуў пра Афрыку ты, можа?
Не, вядома, чуць не мог.
Запрашаю ў падарожжа,
Трэба толькі спрытнасць ног[241].

[240] Пысін, А. Аляксей, Дзяніс, Алёнка. – С. 7.
[241] Тамсама. – С. 13.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Паэт з гумарам глядзіць на такіх незвычайных падарожнікаў. Тут у наяўнасці поўная несумяшчальнасць. Пакуль сурок бег сцяжынкай, драч знік у густым разнатраўі, сурку засталося толькі з сумам пасвіставаць. Сапраўды, Радзіму трэба ведаць, як той драч, схадзіць упоперак і ўдоўжкі пехатой. Калі тут паэт адносіцца з гумарам да сваіх герояў, то ў баладзе "Буслава ўказка" падаецца метафарычна-захопленае ўспрыняцце прыроды. І ў дадзеным выпадку зацікаўленасць дзяцей ідзе далей сваёй мясцовасці. Іхні дыялог з буслам Клекатуном малюецца паэтам таксама з гумарам, але і з адпаведнай узнёсласцю. Да буслоў у народа спрадвеку паважлівыя адносіны. Нездарма менавіта яны становяцца героямі розных павер'яў, легендаў. У фальклоры захаваліся паданні, што бусел можа спаліць сядзібу, калі яго моцна пакрыўдзіць. А. Пысін выбірае іншы аспект. У яго бусел Клекатун выступае ў ролі настаўніка ці лектара, які знаёміць дзятву з далёкімі краямі, але якія ў той час былі на слыху ў кожнага. Як сапраўдны настаўнік геаграфіі, Клекатун шукае сваю ўказку, але не знаходзіць. Ён спрабуе выкарыстаць спадручны матэрыял: спачатку ўласную дзюбу, але безвынікова, бо дзюбай *"дацягнуцца цяжка нават да суседняй канавы*". Нарэшце выйсце знойдзена: указкай становіцца пяро з буславага крыла. Такой указкай можна весці праз сушу і ваду. Але зноў жа ўказка дастае толькі да Дняпра, а дзяцей цікавіць Катунь. Незвычайнасць і казачнасць сітуацыі ўзмацняецца. Бусел вырашае ўзяць за ўказку промень сонца *"сіні-сіні, самы яркі вунь з-пад той маленькай хмаркі"*. Указка атрымалася чароўнай, пад яе промнямі проста ажываюць далёкія краявіды. З яе дапамогай бусел паказвае дзецям тыя краі, што іх цікавяць. Бусел кажа*:*

Рэчка гэта –
На Алтаі,
Бачу добранька яе,
Між лясоў і гор плыве[242].

Далей ідуць краявіды тайгі, БАМ, берагі Амура і Байкала, а таксама знакаміты Байканур. Хто з хлопчыкаў і дзяўчынак не марыў тады стаць касманаўтам, калі такія былі прыклады герояў-беларусаў?... Казка і мара не могуць доўжыцца бясконца, таму паэт як мудры педагог вяртае сваіх герояў да рэальнасці. Клекатун спыняе свой урок. Яму трэба зноў агледзець свае родныя межы, *"кут свой родны, дарагі*". Такім чынам, захопленасць незвычайнымі з'явамі мае свае часавыя параметры, увага больш акцэнтуецца на беражлівых адносінах да родных мясцін. Да такога вываду вельмі далікатна падводзіць паэт свайго чытача.

[242] Пысін, А. Аляксей, Дзяніс, Алёнка. – С. 20.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Паказальна, што ўсе дзеянні ў вершах і баладах, незалежна ад таго, хто з"яўляецца іх героямі – дзеці ці птушкі і звяры, – адбываюцца на ўлонні прыроды. Сапраўды, *"прырода ўваходзіць у дзіцячы свет як пазнавальна-эстэтычны і выхаваўчы элемент. Усё створанае для дзяцей гучыць шчыра, выяўляючы вялікія сімпатыі паэта да маленькага чытача, развівае розум, памяць, выхоўвае адчуванне прыгожага. Добрае і справядлівае спагадліва падтрымліваецца, злое асуджаецца і караецца*"[243].

Пэўныя элементы экзотыкі і незвычайнасці маюць і паэмы-казкі, паэмы-былі А. Пысіна для дзяцей. У 1964 г. ён напісаў паэму-быль "Кавылёк", якая была прыўрочана да дваццацігоддзя вызвалення Беларусі і вялікай Перамогі.

Расказаць малому чытачу праўду пра вайну, але без трагічнага надрыву, надзвычай цяжка. Калі толькі засяродзіць увагу на трагічных і гераічных аспектах, то будзе празмерны цяжар для неўмацаванай псіхікі. Выяўленне толькі пераможнага часцей за ўсё прыводзіць да аблегчанага паказу, што надае прыкметы фальшу. Верны сваёй праўдзе вайны, А.Пысін імкнецца ўтрымацца на адпаведным узроўні. Ён апавядае пра прыгоды вярблюда на франтавых дарогах, што дапускае значную долю ўмоўнасці. Вярблюда падарыў часці стары башкір у час яе папаўнення і перафарміравання ў перадгор'ях Урала. Салдаты далі яму прозвішча Кавылёк – па назве стэпавай травы.

Прыгоды вярблюда пры ўсёй казачнасці і неверагоднасці выяўляюцца паэтам з набліжэннем да суровай рэчаіснасці вайны. Бамбёжкі, артабстрэлы, стрэчныя баі. З усмешкай расказваецца пра тое, як у час такой бамбёжкі, калі ўсе пахаваліся, Кавылёк часцаваў сябе на кухні:

Соль упляжыў бы да дна,
Ды явіўся старшына.

Пасля солі Кавылёк
Выпіў цэлы ручаёк.
І выходзіць – дзве бяды:
Ані солі,
Ні вады [244].

З Кавыльком здараецца многа прыгод. Паэт пра гэта расказвае з лагоднай усмешкай. Вярблюд спакойна пераносіў бамбёжкі і абстрэлы, не зважаў на свіст і грукат. Ды вось аднойчы салдаты на перадавой

[243] Гарэлік, Л.М. Аляксей Пысін. – С. 123.
[244] Пысін, А. Колькі сонцаў. – С. 71.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

убачылі, як міма іх пранёсся Кавылёк прама па нейтральнай паласе ў бок ворага. Усе ў здзіўленні: што здарылася? Аказваецца, флегматычны герой спалохаўся вожыка, як той слон мышы...:

Што здарылася з вярблюдам,
Ад чаго перапалох?
Пад гарэлым чорным дубам
Ён на вожыка прылёг[245].

Трагічных выпадкаў на фронце было многа. Гераічна змагаліся салдаты, гінулі, траплялі ў палон. Нешта падобнае здарылася і з Кавыльком. Пасля здарэння з вожыкам ён трапіў да немцаў. Там яго прызналі за шпіёна, шукалі ў гарбе рацыю, са злосцю біў жывёліну нейкі высокі чын, а пасля адправілі яе ў абоз вазіць салдацкую кухню. Тут зноў праславіўся Кавылёк: ён прывёз да сваіх соннага нямецкага кухара разам з гатовым сняданкам. Паэт дасягае камічнага эфекту выкарыстаннем вось такіх нечаканых здарэнняў. Аднак як франтавік, ён ведаў, што часцей салдату прыходзілася трапляць у трагічныя абставіны. Жорсткі бой на пераправе, падаюць забітыя і параненыя... Маладога артылерыйскага наводчыка выратоўвае Кавылёк, своечасова даставіўшы параненага ў медсанбат. А потым яшчэ раз праславіўся пасля пераможнага бою: Кавылёк пазнаў у палонным генерале свайго крыўдзіцеля і аплявaў яго. І тут у камічнай сітуацыі паэт не адыходзіць ад праўды факта. Вядома, што вярблюды пры раздражненні і злосці плююцца.

А. Пысін праз вясёлы гумар змог разгарнуць перад малым чытачом старонкі гераічнай, трагічнай і пераможнай вайны.

Паэма-казка "Казярог" таксама грунтуецца на гістарычным факце. У вызваленым Мінску адбыўся партызанскі парад, фота- і кінахронікі зафіксавалі ў калонах параду ... казла. Праз шмат гадоў гэты эпізод стаў асновай сюжэта гумарыстычнай гераізаванай казкі. Паэт прыдумвае праўдападобную біяграфію свайму герою: акупанты спалілі вёску разам з жыхарамі, а казла павесілі за рогі на пераездзе, адкуль знялі яго партызаны, калі вярталіся з разведкі. Паколькі жывёліна была знята з-пад неба, то і атрымала ад былога балтыйскага матроса, зараз ужо дзеда, імя Казярог у гонар такога сузор'я. Прыгоды Казярога і гераічныя, і камічныя. Ён дапамагаў вартавым, бо насцярожваўся ад самага нязначнага шуму, хадзіў з падрыўнікамі на чыгунку, дзе яму адводзілася складаная роля: адцягнуць ўвагу вартавых. Пра гэта паэт расказвае з усмешкай. Сапраўды, камічнай выглядае дуэль Фрыца з казлом:

[245] Пысін, А. Колькі сонцаў. – С. 72.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Ракеты ўспыхнулі святлом,
І ўбачыла начная варта:
Ваюе рыжы фрыц з казлом,
Напады адбівае ўпарта[246].

Дзеянне ў паэме часам нагадвае прыгодніцкі твор. Ёсць тут эпізод, у якім Казярог сутыкнуў паміж сабою дзве варожыя часці, а партызаны *“памагалі”* тым і другім. У многіх мясцінах паэт іранізуе, пасмейваецца і з незадачлівасці некаторых мсціўцаў, але, вядома, не дапускае сатырычнага адлюстравання. У гэтым плане твор вытрыманы ў адпаведнасці з ідэалагічнымі патрабаваннямі свайго часу.

Казярог здзейсніў і іншыя подзвігі. Разам з партызанамі ён ўдзельнічаў у разгроме варожага гарнізона, і як сапраўдны важак павёў у лагер адбітую ў ворага жывёлу, чым выклікаў вялікую радасць дзяцей у сямейным лагеры. Паэт не абыходзіць і ў гэтым творы трагічныя моманты. Казярог разам з насельнікамі сямейнага лагера праз балоты выбіраецца з блакады, вязе на сабе мяшкі з шрыфтамі для партызанскай друкарні.

Жорсткую праўду вайны паэт выяўляе якраз у раздзеле пра блакаду. Малому чытачу паэт даводзіць, якой цаной была здабыта свабода:

Стаў кожны на сваёй мясцінцы –
Трымалі абарону мсціўцы
І білі ворага ва ўпор,
І памагаў ім родны бор,
Сасна туліла, засланяла,
Асколкі на сябе прымала.

Ды ўпаў Казлоў,
Казлоўскі лёг,
Забітых, раненых нямала[247].

Як і павінна быць у казцы, прырода дзейнічае сумесна з людзьмі, але і яна не можа абараніць ад страшэннай знішчальнай сілы вайны.

Усё ж мсціўцы разам з Казярогам выходзяць пераможцамі, а там – і сустрэча з вызваліцелямі. На шашы Казярог сустракаецца з другім героем вайны: Кавыльком, іх вітае сам маршал Ракасоўскі.

Паэт у паэме-казцы здолеў перадаць і трагедыю вайны, і агульную радасць перамогі.

Паэма-казка “Алёшка” некалькі іншага плану. Яна пра сучаснасць, таксама грунтуецца на канкрэтных фактах. А. Пысін часта сустракаўся з

[246] Пысін, А. Аляксей, Дзяніс, Алёнка. – С. 26.
[247] Тамсама. – С. 33.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

воінамі-пагранічнікамі. Хутчэй за ўсё, яму была расказана быль пра тое, як нейкая застава вырасціла аленя, які прыжыўся на заставе. Гэты факт і стаў асновай сюжэта. Як і ў многіх творах такога плану, тут многа ўмоўнасці. Мясцовыя дзеці разам з аленем аберагаюць непрыступнасць граніцы. У такім выпадку павінен прысутнічаць і прыгодніцкі элемент. Хлапчукі Мірон і Зянон заўважаюць у лесе незнаёмага мужчыну, які меў выключную для таго часу экіпіроўку: джынсы, куртку. Яны пасылаюць аленя Алёшку шукаць пагранічнікаў. Парушальнік затрыманы. Яго адзенне яскрава гаворыць, адкуль ён мог з'явіцца. Калі не прымаць пад увагу гэтую знарочыстасць, то паэма-казка выразнай займальнасцю зацікаўлівае чытача. Паэту ўдалося стварыць інтрыгуючую сітуацыю, якая падштурхоўвае малога чытача да жадання зведаць вынік. Такім чынам, аўтарская задача стала выкананай, бо напружанасць сюжэта трымае чытача да самага фіналу. Негатыўна можа ўспрымацца толькі ідэалагічная ўстаноўка аб наяўнасці ворагаў, з якімі трэба пастаянна змагацца. Тым не менш, паэма выхоўвае і пачуцці патрыятызму, неабходнасці захоўваць свой край цэласным.

Сюжэт паэмы "Дзяўчынка Марыям" таксама грунтуецца на ўласным паэтавым вопыце. А. Пысін быў у Ташкенце ў час страшэннага землятрусу 1966 г. Пра сваё ўспрыманне гэтай геафізічнай катастрофы ён гаворыць у вершы "Ноч у Ташкенце". Некаторыя паэтычныя рэаліі ўгадваюцца і ў паэме. Своеасаблівасць твора ў тым, што катастрофа ўспрымаецца вачамі малой дзяўчынкі. Яна не можа ўявіць усю яе сацыяльна-эканамічную значымасць, таму засяроджвае ўвагу на прадметах больш ёй зразумелых і блізкіх. Дзяўчынка перажывае за дзеда Садыка, які стаіць на пасту ля самай гасцініцы "Ташкент", радуецца, што ён жывы, вітае яблынькі ў садзе, якія таксама перажылі страшэнную бяду, дапамагае, разабраўшы завалы з друзу, арыку гнаць ваду ў сады. Паэт узвялічвае, паэтызуе душэўную спагаднасць дзяўчынкі, яе жаданне дапамагчы людзям, прыродзе. Натуральным уяўляецца і матыў дружбы народаў. На такую бяду адгукнуліся ўсе рэспублікі, яны пасылаюць матэрыяльную дапамогу. Гэта выражаецца ў здзіўленні Марыям, якая не можа злічыць высотных дамоў, што штодзённа з'яўляюцца на месцах разбурэння. Усім сваім пафасам паэма "Дзяўчынка Марыям" узвялічвае высакароднасць, чалавечнасць.

Аляксей Пысін у гісторыі беларускай літаратуры займае адметнае месца. Ён сярод першых адкрыў дзецям сутнасць той ужо далёкай для нашчадкаў вайны, здолеў даступна і дасціпна расказаць пра высакароднасць і трагедыю чалавека на вайне. А ўся яго паэзія – гэта творчае прадаўжэнне нацыянальнай літаратурнай традыцыі, узор для творцаў новых генерацый.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

РЭХА ШЧАСЛІВЫХ ДЗІЦЯЧЫХ ГАДОЎ

Паэзія Алега Лойкі

У сярэдзіне пяцідзесятых у літаратуру прыйшло пакаленне пісьменнікаў, якія атрымалі вызначэнне “шасцідзесятнікаў” або філалагічнага пакалення. Вызначэнні даволі ўмоўныя, аднак яно (гэтае пакаленне) зрабіла значны ўклад у літаратурны працэс другой паловы XX стагоддзя. Да гэтага пакалення належыць і А. Лойка.

А.А. Лойка нарадзіўся 1.05.1931 г. у г. Слоніме ў сям’і фельчара. Вучыўся ў польскай пачатковай школе, закончыў сярэднюю школу ў Слоніме і філалагічны факультэт у 1953 г., аспірантуру пры кафедры беларускай літаратуры і з 1956 года працаваў на гэтай кафедры дацэнтам, прафесарам, з 1990 па 1998 год быў дэканам філалагічнага факультэта БДУ. На пачатку новага тысячагоддзя цяжка хварэў, жыў у Слоніме, дзе і памёр 19 лістапада 2008 года. Там і пахаваны.

Творчась А. Лойкі шматгранная: ён паэт, навуковец, літаратурны крытык, празаік. Паэзія А. Лойкі вызначаецца надзвычайнай пластычнай музычнасцю, што ідзе ад моцнай сувязі з народнай традыцыяй, фальклорам. Адной з галоўных рысаў лірыкі з’яўляецца выражэнне любові да Радзімы, народа, узвялічванне прыгажосці працоўнага чалавека, яго вялікай духоўнасці. Пейзажная лірыка А. Лойкі шмат у чым традыцыйная; у ёй адчувальныя купалаўска-коласаўскія эмацыянальнасць і пластычнасць, высокая культура радка, што ідзе ўжо і ад захопленасці творчасцю М. Багдановіча. У шматлікіх паэтычных зборніках А. Лойкі выражана вялікая ўлюбёнасць у родны край, рамантычная захопленасць жыццём.

Паэтызацыя прыроды, непасрэднасць успрымання акаляючага свету характэрныя для вершаў “Баравікі”, “Зрэдку скрыпне дзе снег пад палоззямі…”, “Жаваранак”, “Вясенні лес” з першага зборніка вершаў “На юначым шляху” (1959):

Жаваранак песняю
Славячы світанне,
Дзесьці ў паднябессі
Нікне ў сонца ззянні,

Каб адтуль імкліва
Пажаданым, любым,
Упасці на ніву
З кропляй сонца ў дзюбе.”[248]

[248] Лойка, А. На юначым шляху / А. Лойка. – Мн.: ДВБ, 1959. – С. 27.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Паэт у звычайным умее ўбачыць незвычайнае, яркае. Гэтымі якасцямі ўся яго паэзія збліжаецца з напісаным для дзяцей. Невыпадкова ў гэты зборнік былі ўключаны легенда “Нёман і Лоша”, “Адкуль казкі”, “Верабейчык”, “Тоніна калыханка”, “Як Тоня рэха шукала”.

Цікава паэт інтэрпрэтуе старажытную легенду пра Лошу і Нёман. Сапраўды, з’ява гэтая даволі цікавая, легенду, казку пра іх дзеці чытаюць і слухаюць з задавальненнем. Вытокі гэтых рэк у адным у месцы, у Галых балотах, што на Уздзеншчыне. Аднак неверагодная з’ява: выцякаючы амаль з аднаго крынічнага пачатку, рэкі адносяцца да розных басейнаў: Нёман да Балтыйскага, Лоша – да Чарнаморскага. Разбежка такая і паслужыла падставай для паэтычнай легенды. Існуе некалькі варыянтаў гэтага падання. А. Лойка выбірае сюжэт, у які заключана спрэчка дзвюх рэк, аб тым, хто дужэйшы, хто хутчэй дабяжыць да мора. Дамовіліся адправіцца з усходам сонца. А калі Нёман бесклапотна заснуў, Лоша рашыла перахітрыць і кінулася першай у дарогу, выбіраючы мякчэйшыя мсціны. Калі Нёман убачыў раніцой, што Лоша яго перахітрыла, то кінуўся даганяць, але ў адваротны бок. Так і вандруюць яны з таго часу ў розных кірунках. Праўда, паэт адступае ад сюжэта народнай легенды, сцвярджаючы, што Нёман усё ж дапамог Лошы, каб падкрэсліць жыццёвую мудрасць Нёмана і паказаць шляхі да прымірэння:

Стагнала Лоша, выбіўшыся з сілы,
Заблытаўшыся ў куп’і, дрыгве.
І дапамогі ў Нёмана прасіла,
Ад мулу чорная, у ціне і траве,

І падхапіў яе ён клапатліва,
Ёй пра падман нічога не сказаў,
І, кажуць, рады быў ён і шчаслівы,
Калі ёй потым мора паказаў.[249]

У беларускай дзіцячай літаратуры шмат вершаў пра казачніка Бая. Не абышоў гэту традыцыю і А.Лойка, але падае зноў жа свой варыянт з’яўлення казак. Ён распавядае, што *“ехаў Бай праз лясок. Вёз казак мяшок*”, па дарозе яго пераняла Жучка, брахала , церабіла мех, ды так, што зрабіла дзірку. Пакуль Бай агледзеўся, то разгубіў многа казак.

З той пары дарогай
Хто б ні праходзіў,

[249] Лойка, А. На юначым шляху. – С. 65–66.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Казак мала, многа,
Заўсёды знаходзіў[250].

У пазнейшых выданнях для дзяцей А. Лойка зняў дзве апошнія страфы, якія, па сутнасці, нічога не дабаўляюць, а паўтараюць папярэдні змест.

А калі б не ехаў
З возам Бай ля гаю,
А калі б не жучка,
Учэпістая, злая,
Дык ніхто на свеце
Не знаходзіў казак
І пра Бая дзеці
Не чулі б ні разу![251].

Такім чынам, паэт сцвярджае, што ўсе казкі – ад казачніка Бая, і ён таксама знаходзіць гэтыя казкі і вершы на той дарозе. Такая лагічная пасылка зацікаўлівае малога чытача, ён даверліва ўспрымае ўсе творы, і тыя, у якіх узнаўляецца чароўны свет прыроды. Паэт не дапускае залішняй ускладнёнасці вобразнасці, ён распавядае пра прыродныя з'явы даходлівай мовай, натуральна раскрывае паўсядзённыя з'явы, цікавыя праявы навакольля. На першы план усё ж вылучаюцца этычна-маральныя праблемы: разумнасць паводзін, уменне прыслухоўвацца да чужога голасу, патрэба жыць па ўстаноўленых законах, не парушаць іх. Гэта відавочна вынікае з верша пра верабейчыка, які сваім непаслухмяным ціўканнем-чырыканнем пад вакном парушае спакой. Верш напісаны ў стылі беларускіх калыханак, адпаведна вытрымана і рытміка твора, ад чаго ствараецца ўражанне плаўнасці дзеяння. Тут таксама ў наяўнасці фальклорная традыцыя, скандэнсаваны жыццёвы вопыт пакаленняў, які знайшоў завяршэнне ў мастацкай літаратурнай форме. Эстэтычныя вартасці такіх твораў надзвычай яркія, бо прывучаюць змалку разумець і любіць прыроду, адносіцца да ўсяго жывога са спагадай і дабратой. Такія ж элементы гульні заключаныя і ў вершы "Тоніна калыханка", у якім удала перададзена імітацыя народных калыханак маленькай дзяўчынкай. Яна складае яе свайму браціку, пры гэтым заклікае ў дапамогу з'явы прыроды, якія ўзмацняюць сілу ўздзеяння. Фальклярызацыя верша нязмушаная. У вуснах дзяўчынкі фантазіі ўяўляюцца натуральнымі.

Плыве ў небе месяц...
А браціку месяц.

[250] Лойка, А. На юначым шляху. – С. 67.
[251] Тамсама. – С. 67–68.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

...Над рэчкай, над мосцікам...
Месяц яму з хвосцікам.
Над лугам зеляненькім...
З хвосцікам маленькім, –
Спі, мой, брацік,
Падрастай,
Баю,
Бай ![252].

Увогуле дзяўчынка Тоня – гераіня многіх твораў А. Лойкі. Найчасцей падаюцца яе дачыненні з прыродай, своеасаблівае ўспрыманне яе дзівосаў падкрэсліваецца непасрэднасцю паводзін гераіні. Перш за ўсё ў вершах вылучаецца даверлівасць, чысціня душы, калі Тоня просіць маму пакінуць хоць трошкі суніц на паляне, каб маглі паласавацца вавёрка, зязюлька, мышка, а можа нават і мядзведзіха са сваімі дзеткамі. Наіўнасць жаданняў асабліва падкрэслівае багацце вялікай душы маленькага чалавечка ў вершы “Як Тоня суніцы збірала”:

Дык чым жа сунічнік
Гасцей пачастуе,
Калі ўсе суніцы
У збаночак збяру я?[253]

Паэт сцвярджае ў многіх вершах, што такія рысы характару ў дзяцей неабходна развіваць, узбагачаць іхнія душы пастаяннымі добрымі справамі ў дачыненні да прыроды, прывучаць да адчування хараства яе. Не можа чалавек вырасці чэрствым, эгаістычным, калі ён з такой любасцю ставіцца да акаляючага свету. Паўлік, напрыклад, як на вялікае майстэрства мастака дзівіцца на з’явы прыроды: першы снег так дзіўна адразу мяняе ўсё навокал. Прырода-мастак уносіць новыя фарбы ў наваколле, фігуральна мяняе выразы знаёмых прадметаў. Нейкі загадкавы, нетутэйшы, мадэрновы свет адкрываецца пагляду. Ды паэт не забывае напомніць і пра канкрэтна-жыццёвае, карыснае, што дае прыродзе снег. Ён перш за ўсё – абарона ўсяго ад лютых марозаў, хоць непасрэдна гэтага аўтар у творы не падкрэслівае. Такі вывад сам выцякае з фінальнага акорда верша “Першы снег”:

Як у садзе вішням ножкі,
Каб не мерзлі, прысыпаў,

[252] Лойка, А. На юначым шляху. – С. 71.
[253] Лойка, А. Пра ўсе справы Дзіва-Дзяржавы. – Мн.: Юнацтва, 1993. – С. 3.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Як у поле скрыў дарожку,
Дываном на рунь упаў.

Як зялёненькім ялінам
Кжухі ён кроіў, шыў,
На галінкі лёгка ўскінуў,
Толькі стой і калышы[254].

Адзінства свету прыроды і свету дзіцяці ў паэзіі Алега Лойкі надзіва тоесныя. Снегапад здзіўляе сваёй непрадказальнасцю, але і зімовы заснежаны лес чаруе не менш. У ім столькі схавана загадак. Здаецца, няўтульна адчуваюць сябе жыхары лесу, бо сарокам няўежна, а зайцам няўлежна на сіверным марозным ветры. Яны зайздросцяць мядзведзю, якому ўтульна, цёпла ў бярлозе (“У зімовым лесе”). Аднак гэта толькі адзін аспект успрымання. На справе ў лесе дзівосныя карціны. Іней серабрыць наваколле, нават сядае “*срэбнай павуцінай на рагах ласіных”*. Нават снегірыха баіцца лішнім спевам парушыць гэту прыгажосць і цішыню. Паэт не проста малюе ўражлівыя карціны прыгожага лесу, але падкрэслівае, што ўсе гэтыя цуды-таямніцы трэба разгадаць малым, зразумець іх сутнасць, адкрыць заканамернасці ў жыцці прыроды. Такія творы выпрацоўваюць у дзяцей патрэбу пазнавальнай дзейнасці, рыхтуюць глебу для выбару прафесіі: даследчыкаў флоры і фауны.

Да зімовага цыкла пейзажных вершаў адносіцца і “Як замярзае рэчка”. Тут паэтызуецца дзіцячая назіральнасць, уменне разумець законы прыроды. Хлапчука здзіўляе жыватворная сіла вады, яе непакорнасць зімовым марозам. Як бы не хочучы, рэчка паступова здаецца моцным сілам зімовых чараў, вада паціху адступае ад берагоў. Марозу тут служыць яго пасыльны-памагаты – **шэрас**, які быццам нашэптвае рэчцы спакой, “*і пад шэпат яго памалечку засынае, змаўкаючы, рэчка”*

Прыгажосць навакольнага свету паэтызуецца і ў прыродаапісальных вершах вясенне-летняга цыклу. Прыродныя дзівосы прысутнічаюць паўсядзённа ў самых звычайных праявах. Чалавек успрымае дажджы, навальніцы як звычайныя заканамернасці жыцця, дзеці ж у ёй і вясёлцы бачаць нешта звышнатуральнае. Для Тоні навальніца дае вялікае адчуванне паяднанасці са светам, яна быццам сама сааўтар гэтай навальніцы. Яе неўгамоннасць, непаседлівасць, жаданне страсаць з галінак кроплі, каб стварыць аж сто навальніц, выклікае сапраўднае захапленне. Паэту нязмушана ўдаецца раскрыць багацце і душы дзяўчынкі, і навакольных фарбаў.

[254] Лойка, А. Пра ўсе справы Дзіва-Дзяржавы. – С. 3.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Вясёлка незвычайнай колернасцю захапляе ўсіх. Дарослыя гэтую прыгожую з'яву могуць растлумачыць пры дапамозе навуковых тэорый, аднак першаснае ўражанне ўсё ж застаецца эстэтычным, прыгажосць прымушае ўспомніць міфалогію. Тым больш непасрэдна ўспрымаюць гэтыя загадкі дзеці. Паўлік захапляецца зіхотнасцю вясёлкі, ён хацеў бы мець такія фарбы, як у невядомага мастака, тады сам намаляваў бы свой прыгожы свет, дзе былі б і неба, і рэчка, і сонца, і сланечнік, і свая хата. І калі мама прыносіць сыну фарбы, ён здзіўлена робіць непасрэднае дзіцячае заключэнне:

Радасны Паўлік
Бег панадворкам:
– Дык ты гэта,
Мама,
Малюеш вясёлку?![255]

Злучанасць з прыродай праяўляецца і праз дзеянні юных герояў. Тут найважней першыя ўражанні. Імкненне да самастойнасці, самавыражэнне закладзена ў дзяцей генетычна. Праўда, часам дарослыя неадэкватна ўспрымаюць гэтае "сам", "сама", у клопатнай паўсядзённасці забываючы пра педагогіку і дыдактыку, раздражнёна рэагуюць на гэтыя быццам бы капрызы. На самай справе такое натуральнае праяўленне цікавасці да навакольнага свету – інтуітыўнае жаданне самасцвярджэння. Гэтую праблему А. Лойка закранае ў баладзе "Як Тоня рыбу лавіла". Спачатку ідзе паэтызацыя, нават ідэалізацыя сямейных адносін:

Вельмі ж любіць Тоню дзед:
Кожны дзень ёй на абед
Ловіць плотак, акунёў,
Ненажэрных шчупакоў[256].

Дзяўчынка таксама з такімі ж пачуццямі адносіцца да дзеда. Аднак яна ўсё хоча зрабіць сама, пачаставаць дзеда, таму дамагаецца ад яго, каб арганізаваў для яе рыбалку, што ўрэшце вырашаецца станоўча. З характэрнай для А. Лойкі схільнасцю да фальклорнай вобразнасці разгортваецца далей дзеянне ў баладзе, па сваёй форме набліжаючыся да вядомых казак пра Бая. У розных варыянтах перафразіруеца прымаўка *"Рыбка плавае па дну, не паймаеш ні адну"*. У творы яна набывае форму гульні паміж дзедам і ўнучкай. Можна заўважыць у творы і элементы дзіцячай дражнілкі, заключаныя ў рэфрэне "*Можа зловіш, можа, не*".

[255] Лойка, А. Пра ўсе справы Дзіва-Дзяржавы. – С. 8.
[256] Тамсама.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Ва ўласных няўдачах дзяўчынка з дзіцячай непасрэднасцю бачыць віну свайго дзеда, бо і паплавок у яе белы, і чарвячок маленькі. Выспявае самы звычайны сямейны канфлікт. Але, як і павінна быць амаль у казачнай сітуацыі, усё вырашаецца паспяхова. Фінальная страфа выпісана з характэрнай для творчасці А. Лойкі замілаванасцю. У самы крытычны момант –

... рыбка цюк у дно –
Паплаўка жа не відно ...
Закрычала Тоня: "Ах!"
Пацягнула –
і ў руках
Лешч залатавокі,
Серабрыстабокі,
Доўгі і пляскаты,
Заскакаў заўзята...
Рада Тоня, рады дзед :
Будзе рыбка на абед!..[257]

Тут заключаны і практычныя ўрокі жыцця. Першы вопыт, першая перамога дае не толькі душэўнае задавальненне, але і жаданне далейшай дзейнасці, у пэўнай ступені ашчаднасці ў адносінах да роднай прыроды. Дабразычлівасць, удзячнасць у адносінах да акаляючага свету выхоўваюцца, і калі такія ўрокі засвойваюцца, то ёсць спадзяванне на змяншэнне варварскіх адносін да прыроды. Такі ж вось разумова-прагматычны сэнс закладзены і ў баладзе "Па грыбы". Вядома, жанр вызначаны даволі ўмоўна. Аднак па напружанасці менавіта душэўнага дзеяння твор сапраўды дасягае баладнага гучання. Грыбная эпапея падаецца займальна, з пэўнай доляй інтрыгі. Паўлік праспаў паход у грыбы. Справа звычайная. Але незвычайнасць пачынаецца тады, калі Паўлік стаў прасіць дубок, каб той вырасціў яму баравік. Адказы дубка прагматычна спраграмаваныя: ён называе хлопчыку сілы, якія павінны дзейнічаць, каб тут з'явіліся грыбы. З гэтага моманту і развіваецца рамантычна-займальная гісторыя. Паўлік верыць: калі папрасіць прыроду, улашчыць яе, то і яна таксама адгукнецца. Каб не расчароўваць свайго чытача, паэт у займальна-казачнай паступовасці распавядае пра паслядоўнасць прыродных дзеянняў, каб жаданне героя здзейснілася. Паўлік выканаў ўсё і быў узнагароджаны. Пад першым дубком, у якога ён прасіў дапамогі, знайшоў баравік. Хлопчык застаецца ўдзячным дрэ-

[257] Лойка, А. Пра ўсе справы Дзіва-Дзяржавы. – С. 6.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ву за сур'ёзную параду. Інтрыга ў творы яшчэ і ў тым, што ўсе дзеянні адбываюцца перад сябрукамі, якія не разумеюць, чаму раптам Паўлік пачаў абдымаць дрэва. Паэт дае магчымасць самому чытачу ацаніць учынак хлопчыка, а гэта ўжо і далікатнае падштурхоўванне да творча-мысліцельнай дзейнасці. Увогуле літаратура не павінна даваць гатовыя адказы на ўсе пытанні. Яе спрадвечная задача была і застаецца ў пастаноўцы балючых пытанняў і ў стварэнні нейкай мадэлі для пошуку адказаў на іх. У гэтым плане творы А. Лойкі якраз і адпавядаюць такой прыадкрытай дыдактычнасці. Галоўнае, што паэту ўдаецца трымаць увагу чытача на ўзроўні розных успрыняццяў: адвольнага, абстрагаванага і чыста канкрэтнага, вызначанага дадзенай сітуацыяй. А ў цэлым у форме стварэння ўмоўнай сітуацыі тут у наяўнасці фальклорная традыцыя. Дуб спрадвеку ў народзе лічыўся вешчым, захавальнікам родавай мудрасці. Але заўважаецца і літаратурная традыцыя, што бярэ пачатак яшчэ ў старажытнасці. Вось такое спалучэнне дзвюх сілавых ліній, аб'яднаных паэтычным талентам, і выяўляе мастацкае майстэрства Алега Лойкі.

Жыццё прыроды з'яўляецца загадкай не толькі для малога чытача. На раннім веку чалавецтва змены пораў года, дня і ночы наогул былі містычнымі. Людзі набылі вопыт, зразумелі некаторыя законы прыроды, але загадкавасць яе засталася. Увогуле чалавек праходзіць этапы ўспрыняцця рэчаіснасці ад нараджэння да сталасці і старасці амаль тымі ж шляхамі, што і цэлыя народы на раннім этапе свайго існавання: ад наіўнага ўспрыняцця прыроды да навукова-доказнага яе асэнсавання. Шлях гэты доўгі і супярэчлівы, тым не менш выніковы. Паказаць гэты першасны наіўна-неўсвядомлены працэс засваення прыродных з'яваў і паспрабаваў А. Лойка ў кнізе "Дзе хто начуе?" (1977). Паэту ўдалося займальна раскрыць усе таямніцы прыроды і яе жыцця. Кожнай праяве знаходзіцца і адпаведна паэтычнае вытлумачэнне, прыбліжанае да сістэмы ўспрыняцця свету дзіцем. Існаванне жывых істот цікавіць дзяцей не толькі сваёй знешняй формай, але і сутнасцю іхніх заняткаў. У гэтым плане вершы маюць і значнае пазнавальнае значэнне. Так дзеці дазнаюцца, што матылькі часцей за ўсё затрымліваюцца на кветках. Там іх можна браць рукою. Малым здаецца, што гэтыя істоты так і начуюць, бестурботна мараць. У іншым аспекце паказваецца жыццё пчолкі: ад канстатацыі факта, што пчолка начуе ў вуллі, разгортваецца карціна яе дзейнасці. Найперш падкрэсліваецца яе працавітасць, яна шчыруе з усходу да заходу сонца, а калі не паспявае вярнуцца дамоў,

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

то можа заначаваць пад любым лісцікам, нават дождж яе не палохае. Паэт трапна выкарыстоўвае параўнанне з падарожнымі людзьмі, калі іх у дарозе ў адкрытай мясцовасці заспее ноч. Тут у паэтычнай форме вырашаецца шэраг задач: падкрэсліваецца традыцыйная працавітасць пчалы, карысць яе заняткаў для чалавека, а таксама падрыхтоўваецца глеба да практычных дзеянняў: не губляцца ні пры якіх неспадзяваных здарэннях. Кожны верш кнігі як бы дапаўняе папярэдні насычанасцю патрэбнай інфармацыяй. Каб наладзіць сабе добры адпачынак, перад гэтым трэба многа працаваць, не мець спакою ні хвіліны. Будаваць дом заўсёды клапотна і цяжка, але затое і радуе вынік (“Мурашка”). Не спіць дождж. Ён палівае зямлю і днём, і ноччу, толькі на лісціку можа прылегчы *“дочачка яго – дажджынка”* (“Дождж”). Такой няўрымслівай дзейнасцю займаецца і вежавы кран, які працуе цэлыя суткі. Яго знешні выгляд асацыіруецца з буслам, які таксама стаіць на адной назе і ў такой позе можа нават спаць у гняздзе.

У паэзіі А. Лойкі ўсе жывыя істоты малююцца ў розных іпастасях, становяцца запамінальнымі не толькі вонкава, але і сутнасцю імі здзейсненага. Што, здавалася б, цікавага могуць выклікаць вароны, якія ўсім надакучылі сваім няспынным карканнем? Аказваецца, што вароны з’яўляюцца своеасаблівымі санітарамі, яны ачышчаюць тэрыторыю ад смецця, гніенне якога можа прывесці да эпідэміі. Таму яны і спяць толькі там, *“дзе чысцюткія загоны*” (“Вароны”). Эстэтычны і маральна-этычныя высновы з усяго пачутага дзеці робяць самі. Як высвятляецца, такую ж карысць людзям прыносяць і кажаны, хоць спяць яны ў дзівосных позах, затое спрытна ловяць палявых мышэй, каб не знішчалі ўраджай. Значыць, і іх не трэба жахацца, як нячыстай сілы (“Кажаны”). З усіх насельнікаў прыроды з найбольшай паэтызацыяй выяўляюцца гаспадары Белавежы – зубры. Яны традыцыйна асацыіруюцца з магутнасцю, трываласцю беларускай нацыі. Іх паэт паказвае ў экзатычным, казачным святле. Зімовай ноччу зубрам сніцца далёкая Афрыка з яе цяплом, багаццем дарункаў прыроды: грэйся на сонцы, ласуйся прысмакамі. Можна і пазайздросціць яе сталым жыхарам, а можа, і палоннікам заапарка, дзе таксама ўсё ёсць, не дакучае мароз, не турбуе дождж. Але такая місія не для зуброў, імі перш за ўсё цэніцца прастор і воля.

У сне сваім зубрыным
Зубр азяблы як зароў!
Ашчаінена чупрына,
Снег ляціць з-пад капытоў.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Сосны небасхіл трымаюць,
Расхінаюць даль без меж,–
З душных сноў зубры ўцякаюць
На радзіму – у Белавеж[258] .

У творчасці А. Лойкі своеасабліва паэтызуецца стыхія. Кніжка "Дзе хто начуе" і адкрываецца такімі вершамі. Сонца – аснова ўсяго жыцця, таму так займальна і пяшчотна, дарэчы, як і іншыя нябесныя святілы, малюецца яно. Павучальна-дасціпна паэт расказвае, куды знікае сонца вечарам. Верш напісаны ў форме дыялогаў, спрэчак птушак пра тое, дзе начуе сонца: можа, у ГУМе каля цацак, можа, на складзе, дзе многа розных награвальных прыбораў, можа, у агародзе, таму што расцвітае, як півоня, калі ўзыходзіць. Але найбольш пераканаўчы аргумент выказвае пліска, заявіўшы, што сонца начуе "*між дубоў, аселіц"*. Гэтым сцвярджаецца і пачуццё патрыятызму. Прывіваецца любоў да родных краявідаў, сваёй радзімы. Надзвычай вобразна распавядаецца пра месяц і зоркі. Ненавязліва даюцца дзецям назвы сузор'яў. Найважнейшая ў Млечным шляху Вялікая Мядзведзіца, аказваецца, кіруе зоркамі. Перад самай раніцай, калі яны засынаюць, то

І не чуюць, – грукай, ляпай,–
Як Мядзведзіца тады
Іх зграбае мяккай лапай,
Коўш прыўзняўшы залаты[259].

Уменне гаварыць з малым чытачом сцісла і метафарычна ёміста з'яўляецца характэрнай рысай паэзіі А. Лойкі. Выказанае ў такім плане захапляе і добра запамінаецца. Прыгадаць можна вершы пра дождж, пра сонца, і іншыя, дзе ў наяўнасці адкрытая дыскусійнасць, пошук ісціны, што зноў жа вядзе да спазнання таямніц. "Спрэчкі ў кювеце" ўзбуджаюць фантазію, прымушаюць супастаўляць знаёмыя і рэдкасныя рэчы і з'явы. Паэт ненавязліва дае зразумець малому чытачу, што свет бяскрайні, высветліць, дзе начуе вецер, проста немагчыма, бо ён паўсюдна. Але галоўнае, чаго дабіваецца паэт, – гэта сцверджання абавязковасці, вернасці ў дружбе. Сам вецер нечакана падслухаў тыя спрэчкі і адказаў насельнікам кювета:

Свет увесь – чароўны,
Кожны друг мне – роўны:
Траўка, куст шыпшыны,
Ветразі і машыны,

[258] Лойка, А. Дзе хто начуе / А. Лойка. – Мн.: Маст. літ., 1977. – С. 29.
[259] Тамсама. – С. 4.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

“ТУ”, ракеты, луг,
Таполі і рэчкі, –
Друг – заўсёды друг!..
Закрывайце спрэчкі[260].

Пра тое, куды знікае ноч, расказана ў вершы “Ноч начавала ў полі...” не менш захапляльна. Тут пералічваюцца многія мясціны прыроды: лясы, лугі, палі, урочышчы, дзе ў розныя часы начавала ноч, а пасля ёй усё гэта надакучыла і яна *“у месяца начоўках сплыла за небакрай”*. Афарыстычна даецца адказ і на пытанне, чаму месяц бывае то, як сярпок, то круглы, як вока. Высвятляецца, што яго склёўваюць птушкі, як толькі ён з’яўляецца над прасторамі. Тады месяцу зноў трэба вяртацца пад молат маладога каваля, які яго расклепле і выпусціць зноў на неба. Так і паўтараецца нязменны кругазварот. Такія вершы развіваюць у дзяцей фантазію, прывучваюць іх да назіральнасці, да ўмення знаходзіць у звычайным элементы прыгожага і таямнічага. Як адзначыў Р. Літвінаў, у кнізе “Дзе хто начуе” *“А. Лойка змог артыстычна ўлавіць і непаўторна перадаць сродкамі мастацкай выразнасці цішыню сноў, цемру ночы, дрымоту ветру. Мастацкая выдумка паэта невычарпальная, яго вершы даюць шырокі прастор вобразнаму ўспрыманню дзяцьмі навакольля. Дзе могуць, напрыклад, начаваць сны? Магчыма, у зялёным бары або на акіянскім дне на промнях марскіх зорак і спінах мядуз. Магчыма, у палях або ў садах. Аднак большасць сноў начуе пад падушкай...”*[261]. Менавіта гэтым вершам А. Лойка завяршае кніжку, нібы ставіць апошнюю кропку ў вялікай зацікаўленай гаворцы.

Паэтычна А. Лойка выяўляе і бытавыя з’вы, такія звычныя для вясковага дзіцяці і, магчыма, крыху рамантычныя для гарадскога. Але абагульняльна паэт разлічвае на дасведчанасць усіх. Ён сцвярджае, што для ўспрыняцця простых з’яў патрэбна таксама і фантазія, і паэтычнае ўяўленне, таму ў кнізе “Каля млына” (1972) і ў цыкле “Вясёлы агарод” (1993) А. Лойка ўмела паказвае хатніх жывёл, агароднія расліны ў незвычайным ракурсе, надаючы ўсім з’явам арэол таямнічасці і пэўнай займальнасці. Гэтыя вершы можна назваць букваром жыцця, першай ступенькай пазнання паўсядзённых стасункаў, набыццём пераканання ў неабходнасці самім ствараць свой быт. У зборніку “Каля млына” перад малым чытачом прадстаюць амаль усе свойскія жывёлы, якіх чалавек

[260] Лойка, А. Дзе хто начуе. – С. 13.

[261] Літвінаў, Р. Асаблівасці вобразнага ўвасаблення ў творах для дзяцей / Р. Літвінаў // Бел. літаратура: зб. артыкулаў; пад агульн. рэд. М. Грынчыка. – Вып. 7. – Мн.: Выш. школа. – 1979. – С. 136.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

шанаваў здаўна. Аднак паэт піша не навуковы трактат, а мастацкі твор, таму ўся гэтая жыўнасць выяўляецца ў алегарычным, фантастычным, часам у чарадзейным святле. Сівы конік можа ўявіцца героем з чарадзейнай казкі, калі толькі на яго надзець залатую збрую; нават цялушка каля става здаецца незвычайнай істотай, калі на яе глядзець з пэўным допускам фантазіі. Чароўнасць усіх вершаў якраз і выяўляецца ў паэтычным узвелічэнні самых звычайных гаспадарчых жывёл. Жэўжыкамі прадстаюць жарабяткі, нават курачка рабенька, герой многіх беларускіх (і не толькі) казак, становіцца цікавым аб'ектам для назірання, бо не такая, якой яе ўсе ўспрымаюць, -- яна проста любіць спаць. Паэтычна перадаюцца і ўзаемаадносіны ў тым асяроддзі. Дзеці бачаць, што добра, а што дрэнна, бо ў завяршэнні кожнага верша робіцца маральны вывад аб адэкватнасці паводзін. Этычныя, маральныя і эстэтычныя якасці вершаў унікалныя. Гэта характэрна і для цыкла "Вясёлы агарод", які створаны фантазіяй паэта на аснове жыццёвай практыкі і вуснай народнай творчасці. Амаль усе вершы заснаваны на прыказках, прымаўках, загадках. У кожнай агароднай расліне паэт знаходзіць нейкую вызначальную рысу, узвялічвае яе і робіць вобраз запамінальным. Пачынаючы з агульнага сцверджання, што "*любяць агарод вясёлы гарады ўсе і ўсе сёлы*", аўтар пераходзіць да характарыстыкі кожнай расліны. Караняплоды маюць адметнасць, што сядзяць у зямлі: бурак расчырванеўся, бо расце ўніз галавой, морква дзівуецца, ці доўгі ў яе нос, бручка і рэпка малююцца, як заўзятыя сяброўкі па ўнутраным падабенстве. Часнок і цыбуля пасля агарода ўтульна адчуваюць сябе ў вянках, падвешаных у запечку. Не менш запамінальна падаюцца і іншыя расліны. Кожная знешняя рыса падмацоўваецца практычным прымяненнем яе ў страве, на стале. Ганарыстая фасоля, у якой "*стручкі, як завушніцы*", расце вышэй паветкі: яна цягнецца да сонца, каб вітамінаў было больш для росту дзяцей. Флегматычныя гарбузы і гуркі грэюцца на сонцы; памідоры стаяць, як дзяды, абапёршыся на кійкі і г.д. Вялікая адметнасць падкрэсліваецца і ў раслін для прыправы: кроп, пятрушка, сельдэрэй, каляндра. Напрыклад, сельдэрэй выглядае, як чужаземец, каляндра – нібы лісток календара, а завяршальныя радкі верша "Хрэн" наогул успрымаюцца, як народная загадка: *"корань белы, ліст зялёны, вітамінам бласлаўлёны*". Пазнавальныя якасці такіх твораў неабмежаваныя. Паэт настойліва падказвае, што ўсе гэтыя дзівосы, смаката не ўзнікаюць самі па сабе: патрэбна шчырая праца ("Лебяда"), паўсядзённы клопат ("Расада"). У апошнім вершы таксама абыгрываецца народная

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

прымаўка пра гультайства *(“Рэшатам вады не наносіш”)*. Шчодра агарод адплачвае толькі тым, хто палівае “*з поўнага вядзерца*”. Магчыма, што і не ўсе дарослыя ведаюць, якім чынам у нас з’явіліся многія агародныя расліны. Гэтыя звесткі падаюцца ў вершы “Адкуль хто”. Дасціпна, у форме разгорнутай гутаркі раскрываецца радаслоўная нашага агарода: бульба з Мексікі, морква з Егіпта, соя з Кітая і В’етнама, баклажаны з Узбекістана, кроп з Цэнтральнай Еўропы, толькі пустазелле – асот, хвошч, бадак ды іншае – з’явілася самасеем. З імі чалавеку патрэбна пастаянна змагацца. Значыць, трэба змалку прывучацца да штодзённай працы, і напамінае пра гэта А.Лойка не прамалінейна, а праз займальнасць, іншасказальнасць, гіпербалізацыю некаторых з’яў, а гэта значыць, што *“кожны твор А. Лойкі нават у даўно знаёмых рэчах, прадметах і з’явах адкрывае нешта новае і, як правіла, глыбокапаэтычнае”*[262]. Па глыбіні пазнавальнасці сапраўднай малой энцыклапедыяй можна лічыць вершы гэтых кніг А. Лойкі.

Жанр казкі ў творчасці А. Лойкі не надта пашыраны, усяго два такія творы. Але яны вельмі цікавыя ў філасофскім, маральным і этычным плане. Казка “Як Тоня рэха шукала” можа ўспрымацца і як прыгодніцкая балада. Твор і пачынаецца з баладнага запеву:

Шэрая зязюля
На суку кувала,
На суку кувала –
У бор запрашала[263].

Велічнасць адбываючагася падкрэсліваецца і наступнымі строфамі, дзе падзеі набываюць яшчэ большы арэол урачыстасці, святочнасці. Лес сустракае Тоню як сапраўдную чаканую госцю: ляснымі кілімамі высцілае дарожкі, частуе *“малінай, сакаўной ажынай, суніцай духмянай, арэхам крамяным*”. Усе найдаражэйшыя дары лес прадстаўляе Тоні, тая ад радасці “*пляскае ў далоні*”. Вось адсюль пачнаецца чыста казачнае дзейства, бо ўслед за Тоняй *“як запляскаў хтосьці ў дужыя далоні”*. Гук пошчакам разносіцца па лесе, таму Тоня рашыла знайсці таго, хто так шчыра яе падтрымаў. На ўсе яе заклікі *“Пачакай*!” чула ў адказ “...ай”. І яна рашыла знайсці гэтае таямнічае рэха (праўда, у казцы паэт не тлумачыць, адкуль дзяўчынка зразумела, што гэта РЭХА), дзяўчынка ідзе праз многія прыгоды, сустракаецца з рознымі ляснымі жыхарамі, якія яе адпраўляюць то на Захад, то на Усход, то на Поўнач,

[262] Літвінаў Р. Асаблівасці вобразнага ўвасаблення ў творах для дзяцей. – С. 137.
[263] Лойка А. Пра ўсе справы Дзіва-Дзяржавы. – С. 16.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

то на Поўдзень. Пошукавая эпапея захапляе Тоню, адначасова з ёю і чытача настраёвасцю на вынік. Разам з тым, дзеці шмат чаго даведваюцца пра таямніцы лесу, яго жыхароў і расліннасць. Сцвярджаецца дапытлівасць і дасведчанасць, з усіх звяроў і птушак самы пераканаўчы адказ дае Бусел, даводзячы Тоні, што рэха ходзіць па ўсіх прасторах бору. Спачуванне выклікае і няўдача Тоні:

Плачучы ад стомы,
Тоня йшла дадому,
Хацелася есці,
Хацелася сесці[264].

Адкрыццё заўсёды нечаканае, для маленькіх яно сустракаецца на кожным кроку, для крыху пасталеўшых прыходзіць у выніку іхняга жыццёвага вопыту, але таксама спантанна, неспадзявана. Такі фінал і казкі. Тоня нечакана ўздыхнула ў збанок пасля таго, як выпіла малако. І пачула адказ. Гукнула яшчэ раз – зноў вынік. Малы чытач радуецца разам з героем казкі, што ўрэшце таямніца адкрыта:

Тоня ўся аж расцвіла:
“Вось дзе рэха я знайшла!..”
“Мама!” – Кліча. – “Мама!
Глянь ты, што я маю!..
Паглядзі:
я
рэха
у руках трымаю![265]

Тут спрацоўвае закон успрымання з уласнага вопыту. Дзеці разам з жыццярадаснай, паэтычнай і цікавай гераіняй твора шукаюць няўлоўнае таямнічае рэха, паступова прыходзяць да вываду, што рэха знаходзіцца заўсёды там, дзе і ты: значыць, сам чалавек удзельнічае у многіх фізічных з’явах прыроды, садзейнічае іх узнікненню.

У казках найболей галоўную ролю ўсё ж адыгрывае чалавек: герой дзейнічае на фоне прыроды або пры актыўным удзеле апошняй, калі ён спаўняе свае подзвігі. У А. Лойкі некалькі іншы аспект. У казцы” “Чаму не старэе дуб” галоўнай дзеючай істотай становіцца славутае дрэва, а чалавек прысутнічае толькі як фон. Прытым, гэта зноў жа маленькія героі як бы прымерваюцца да прыродных гігантаў. У казцы “Чаму не старэе дуб” узнімаецца філасофскае пытанне адносін да жыцця, яго

[264] Лойка, А. Пра ўсе справы Дзіва-Дзяржавы. – С. 16.
[265] Тамсама. – С. 17.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

зменлівасці і працягласці. Малады дубок спачатку лічыць гады па тыднях, губляе лісты і трывожыцца, што старэе, але знаходзіць выхад: чатыры тыдні – усяго месяц, значыць зноў малады, і гэтак далей аж да дзесяткаў гадоў.

А падрос да ста гадоў,
Прызадумаўся ізноў:
“Сто гадкоў, браткі,
Нямала.
Палічыць – сукоў
не стала.
Каб лічыць было зрукі,
Перайду я на вякі[266].

І ў гэтай казцы А. Лойка выкарыстоўвае прыём гульні. Перажыванні дубка аб старэнні успрымаюцца з усмешкай, гэта падмацоўваецца рэфрэнам *“Як тут што ні гавары, а зусім я не стары”*. Паэт у развіцці сюжэта пастаянна трымае ў полі зроку чытача. Пасля кожнага падліку гадоў *дубам*, які канстатуе, што пастарэў на адзін месяц, на год, на стагоддзе, паэт звяртаецца да чытача таксама з пытаннем-рэфрэнам: *“А вам колькі?”* Для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў кантынгенту такое пытанне мае немалаважнае значэнне. Яно прывучае да самаацэнкі, а значыць, і да абстрактнага мыслення.

Паэзія А.Лойкі заўсёды была канкрэтна-змястоўнай, нават там, дзе ён захапляецца жыццём амаль да ідылічнасці. Але арыентацыя на многія жыццёвыя фактары, вядомыя яму з маленства, дапамагалі застацца на вышыні. У творчасці для дзяцей ёсць свае законы, пісьменнікі ў многім гэта ўлічваюць. Там шмат што ствараецца на прынцыпах алагізму, абсурду: мусіць, гэтую асаблівасць добра ўлавіў А. Лойка ў зборніку “Пра дзеда Аяяй і бабку Оёёй” (1984). Гумарыстычныя сітуацыі, якія ўзнаўляюцца паэтам, захапляюць сваёй недарэчнасцю, незвычайнай віртуознасцю ўзнаўлення тых неверагодных сітуацый. Тут зноў у наяўнасці фальклорны пачатак. У малога чытача адразу ўзнікае пытанне: хто такія гэтыя бабка і дзед? Потым высвятляецца, што яны не прыляцелі з космасу, што яны тутэйшыя. І вялікая справа – не паўтарыць іхнія шляхі. Таму кожны момант у вершах акцэнтаваны на тое, каб у яго чытачоў не развіваліся такія несур’ёзныя звычкі.

Віртуознасць выяўлення такіх незадачлівых герояў захапляе малога чытача, пры гэтым выпрацоўваючы ў яго высокае пачуццё гонару,

[266] Лойка, А. Пра ўсе справы Дзіва-Дзяржавы. – С. 17.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

каб не стаць такім. Тут паэт вырашае многія задачы: цешыць свайго чытача, забаўляе яго і адначасова папярэджвае, выхоўвае. Чытач з вялікім напружаннем сочыць за развіццём дзеяння, смяецца, асуджае, захапляецца гэтай зкзатычнай парай. Дзед Ааяй і бабуля Оёёй вельмі часта трапляюць у камічныя сітуацыі, але гэта не смех дзеля смеху. У кожным выпадку выносіцца маральная выснова: неабходнасць духоўнага станаўлення і развіцця асобы, пазбаўлення перш за ўсё ад дрэнных звычак (“Спрытны ўнучак, як каўбой”), выпрацоўкі ўмення не трапляць у недарэчнае становішча (“Як яйкі несла бабка да Майкі”), практычных жыццёвых умельстваў (“Пайшоў рыбу лавіць дзед”), назіральнасці, разумення прыроды і адрозненне яе дароў (“Як дзед Ааяй збіраў грыбы”) і г.д.

Гумар і сатыра ў А. Лойкі не самамэтныя. Уся кніжка пранізана гумарам, мае многія адметныя рысы забаўляльнасці, нават парадаксальнасці, але тут няма жадання толькі пасмяшыць, стварыць камічную сітуацыю. Перш за ўсё вылучаецца этычна-маральны і эстэтычны аспекты. Высокія ідэалы выпрацоўваюцца і праз выкрыццё адмоўнага. А. Лойка дабіваецца менавіта такой мэты. Недарэчнасці перашкаджаюць жыць, не даюць магчымасці раскрыцца асобе, супярэчаць выпрацоўцы мэтанакіраванасці, умення даводзіць справу да завяршэння. Дасціпна пра гэта расказвае паэт у вершы “Гарадзіў дзед агарод...” З дзедавай працы смяюцца не толькі хлапчукі, але нават і гусі, таму што ён прыбіваў паркаціны абыяк, крыва, цвікі згіналіся, штыкеціны ледзь трымаліся. Але не лепшым апынуўся і інспектар у асобе бабкі Оёёй:

адрывала бабка
Трохсотую штыкеціну, –
Дзвесце год стаяў бы плот,
Каб не яе агледзіны.

Па шчаках па дзедавых
Не слёзы – гарошыны,
Агарод на поплаве
Дасюль не загароджаны[267].

Нядбальства, лянота – найгоршыя рысы. Дасціпнай паэзіяй А.Лойка дае кірунак чытачу, як трэба пазбаўляцца ад такіх заганных якасцей. Вершы “Пра бабку і тэлевізар”, “Ехаў неяк нейкі князь” і іншыя якраз і накіраваныя на змаганне з недахопамі ўласнага характару. Смешнымі

[267] Лойка, А. Пра дзеда Ааяй і бабку Оёёй / А. Лойка. – Мн.: Юнацтва, 1984. – С. 29.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

выглядаюць прычытанні бабкі Оёёй, што ў яе сапсаваўся тэлевізар, нічога не паказвае. Прыйшоў майстар, выцер ад пылу – і зноў экран заяснеў. Або пра тое, як прысніўся дзеду Аяяй сон:

Дзед прысніў, як ехаў князь,
Выпучыўшы грудзі.
Кажа дзеду: – З печы злазь,
Я выводжу ў людзі!..

Вось табе, дзед Аяяй,
Ордэн Малой Ласкі
Без панчошынай пакуль
З капрону падвязкі!..

А цяпер бяры, друг мой,
Ордэн баязлівасці
На падвязцы залатой
Вялікай ліслівасці.

Вось – Гультайства медалёк,
Ордэн Марнатраўцы
На падсцілцы на мякчэйшай –
На зялёнай траўцы[268].

Вядома ж, атрымліваць такія адзнакі ўшанавання вялікі сорам. І пазбегнуць яго можна толькі праз выпрацоўку высакародных якасцей характару. У цэлым жа кніга мае гуманістычную накіраванасць, прывучае да павагі працоўнага чалавека, даравання яму нейкіх нязначных правіннасцей. Нездарма кніжка завяршаецца на аптымістычнай ноце пра вечнасць дзеда з бабай і іх курачкай рабай.

Этычна-маральная праблематыка характэрна для ўсёй творчасці А. Лойкі. У зборніку “Кніжка Надзейкі” (1987) яна становіцца стрыжнявой, паколькі гераіняй усіх вершаў з’яўляецца дзяўчынка Надзейка. У займальнай форме паэт паказвае ўсе варункі і турботы сваёй маленькай гераіні, падкрэслівае яе самастойнасць, што немалаважна для дзіцяці ў такім узросце, яе трывогі і клопаты, паколькі новая апратка выклікае ў яе страх (“Цыгейка”). Асабліва паэтызуецца беражлівасць і працавітасць (“Лейка”, “У садзе”), мастацкія захапленні дзяўчынкі (“Надзейчына песня”, “Пра ваўка”) і іншыя. Займальнасць такіх твораў значная, паз-

[268] Лойка, А. Пра дзеда Аяяй і бабку Оёёй. – С. 30–31.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

навальная магчымасць высокая, бо паэт імкнецца размаўляць са сваім чытачом хоць і з лагоднай усмешкай, але на сур'ёзным узроўні.

Зборнік "Пра ўсе справы Дзіва-Дзяржавы"(1993) з'яўляецца свайго роду паэтычнай анталогіяй. У ім сабраны найбольш значныя творы з некаторых папярэдніх кніжак. Кампазіцыйна ён скампанаваны так, што наступныя раздзелы пашыраюць далягляды, узбагачаюць папярэдне набыты вопыт, замацоўваюць веды, дасведчанасць і асновы духоўнасці.

Уся творчасць А. Лойкі развіваецца ў рэчышчы нацыянальнай традыцыі, яна цесна звязана з фальклорам, з'яўляецца выразна медытатыўнай. В. Козіч адзначае: "*Такая адметнасць паэзіі А. Лойкі, як спавядальная шчырасць, умельства ствараць побытавы малюнак, здольнасць да непасрэднасці перажыванняў, спрыяе творчасці для дзяцей. Дзіцячая паэзія Алега Лойкі – поўная светлых захапаленняў, багатых пачуццяў, радасці жыцця. ... Вершы для дзяцей, што уваходзяць у цыкл "Скрыжаль першага промня", маюць трывалую народную аснову, моцную повязь з фальклорам, сведчаць пра тонкае адчуванне духоўных патрэб маленькага чалавека*"[269].

Алег Лойка пісаў для дзяцей амаль паўстагоддзя, на яго паэзіі выхавалася не адно пакаленне маладых людзей. Гэтай высакароднай справе яго паэзія будзе служыць і далей.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

[269] Гісторыя беларускай літаратуры XX ст.: у 4 т. – Мн.: Бел. нав., 2003. – Т. 4. – Кн. 2. – С. 381.

З РАЗУМЕННЕМ ДЗІЦЯЧАЙ ПСІХАЛОГІІ

Творчасць І. Аношкіна для дзяцей

У літаратуру ідуць рознымі шляхамі. Адны імпэтна заяўляюць пра сябе першымі творамі, пасля замаўкаюць, як бы выпрабоўваючы сябе, каб потым стала працпаваць на абраным надзеле. Іншыя ідуць паступова, можа нават на пачатку і не думаючы стаць пісьменнікамі. Аднак назапашаны жыццёвы вопыт шукае выйсця, і чалавек не можа не пісаць, бо гэта ўжо покліч яго душы. Так паступова і няўхільна ішоў у літаратуру і Аношкін.

Іван Архіпавіч Аношкін нарадзіўся 21 студзеня 1928 года ў в. Антонаўка Чавускага раёна Магілёўскай вобласці ў сям'і сялян. Да вайны закончыў шэсць класаў, у час фашысцкай акупацыі знаходзіўся дома, пасвіў кароў, аднойчы з сябруком Міхасём знайшоў неразарваўшуюся бомбу, сябрук загінуў, а ён застаўся пакалечаным. "*Каб не тая праклятая бомба, ды не мыліцы пасля яе, можа, і не трапіў бы я ў Азарыцкі лагер смерці*"[270]. Там разам з аднавяскоўцамі спазнаў усе жахі гітлераўскіх канцлагераў, але, наперакор усім жудасцям, выжыў. Ды той жахлівы момант на ўсё жыццё ўрэзаўся ў памяць, застаўся пастаянным болем: "*Цяпер, калі сустракаю цётку Аўдулю, мне становіцца вельмі балюча. Цётка нічога не кажа, толькі глядзіць тужліва. Пэўне, думае: а ці не ты крануў першы?.. Ці не ты вінаваты, што не вярнуўся мой Мішка?*!"[271]. Пасля вызвалення раёна ад акупантаў неўзабаве паступіў у Суражскае педагагічнае вучылішча, якое закончыў у 1947 годзе. У час вучобы быў актыўным селькорам, працягваў дасылаць допісы ў газету і ў час працы выхавацелем дзіцячага дома на Бранщчыне. У тым жа годзе яго прызначылі адказным сакратаром суражскай раённай газеты "Маяк камунізма". А ўжо ў наступным годзе вярнуўся ў Беларусь, працаваў загадчыкам Мышчанскай пачатковай школы Жабінкаўскага раёна на Брэстчыне, а неўзабаве адказным сакратаром газеты таго ж раёна "Ленінскі шлях", карэспандэнтам абласной газеты "Зара". Закончыў Рэспубліканскую партыйную школу ў 1956 годзе і быў накіраваны на пасаду рэдактара чавускай раённай газеты "Сацыялістычная перамога". У 1959 годзе пераехаў у Магілёў, працаваў спачатку літсупрацоўнікам, потым загадчыкам аддзела ў "Магілёўскай праўдзе", адначасова вучыўся на завочным аддзяленні гістарычнага факультэта Магілёўскага педагагічнага інстытута, якое закончыў у 1964

[270] Аношкін, І.А. Мае рабінавыя ночы / І.А. Аношкін // Вытокі песні: Аўтабіяграфіі беларускіх пісьменнікаў. – Мн.: Маст. літ., 1973. – С. 14.

[271] Тамсама.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

годзе. У той час ён быў ужо вядомым пісьменнікам: выдаў дзве кніжкі гумару і сатыры. У тым жа годзе і прыняты ў Саюз пісьменнікаў Беларусі (тады ўсе лічыліся аўтаматычна пісьменнікамі Саюза СССР).

І. Аношкін нястомна працаваў, павышаў мастацкае майстэрства, што выявілася ў яго сатырычных апавяданнях і гумарэсках са зборніка "Брантазаўр" (1973), а таксама эпічных твораў, уключаных у кнігу "Землякі" (1979). А ў 1981 годзе сябры Магілёўскага абласнога аддзялення пісьменнікаў абралі яго адказным сакратаром, на гэтай пасадзе працаваў да 1994-га. Потым былі выдадзены кнігі "Херувім з чорнымі крыламі" (1984), "Курам не да смеху" (1985), "Каханне з памялом" (2007).

У апавяданнях і аповясцях І.Аношкіна ў асноўным распрацоўваюцца этычна-маральныя праблемы, раскрываецца высакароднасць чалавека працы, вышэйшыя якасці чалавечых характараў, разам з тым выкрываюцца заганы сямейнага выхавання, хцівасць і жорсткасць прагных людзей. усе тыя адмоўныя тыпы, што перашкаджаюць нармальнаму жыццю.

Аднак не меншую мастацкую каштоўнасць маюць і яго кнігі для дзяцей дашкольнага ўзросту і вучняў сярэдніх і старэйшых класаў. Скажам адразу: па колькасці напісанага І.Аношкін уступае сваім калегам у гэтым жанры, асабліва тым, што спецыялізуюцца менавіта на дзіцячай літаратуры. Варта згадаць тут яго кнігі для самых маленькіх "Навічок" (1966), "Алёнчын сакрэт" (1969), "Антонаў ясень" (1981), "Дзве дзяўчынкі, дзве Ірынкі" (1992), каб убачыць талент пісьменніка ў выяўленні самых звычайных жыццёвых сітуацый праз непасрэднасць іх успрымання дзецьмі. У кожным апавяданні аўтар стварае такую сітуацыю, у якой праяўляюцца і асабістыя рысы характару яго маленькіх герояў, і іх натуральнае жаданне ўсё ў жыцці бачыць прыгожым, і памкненне быць першымі сярод іншых, і спагаду да свайго бліжняга, чаго так часам не хапае дарослым, і камічныя сітуацыі, уласцівыя гэтаму ўзросту. Вось хоць бы сюжэт апавядання "Воля-кулінарка", не дужа сюжэтна напружанае, але ў нечым і ўражлівае: маленькая Волечка, якая хацела так здзівіць сваіх сяброў, што рашыла самастойна прыгатаваць пірог. Але ў сваіх стараннях пераўзышла ўсе нормы, яе здоба аказалася нейкай салёнай, непрывабнай. Высветлілася, што дзяўчынка многа кінула стрававай соды. Але і тут на выручку прыходзяць старэйшыя: бабуля частуе гасцей пячэннем сваёй выпечкі. Тут і дасціпнасць, і наяўнасць звычайнай павучальнасці. Дарэчы, тактоўны дыдактызм характэрны ўсім апавяданням, бо пісьменнік ставіць за мэту не стварыць нейкую камічную сітуацыю, а падаць гістарычна працэс народнага педагагічнага вопыту ("Дружная сямейка", "Балельшчык", "Казюрачка" і інш.).

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Пісьменнік умее па-мастацку пераканальна перадаць духоўны свет маленькага героя, выразіць яго пастаяннае памкненне да самастойнасці, да сцверджання сваёй пазіцыі ў даступных яму межах, напрыклад, даказаць самаму сабе, што не баіцца пайсці ў лес, якім яго заўсёды палохаюць сталыя людзі.

Асабліва пісьменнік любіць вылучаць у сваіх герояў самыя лепшыя якасці, тыя рысы, якія фармуюць іх як асобы: умець спагадаць усяму жывому, радавацца жыццю, імкнуцца дапамагчы знядужаламу і патрапіўшаму ў бяду. Самыя лепшыя якасці характару чалавека заўсёды вылучаюцца ў творах І. Аношкіна. Вось Марынка, якая шкадуе замёрзлую сінічку (“Знічка”), хлопчыкі, якія рашылі прывезці жывую ёлку на Новы Год, але ўжо ў лесе, загледзеўшыся на прыгажосць прыроды, рашаюць абысціся толькі галінкамі (“У гаі, каля Цішоўкі”), дзяўчынка даруе сваім міжвольным крыўдзіцелям (“Пасварыліся...”) і г.д.

Кожная мастацкая кніжка павінна многаму вучыць, але тут галоўнае не перабраць меру, выявіць усе працэсы найбольш натуральна, каб малы чытач верыў, што гэта так і на смамй справе. У гэтым плане апавяданні І. Аношкіна вытрымліваюць самыя строгія патрабаванні: у іх і харошы дыдактызм, і дапушчальная займальнасць, і прыглушаная іронія, і адкрытая жыццясцвярджальная ўсмешка (“Памочніца”, “Качалка”, “Чаму засумавала бярозка”, “Зманлівыя ледзяшы” і інш.). Разам з тым, у творах пісьменніка ясна праглядваецца арыентацыя яго чытача на будучыню, на ўменне спалучыць свае жаданні з агульнымі патрэбамі, урэшце, на канкрэтную неабходнасць узаемаразумення паміж сталымі і малымі, адказнасць бацькоў за выхаванне сваіх дзяцей. Увогуле, усе апавяданні пры іх звычайнай прастаце маюць надзвычай вялікую знешнюю прыцягальнасць і глыбокі ўнутраны змест.

Часам у творах пісьмееніка з’яўляюцца сітуацыі і малападобныя да жыццёвых, як, напрыклад, у апавяданні “Мядзведзевы жарты”, калі бацька, манцёр тэлефонных ліній бярэ з сабой сына Алёшку на прагляд ліній, бо зноў недзе абрыў. Як высветлілася – хуліганіў мядзведзь, які прымаў шум тэлеграфных слупоў за гукі пчаліных вулляў, таму выдзіраў слупы. Нават калі ўлічыць, што падзеі адбываюцца недзе ў шасцідзясятыя гады, то і тады цяжка было паверыць, што мядзведзі так вольна разгульвалі па дарогах. Хоць і гэты твор не пазбаўлены займальнасці і добрай павучальнасці. “*Задаў нам Таптыга клопату! – і тата ўзяўся за рыдлёўку. – Памагай, Алёшка*!..”[272].

[272] Аношкін, І. Дзве дзяўчынкі, дзве Ірынкі / І. Аношкін. – Мн.: Юнацтва, 1992. – С. 35.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У асноўным пісьменнік імкнецца прывіць дзецям любоў да прыроды, ахоўваць птушак, якія прыносяць многа карысці, хоць на першы погляд яны, як тыя вераб'і, могуць здасца шкоднымі, бо клююць на градах зярняткі, не разбураць у лесе муравейнікі, адносіцца разумна да ўсяго ляснога гаспадарства. Гэта вынікае і з апавядання "Лясная радасць", у якім тата, Фёдар Акімавіч, даходліва распавядае малой дачушцы Зіне пра каштоўнасць грыбоў, якія яны збіралі ў лесе. Дакладна перададзены настрой дзяўчынкі, якая ўпершыню была сярод прыроды, адчувае задаволенасць ад здзейсненага: "*Поўны кошык цяжэйшы, затое несці яго весялей, радасней. І ўсё вакол, здаецца радуецца. Нават вунь тая рыжаватая птушка. Але што гэта? Птушка нырнула ў муравейнік, нібыы качка ў сажалку. Купаецца ў муравейніку?*

– А бадай што прымае ванну! – прыпыніўся з лагоднай усмешкай тата. – Сойка! Гэтак яна чысціць пер'е.

А сойка забавілася, не заўважае людзей, распасцерла свае кароткія закругленыя крылы, залопала імі – ва ўсе бакі паляцелі сухія іголкі. Потым давай куляцца на мураўінай кучы. Тут ужо Зіна не сцярпела, засмяялася. Эх, спалохала птушку! Сойка цяжка падскочыла, пераляцела на сасну і нібы прапала.

– Бо яна такога рудога коляру! – тлумачыў тата. – Злілася з бурым ствалом сасны – не ўгледзіш"[273].

Так адначасова адбываецца і накапленне ведаў.

Аднак не толькі дашкаляты прыцягвалі ўвагу І.А. Аношкіна. Школьнікі сярэдніх і старэйшых класаў тасксама могуць знайсці цікавыя для сябе творы з усяго напісанага пісьменнікам. Напрыклад, займальнай з'яўляецца аповесць "Компас паказвае на захад" (1976), у пэўнай меры заснаваная на ўласных сведчаннях і перажываннях самога пісьменніка. Падзеі пачынаюць разгортвацца ў самыя перадваенныя гады. Сябры, вучні чацвёртага і пятага класаў Максімка, Костусь, Гога і Зміцерка, імкнуцца пазнаць свет, не прапусціць нешта дужа важнае, таму часам трапляюць у складаныя сітуацыі, дзе неабходна не толькі звычайная загартаванасць, але і ўменне шукаць выхад з самых неверагодных прыгодаў, пераадольваць страх і фізічную стомленасць. Першае такое выпрабаванне хлапчукі міжвольна наладзілі сабе выпадкова, калі Максімка, пастаянны выдумшчык і завадатар, арганізаваў лыжны паход у няблізкую Смалярню, каб праверыць на практыцы дзеянне компаса, які яму прыслаў у падарунак дзядзька-пагранічнік. Прыгоды завяршыліся

[273] Аношкін, І. Дзве дзяўчынкі, дзве Ірынкі. – С. 71.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

на той час шчасліва, бо хлопчыкаў, якія заблудзіліся ў зімовым лесе, знайшоў дзед Кузьма з Леснічоўкі. Тут хлапчукі пазнаёміліся з сваім аднагодкам Сёмкам, які таксама, як і дзед, добра ведаў урочышчы, балоты, таемныя сцяжынкі ў іх. Ён і паказаў шлях да Смалярні, дзе мужчыны з вёскі рыхтавалі бярвенні для будаўніцтва школы. Уласна, з гэтага эпізода і пачынаюцца завязвацца ўсе драматычныя вузлы ўзаемаадносінаў, што стануць вызначальнымі ў сюжэце твора. Тут назіраюць хлапчукі за першымі супярэчнасцямі жыцця, якія пакуль ім бачацца толькі ў суперніцтве маладых хлопцаў Яшкі і Сцяпана ў старанні завалодаць сэрцам прыгажуні Зоські. Яны становяцца і сведкамі драматычнага выпадку, калі бервяно, скаціўшыся са штабеля, магчыма і не без дапамогі Яшкі, перабіла нагу Сцяпану. Адсюль і будуць разыходзіцца па розных сцяжынах жыццёвыя шляхі многіх герояў. Пісьменнік даволі скупымі штрыхамі абмалёўвае трывожнае становішча пачатку саракавых гадоў: ідзе вайна, пакуль яшчэ далёка ад іхніх мясцін, але ўжо ёсць і першыя трагічныя яе вынікі, бо загінуў на фінскай вайне бацька Кастуся, недзе на граніцы ахоўваюць спакой краіны і іншыя вяскоўцы.

У адпаведнасці з успрыманнем падлеткамі рэчаіснасці паказвае І. Аношкін і першыя звесткі пра напад фашыстаў. Хлапчукі перажываюць не драматызм падзей, а нейкае шкадаванне, што геройская Чырвоная Армія разаб'е ворага без іх удзелу, таму і робяць усе наіўныя намаганні, каб патрапіць на фронт. Але іхняя летуценнасць хутка развейваецца, калі прыйшлося сустрэцца з жорсткімі рэаліямі жыцця. Першыя іх праявы Максімка ўбачыў, калі дапамагаў гнаць статак на Усход: пагоншчыкі прыдумвалі розныя прычыны, каб толькі пабольш затрымлівацца на адным месцы, урэшце вярнулі статак дадому, чаго не асудзілі ўсе вяскоўцы. Потым хлопчыкаў здзіўляла, што знаходзяцца людзі, якія ахвотна ішлі на службу да акупантаў, відаць, не разумеючы, што многае было вымушана, а сёе-тое і па загадзе, зрэшты, і розныя іншыя сітуацыі. Але яны застаюцца патрыётамі: спальваюць мост, каб фашысты не дабраліся да іхняй вёскі, выконваюць некаторыя заланні партызанаў, урэшце, і самі вымушаныя былі застацца ў супраціўленчым атрадзе. Моцную зарубку ў душах пакінула смерць сябрукоў, масавы расстрэл яўрэйскіх жыхароў мястэчка.

На старшых школьнікаў, можна сказаць, арыентавана і аповесць "Наследніца" (відаць, лепш было б "Спадчаніца"), у якой створаны абаяльны вобраз маладой дзяўчыны Надзі Гараўцовай, нядаўняй выпускніцы сельскай сярэдняй школы, сіраты, якая хоча здзейсніць

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

сваю даўнюю мару – стаць настаўніцай, але па нейкай недарэчнасці не дабрала неабходных балаў, таму застаецца жыць у цёткі, а потым, не згаджаючыся з яе мяшчанскай філасофіяй, вырашае вярнуцца ў родную вёску. Пісьменнік узнімае важную праблему – выбару свайго жыццёвага шляху, паказвае, што зрабіць гэта бывае і не так проста. Праўда, і тут праглядаецца прыкметная заідэалагізаванасць.

Гэтаму ж чытачу адрасавана і аповесць “Чырвоная каліна стаяла…” (1985), у якой распавядаецца пра змаганне беларусаў за нацыянальную школу ў былой Заходняй Беларусі. Завадатарам справы быў Алесь Чабор, ён арганізоўваў лісты вяскоўцаў да ўладаў, даходзіў нават да чыноўнікаў у Варшаве. Пісьменнік паказвае, што сіла грамады – у іх адзінстве, бо нават паліцыянтам прыходзілася мірыцца з патрабаваннямі сялян. Таму самай небяспечнай асобай для мясцовых уладаў становіцца непахісны юнак. Да таго ж Алесь быў і моцным супернікам для пісара мясцовай гміны Францішка, які таксама дабіваўся ўзаемнасці мясцовай прыгажуні Марысі. Натуральна, што ўладам неабходна любым чынам нейтралізаваць актыў, арыштаваць Алеся за распаўсюджванне лістовак, якія ўжо былі падкладзеныя пад страху. Аднак атрымалася неспадзяванка: Францішак у прыступе злосці, калі Алесь аказаў супраціўленне, забівае яго. Тут пісьменнік з жаданнем драматызаваць сюжэт, адыходзіць ад ісціны: па тым часе, да роспуску палітычных арганізацый Камінтэрнам па сталінскім загадзе, была ўсё ж недатыкальнасць асобы. Пры ўсёй жорсткасці акупацыйнай сістэмы яны не маглі адкрыта ісці на злачынствы. Па тым часе камендант і яго падручныя не маглі забіваць дзеда і бабу, тым больш падпальваць сядзібу, бо гэта была справа падсудная. Па логіцы рэчаў камендант павінен быў затрымаць Францішка як забойцу. Таму фінал бачыцца надуманым.

Аднак галоўнае застаецца: пісьменніку ўдалося паказаць сутнасць сумленных людзей, перспектыву на будучыню. Мару Алеся Чабора здзейсніў яго і Марылі сын, у той час ужо Марыі Герасімаўны,таксама Алесь, Аляксандр Аляксандравіч Чабор, але ўжо пасля Другой сусветнай вайны. Лагічна тут усё на месцы, а вось у мастацкіх адносінах не надта пераканаўча, бо не ўлаўліваецца галоўны стрыжань, сацыяльна-эканамічны фактар усіх падзеяў. Тым не менш, кніга ў пазнавальным значэнні мае важныя пазнавальна-выхаваўчае значэнне.

Кнігі пісьменніка вучаць дабрыні, спагадлівасці, простай чалавечнасці, таму і сёння з’яўляюцца надзённымі. На жаль, выдадзеныя паўвека таму, відаць, прыйшлі ў таварную нягоднасць, асабліва для маленькіх чытачоў, бо іх няма ў бібліятэках.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ПРА СВАЁ ПАКАЛЕННЕ І НЕ ТОЛЬКІ
Творчасць Галіны Васілеўскай

Пакаленне пісьменнікаў, дзіцячыя і падлеткавыя гады якіх прыпалі на суровыя часы акупацыі, назаўсёды і рэзка зафіксавалі тыя нялёгкія гады. Яны потым у многім вызначалі не толькі іх адносіны да жыцця, але і вартасці кожнага чалавека. Чыста дзіцяча-суб'ектыўнае успрыняцце падзей пазней перарасло ў аб'ектыўна-аналітычнае, што ў сувязі з творчым уяўленнем спарадзіла мастацкія творы.

Нарадзілася Галіна Ануфрыеўна Васілеўская 15 студзеня 1927 года ў в. Клічаў (зараз г.п. і раённы цэнтр) у сям'і Скрыпкаў-Бенат, працоўнай, але ўжо не зусім сялянскай, бо бацька быў больш адыходнікам, тым не менш мелі свой кавалак зямлі. З наступленнем часу агульнай драпежнай калектывізацыі ім удалося перабрацца ў Мінск. Пасяліліся ў тагачасным прыгарадзе Грушаўцы, што была амаль вёскай. Дзіцячыя і юначыя гады прайшлі ў тых мясцінах, назаўсёды ўрэзаўшыхся ў памяць. Да вайны Галіна паспела закончыць шэсць класаў, у час акупацыі займалася самаадукацыяй, што дазволіла пасля вызвалення Мінска ад акупантаў здаць экстэрнам усе экзамены за дзесяцігодку і паступіць на аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта БДУ, якое закончыла ў 1950 годзе. Атрымаўшы дыплом, яна працавала на Рэспубліканскім радыё, а ў 1953 годзе перайшла ў часопіс "Сельская гаспадарка Беларусі", затым была рэдактарам аддзела ў часопісе "Работніца і сялянка". З 1977 года яна – рэдактар аддзела нарыса і публіцыстыкі часопіса "Полымя", а ў 1979–1982 – сакратар гэтага выдання. Пазней, да выхаду на пенсію, ці, як прынята гаварыць ў творчым асяроддзі, на творчую работу, да 1988 года ўзначальвала Бюро прапаганды мастацкай літаратуры СП БССР.

У мастацкую літаратуру Г. Васілеўская прыйшла з журналістыкі. А першае апавяданне было змешчана ў часопісе "Работніца і сялянка" ў 1959 годзе. Аднак актыўна пачала друкавацца толькі з сярэдзіны шасцідзясятых. Яе цікавіла ў асноўным жыццё дзяцей, іх заняткі, мары і дзеянні. А больш за ўсё вярэдзіла памяць мінулай вайны, якую яна сама перажыла падлеткам у акупаваным Мінску. Але да ўласна бачанага і адчутага яна звярнулася не адразу. Першыя яе аповесці раскрываюць гераічныя подзвігі моладзі, у тым ліку і падлеткаў. У творах "Маланка ў начы" (1963), "Малюнак на снезе" (1969) створаны вобразы савецкіх дзяцей, максімалістаў і аптымістаў, у якіх вера ў шчаслівую будучыню прымушае не звяртаць увагі на ўсе нязгоды, нават на жахлівую

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

несправядлівасць. Такі драматычны момант, як арышт бацькі Рымы Кунько, настаўніка сярэдняй школы, праходзіць неяк незаўважна, як прыкры выпадак, бо данос напісаў мясцовы п'яніца Усачоў. Ён стане злым ценем усёй сям'і на працягу вайны, пакуль, нарэшце, не будзе забіты перад вызваленнем за спробу паўторна выслужыцца перад акупантамі.

Галоўная гераіня аповесці "Маланка ў начы" Рыма Кунько – рэальны чалавек. Аднак пісьменніца не прытрымліваецца толькі біяграфічных дадзеных, а стварае мастацкі вобраз, дае свабоду вымыслу, стварае сітуацыі, у якіх правяраецца характар гэтай гераіні, дарэшты няўрымслівай і надзіва мэтанакіраванай. Пісьменніца выкарыстоўвае цікавы літаратурны прыём, у цэлым даволі выйгрышны ў творы: яна паказвае, што яшчэ ў дзіцячым узросце Рыма страшэнна спалохалася летняй навальніцы, якая захапіла яе з старэйшымі братамі ў лесе, што давала падставы братам называць яе малой баязліўкай. Выпадак гэты становіцца ключавым у творы, паколькі з гэтага часу Рыма стараецца выпрацаваць характар, навучыцца пераадольваць страх. Такая ўстаноўка дае магчымасць Г. Васілеўскай не засяроджвацца на перадваенных гадах, бо яе гераіня яшчэ не мела аналітычнага мыслення, успрымала рэчаіснасць можа крыху і наіўна, але і пісьменніца таксама не засяроджваецца на гэтым, а падкрэслівае патрыятызм моладзі, якая імкнецца на фінскую вайну, пазней названую непапулярнай, бо яна высвяціла страшыя прабелы ў вайсковай падрыхтоўцы Савецкай Арміі. Старшыя браты Рымы Валодзя, студэнт, і Марк, дзесяцікласнік ідуць дабраахвотнікамі на фронт, Рыма захапляецца імі, нават сама спрабуе падацца туды. Разам з тым у аповесці адчуваецца ўжо і антываенны пафас, асуджэнне вайны як з'явы, што вынікае з дыялогу Рымы і яе сяброўкі Валі:

– Ненавідзіш, а сама ўцякала на вайну.

Рыма аж прыпынілася ад нечаканасці.

– Таму і ўцякала, што ненавіджу, – адказала яна.

Валя збоку недаверліва паглядзела на Рыму.

– Не верыш? Эх ты! Хіба можна сядзець дома і чакаць, калі гінуць другія, калі не ты, а яны абараняюць Радзіму ад ворага? Хавацца за іх спіны? Не, я так не магу. Я ненавіджу вайну, але калі б ведала, што хоць на адну хвіліну наблізіла яе канец, я была б шчаслівая…"[274].

Яна і дапытваецца ў братоў пасля іх звароту, ці было страшна ў баях, на што тыя адказваюць па-рознаму. Напрыклад, Марк гаво-

[274] Васілеўская, Г. Выбраныя творы / Г. Васілеўская. – Мн.: Юнацтва, 1986. – С. 268.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

рыць, што "*вайна ёсць вайна <…> А страх трэба пакідаць дома, калі адпраўляешся ваяваць… <….> Валодзя памешваў у шклянцы лыжачкай і, здавалася, думаў толькі пра чай. Потым ён сказаў: – Лепш, каб яе не было"*[275]. Калі адкінуць пытанне, хто ад каго бараніўся ў той вайне, то, можна сказаць, што ў гэтых эпізодах сфармуляваны прынцыпы ўсіх далейшых дзеянняў Рымы.

Такім чынам, Г. Васілеўская ўжо на пачатку стварае сітуацыю, якая адначасова сведчыць пра высокі патрыятызм моладзі і пра мірную настроенасць народа. Асуджэнне ўсялякага прыніжэння і знішчэння чалавека.

Вайна для народа – вялікая трагедыя, але і праверка на трываласць і высокую годнасць, або пацверджання страшнай пачварнасці, што выразна праяўляецца ў часы розных катаклізмаў. Гінуць людзі, і не толькі ў адкрытым баі, але і праз нялюдскасць такіх, як Усачоў, які помсціць усім, нават родзічам. Праз вялікія выпрабаванні праходзіць і Рыма, бясстрашная партызанка і разведчыца. І тут відавочна адначасова і рамантызацыя гераічнага змагання, нават з пэўнай доляй ідэалізацыі, паколькі ўсе захапляюцца незвычайнай здольнасцю пераўсаблення, хітрасцю і адвагай гераіні. Здаецца, пісьменніца ў творы для дзяцей імкнулася пазбягаць драматычных сітуацый, выкарыстоўвае ў паказе людзей толькі бела-чорныя фарбы, без паўтонаў. І ўсё ж праўда вайны тут ёсць, бо многае залежыць ад выпадку, збегу абставін, калі героі гінуць у той час, калі, здавалася, можна і з палёгкай уздыхнуць. Але выпадкі маюць нейкую ўнутраную заканамернасць, няўхільнасць у лёсе чалавека. І Рыма Кунько загінула ў сутычцы з нейкай адступаючай групай ворага. І ў гэтым таксама трагедыя вайны.

Драматычныя падзеі разгортваюцца і ў аповесці "Малюнак на снезе". Тут таксама жахлівая з'ява вайны, яе самая бесчалавечная сутнасць. Галоўны герой Ціхан Баран з вёскі Баркі. Ён апынаецца ў партызанскім атрадзе, прайшоўшы праз выпрабаванні ў варожай турме, здзек, псіхалагічны стрэс, бо маці адпраўляюць у кацлагер. Імкнецца быць у адзіноце, хоць і не пазбягае сустрэч з партызанамі, з многімі сябруе. Пісьменніца неаднаразова падкрэслівае, што Ціхан падлетак і яму характэрныя дзіцячыя звычкі. Г.Васілеўская паказвае падзеі па-мастацку пераканаўча, не навязвае нейкіх незвычайных сітуацый. Яна ўпэўнена, што і на вайне многае залежыць ад збегу абставін, але яе цікавіць іншае: як будзе паводзіць сябе падлетак у крытычнай сітуацыі, калі

[275] Васілеўская, Г. Выбраныя творы. – С. 270.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

яшчэ ўвогуле не сфарміраваны характар, не ўсталявалася псіхалагічная ўраўнаважанасць. Аднак пісьменніца падкрэслівае і агульную закананамернасць: калі справа ідзе пра годнасць, вернасць сваім сябрам і родным, то пачынае ўключацца як бы трэцяя сіла, якая ўжо сама па сабе рухае дзеянні асобы. Г. Васілеўская, выяўляючы душэўны стан свайго героя, не запыняецца на дэталізацыі яго перажыванняў і прадумванне нейкіх стратэгічных планаў. Яна ўлавіла стан утрапёнай душы, калі на яго вачах знішчаюць аднавяскоўцаў, яго меншых сястрычак. Прымушаны весці карнікаў, ён у далейшым дзейнічае аўтаматычна, проста ведае, што такім істотам проста нельга жыць, вядзе карнікаў у непраходнае балота, зусім не думаючы, што здяйсняе гераічны подзвіг. І ўсе падзеі ўспрымаюцца натуральна, бачыцца гэты падлетак на сваім апошнім шляху як сапраўдны патрыёт, які адпомсціў ворагу цаной уласнага жыцця. Хіба толькі выклікае нязгоду паралель з подзвігам Сусаніна, паколькі гэты факт не надта працуе на беларускі патрыятызм, паколькі рускі ахвярнік у той далёкай вайне зводзіў у непраходныя нетры беларускія войскі. Як зазначае пісьменніца, Ціхан Баран хутчэй за ўсё і не ведаў пра таго Сусаніна. Яго вяла, кіравала ўчынкамі патрэба помсты за здзейсненае злачынства. Таму і становіцца ён сапраўдным героем у вачах нашчадкаў, у нейкай ступені сімвалам велічнасці і неўміручасці народа.

М. Яфімава адзначыла, што аповесці Г. Васілеўскай маюць вялікае выхаваўчае значэнне, паколькі твор пра Рыму Кунько выклікае не толькі "*захапленне подзвігам, але і ўсяляе веру ў свае сілы, у тое, што можна да лепшага змяніць свой характар, воляй і настойлівасцю дабіцца пастаўленай мэты*"[276], а ў аповесці "Малюнак на снезе" паказаны звычайны хлопчык, добры, душэўна шчодры, які "*клапоціцца пра сваіх маленькіх сястрычак, вельмі ўважліва адносіцца да сваіх баявых таварышаў, заўсёды прыходзіць на дапамогу людзям*" [277]. Гэтыя якасці і павінны выхоўваць падрастаючае пакаленне.

Уласна перажытае, убачанае і па-новаму асэнсаванае жыццё ў акупаваным Мінску Г.Васілеўская перадала ў аповесці-хроніцы "Бывай, Грушаўка" (1979).

Жанр твора і дыктаваў пісьменніцы характар падачы матэрыялу. Можна сцвярджаць, што ў полі зроку яе дзве сям'і, лёс якіх вызначаюць

[276] Беларуская дзіцячая літаратура / пад агульнай рэд. М.Б. Яфімавай, М.М. Барсток. – 2-е выд. дапр. і дап. – Мн.: Выш. школа, 1980. – С. 100.

[277] Беларуская дзіцячая літаратура. – С. 101.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

суровыя падзеі сярэдзіны дваццатага стагоддзя, лёс іх раскрываецца праз успаміны галоўнай гераіні Таццяны Міхалевіч, у той час падлетка Тані. Такім чынам, твор мае кальцавую кампазіцыю. Сустрэча з сваім аднагодкам Славай Полазавым вяртае ў мінулае, прымушае зноў перажываць тыя драматычныя падзеі. Таццяна імкнецца быць аб'ектыўнай, расказваць пра падзеі так, як яны бачыліся тады, калі ёй не ўсё было даступнае для ўспрымання. Пра складанасць барацьбы, пра тую вялікую справу, якую рабілі ўвогуле непрыкметныя, звычайныя людзі, яна толькі здагадвалася, хоць у асобных акцыях паступова пачынала ўдзельнічаць і сама.

Г. Васілеўская імкнецца паказваць усе падзеі як звязаныя у адзін неразрыўны вузел, дзе побач з ахвярнымі людзьмі былі і прыстасаванцы, і няўстойлівыя элементы, і адкрытыя ворагі. Але няпроста было і звычайным жыхарам, якія пакутавалі ад голаду, былі заложнікамі зацятай барацьбы. Складваецца ў творы аб'ектыўная карціна жыцця ў акупаваным Мінску, у горадзе, які не скарыўся акупантам, дзе кожнага магла спаткаць трагічная выпадковасць. Вядома, пісьменніца не ставіла перад сабой задачы паказаць усю складанасць і маштаб той барацьбы. Але такая ў нейкай ступені мазаічная падача падзей толькі ўзмацняе пачуццё праўдзівасці ўсяго пададзенага ў творы. І важнейшае тут – расказаць дзецям пра тыя гады, пра тых людзей, што не лічылі сябе героямі, бо проста жылі і па сіле магчымасцей прыбліжалі Перамогу. І памяць гэта павінна жыць у пакаленнях, бо яна вярэдзіць душу тым сціплым удзельнікам: "*Памяць… Яна, нібы маланка, высвечвае падзеі, якія адгрымелі, адвіхурылі. Тады, калі я жыла з імі, не думалася, што западуць яны ў тайнікі душы, прыцішацца і будуць ляжаць доўгія гады, пакуль памяць не выхапіць іх адтуль*"[278]. Гэта і сцверджанне псіхалагічнай дакладнасці ў асвятленні ўсіх падзей, бо яны, прапушчаныя праз уласнае сэрца аўтара, не пакідаюць раўнадушным юнага чытача.

Добрай займальнасцю і пазнавальнасцю вызначаюцца аповесці для дзяцей "Я еду на вярблюдзе" (1970) і "Крылы, альбо Адзін год з жыцця Віталя Пакроўскага" (1987). Пісьменніца ў даступнай форме праз успрыманне хлопчыка-пяцікласніка Міколкі Паўлава расказвае пра культуру і архітэктуру старажытнага Егіпта. Г. Васілеўскай удалося без лішняй дыдактыкі паказаць неабходнасць набыцця ведаў, ужывацца ў гісторыю і адэкватна ўспрымаць сучаснасць, таму што і сёння Блізкі Усход мае шмат таямніц. Цікава ў творы распавядаецца пра егіпецкіх фараонаў,

[278] Васілеўская, Г. Выбраныя творы. – С. 179.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

піраміды, таямніцы старажытнай інжынерыі і механікі, загадкавасці ўзвядзення за тысячы гадоў да нашага часу гіганцкіх збудаванняў, пра ўклад жыцця арабскіх народаў другой паловы XX стагоддзя, пра неабходнасць узаемаразумення і дружбы людзей свету. Пазнанне экзатычнай краіны яшчэ больш садзейнічае захапленню родным пейзажам, сваёй радзімай. Міколка з гонарам заяўляе: "*Я бачыў вясёлку над Нілам, і мне здавалася, што яе прывезлі з Беларусі будаўнікі Асуана: яна такая ж, як і ў Мінску пасля дажджу*"[279]. Такія творы павінны зацікавіць школьнікаў сярэдніх класаў, таму што акрамя ўспрымання дзівосаў чужой прыроды, яны атрымаюць і шмат карыснай інфармацыі. Мусіць, у гэтым і сіла падобных твораў. Пэўным дыдактызмам вызначаецца і аповесць "Крылы…". У цэнтры ўвагі так званы "*ціхі*" троечнік, які апантаны адзінай марай – стварыць машыну незвычайнай канструкцыі. Ён хоча здзівіць свет, гэтаму аддае ўвесь час, пастаянна пераконвае сябе, што на ўроках, акрамя фізікі, яму нецікава. Схільнасць да канструкцыявання Віталя падтрымлівае і бацька, але пастаянна даказвае і важнасць іншых ведаў, якія патрэбныя сучаснаму чалавеку. Але зразумеў гэта Віталь толькі тады, калі апынуўся ў тэхнічным вучылішчы металістаў: выявіліся яўныя прабелы ў засваенні школьных дысцыплін. Выхад з гтай сітуацыі ён знаходзіць зноў жа традыцыйны: "*Віталь сеў за падручнікі. Добра, што бацька не выкідаў іх, а складваў у кладоўку на паліцу. Ён корпаўся цяпер на той паліцы і хутка амаль усе падручнікі перацягаў да сябе ў пакой і чытаў, чытаў*"[280]. Г. Васілеўская, такім чынам, не асуджае такую катэгорыю дзяцей, а хутчэй падказвае шляхі да разумення іхняй псіхалогіі, у патрэбны час зразумець і падтрымаць. Пісьменніца зусім не імкнецца даваць рэцэпты для рашэння многіх праблемаў, яна толькі акцэнтуе на іх увагу, а юныя чытачы самі павінны рабіць вывады, прыходзіць да разумення важнасці ўсіх вучэбных дысцыплін у школе, выпрацоўваць у сябе рысы самастойнасці і адказнасці за прынятыя рашэнні і здзейсненыя ўчынкі.

З усяго напісанага Г. Васілеўскай крыху адасоблена ўспрымаецца кніга "Іх было чацвёра" (2013), якая можа захапіць як дарослага чытача, так і старшакласнікаў. Да вяртання да каранёў, узнаўлення дрэва свайго роду падштурхоўвае аповесць "Сем Я". Аповед-успамін "Іх было чацвёра" ўзнаўляе час жыццёвай і творчай узаемнасці А. Мака-

[279] Васілеўская, Г. Выбраныя творы. – С. 469.

[280] Васілеўская, Г. Крылы, альбо Адзін дзень з жыцця Віталя Пятроўскага / Г. Васілеўская. – Мн.: Юнацтва, 1987. – С. 116.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ёнка, А. Кулакоўскага, І. Шамякіна і П. Васілеўскага. Пісьменніца згадвае, што яны часта чыталі свае творы, спрэчкі па іх бывалі такія рэзкія, што сябры рвзыходзілся злоснымі, але потым зноў сустракаліся, бо асэнсоўвалі заўвагі, каб зноў так жа востра дыскутаваць. Можа так і крыштылізваўся талент?

Этычна-маральная праблематыка яскрава праяўляецца і ў апавяданні "Шляхі і сцежкі", адказнасці бацькоў за лёс дзяцей: "*Даніла думае, што тады бацька забыўся пра іх. Толькі пра сябе помніў. І хлопец раптам даў сабе клятву, клятву дарослага, на ўсё астатняе жыццё: ніколі не паўтарыць памылку бацькі, які перакрэсліў дзяцінства сына і зрабіў адзінокай маці сына*"[281].

Колькасна Г. Васілеўская напісала нямнога, аднак яе творы занялі значнае месца ў гісторыі беларускай літаратуры. Выконваюць вялікую выхаваўчую функцыю, садзейнічаюць выпрацоўцы характару ў падрастаючага пакалення, клічуць да пазнання, набыцця ведаў.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

[281] Васілеўская, Г. Іх было чацвёра / Г. Васілеўская. – Мн.: Маст. літ., 2013. – С. 145.

БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС

1. Адамовіч, А. Здалёк і зблізку / А. Адамовіч. – Мінск: Маст. літ., 1976.

2. Аношкін, І. Дзве дзяўчынкі, дзве Ірынкі / І. Аношкін. – Мінск: Юнацтва, 1992.

3. Аношкін, І. Мае рабінавыя ночы / І. Аношкін // Вытокі песні: Аўтабіяграфіі беларускіх пісьменнікаў / скл. Я. Казека. – Мінск: Маст. літ., 1973.

4. Арочка, М.М. Беларуская савецкая паэма / М.М. Арочка. – Мінск: Навука і тэхніка, 1979.

5. Беларуская дзіцячая літаратура / пад агульнай рэд. М.Б. Яфімавай, М.М. Барсток. – 2-е выд., дап. – Мінск: Выш. школа, 1980.

6. Бечык, В. Свет жывы і блізкі / В. Бечык. – Мінск: Маст. літ., 1974.

7. Броўка, П. Збор твораў: у 9 т. / П. Броўка. – Мінск: Маст. літ., 1987. – Т. 1.

8. Бугаёў, Дз. Талент і праца / Дз. Бугаёў. – Мінск: Маст. літ., 1979.

9. Васілеўская, Г. Выбраныя творы / Г. Васілеўская. – Мінск: Юнацтва, 1986.

10. Васілеўская, Г. Іх было чацвёра / Г. Васілеўская. – Мінск: Маст. літ., 2013.

11. Васілеўская, Г. Крылы, альбо Адзін дзень з жыцця Віталя Пятроўскага / Г. Васілеўская. – Мінск: Юнацтва, 1987.

12. Вітка, В. Выбраныя творы / В. Вітка. – Мінск: Беларус. навука, 2013.

13. Гарэлік, Л.М. Аляксей Пысін: Нарыс жыцця і творчасці / Л.М. Гарэлік. – Мінск: Навука і тэхніка, 1981.

14. Гаўрусёў, С. Збор твораў: у 2 т. / С. Гаўрусёў. – Мінск: Маст. літ., 1993. – Т. 1.

15. Гаўрусёў, С. Збор твораў: у 2 т. / С. Гаўрусёў. – Мінск: Маст. літ., 1993. – Т. 2.

16. Гаўрусёў, С. Трываласць грунту / С. Гаўрусёў // Пра час і пра сябе: Аўтабіяграфіі беларускіх пісьменнікаў. – Мінск: Беларусь, 1965.

17. Гілевіч, Н. Годнасць, сумленнасць, мужнасць / Н. Гілевіч. – Мінск: Маст. літ., 1988.

18. Гісторыя беларускай літаратуры: у 4 т., 6 кн. / пад рэд. У. Гніламёдава, В. Каваленкі. – Мінск: Беларус. навука, 2001. – Т. 3.

19. Гісторыя беларускай літаратуры XX ст.: у 4 т., 6 кн. / пад рэд. У. Гніламёдава, С. Лаўшука. – Мінск: Беларус. навука, 2002. – Т. 4., кн. 2.

20. Гніламёдаў, У.В. Сучасная беларуская паэзія / У.В. Гніламёдаў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1983.

21. Гніламёдаў, У. Творыць памяць / У. Гніламёдаў // Полымя. – 1978. – № 4.

22. Грамадчанка, Т.К. Жывая памяць народа / Т.К. Грамадчанка. – Мінск: Навука і тэхніка, 1981.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

23. Грамадчанка, Т.К. Перад праўдай высокай і вечнай: Беларуская проза сёння / Т.К. Грамадчанка. – Мінск: Беларус. навука, 1991.

24. Дзюбайла, П.К. Беларускі раман: Гады 70-я / П.К. Дзюбайла. – Мінск: навука і тэхніка, 1982.

25. Лзюбайла, П.К. У пошуку духоўных каштоўнасцей / П.К. Дзюбайла. – Мінск: Навука і тэхніка, 1987.

26. Дубоўка, У. Залатыя зярняты: Казкі / У. Дубоўка. – Мінск, 1975.

27. Дубоўка, У. Збор твораў: у 2 т. / У. Дубоўка. – Мінск: Беларусь, 1965.

28. Дубоўка, У. Казкі / У. Дубоўка. – Мінск: Беларусь, 1968.

29. Дубоўка, У. Пялёсткі / У. Дубоўка. – Мінск: Маст. літ., 1973.

30. Каваленка, В. Жывое аблічча дзён / В. Каваленка. – Мінск: Маст. літ., 1979.

31. Каваленка, В.А. Іван Шамякін: Нарыс жыцця і творчасці / В.А. Каваленка. – Мінск: Нар. асвета, 1983.

32. Каваленка, В.А. Міфа-паэтычныя матывы ў беларускай літаратуры / В.А. Каваленка. – Мінск: Навука і тэхніка, 1981.

33. Каваленка, В. Прага духоўнасці / В. Каваленка. – Мінск: Маст. літ., 1975.

34. Карамазаў, В. Аброчны крыж / В. Карамазаў. – Мінск: Маст. літ., 1994.

35. Карамазаў, В. Дома / В. Карамазаў. – Мінск: Маст. літ., 1984.

36. Карамазаў, В. З вясной у адным вагоне / В. Карамазаў. – Мінск: Юнацтва, 2002.

37. Карамазаў, В. Мастак і прарабкі: раман / В. Карамазаў. – Мінск: Медысонт, 2011.

38. Карамазаў, В. Проста ўспомніў я цябе / В. Карамазаў. – Мінск: Маст. літ., 1989.

39. Карамазаў, В. Пушча: раман / В. Карамазаў. – Мінск: Маст. літ., 1979.

40. Коваленко, В.А. Общность судеб и сердец / В.А. Коваленко. – Минск: Наука и техника, 1985.

41. Літвінаў, Р. Асаблівасці вобразнага ўвасаблення ў творах для дзяцей / Р. Літвінаў // Беларуская літаратура, Выш. школа, 1979. – Вып. 7.

42. Лойка, А. Дзе хто начуе / А. Лойка. – Мінск: Маст. літ., 1977.

43. Лойка, А. На паэтычным шляху / А. Лойка. – Мінск: ДВБ, 1959.

44. Лойка, А. Пра дзеда Аяяй і бабку Оёёй / А. Лойка. – Мінск: Юнацтва, 1984.

45. Лойка, А. Пра ўсе справы Дзва-Дзржавы / А. Лойка. – Мінск: Юнацтва, 1993.

46. Лойка, А. Сустрэчы з днём сённяшнім / А. Лойка. – Мінск: Нар. асвета, 1968.

47. Марціновіч, А. За трэцім разам / А. Марціновіч // Полымя. – 1994. – № 12.

48. Марціновіч, А. Сіла вытокаў / А. Марціновіч // Полымя. – 1987. – № 4.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

49. Мішчанчук, М.І. Беларуская літаратура на сучасным этапе / М.І. Мішчанчук. – Мінск: Выш. школа, 1983.

50. Навуменка, І. Кніга адкрывае свет / І. Навуменка. – Мінск: Маст. літ., 1978.

51. Нікіціна, Т. Пазнавальна, дасціпна / Т. Нікіціна // ЛіМ. – 1975. – 21 сак.

52. Новікаў, І. Ачышчэнне: раман / І. Новікаў. – Мінск: Маст. літ., 1987.

53. Новікаў, І. Выбраныя творы: у 3 т. / І. Новікаў. – Мінск, Маст. літ., 1987. – Т. 1.

54. Новікаў, І. Выбраныя творы: у 3 т. / І. Новікаў. – Мінск: Маст. літ., 1987. – Т. 2.

55. Новікаў, І. Параненая памяць: аповесць і апавяданні / І. Новікаў. – Мінск: Юнацтва, 1990.

56. Новікаў, І. Сэрца інакш не можа: Дакументальная аповесць пра Веру Харужую / І. Новікаў // Маладосць. – 1960. – № 8.

57. Новікаў, І. Тварам да небяспекі: дакументальная аповесць / І. Новікаў. – Мінск: Беларусь, 1968.

58. Панчанка, П. Высокі бераг / П. Панчанка. – Мінск: Маст. літ., 1993.

59. Панчанка, П. Горкі жолуд / П. Панчанка. – Мінск: Маст. літ., 1988.

60. Панчанка, П. Дзе начуе жаваранак / П. Панчанка. – Мінск: Маст. літ., 1983.

61. Панчанка, П. Збор твораў: у 4 т. / П. Панчанка. – Мінск: Маст. літ., 1981. – Т. 1.

62. Панчанка, П. Крык сойкі / П. Панчанка. – Мінск: Маст. літ., 1976.

63. Панчанка, П. На паэтычным небасхіле / П. Панчанка. – Мінск: Маст. літ., 1977.

64. Панчанка, П. Размова з наследнікамі / П. Панчанка. – Мінск: Нар. асвета, 1967.

65. Панчанка, П. Чатыры кантыненты / П. Панчанка. – Мінск: Беларусь, 1964.

66. Пысін, А. Аляксей, Дзяніс, Алёнка / А. Пысін. – Мінск: Юнацтва, 1984.

67. Пысін, А. Вясёлка над плёсам / А. Пысін. – Мінск: Беларусь, 1964.

68. Пысін, А. Колькі сонцаў / А. Пысін. – Мінск: Маст. літ., 1979.

69. Пяцьдзясят чатыры дарогі: аўтабіяграфіі беларускіх пісьменнікаў / скл. Я. Казека. – Мінск: ДВБ, 1963.

70. Стральцоў, М. У полі зроку / М. Стральцоў. – Мінск: Маст. літ., 1976.

71. Сямёнава, А. Гарачы след таленту / А. Сямёнава. – Мінск: Маст. літ., 1979.

72. Чыгрынаў, І. Апавяданні / І. Чыгрынаў. – Мінск: Маст. літ., 2007.

73. Чыгрынаў, І. Вяртанне да віны / І. Чыгрынаў. – Мінск: Юнацтва, 1994.

74. Чыгрынаў, І. Плач перапёлкі / І. Чыгрынаў. – Мінск: Маст. літ., 1979.

75. Шамякін, І. Глыбокая плынь / І. Шамякін // Шамякін, І. Збор твораў: у 4 т. – Мінск: Беларусь, 1965. – Т. 1.

76. Шамякін, І. Карэнні і галіны / І. Шамякін. – Мінск: Маст. літ., 1986.

77. Шамякін, І. Снежныя зімы / І. Шамякін. – Мінск: Беларусь, 1970.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

З М Е С Т

I

АД БЕСЯДЗІ ПАЧАТАК
Штрыхі творчай індывідуальнасці Аркадзя Куляшова 3
“ПАДУМАЕМ АБ ГАЛОЎНЫМ…”
Паэзія Пімена Панчанкі 29
“А НАШЫ ХАТЫ – ЗАЛАТЫЯ ХРАМЫ…”
Паэзія Сцяпана Гаўрусёва 44

I I

РАМАНТЫЗАЦЫЯ ГЕРАІЧНАГА ПОДЗВІГУ
Раман І. Шамякіна “Глыбокая плынь” 62
АНТАНЮК, ЯГО АДНАДУМЦЫ І ПРАЦІЎНІКІ
Раман І. Шамякіна “Снежныя зімы” 86
ДАРОГАМІ МУЖНЫХ ЗМАГАРОЎ
Творчасць Івана Новікава 116
ПРА СВОЙ КРАЙ І ЛЮДЗЕЙ
Проза Віктара Карамазава 140
ГЛЫБІННАЕ ЎЗНАЎЛЕННЕ ЖЫЦЦЯ
Творчасць Івана Чыгрынава 164

I I I

ПАТРЫЯРХ ДЗІЦЯЧАЙ ПАЭЗІІ
Творчасць Уладзіміра Дубоўкі 175
З МАЙСТЭРСТВАМ ПРА ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ
Паэзія Аляксея Пысіна 196
РЭХА ШЧАСЛІВЫХ ДЗІЦЯЧЫХ ГАДОЎ
Паэзія Алега Лойкі 213
З РАЗУМЕННЕМ ДЗІЦЯЧАЙ ПСІХАЛОГІІ
Творчасць І. Аношкіна для дзяцей 231
ПРА СВАЁ ПАКАЛЕННЕ І НЕ ТОЛЬКІ
Творчасць Галіны Васілеўскай 237

БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС 244

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова